11—12 крыніца 1990 ЛІСТАПАД СНЕЖАНЬ

ISSN 0234-1387



КОЛЬКІ ЗЯМЛІ ТРЭБА ЧАЛАВЕКУ?

ТАЯМНІЦА КАМІННАЙ ЗАЛЫ

КАТАВАЦЬ ЦІ ЗЛІТАВАЦЦА?

СВЕТ Валерыя СЛАВУКА

Самы няўдзячны гэта занятак — шукаць адказы на пытанні пра творчасць мастака ў ягонай біяграфіі. Малады чалавек можа раптам трапіць у шэраг верных паслядоўнікаў тытанаў сацрэалізму, а колькі гадоў было б сёння Шагалу ці Фальку?..

І ўсё ж, перад тым як пазнаёміцца з Валерыем Славуком, я прагартаў каталог «Жывапіс, графіка—88», выдадзены два гады назад у Мінску. Пра Славука там было напісана, што ён нарадзіўся ў 1948 годзе ў Ќоханаве, маленькім мястэчку пад Віцебскам, потым вучыўся, служыў у войску. Карацей, нічо-

ВЕРНІСАЖ

ВІЗІТ ▲

◄ СПАБОРНІЦТВА

СЛАВУК ►

га асаблівага. Праўда, у беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, на аддзяленні графікі, ён быў стыпендыятам Саюза мастакоў СССР. Відаць, Валерый быў добрым студэнтам і старанна авалодваў рамяством... Далей каталог расказваў аб прыёме ў Саюз мастакоў, удзелы ў выставах, некаторыя ўзнагароды.

Крыніца

№№ 11—12 1990

ШТОМЕСЯЧНЫ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ
І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ
ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС
ЦК ЛКСМБ
І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Мінск, «Полымя»
Выдаецца са студзеня 1988 года

Галоўны рэдактар
Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Рэдакцыйная калегія:
Канстанцін АСТРЫНСКІ
Генадзь БУРАЎКІН
Аляксей ДУДАРАЎ
Леанід ЕКЕЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара)
Міхась КАЦЮШЭНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара)
Уладзімір ЛАБУНОЎ
Міхась ПАДГАЙНЫ
Аляксей СКАКУН
Мікалай ЧАРГІНЕЦ
Павел ЯКУБОВІЧ

Мастацкі рэдактар
Канстанцін ВАШЧАНКА
Тэхнічны рэдактар
Марына МАЛЕЦ

Выдаецца на беларускай і рускай мовах

Рэдакцыя прымае матэрыялы, аб'ём якіх не перавышае 12 старонак машынапісу праз два інтэрвалы. Рукапісы рэдакцыя па пошце аўтарам не вяртае.

ПІШЫЦЕ: 220807
г. Мінск, ГСП
вул. Кісялёва, 11
ЗВАНІЦЕ: 36-60-71,
36-61-13, 36-61-42

Выдавецтва «Полымя»
Дзяржаўнага камітэта
Беларускай ССР
па друку
Здадзена ў набор 16.08.90 г.

Падпісана да друку 16.11.90.
Фармат 60×90 ⅛. Афсетны друк.
Папера афсетная.
Ум.-друк. арк. 9.5. Ум. фарб.-адб. 20.
Ул.-выд. арк. 15,5. Тыраж 50000 экз.
Зак. 910. Цана 50 к.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга
друкарня выдавецтва
ЦК КП Беларусі
Адрас: 220041, г. Мінск,
Ленінскі праспект, 79.

4-я стар. вокладкі
Яўгена СКУРАТОВІЧА

1-я стар. вокладкі
Канстанціна ВАШЧАНКІ

© «Крыніца», 1990.



Сярод выстаў трапляліся даволі прэстыжныя, напрыклад, у Грэцыі, VI Трыенале графікі ў Таліне, Усесаюзная выстава малюнка. Але ўсе гэтыя выставы — групавыя.

— А вось персанальнай пакуль што не было,— бестурботна задаволіў маю цікаўнасць Славук.— І ці патрэбная яна? Шчыра кажучы, чым больш сталееш, тым больш разумееш шматмернасць знакамітага афарызму: «Служенье Муз не терпит суеты». А выставы і ўсё звязанае з імі — гэта ўсё ж марнасць.

Дарэчы, слайды паказаных тут работ Валерыя Славука нам давялося ў яго выпрошваць... Не імкнецца ён, відаць, да славы, прынамсі не мае жадання распіхваць вострымі локцямі тых, хто апынуўся паперадзе яго, як гэта робяць многія ягоныя калегі-аднагодкі.

Што ж да светаадчування вядомага беларускага графіка, то ўяўленне аб ім можна скласці па гэтых вось афортах. Каментарыяў да іх я не рабіў, бо ўпэўнены — у кожнага з вас узнікнуць уласныя думкі, асацыяцыі і аналогіі. Ці не так?



▲ АРЭНА

Пётра РОГАЎ

АДКАЗЫ «ТЫПОВАМУ ПРАДСТАЎНІКУ»

Я пішу вам з нагоды артыкула Святланы Бартохавай «Споведзь тыповага прадстаўніка» («Крыніца, № 4, 1990 г.). Загадзя прашу прабачэння за пэўную рэзкасць ліста: яна можа здацца людзям, якія не ведаюць мяне, гаворкаю кплівай бабы-каргі ці фанаткі-кансерватаркі. Проста гэта вынікае з маёй натуры.

Дык вось, пасля прачытання артыкула ў мяне ўзнікла вялікае жаданне пагладзіць беднага хлопчыка Андрэйку па галоўцы і даць яму прыгожую цацку ці цукерку ў зіхоткай абгортцы, каб супакоілася беднае «дзіця». Разбэсцілі брыдкія жанчыны гаротнага! Не было б непростойнай распусніцы-пія-нерважатай, вырас бы ён «джэнтльменам» у адносінах да дзяўчат і добрым сынам радзімы-матулі.

Хочацца ў яго спытацца: «А ці ж не сам ты прымусіў сябе скокнуць у прорву «цывілізацыі»? І потым, чаму ты сябе лічыш «тыповым»?

Можа, Андрэй тыповы для нейкае часткі моладзі. Для мяне, напрыклад, ён хутчэй рэдкі экземпляр, выхаваны на «відзіках». Паглядзіце, людзі: цэлае пакаленне выхавана на «відзіках», перасычана імі, а вы скардзіцеся на ўпадак эканомікі і нізкі пражытачны ўзровень у краіне (дзе я, цікава, магу гэты «відзік» набыць і нагледзецца? У сне, ці што?).

Дабрабыт павышаецца, узровень культуры павышаецца яшчэ хутчэй («цывілізаванае пакаленне»), а кахання, як сцвярджае «прадстаўнік», няма. У Дастаеўскага ў рамане «Падлетак» ёсць словы: «Маё перакананне, што я нікога не смею судзіць...» Я разумею іх як заклік паважаць чужы погляд (што мне, зрэшты, не заўсёды ўдаецца). Хоць і не магу яшчэ ўбачыць розніцы паміж дружбаю і каханнем, хоць і не пакутую без кахання, але хацела б папрасіць Андрэя не блытаць сапраўдных закаханых. Уявіце сабе: ёсць маладыя людзі, упэўненыя ў сваім пачуцці, шчаслівыя, і раптам ім кажуць, што каханне — перажытак і што яны звязаны «тэхнікай сексу». Пра якое ўжо тут пачуццё можна казаць, калі, выяўляецца, такое пачуццё перажывае любая яшчарка! Давайце пакінем «кесару кесарава» і не будзем такія катэгарычныя ў сваіх сцвярджэннях.

Што ж да поглядаў Андрэя на дачок Евы, дык тут неабходна, згадзіцеся, выслухаць процілеглы бок. Андрэйка, галубок, ты не заўважыў выпадкова ў дзявочых позірках пагарды ці насмешкі? А непрыязнасць? Шкада! Мне заўсёды такога «аматара» хочацца пакласці пад мікраскоп. Бо калі на вас больш ўважліва паглядзіш, то бачыш, што вы нават не Дон-Жуаны... Ты, Андрэй, і твае сябры наракаеце на нізкі ўзровень культуры, на тое, што «грамадства» ўзаконіла нецнатлівасць дзяўчыны... Але гэта ж нелагічна! Бо вы прыклалі ўсе намаганні, магчыма, несвядома, каб гэтага дасягнуць, а потым яшчэ спрабуеце абвінаваціць міфічнае грамадства? Гэта нагадвае выступленне прамоўцы, які заяўляе: «Савецкі народ з гонарам...» А да каго ж ён сам сябе адносіць? Да «ненарода»?

Ведаеце, я думаю, што Андрэй цікавы суразмоўца і чалавек недурны. А паколькі я дзялю людзей на дзве катэгорыі: на «суразмоўцаў» і «несуразмоўцаў», то думка, якая аднойчы прыйшла ў галаву, стане, бадай, неўзабаве перакананнем: калі ўжо і праўда такія суразмоўцы-юнакі, як Андрэй, тыповыя, дык іх лепей мець сябрамі, таварышамі, але не «каханымі» (гучыць трохі напышліва).

У канцы гэтага, можа, залішне доўгага ліста хачу прапанаваць Святлане Бартохавай сустрэцца з прадстаўніком другога «тыпу» маладых людзей. Якога — гэта ўжо на ваш выбар. Можа, вы знойдзеце яшчэ «тыповых прадстаўнікоў» і трэцяга, і чацвёртага тыпу, пазнаёміўшыся з якімі, нехта ўсклікне: «Не, не перавяліся яшчэ на нашай зямлі волаты!» Вызначэнне «волат», вядома, у кожнага сваё.

Шаўлякова Ірына,
15 гадоў,
г. Беразіно.

Я жыву ў вёсцы, цывілізацыі не бачыла, не бачу і, напэўна, ніколі не ўбачу, дый не імкнуся да гэтага. Я ніколі не пісала лістоў у рэдакцыі. Хацелася б верыць, што гэты ліст дойдзе да Вас і Вы знойдзеце час прачытаць яго да канца. Прачытала ў Вашым артыкуле споведзь гэтага «тыповага прадстаўніка цывілізаванага пакалення» Андрэя. Падышоў да горла камяк, слёзы самі коцяцца. Цяпер паклала сыночка спаць (дзённы сон) і прысела напісаць гэты ліст. А хутчэй за ўсё не ліст — крык душы, не, не крык — енк...

Я маці-адзіночка. І ўсё, што Андрэй выказваў, трэба разумець, гэта папрок і ў мой бок. Ну, па-першае, пра ўсіх меркаваць нельга, як ні круці, усіх пад адзін грабень стрыгчы нельга, людзі розныя. Андрэй выказваў свае погляды на навакольны свет, паказваючы тым самым і сябе. Святое і вялікае, калі і было ў ягоным жыцці, дык, як я зразумела, да 12 гадоў. Я ж пражыла свае 22 гады свята. Мне няма ў чым сябе папракнуць. Не п'ю, не куру, не ведаю нічога подлага і не імкнуся да моды. Увесь дзень працую (гадзіну назад звязала берэт сыну, а да гэтага згатавала абед, да абеду на гародзе саджала бульбу...)

Мішаў бацька падмануў мяне і адмовіўся ад нас. Часта ходзіць міма нашага дому, але зайсці не рашаецца ніколі, бо выдатна разумее, што яму не вымаліць прабачэння ні ў мяне, ні ў сына. І ўсё ж, нягледзячы на ўсё гэта, у вёсцы пра мяне ніхто благога не скажа. Нараджэнне сына для мяне было больш як шчасце. Я баялася, што ў мяне разарвецца сэрца ад пачуцця, якім яно пачало поўніцца. З гэтае хвіліны ўва мне не стала гора, зла, жорсткасці, для мяне не існавалі ворагі і сябры. Я трымала на руках сваё дзіця! О, гэта вечнасць! Шчасце ў Сусвеце, у хвіліны спакою я была багіня і маці. І што мне да таго, што да суседак па палаце прыходзілі мужы. Магчыма, яны і былі шчаслівыя, мне ўсё роўна, хоць ува мне і віравала зайздрасць, але ўсё гэта я выгнала з сябе. Я прымусіла сябе стаць сляпой да чужога шчасця, дый ці ж да шчасця — як на маю думку, дык гэта імітацыя шчасця. Ад мяне ўсё гэта далёка, я жыву для сына. Ці шчаслівая я? Большага шчасця мне не трэба!

Інстынкт жанчыны ўва мне ніколі не згасаў, але я ад яго пазбаўляюся. Каб не ўзнікала ніякіх жаданняў, я працую, працую да сёмага поту, а потым падаю як нежывая і спакойна засынаю. Цяжарнасць 9 месяцаў і 2 гады сыну, увесь гэты час я не бачыла мужчыны.

Я ганаруся, што я маці-адзіночка. Дзяржава плаціць 20 рублёў. Ніякімі прывілеямі я не карысталася і не ведала, што ў мяне яны могуць быць. Цяпер я ў адпачынку па доглядзе за дзіцём, жыву на 20 рублёў. Я не толькі за рысаю беднасці, але і за ўсімі тымі, хто за ёю стаіць. Каб не бацькі...

Калі б кожная маці выхоўвала сваё дзіця на 20 рублёў, будучы маці-адзіночкаю, дык менш было б круглых сірот у дзіцячых дамах. Безумоўна, не кожная маці можа стаць сапраўднай маткаю свайму дзіцяці. Але такіх адзінкі, з тысячы адна, я так думаю. Ва ўсякім разе, Андрэй мяркуе пра людзей па сабе, а я па сабе.

Няхай ён пакладзе на шалі сябе і таго, каго судзіць, і паглядзіць, у каго больш мінусаў.

А пасля няхай падумае: хто ён ці што, і ці мае ён права стрыгчы ўсіх пад адзін грабеньчык. Упэўнена, нават дзеля гонару, дзеля святога ён не пражыве і двух гадоў без жанчыны.

Магу толькі марыць выказаць усё гэтаму тыповаму прадстаўніку (у дадзеным выпадку Андрэю). А я не тыповая і не падобная да ўсіх — у гэтым мая сутнасць і дасканаласць.

Ірына І.,
Варонежская вобл.

Я з нагоды артыкула «Споведзь тыповага прадстаўніка». Ён мяне вельмі засмуціў. Трохі пра сябе: 27 гадоў, 5 гадоў замужам, трое дзяцей, настаўніца.

Галоўную прычыну такога погляду на каханне я бачу не ў парнаграфіі, проста дзіцяці непасрэдна ці ўскосна ўнушаецца думка, што адносіны паміж мужчынам і жанчынаю — ганебныя. Школьніцаю я прачытала «Жыццё» Мапасана. Тады думала, што ніколі замуж не пайду, так брыдка ўсё было, я яго кніг і цяпер не чытаю ніколі. Але потым усё гэта прайшло. Можа, я проста шчаслівая.

Не, я не была «святая». Яшчэ студэнткаю (заканчвала Гродзенскі універсітэт) на танцах на вяселлі сустрэла мужчыну. Прайшло вось ужо 8 гадоў, а я з замiраннем сэрца кожны раз згадваю яго. Высокі, прыгожы — і жанаты. Не, гулёнаю ён не быў. Пайшоў ад жонкі яшчэ да мяне. Прычыны мне не вядомыя. Мы ніколі пра гэта не гаварылі. Разам былі нядоўга, месяцы тры, напэўна, але і цяпер я згадваю яго, як нешта незямное. Магчыма, калі б мы ажаніліся, то наўрад ці былі б шчаслівыя. Абое прыгожыя, абое нястрыманыя, абое псіхаваныя — магчыма, з часам мы ўзненавідзелі б адно аднаго. Але тады я зайздросціла самой сабе. І я ўдзячная яму за ўсе тыя хвіліны, якія мы былі разам. Ён неяк спытаўся ў мяне:

— Ці згадзілася б ты выйсці за мяне замуж?

А я пасаромелася сказаць праўду:

— Ты што!..

Ён, напэўна, падумаў, што я з ім проста ад няма чаго рабіць. А я, можа, кахаю яго яшчэ і цяпер. І была б удзячная лёсу, калі б яшчэ хоць раз давялося яго ўбачыць. Тады я шкадавала аб адным: што ў мяне ад яго не было дзіцяці. Я яму нават не сказала б пра гэта.

А муж? Мужа я таксама кахаю, але тае юнацкае палкасці ўжо няма. Гэта нейкае іншае каханне. Я проста ведаю, што калі б нешта здарылася з ім, дык і мяне б не стала.

Мне вельмі шкада Андрэя, але ён вінаваты сам. Які чорт панёс яго да піянерважатай? Хацелася паспрабаваць? Дапускаю. А потым? Ненавідзеў, а хадзіў. Вось і выходзіць, што ён сам сябе згвалціў. Адчуваецца, што ён ненавідзіць жанчын. А як ён глядзіць на сваю маці і на сябе ў сувязі з гэтым? Ён жа не думае, што з'явіўся на свет іншым шляхам. Калі б мяне хто-небудзь згвалціў супраць маёй волі ці я ўступіла ў блізкасць з чалавекам, не маючы да яго ніякіх пачуццяў, я ненавідзела б сябе ўсё жыццё.

Я сваім вучням на іхнія не заўсёды прыемныя мне пытанні адказвала шчыра. Можа, таму, калі была цяжарная, ніхто ў мяне пальцамі не тыкаў, не хіхікаў, а наадварот, уранку сустракалі, дыпламат падносілі, усе даручэнні выконвалі: «Вам жа цяпер адмаўляць нельга». І мне тым больш крыўдныя водгукі Андрэя пра настаўнікаў. Мы таксама людзі, але калі недзе запэцкаўся сам, то не трэба ўсіх астатніх пэцкаць. І ўсё-такі я веру, што сустрэнецца яшчэ дзяўчына ці жанчына, якую ён будзе абагаўляць, няхай не ўсё жыццё, але, я думаю, шчасце павінна ўсміхнуцца кожнаму чалавеку хоць раз у жыцці, хоць раз трэба «страціць галаву».

І яшчэ. Навошта нападаць на адзіночак? Не, не ўсе яны распусныя. Лёгка тым, хто кідаюць дзяцей, а тым, хто гадуюць адны, зайздросціць няма чаго. Я маці, я ведаю, як цяжка гадаваць адной. А да родаў трэба прайсці столькі ўсялякіх інстанцый, і ўсюды на адзіночку глядзяць з пагар-

даю. А ў раддоме? Са мною адна раджала, 18 гадоў. Толькі прывезлі, а ўсе ўжо глядзець пайшлі: «адзіночка». Нарадзіла хлопчыка. Да іншых і бацькі ходзяць, і мужы ад вокнаў не адыходзяць, а да яе — ніхто. Не крыўдна хіба, што сваёй але ж самая распусная дзяўчына нарадзілася дзяўчынкаю. І быў нехта, хто яе зрабіў распуснаю. Чаму ты бачыш толькі чорнае, свет жа разнастайны, і калі табе яшчэ яго такім бачыць, як не цяпер. Не ўся віна ў нас. Ад мужчынскай высакароднасці, прыстойнасці і гонару таксама многае залежыць.

Галіна П.,
г. Навагрудак.

«Я кожную падазраваў у юрлівасці і распуснасці. Гляне якая-небудзь, і я ўжо бачу яе паўраздзетай, раскарачанай, потнай, бруднай нейкай...» — кажа Андрэй. Вой-вой-вой, якія мы чысцюткія! Выходзіць, што ён — цаца, а мы ўсе благія. А ці ведае ён, што 90% дзяўчынак да 16 гадоў ужо сустракаліся з «замахамі» з боку такіх вось «цац» і «тыповых прадстаўнікаў цывілізаванага пакалення». Ды калі я ўдзень іду па вуліцы, адно пра гэта і думаю. «Божа, толькі б не лезлі!» Я нават вачэй не смею падняць. Я баюся. Я ў кожным бачу гвалтаўніка. Ен піша, што «жанчына даўно распятая, знішчаная». Але, даруйце, не самі ж мы сябе распіналі! Няўжо так цяжка зразумець, што мы не ўсе прастытуткі і шлюхі. Вы ж, хлопцы, самі нас топчаце, а потым крычыце на ўсіх скрыжаваннях пра тое, якія мы благія. Есць, вядома, такія, што самі да вас ліпнуць, але іх не большасць. Нас, добрых і благіх, цяпер пароўну. І хто вінаваты, што вам «вочы засцілала»? Ды вы ж з непрастытуткамі і паводзіць сябе не радасцю і падзяліцца няма з кім? А потым як адказаць «чамучцы», дзе бацька? А ў садочку? А ў школе? Чаму раджаюць? Адны, каб у адзіноце не старэць, іншых падмануць вось такія гладкія і халёныя, а некаторыя, можа, з распуснасці.

Ты Андрэй, супраць шматдзетнасці? Тут я магу толькі сказаць: адно дзіця — эгаіст.

Ну, а што дзеці бачаць полавае жыццё адзіночак, дык у нас мікрараён маласямеек, а ў іх у кожнай сям'і 1-2-3 дзіцяці. Што бачаць нашы дзеці? Тое, што мы ім паказваем. І пераважна гэта залежыць ад мужчын. Гэта яны часцей за ўсё не могуць дачакацца, пакуль дзеці заснуць.

Ты Андрэй, ненавідзіш нас, ўмееце (вельмі ўжо гэта цяжка, відаць...)

Яшчэ Андрэй «не вельмі добра» (так скажам) ставіцца да адзіночак. Ен кажа, што грамадства ўзаконіла нецнатлівасць дзяўчыны. Але ён, мабыць, забыўся на тое, што ёсць такія «вельмі добрыя» хлопцы, якія спачатку нагавораць тысячу прыгожых слоў (з пэўнай мэтаю), а потым уцякаюць, як пацукі з карабля, што тоне. Пра пакінутых, ашуканых дзяўчынак са знявечанай душою ён, напэўна, забыўся? Ім што рабіць?

Я назіраю за тым, як развіваецца адно вельмі рамантычнае каханне (як у кіно!). І вы ўявіць сабе не можаце, да чаго я баюся яго «фіналу». Я вельмі баюся за сваю сяброўку, бо яна за сваім хлопцам гатовая пайсці «на край свету». Яна так яму верыць! Ей яшчэ цяжка зразумець, што яе могуць падмануць (яна яшчэ не ведае, што ГЭТА такое, і дай Бог, каб не ведала). Я ўжо паспела заўважыць, што чым больш рамантычнае каханне з боку дзяўчынак, тым больш сумна яно для іх канчаецца. Вядома, дзяўчынкі не ідэальныя, але ж і хлопцы далёка не анёлы.

Выбачайце, калі тон ліста здаўся вам рэзкім. Ведаеце, я ніколі раней не пісала ў часопісы, а толькі чытала такія інтэрв'ю. Набалела, вось і рашылася «выплюхнуць». Крыўдна проста за дзяўчынак. Але калі раптам надрукуеце і калі Андрэю прыйдзецца прачытаць мой ліст, дык няхай ён не злуецца і не крыўдзіцца. Ен хлопец разумны, і ў тым, што ён казаў (трэба прызнацца), ёсць і доля праўды, але погляды на дзяўчынак у яго вельмі тыповыя для хлопцаў. Па-мойму, ён усяго толькі разнавіднасць па-свойму раненых птушак. А ў дзяўчынках няхай паспрабуе знайсці што-небудзь добрае. Няхай паверыць мне, што гэтае «нешта» ў нас сапраўды ёсць, трэба адно больш уважліва глядзець у нашыя вочы, г. зн. у нашыя душы, і бачыць у нас людзей, роўных сабе. Я ж не адкрыю Амерыкі, калі напішу, што большасць мужчын жанчыну за чалавека не лічыць. Нават ёсць такая прымаўка (праўда, трохі грубаватая): «Курыца не птушка, баба не чалавек». Вось так вось...

Е. К.,
16 гадоў,
г. Мінск.

Мяне вельмі закранула пазіцыя «тыповага прадстаўніка» (як ён сябе называе) у адносінах да жанчыны і ўвогуле да сучаснага жыцця.

Што ж атрымліваецца? «Патэнцыяльна ў кожным сучасным мужчыну прысутнічае гвалтаўнік...» Чаму ён смее так гаварыць? Мяркуе па сабе? Ды калі б усе жылі так, як ён, то, не кажучы ўжо пра маральны стан грамадства, гэтага самога грамадства не было б увогуле. Мяркуючы па гутарцы, Андрэя, апрача праблемы сексу, увогуле мала што цікавіць. Навошта палітыка, навука, мастацтва? Дзеля чаго «спальвалі» сябе вялікія мастакі, паэты, пісьменнікі, кампазітары? Дзеля чаго стараліся вырашыць пытанне аб сэнсе жыцця філосафы ўсіх часоў? Не, гэта ўсё лухта. Галоўнае — «не сядзець на галодным пайку», «адна адмовіць, другая, ну а трэцяя абавязкова пойдзе» і г. д. Мне млосна ад такіх слоў, ад такога ладу жыцця. І справа не толькі ў распуснасці жанчын, як думае Андрэй. Ці ж лепшы ён сам? У 12 гадоў ён ўжо глядзеў «парнуху», і нішто іншае яго не цікавіць. Самае страшнае — сустрэць у жыцці такога вось Андрэя, і асабліва ў юныя гады.

У жывёлін існуюць шлюбныя перыяды, а астатні час яны клапоцяцца аб дзіцянятах. А чалавеку дадзены розум! І, па-мойму, не на ўдасканальванне тэхнікі сексу. Менавіта чалавек з развітым інтэлектам можа кахаць. Ім можа быць не толькі той, хто мае вышэйшую адукацыю, ёсць людзі мудрыя і сярод рабочых, і сярод сялян. Справа не ў становішчы. А такім, як Андрэй, патрэбны толькі тыя аддзелы мозгу, якія рэгулююць фізіялогію, не больш. Астатнія проста засмечваюць ягоную чарапную каробку. Яму каханне не патрэбнае. Навошта? Што да таго, што «жанчына даўно распятая», «знішчаная»... Ведаеце показку пра трох сляпых, у якіх запыталіся: «Што такое слон?» Той, хто трымаў у руках хобат, думаў, што слон — гэта нешта гнуткае, вёрткае, як змяя. Хто кранаў нагу, лічыў, што слон — гэта тоўстае бервяно. Трэці, мацаючы хвост, уяўляў, што слон — нешта тонкае, як вяроўка. І кожны думаў, што адказаў правільна. Так здарылася і з Андрэем. У жыцці ён сустракаў толькі распусных жанчын, ва ўсякім разе, спачатку, вось і пачаў думаць так пра ўсіх. Відаць, добрыя дзяўчынкі яго проста пазбягалі. А яны ёсць, і іх шмат. Мне шкада Андрэя, калі ён не сустрэў ніводнай з іх. А можа, і добра, што не сустрэў? Не для яго добра — яго наўрад ці пераканаеш,— а для іх. Усё ж меней будзе знявечаных лёсаў.

Мая, 22 гады,
г. Барысаў.

Падрыхтавала Святлана БАРТОХАВА.

Фота Цімура ГРЫБА

Афармленне Канстанціна ВАШЧАНКІ

У рэспубліканскім Вярхоўным Савеце, як вядома, прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР суправаджалася бурлівай дыскусіяй паміж прадстаўнікамі розных парламенцкіх груповак. Урэшце перамагло меркаванне большасці і была прынята Дэкларацыя, прапанаваная Камісіяй. Пастараемся суцешыць сябе, што ў дадзеным выпадку большасць была не толькі шматлікая, але і разважлівая. Бо гаворка ішла пра будучыню народа Беларусі, ягоныя перспектывы і гістарычны лёс.

Публікуем праект Дэкларацыі, падрыхтаваны ў БНФ і прапанаваны дэпутатамі ад яго. Цяпер гэты праект уяўляе сабою каштоўнасць толькі як гістарычны дакумент. Але ж і гістарычным дакументам месца не ў адных маўклівых архівах...

ДЭКЛЯРАЦЫЯ
АБ ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ

I. ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАЛАЖЭНЬНІ

Сувэрэннасьць Беларускай дзяржавы мае вытак у незалежнасьці Полацкага Княства, Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Пасьля анэксіі Беларусі ў канцы XVIII стагодзьдзя Расійскай імпэрыяй імкненьне беларускага народу да незалежнасьці выявілася ў шэрагу паўстаньняў (1794,1830—31,1863—64 гг.), у асэнсаваньні неабходнасьці аднаўленьня незалежнай дзяржаўнасьці. Гэты працэс прывёў да скліканьня Усебеларускага Кангрэсу ў сьнежні 1917 г. і закончыўся ў 1918 годзе ўтварэньнем на аснове шырокага, свабоднага і дэмакратычнага народнага прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) і абвяшчэньнем яе незалежнасьці, што засьведчана Трэцяй Устаўной граматай БНР, паводле якой уся ўлада на Беларусі перадавалася Усебеларускаму Устаноўчаму Сойму. Гэтым актам, прызнаным шэрагам эўрапейскіх дзяржаў, было засьведчана аднаўленьне беларускай дзяржаўнасьці.

Аднак першыя крокі Беларусі да адраджэньня былі абарваныя процідзеяньнем іншых дзяржаў і новай імпэрскай сілы — Расейскай камуністычнай партыі зь яе ідэяй сусьветнай рэвалюцыі.

У сьнежні 1918 года тэрыторыю Беларусі бяз згоды беларускага народу і Ураду БНР заняла Чырвоная Армія РСФСР. На зямлі Беларусі была ўстаноўлена таталітарная бальшавіцкая ўлада і незаконным, недэмакратычным шляхам створаны залежны ад яе ўрад, які 1-га студзеня 1919 года па рашэньні ЦК РКП(б) абвясьціў аб стварэньні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якая, аднак, незалежна ад жаданьня чужых сілаў аказалася пераемніцай дзяржаўных традыцыяў Беларусі. Без абвяшчэньня незалежнасьці БНР не была б утворана і БССР.

Праз два месяцы гэтая рэспубліка была ліквідавана бальшавікамі і створана штучнае дзяржаўнае ўтварэньне — Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Неўзабаве яна была таксама скасавана і на тэрыторыі з шасьці паветаў цэнтральнай Беларусі ў ліпені 1920 года зноў была ўтворана БССР.

Але і гэтая марыянеткавая дзяржаўнасьць была прынесена ў ахвяру унітарнаму бальшавізму. Коштам Беларусі таталітарныя ўлады Расеі купілі сабе мір з Польшчай, падзяліўшы зь ёю ў Рызе ў 1921 годзе этнічныя беларускія землі і разьяднаўшы адзінакроўны народ; адвольна перакройвалі карты і перайначвалі межы БССР, выключыўшы зь яе складу частку адвечных беларускіх тэрыторыяў на ўсходзе — цяперашнія землі Магілёўскай, Гомельскай, Смаленскай, Бранскай, часткова Пскоўскай вобласьцяў. Дзеля імпэрскіх палітычных мэтаў у 1939 годзе Літве была перададзена Віленшчына разам зь Вільняй, а ў 1944 годзе Польшчы — Беласточчына зь Беластокам. Усё гэта адбывалася са згоды прызначанага Масквой кіраўніцтва БССР, якое паслухмяна ішло на згубныя эканамічныя і палітычныя экспэрыменты над народам, якое стала саўдзельнікам у злачынствах калектывізацыі, дэнацыяналізацыі, гэнацыду.

Падпісаньне прадстаўніком БССР Саюзнага дагавору 1922 г. ня мела юрыдычнай сілы, бо гэтае рашэньне прынятае пад дыктоўку Масквы ва ўмовах таталітарнага рэжыму і акупацыі, без правядзеньня рэферэндуму і ратыфікацыі Рэспублікай гэтага акту. Усё гэта дае права Вярхоўнаму Савету БССР не заключаць новы Саюзны дагавор і дэнансаваць дагавор 1922 года ў аднабаковым парадку.

Аднак нацыянальна-адраджэнскія і дзяржаўна-стваральныя працэсы, нягледзячы на перашкоды, працягвалі разьвівацца ў БССР у першыя гады яе існаваньня. Гэта было станоўча ацэнена законным Урадам БНР у эміграцыі. У 1925 годзе частка дзеячоў Ураду БНР прызнала нацыянальна-будаўнічую дзейнасьць у БССР і вярнулася на Бацькаўшчыну, чым засьведчыла факт пэўнай пераемнасьці паміж БНР і БССР. Але неўзабаве



З Зянонам ПАЗНЯКОМ гутарыць Павел ЯКУБОВІЧ

— Ваша ацэнка Дэкларацыі з пункту гледжання грамадскага развіцця БССР?

— Беларускае грамадства цяпер можа выратаваць толькі суверэнітэт, дзяржаўная незалежнасць Беларусі ад СССР. Не будзе гэтай незалежнасці — не будзе нічога. Баюся толькі, што беларусы зразумеюць гэта па часе, калі ўжо стане зусім позна і нічога не застанецца, як перамяніць камуністычнае рабства на нацыянальнае небыццё. Дэкларацыя БНФ акрэслівае шлях да свабоды і незалежнасці не толькі ад СССР, але і ад камунізму. Менавіта таму яна не была прынятая партыйнай дэпутацкай большасцю. Дэкларацыя закранала асновы наменклатурнае ўлады над грамадствам.

Тая Дэкларацыя, якую прыняў Вярхоўны Савет, пабудаваная ў асноўным на прынцыпах БНФ паўтарагадовай даўнасці, якія цяпер нашы антаганісты выдаюць за свае. Прынятая Дэкларацыя зараз выглядае пустой паперкай. Але можа стаць сцягам, калі нашае грамадства выявіць здольнасць да паратунку. З прыняццем гэтага дакумента мы юрыдычна аб'явілі пра дзяржаўную незалежнасць. Але няма яшчэ магчымасці зрабіць яе рэальнай. З цягам часу значэнне Дэкларацыі будзе павялічвацца, нават калі нашае згодніцкае кансерватыўнае кіраўніцтва паслужліва падпіша новы кабальны «саюзны» дагавор з Гарбачовым.

— Як вы разумееце шматпартыйнасць у канкрэтных умовах сацыяльнага жыцця Беларусі?

— У Беларусі цяпер існуе пэўны палітычны вакуум. Адзінай рэальнай апазіцыйнай палітычнай сілай, накіраванай супраць паміраючай, але па-ранейшаму кіруючай КПСС, з'яўляецца Беларускі Народны Фронт. Аднак БНФ недастаткова моцны, каб паўсюдна пераняць дзяржаўную ўладу і ўзваліць на свае плечы справу Рэспублікі. А значыць, агонія КПСС і ўвесь гэты «ван-

ўсе дзеячы БНР, што вярнуліся на Беларусь, былі рэпрэсаваныя і расстраляныя.

Беларускі народ са зброяй у руках выступаў супраць таталітарнай улады ў Слуцкім паўстаньні 1920 года, у часы калектывізацыі. Гераізм і самаахвярнасьць нашага народу ў барацьбе з фашызмам у другой сусьветнай вайне здабылі прызнаньне міжнароднай супольнасьці. Беларусь у 1946 годзе стала сябрам (членам) — заснавальнікам Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў. Аднак гэта не зьмяніла каланіяльнага становішча Беларусі. Таталітарная дыктатура растаптала правы беларускага народу і давяла эканоміку і культуру Беларусі да крызіснага, амаль безвыходнага стану. Апошняе глабальнае злачынства унітарнай імпэрыі — Чарнобыльская катастрофа, маўчаньне вакол яе наступстваў — галоўны ўдар нанесла па Беларусі. Выратавацца ад чарнобыльскай бяды немагчыма, не маючы дзяржаўнай незалежнасьці. Беларускі народ, стаўшы незалежным, зможа валодаць сваімі прыроднымі рэсурсамі, сваёй працай і яе вынікамі, эканомікай, распараджацца сваім лёсам, унутранай і знешняй палітыкай і накіраваць свае багацьці, якімі цяпер не распараджаецца, на выратаваньне ад Чарнобыльскай катастрофы.

П. ДЭКЛЯРАЦЫЯ

Незалежнасьць Беларусі ажыцьцяўляецца праз пераходны перыяд, палажэньні якога вызначаюцца гэтай Дэклярацыяй і дагаворам аб пераходным перыядзе паміж БССР і СССР тэрмінам ня больш аднаго года, на працягу якога Беларусь захоўвае пэўныя саюзныя стасункі з СССР.

Зыходзячы

— з унівэрсальнага права народаў на самавызначэньне і незалежнае дзяржаўнае жыцьцё, замацаванага ў артыкуле 1 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах;

— з тысячагадовай традыцыі беларускай дзяржаўнасьці;

— з акту абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі Радай Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 году;

— з арт. 68 і 69 дзейнай Канстытуцыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якія дэкляруюць яе сувэрэнітэт;

Улічваючы,

— што Беларусь зьяўляецца сябрам (членам)— заснавальнікам Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў і паўнапраўным суб'ектам міжнароднага права;

Адзначаючы,

— што палітычны сувэрэнітэт Беларусі можа рэалізавацца толькі ў форме незалежнай нацыянальнай дзяржаўнасьці;

— што незалежнасьць Беларусі — натуральная і галоўная ўмова забесьпячэньня правоў і свабодаў грамадзянаў Беларусі, жыцьцёвых інтарэсаў яе насельніцтва і гістарычнай перспэктывы беларускага народу, гарантыя самавызначэньня і свабоднага выбару Рэспублікай свайго шляху,

ВЯРХОЎНЫ САВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ЯК ВЫРАЗНІК СУВЭРЭННАЙ ВОЛІ НАРОДУ БЕЛАРУСІ, ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Пацьвердзіць незалежнасьць Беларусі паводле Трэцяй Устаўной Граматы Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 25 сакавіка 1918 году.

Надаць Беларускай дзяржаве афіцыйнае найменьне ***Беларуская Рэспубліка,*** якое сьведчыць пра пераемнасьць дзяржаўнасьці ад Беларускай Народнай Рэспублікі і ўзьніклай як яе наступства Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Найменьне ***Беларуская Рэспубліка*** адлюстроўвае і замацоўвае рэспубліканскую форму дзяржаўнага кіраваньня на Беларусі.

Незалежнасьць Беларускай Рэспублікі ***азначае:***

— поўны сувэрэнітэт Беларусі, вяршэнства органаў дзяржаўнай улады Беларускай Рэспублікі пры вырашэньні ўсіх пытаньняў дзяржаўнага, палітычнага і эканамічнага жыцьця Беларусі на ўсёй яе тэрыторыі;

— абсалютнае права беларускага народу валодаць, карыстацца і распараджацца нацыянальным багацьцем Беларусі;

— вяршэнства Канстытуцыі і Заканадаўства Беларускай Рэспублікі на ўсёй яе тэрыторыі, адпаведнасьць заканадаўчых актаў Беларускай Рэспублікі міжнародным пагадненьням аб правох чалавека;

— сувэрэннае права народу Беларусі вызначаць свой грамадскі лад і форму дзяржаўнага кіраваньня;

— увядзеньне грамадзянства Беларускай Рэспублікі;

— гарантыі гістарычнай перспэктывы беларускай нацыі, яе мове і культуры, мовам і культурам нацыянальных меншасьцяў Беларусі;

— адсутнасьць на тэрыторыі Беларусі ўзброеных сілаў іншых дзяржаў і нератварэньне яе ў бязьядзерную краіну.

2. Пацьвердзіць юрыдычную сілу палажэньня Трэцяй Устаўной Граматы Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 25 сакавіка 1918 году, паводле якой уся ўлада ў дзяржаве перадаецца Усебеларускаму Устаноўчаму Сойму.

3. Прыпыніць у дачыненьні да Беларускай Рэспублікі дзеяньне Саюзнага дагавору 1922 году, які:

а) супярэчыць палажэньням Трэцяй Устаўной Граматы Рады БНР аб незалежнасьці Беларусі і выключнаму праву Усебеларускага Устаноўчага Сойму прымаць рашэньне пра дзяржаўныя сувязі Беларусі;

б) падпісаны БССР ва ўмовах незаконнай яе акупацыі і не ратыфікаваны зьездам Саветаў (Вярхоўным Саветам) БССР;

в) фактычна страціў сілу ў выніку нератварэньня СССР ва унітарную дзяржаву.

4. Абвясьціць да моманту скліканьня Усебеларускага Устаноўчага Сойму пераходны перыяд, падчас якога:

а) дзейнічаюць тыя нормы Канстытуцыі БССР і заканадаўчыя акты, якія не супярэчаць гэтай Дэклярацыі і міжнародным пагадненьням аб правох чалавека;

б) вышэйшую дзяржаўную ўладу ў Беларускай Рэспубліцы ажыцьцяўляе яе Вярхоўны Савет;

в) выбары дэлегатаў на Усебеларускі Устаноўчы Сойм праводзяцца з удзелам міжнародных назіральнікаў.

* * *

Беларусь застаецца свабодным суб'ектам адной эканамічнай прасторы з СССР. Пры гэтым паважае ўсе свае дагаворы, абавязкі і сувязі з іншымі рэспублікамі, стараецца прадаўжаць гэтыя сувязі, застаючыся поўнасьцю сувэрэннай дзяржавай, незалежнай ад іншых дзяржаў.

Беларуская Рэспубліка клапоціцца пра беларусаў, што жывуць па-за яе межамі, спрыяе захаваньню і разьвіцьцю іхніх рознабаковых сувязяў з Бацькаўшчынай.

Беларуская Рэспубліка выказвае гатоўнасьць і добрую волю да ўсебаковага супрацоўніцтва і ўзаемавыгадных пагадненьняў з суседнімі дзяржавамі, з усімі народамі сьвету.

дэйскі» маразм, які мы назіраем, будзе цягнуцца ў нас яшчэ доўга — год-паўтара як мінімум, а можа, і больш — час пры цяперашніх варунках ужо дастаткова, каб дайсці да сацыяльнай роспачы і нават голаду. Палітычнае выратаванне нашага хворага, імкліва дэградуючага грамадства залежыць ад масавай і растучай падтрымкі БНФ усімі здаровымі сіламі і ад расфармавання таталітарных структур КПСС, парткамаў, КДБ, асобных сфераў МУС і г. д. Толькі тады з'явіцца рэальная, а не дэкларацыйная, не бутафорская шматпартыйнасць. Гэта значыць, тады, калі не будзе дыктатуры КПСС і неабходнасці адзінага дэмакратычнага народнага фронту для барацьбы з ёй.

— Што вы разумееце пад тэрмінам «задачи молодежи»?

— Гэта пустое словазлучэнне з бальшавіцкага лексікону, якое выяўляе антычалавечы прынцып падзелу людзей па сацыяльных групах, класах, прафесіях, полавых прыкметах, дачыненнях да ўласнасці, да ідэалогіі і г. д. «Задачами молодежи» кіраўнікі СССР апраўдвалі сваю авантурную палітыку, «задачами молодежи» ашуквалі маладых, адпраўлялі іх на згубу, збэшчвалі цэлыя пакаленні. А цяпер, калі раскрылася ашуканства, адчынілі дзверы распусце, сексу, брыдоце вынарадавання.

Добра, калі людзі прыходзяць да пераканання, што толькі хрысціянская рэлігія можа выратаваць у нас чалавечае і боскае. Хрысціянству няма больш ніякай маральнай альтэрнатывы — усё астатняе збанкрутавала. Будзем верыць — будзем жыць духоўна, вечна і несмяротна.

Чалавек увогуле залежыць ад таго, што яму закладзена ў дзяцінстве. Трэба як найхутчэй спыніць бязбожную палітызацыю дзяцей, нейкую варварскую гульню ў піянераў, «акцябрат», «зарніцу» і да т. п. Гэта злачынства супраць цэлых пакаленняў.

— Што чакае Рэспубліку ў бліжэйшы час (контратакі кансерватараў, інфляцыйныя тэндэнцыі і падзенне ўзроўню жыцця, Чарнобыль і г. д.)?

— Усё гэта, відаць, павялічыцца. Сітуацыя шмат залежыць, як я ўжо казаў, ад таго, ці будзем мець суверэнітэт і колькі доўга пратрывае наменклатурная ўлада. Вельмі важна як найхутчэй займець свае беларускія грошы і сваю банкаўскаю сістэму. Гэта адразу паспрыяе затрыманню тавараў на Беларусі. Беларускі талер цяпер можа саслужыць яшчэ больш важную ролю, чым у старажытнасці, у залаты век Беларусі, калі талеры з'яўляліся самымі аўтарытэтнымі і распаўсюджанымі грашыма на нашых абшарах. Як бы ні было цяжка — само жыццё патрабуе глядзець у будучыню аптымістычна і з надзеяй.

Вацечка

Леанід ЕКЕЛЬ

ЗЯМЛЯ БЕЗ ВОЛІ

І. ВОГНІШЧА НА ВЕТРЫ

Дзіцячая памяць быццам вогнішча на ветры. То раптам палыхне, разгоніць цемру, асветліць зямлю так, што бачная будзе кожная травінка, то зусім згасне: і колькі ні чакай, ні спадзявайся — не ажыве полымя. Толькі горкі дымок закурыцца, дый той хутка знікне. І наступіць цемра...

Але над тым, што помніцца, над тым ні людзі, ні гады не маюць улады.

«Я — НЕ КАЛЬХОЗНІК»

Калі ў нашым сяле арганізавалі калгас імя Сталіна, мне не было яшчэ і трох год. Але цьмяная, цёмная трывога тых дзён увайшла і ў маю душу. Праз чатыры гады пасля вясны сорак пятага вайна зноў прыйшла да маіх землякоў. Без крыві і смерці; аднак ці не было гэта для селяніна духоўнай пагібеллю — адмовіцца ад зямлі, якая патыхала тым самым потам, што і ўласная кашуля, адвесці на агульны двор каняку, аддаць карову; дазволіць раскідаць на бервянцы гумно і свіран. Не, не з песняю будавалася новае жыццё, а з крывёю адрывалася звыклае, тое адзінае, што селяніна рабіла селянінам. Дзе «маё» было сапраўды «маім», а не міфічным нашым. Дзе зямля-карміцелька мела сапраўдную цану і сэнс.

Наша сям'я ніколі не была заможная. Дый як яна магла стаць такой? Не паспелі перасяліцца на хутар, як пачалася вайна. Пяцёра маіх братоў і сясцер, двоіх з якіх мне ніколі не давялося бачыць, бацькі ды дзед з бабкай жылі ў неяк прыстасаваным хляве. Дом пабудавалі ўжо пасля вайны.

Колькі разоў потым, калі даводзілася адказваць на пытанні анкет «Дзе былі бацькі ў час вайны?», так і рупіла напісаць: «А якая ваша сабачая справа?» Хіба ёсць віна маіх бацькоў у тым, што іх зямля стала акупіраванай тэрыторыяй? Хіба не яны аддавалі партызанам апошні кавалак хлеба? Зрэшты, тыя асабліва і не пыталіся: бралі як сваё. На каленях маліла мама, как не забіралі карову — дзеці адно за аднаго меншыя. Адштурхнулі прыкладам: «Вы тут на печцы сядзіце, а нам што, у лесе кару жэрці?..»

Пасля вызвалення Беларусі бацьку ўзялі на фронт. Дамоў ён вярнуўся са зняволенай рукою.

А ўдалыя чырвоныя партызаны сталі сельсаветчыкамі і сумленнымі актывістамі. Не прасыхаючы ад самагонкі, з хмурымі тварамі, якія не абяцалі нічога добрага, хадзілі яны з аднае хаты ў другую, каб прымусіць сялян уступіць у шчаслівае калгаснае жыццё. Калі ўгаворы не дзейнічалі, пачыналіся пагрозы. І людзі разумелі, што ад гэтых можна чакаць усяго. Што яны ведаюць усё пра ўсіх і нікога не пашкадуюць.

Стогн стаяў па сялу. Але што маглі зрабіць вяскоўцы? Каму паскардзіцца? Ды і хто стаў бы слухаць гэтых «прыдуркаватых людзей, якія не жадаюць сабе шчасця»? Праўда, некалькі непахісных душ усё ж знайшлося сярод маіх землякоў. Яны так і памерлі «аднаасобнікамі». Але колькі праклёнаў, колькі здзекаў і варожасці даталося на іх долю! Нават ад блізкіх людзей і суседзяў, не кажучы ўжо пра мясцовае начальства...

Нейкі час Бог ратаваў бацьку ад сустрэчы з калгаснымі агітатарамі. Маму яны ўсур'ёз не ўспрымалі — што можна ўзяць з неадукаванай сялянкі, якая нават свайго прозвішча не ўмее напісаць? Але аднойчы гэты дзень прыйшоў. Бацька, узяты ў кальцо раззлаванымі актывістамі, вымушаны быў напісаць заяву аб «добраахвотным і свядомым» уступленні ў калгас.

Аглушаны, ён так і сядзеў за сталом, дзе толькі што напісаў заяву, калі ў хату ўвайшла суседка. Яна зразумела ўсё без слоў і, відаць, жадаючы неяк разрадзіць становішча, стала жартаваць са мною:

— Ну, што, калгаснічак, запісаўся ў калгас? Цяпер усё забяруць. І каня, і кароўку, і цябе забяруць.

— Я — не кальхознік! Я — не кальхознік! — заламантаваў я і зайшоўся плачам.

— Пабойся, Маня, Бога, што ты дзіцё дражніш? Які ж ён калхознік? — заступілася за мяне мама.

...Калі бываю дома і сустракаюся з маёй вясёлай цёткаю, яна не-не дый спытае: «А памятаеш, як ты крычаў: «Я — не кальхознік! Я — не кальхознік!..»

Не памятаю, мілая мая цётачка, не памятаю. І пішу ўсё са слоў мамы. А вось другое добра памятаю...

ВЕРА І БАЦЬКА

Жоўтае святло газніцы. Цені ў кутках. Цені на тварах у бацькі, на тварах у братоў і сястры. Ужо колькі часу ў калысцы, падвешанай да бэлькі, плача брацік. Яму няма і года. Сястра не раз падыходзіла да яго, калыхала, але малы не змаўкаў.

Стукнуць веснічкі — і ўсе з надзеяй глядзяць на дзверы. Вось яны расчыняцца — і на ганку з'явіцца мама. Але не — гэта вецер і дождж...

Лета было надзвычай даждлівае, і бульба, якую пасадзілі ў нізіне, вымакла. Ні хлеба, ні бульбы. Чым карміць сям'ю? Як перажыць зіму? Адвечны сялянскі боль і страх, здаецца, не ведалі прасвету. А «шчаслівае калгаснае жыццё» толькі ўзмацніла іх, давяло да поўнай безнадзейнасці.

Калгасную бульбу выкапалі, поле ўзаралі. І тамсям, адмытыя дажджом, забялелі клубні. Дзень-другі і бульба згніе. А не згніе, дык маразы даканаюць. Ці магла дапусціць сялянская душа, каб дабро гіну-

ла на вачах? Вось на гэтае поле з кашамі ў руках і пайшлі хутаранкі. І мама таксама.

Таратайка старшыні наляцела на жанчын. Хто быў далей на краі поля, пакідалі ўсё і разбегліся. А мама з суседкаю апынуліся бліжэй за ўсіх. Старшыня схапіў іх, заштурнуў у таратайку і павёз да шашы, дзе чакаў крыты грузавік...

— Вой, Сямён, павезлі тваю Веру ў турму! — прынесла нам хутаранка благую вестку.

Веру павезлі ў турму. Веру і ў прамым, і ў пераносным сэнсе.

Бацьку было лёгка ў нечым пераканаць. Так, ён сумняваўся, пакутаваў — хіба проста вось так, адным росчыркам пяра змяніць усё жыццё? Але калі стаў калгаснікам, дык кожнае слова сваіх ці прыезджых начальнікаў браў на веру і добрасумленна перадаваў іх маме, хоць тая да яго агітацыі як да бабчыных казак ставілася.

Якую б работу бацьку ні давалі, ён рабіў яе сумленна, выкладваўся да апошняга. І не здолелі астудзіць гэтую добрасумленнасць ні бясконцыя перакуры ўчарашніх сялян, якія хутка зразумелі, што ў калгасе можна працаваць не надта завіхаючыся, ні адкрытае махлярства. Заўсёды спакойны, памяркоўны, бацька выходзіў з сябе, калі бачыў, як нешта кідалася, ламалася, калечылася, знішчалася. Яго заўсёды мучыла пытанне, чаму гэта добры гаспадар на сваім уласным дварышчы ў калгасе — нікуды не варты. Што адбываецца з людзьмі? І як можна цягнуць у свой хлеў, крадучы ў калгасе? Гэта ж красці ў самога сябе...

Колькі разоў, бывала, мама просіць: «Сямён, схадзі да скірды, прынясі бярэмак саломы. У хлеў не зайсці». У адказ — маўчанне. Ці: «Няможна».

Бацькоўскае «няможна» змяшчала ў сабе не менш, чым біблейскія запаветы. Не ведаю, ці дапамагала гэта яму ў жыцці, але, акрэсліўшы аднойчы свой маральны круг, ён так і не выходзіў з яго. Вось за гэтыя «дзівацтвы» лічылі бацьку ў вёсцы чалавекам бесхарактарным і бяскрыўдным. І карысталіся гэтым: абдзялялі, абыходзілі, забывалі. Мама разумела, што бацьку не перайначыць ні слязьмі, ні крыкам. І, каб неяк звесці канцы з канцамі, іншы раз упрагалася за дваіх.

Мне ніколі ўжо не даведацца, што адбывалася ў душы ў бацькі ў той восеньскі змрочны вечар, чаго толькі не перадумаў ён за пакутлівую і бяссонную ноч... Нешта замінала спытаць у яго пра гэта. Нешта стрымлівала. Можа, прадчуванне пытання ў адказ на маё пытанне: «Няўжо, сынок, столькі гадоў пражыўшы са мною, ты гэтага так і не зразумеў?..»

Я быў упэўнены, што ўсё ведаю пра бацьку. Што цудоўна яго разумею. Але вось не стала яго — і ўсё няспытанае, нявыказанае нашу ў сабе, як боль. І марна спрабую знайсці адказы на пытанні, якія ў свой час не задаў бацьку...

Маму адпусцілі назаўтра. Як толькі пераступіла яна парог, кінулася да калыскі, выхапіла браціка, прыціснула да сябе, плакала і ўсё паўтарала: «Збавіцель ты мой! Збавіцель...»

Я часта ўспамінаю гэты прыкры эпізод далёкага дзяцінства і з жахам думаю: а што сталася б з усімі намі, калі б маму аддалі пад суд? Як жылі б мы на вольнай калгаснай зямлі, з якой адправілі б у няволю самага роднага чалавека? Дзіўна, але гэты выпадак не прымусіў бацьку змяніць свае адносіны ні да калгаснай уласнасці, ні да калектыўнай працы. Цярпліва пераносіў ён адно выпрабаванне за другім, падман і здзекі і да апошняй сваёй хвіліны застаўся селянінам. Дык ці не на цярплівасці такіх сялян, ці не на іх веры ў заможнае заўтра трымалася і трымаецца наша шматпакутная сельская гаспадарка? Але ж усяму ёсць свая мяжа: і цярпенню, і веры, і самому жыццю...

І ўсё ж такі ў бацькі, я думаю, на самым дне душы жыла туга па сваёй зямлі. Гэтая вялікая туга, відаць, і да мяне дакранулася сваім крылом. Ці не яна клікала мяне на даўні наш хутар, дзе я падоўгу глядзеў на раўнюткае поле?.. То свежаўзаранае, то ў руні, то ў спелай збажыне. А бачыў: хату пад саламянай страхою, хлеў і гумно. Вішні і яблыні. Лясочак — утульны, наскрозь пранізаны сонцам...

Аднойчы бацька падвёў мяне да невялікага поля і сказаў раптам дрыготкім голасам: «Глядзі, сынок, гэта была наша зямля»... Я бачыў, як завіхаўся ён вакол канякі, які памятаў і гаспадара, і свой хлеў. Як моўчкі пакутаваў, калі ўшчэнт замардаванага каня закапалі на Лысай гары. Я памятаю, як разгублена хадзіў бацька вакол гумна, пад самую страху забітага калгаснымі снапамі і як амаль што плакаў, калі неяк вясною разламалі яго, пераўтварылі ў гару смецця і бруду. Моцныя яшчэ бярвенні так і не знайшлі прымянення. Пад дажджом і снегам доўга ляжалі яны на калгасным двары, пакуль не спарахнелі. Вось так і не знайшлі свайго прымянення ў калгасным жыцці сялянская мудрасць, гаспадарчая беражлівасць, чалавечая сумленнасць. Не спатрэбіліся. Усіх і ўсё падмяніў апарат. Як малатарня, ён ламаў, мяў і спустошваў сялянскія душы. І цяжка, не па-чалавечы цяжка было не зламацца пад зубамі гэтай тупой і абыякавай машыны.

НЕ ПАЛІЦЕ АПОШНІЯ МАСТЫ

Бедны наш калгас, які не ведаў ні ўзлётаў, ні спадаў, а моцна ляжаў на абедзвюх лапатках, даўно ўжо стаў саўгасам. Але ўсё тут засталося па-ранейшаму. Жыццё маіх землякоў ніяк не рабілася лепшае і плялося абы-як, быццам бязубая бабуля. Пастарэлі мы, пастарэлі нашы хаты...

У маім родным Заполлі, вялізнай, на некалькі кіламетраў вёсцы, працаздольных сялян можна пералічыць на пальцах. Што гэта — апошні віток сялянскага жыцця? А што ж далей? Дзе выратаванне і ці ёсць яно наогул? Так ці інакш, але ніхто з маіх землякоў браць зямлю не хоча. І размову пра волю лічыць пустой: зямля была і ёсць, толькі ніколі не было на ёй волі...

Відаць, прыйшоў час разлічыцца за шматгадовыя здзекі з сялянства і зямлі. І ўсё ж такі не трэба спяшацца паліць апошнія масты. Бо, нягледзячы ні на што, былі і ёсць калгасы, якія кармілі і кормяць краіну...

Заканчэнне на стар. 46.

Фота Генадзя КАРЧЭЎСКАГА

ЗАБОЙСТВА НА КАЛЯДЫ

АПОВЕСЦЬ

Фрыдэрык Стральчэня, высокі, з атлетычным торсам і хваравітым нервовым тварам, у рагавых акулярах, прапанаваў Бруна Чыку прысесці на драўлянае крэсла, а сам ўладкаваўся на скураной канапе.

— Пана Фрыдэрыка чакае на партыю ў більярд пан Дамінік, і я пастараюся не затрымліваць пана. Таму пачну з канкрэтнага пытання. Учора загінуў ваш сябар, і я спрабую аднавіць на свежы розум падзеі мінулага вечара.

— Мы ўсе гэтым займаемся,— Фрыдэрык паправіў акуляры,— і следчы, пан Сокал, атрымаў ад мяне вычарпальную інфармацыю. Пану Чыку лепш звярнуцца да яго. Пан не прадстаўляе афіцыйную ўладу, і я маю права не адказваць на вашы пытанні,— расцягваючы словы, вымавіў Фрыдэрык.

— Так, я прыватны эксперт, і калі пана Фрыдэрыка задавальняе афіцыйнае следства, то не настойваю.

— Следчы мяне не задавальняе. Выбачайце маю рэзкасць. Пана Сокала не цікавіць наша спрэчка, бо Вінцэнт у ёй не ўдзельнічаў. Але я прыйшоў да высновы, што пачынаць трэба з ідэй, а не з паводзін. Следчы пераканаць, што людзі падзяляюцца на злодзеяў, якія лічаць сябе сумленнымі, і на сумленных, якія лічаць сябе злодзеямі. Вінцэнт належаў да апошніх. Я яго слаба ведаў, нас пазнаёміў Дамінік тыдні тры таму, і Вінцэнт не паспеў увайсці ў нашую справу. Можа, пан Чык ведае, што я з Дамінікам вучыўся ў адным класе гімназіі. Яшчэ там, у гімназіі, мы вырашылі даказаць усім, што беларусы ва ўсякім разе не горшыя за палякаў і астатніх. Мы далі слова, што абставім усіх па ўзроўні ведаў і па фізічнай падрыхтоўцы. Улетку ездзілі ў вандроўку на роварах па Еўропе — Рым, Парыж, Берлін. Сталі лепшымі вучнямі. У гімназіі нам не было роўных. Разам паступілі на медыцынскі факультэт. На першым курсе да нас далучыўся Казімір. Нас аб'ядноўвае ідэя адраджэння міфалогіі як спрадвечнай рэлігіі, але мы разыходзімся ў сродках дасягнення нашае мэты. Мяне і Дамініка цікавіць непасрэдна культавы падмурак, без усялякіх бутафорска-мастацкіх аксесуараў. Мы згуртуем вакол нашай ідэі аднадумцаў, створым палітычных рух, пабудуем Сабор. Славяне апошнімі ў Еўропе прымалі хрысціянства, а на Палессі яшчэ дагэтуль захаваліся мясціны з моцным культам славянскіх Багоў. Пярун і Вялес яшчэ жывуць на Беларусі. Ідэя адраджэння Перуна як спрадвечнага Беларускага Бога блізкая нашаму народу і пойдзе ў народ. Мы прачнемся і скінем хрысціянскія путы, і тады сытая Еўропа і нямытая Расія яшчэ ўзгадаюць Вялікае Княства ад мора да мора. Нас будуць паважаць і трапятаць. Вітаўт і Гедымін ставілі Еўропу на калені. Голас крыві нашых продкаў прывядзе Беларусь да перамогі. Але напачатку нам неабходна перамагчы саміх сябе. Гэта самая цяжкая бітва — сам з сабою. І нам нельга яе прайграць, бо Беларусь даведзена да апошняй ступені, і мы стаім перад будучыняй, дзе ёсць толькі смерць на крыжы або смерць на кані з мячом у руцэ. Мы абралі апошні шлях, лепш загінуць з мячом у руцэ, чым жыць на каленях перад крыжам. А крыжакоў у свой час мы секлі.

— Пан Фрыдэрык мае на ўвазе Грунвальд,— падтрымаў размову Бруна Чык.

— Так, і не толькі Грунвальд,— усхвалявана кіўнуў Фрыдэрык і паправіў акуляры.

— Дык з-за чаго вы пасварыліся?

— Казімір Кушаль учора паведаміў, што збіраецца напісаць нашую міфалогію. Яго мэта — стварэнне нацыянальнай святой кнігі. Свайго роду — Бібліі беларуса, якую ёю сам збіраецца напісаць. Гэта было ганебна слухаць. Я і Дамінік спачатку палічылі, што Казімір сказіўся. Ён на поўным сур'ёзе заявіў, што напіша ў форме навэлак кнігу міфаў і паданняў. Сама ідэя такой кнігі можа быць толькі ўхвальнай. Але Казімір сцвярджае, што надасць свайму твору святарскую афарбоўку. Ён лічыць, што ягоны зборнік пойдзе ў народ як Святое Пісанне. Мы запярэчылі яму. Нельга замахвацца на аўтарства святыні, яна — ад Бога. Ён смяяўся нам у твар і абяцаў, што не будзе яе падпісваць, а выдасць ананімна, як апокрыф. Мы казалі, што наяўнасць святасці, як і таленту, можна ўспрымаць толькі як звышдадзенае, і такая кніга з'явіцца толькі ад Бога, а не ў выніку разумовых, рацыянальных разлікаў. Казіміра апанавала бязмежная пыха, калі ён нават не збіраецца падпісваць свой твор. Ды гэта абсурд, спадзявацца на зборнік навэлак з рэлігійным зместам і святымі ідэямі, калі наш народ не падрыхтаваны ўспрымаць наогул ніякіх ідэй. І мастацкі твор тут можа толькі моцна напсаваць. Нельга змагацца з хрысціянствам па сутнасці тымі ж езуіцкімі сродкамі. Наша зямля нараджае нашых Багоў, а не розум, і не ідэі, нават калі яны па-мастацку выкананы. Мы пераконвалі Казіміра, што пачынаць трэба з адраджэння рэальных святынь, са стварэння рэальнага пантэона сапраўдных Багоў, а не займацца літаратурнымі намаганнямі і пошукамі абстрактнай эстэтыкі. Вонкава прыгожыя хрысціянскія ідэі разбурылі свядомасць нашага народа, ён заняты пошукамі райскага жыцця, яго перастала цікавіць рэальнасць, і тут неабходна не ўцякаць у свет ілюзій, а, наадварот, адмаўляючы мастацкія формы, несці меч і паходню, і змагацца з жыццём, каб перамагчы смерць.

Што тычыцца Вінцэнта, то ён не падтрымліваў Казіміра, але і нас таксама. Ён лічыў, што любы культ трымаецца на тэатральна-мастацкім дзеянні. Мастацтва нараджае рэлігію, рэлігія — культ, а культ пачынае адмаўляць мастацкія пачаткі. Вось гэты ланцуг і павінен быў, паводле Вінцэнтавых разваг, з'яднаць наш народ. Ён лічыў, што нам цяпер нельга сварыцца, а кожны няхай робіць сваю справу. Як пан бачыць, сварыліся мы з-за сродкаў, а мэта ў нас агульная.

Бруна Чык падняўся і, падзякаваўшы за размову, сабраўся быў пайсці, але быццам нешта ўспомніў і спытаў:

— Калі пан Фрыдэрык не стаміўся ад бясконцых допытаў, то я дазволю сабе пацікавіцца, што адбылося пасля вячэры? Як усе разыходзіліся?

— Калі ласка, але мяне даўно чакае Дамінік, таму я паўтару гэта як мага карацей,— Фрыдэрык таксама падняўся з канапы і прайшоўся па пакоі.

— Свята ў нас не ладзілася. Мы спрабавалі спяваць, але атрымоўвалася неяк па-штукарску, выпакутавана. Гаспадыня, пані Ганна, пайшла да сябе. Мажардом недзе знік. У зале засталіся: пан Адам Кастравіцкі, я, Дамінік, Вінцэнт і Казімір. Вінцэнт пайшоў ледзь не адразу за гаспадыняй. Пан Кастравіцкі прапанаваў більярд. Я пагадзіўся і пайшоў у більярдную за гаспадаром. Праз пару хвілін зайшоў Дамінік і зняў са сцяны алебарду, сказаўшы, што яны вырашылі яшчэ раз паспрабаваць наладзіць фэст, і праз дваццаць хвілін чакаюць усіх у зале. Дамінік пайшоў, і не паспелі мы скончыць першую партыю, як пачулі крык пані Ганны. Прыбеглі на другі паверх. Там ужо быў Казімір. Астатняе пан ведае.

— Ці ведае пан Фрыдэрык, што следчы падазрае Казіміра?

— Так, але гэта неверагодна. Казімір не мог некага забіць. Па-першае, Казімір не здатны на гэта, а па-другое — нашто Казіміру забіваць Вінцэнта? Яны пазнаёміліся тыдні тры таму, амаль не ведалі адзін аднаго, і ніколі не былі ворагамі.

— Ці не варта ў гэтай справе пашукаць жанчыну? Магчыма, які-небудзь віленскі раман? — быццам між іншым пацікавіўся Бруна.

— Не, пан Чык памыляецца. Пан не ведаў Вінцэнта. Вінцэнт быў тэолагам. Захапляўся Кантам і, у адрозненне ад Казіміра і Дамініка, быў рафінаваным аскетам, меў пурытанскія схільнасці. Пан Сокал закранаў гэтую тэму, але беспаспяхова. І я параю пану Чыку не паўтараць гэтую памылку.

Заканчэнне. Пачатак у № 10.

Палац Кастравіцкіх колькі разоў перабудоўваўся, але гаспадары захоўвалі знешнія аксесуары XVIII стагоддзя. Калі меркаваць па бакавых алькежах з вузкімі байніцамі і шатровымі ў раманскім стылі дахамі, то будынак, магчыма, яшчэ ў часы Вітаўта бараніў гэтую зямлю ад нашэсцяў паўдзікай жмудзі. Але дойлідства губляла абарончы сэнс, да палаца прыляпілі вытанчаны баракальны фасад з мяккімі паўкруглымі абрысамі і паўпразрыстымі валютамі па карнізах.

За вузкаватай вітальняю і люстраным перадпакоем ішоў змрочны задпрапіраваны цьмянымі габеленамі партэр, які адначасова выконваў функцыю гасцёўні, вялікай залы і — на святы — сталовай. З высачэзнай, на два паверхі, столі звешвалася каваная жырандоля, абсыпаная буйнымі крышталямі. Сіметрычна закладзеныя каміны кідалі прымружанае масянжовымі экранамі святло на ўсходні дыван. Прамакутны стол за чарадою крэслаў, пара ўтульных фатэляў, фісгармонія і цвёрдыя канапы па перыметры пакоя былі вытрыманы ў традыцыйным стылі Жыгімонта Вазы.

На ўзроўні другога паверха праз партэр цягнуліся падобныя да хораў антрэсолі з драўлянай балюстрадай. На першым паверсе зала рызыходзілася кароткімі калідорчыкамі. Налева ішлі — більярдная, кухня і пакойчык кухаркі, направа — бібліятэка, пакой Дашкевічаў, лёкая і дробныя гаспадарчыя памяшканні. З більярднай і з бібліятэкі дзверы выходзілі на вінтавыя лесвіцы, што віліся па алькежах з абодвух бакоў будынка. Такім чынам, трапіць на другі паверх магчыма было або праз більярдную і далей праз левую алькежу, або праз бібліятэку і правую алькежу. Другі паверх займалі: у левым крыле — спачывальня, кабінет і імправізаваны будуар Кастравіцкіх; правае крыло прызначалася для гасцей. Адзіны доўгі калідор на другім паверсе перарываўся антрэсолямі з балюстрадаю, што выходзілі на вялікую залу.

Бруна Чыку быў прыгатаваны пакой насупраць кабінета Адама Кастравіцкага. Учарнелыя, крыху абвугленыя дзверы Вінцэнтавага пакоя знаходзіліся побач з кабінетам. З-за кароткіх ценяў ад балясін сцяна паміж Вінцэнтавым пакоем і кабінетам нагадвала сходы.

Бруна Чык выйшаў на антрэсолі і зірнуў уніз. На непрыбраным стале яшчэ дагэтуль заставаўся посуд. Бруна глянуў на гадзіннік і вырашыў, што пакаёўка пані Дашкевіч не вельмі руплівая гаспадыня. З більярднай даляцела бомканне касцяных шароў, але галасоў не было чуваць. Нарэшце Бруна Чык пачуў пругкія крокі і азірнуўся. Па калідоры спяшаўся да правай алькежы Казімір Кушаль.

— Я хацеў бы задаць пану Казіміру колькі пытанняў,— Бруна заступіў яму дарогу.

— На калідоры? — пацікавіўся Казімір і паказаў рукою на свой пакой.— Можа, пан эксперт зойдзе да мяне?

— Так будзе лепш,— пагадзіўся Бруна.

У пакоі было накурана, і малады чалавек адчыніў фортку. Па ўстойлівым араматызаваным водары Бруна адразу адзначыў, што Казімір паліць дарагі галандскі тытунь. Казімір сеў за стол і дастаў з кішэні люльку. Сярод папер і часопісаў на стале Бруна заўважыў сваю манаграфію «Уводзіны ў крышталаграфію».

— Цікавіцеся даследаваннем крышталёў? — спытаў Бруна і апусціўся ў фатэль, што зарыпеў перасохлаю скураю.

— На папулярным узроўні займаюся гісторыяй камянёў,— адказаў Казімір.

— У мяне ёсць раздзелы, прысвечаныя гісторыі буйных дыяментаў.

— Так, я паглядзеў, але, на жаль, вашая праца не ўяўляе для мяне цікавасці.

— Чаму? — сур'ёзна ссунуў бровы Бруна Чык.

— Таму што яна напісана па-нямецку.

— Хіба пан Казімір не валодае нямецкай мовай?

— Я чытаю па-нямецку, але не ў гэтым справа. Я меў на ўвазе агульны здабытак для культуры. Для нямецкай культуры вы, пане Чык, выбачайце,— нуль, як і для Радзімы. У тым ліку і для навукі нашай, іхняй, сусветнай, пан Чык — дробны даследчык. Навука хутка змяняецца, а творы навукоўцаў захоўваюцца з-за мовы, як помнікі гісторыі і культуры. А нямецкая культура не прымае іншародцаў.

— Дзякуй за шчырае слова. Але павінен заўважыць, што немцы нават сваіх славутых суайчыннікаў не надта шануюць. Паўтара года, як з Германіі з'ехалі браты Маны, і мне здаецца, надоўга, калі не назаўсёды.— Бруна дастаў з тытунёвай скрынкі папяросу, нервова пастукаў папяровым мунштуком па гатычнай манаграме на накрыўцы і запаліў.

— Маны застануцца немцамі, дзе б яны ні жылі, пане Чык. І Германія яшчэ будзе стаяць на каленях і прасіць іх вярнуцца.

— Лёгка быць прарокам у дваццаць гадоў,— бяскрыўдна ўсміхнуўся Бруна.

— Пажывем — пабачым.

— Я займаюся забойствам і паспеў пагаварыць з Дамінікам і Фрыдэрыкам. Цяпер, калі пан нічога не мае, мне хацелася б пачуць меркаванні пана пра падзеі мінулага вечара,— Бруна ў спадзяванні пачуць чарговае апавяданне адкінуўся на мяккую спінку фатэля.

— Што пан мае на ўвазе?

— Вам пагражае арышт.

— Я гэта ведаю. Вы нешта хочаце мне параіць?

— Я хачу вас выслухаць і, наколькі гэта магчыма, знайсці выйсце са становішча, у якім усе апынуліся.

Казімір Кушаль выглядаў маладзейшым за Дамініка і Фрыдэрыка. Ускудлачаныя рудыя валасы густымі пасмамі закрывалі вушы і аксамітавы каўнер пінжака. Чыста паголены твар. Халодны, неміргаючы позірк зеленавата-блакітных, як кітайская біруза, вачэй. Нерухомыя бяскроўныя вусны і тонкі нос нератваралі ягоны твар у мармуровую маску. Бруна са здзіўленнем адзначыў, што ён пазбягае глядзець у Казіміравы вочы.

— Я ўяўляю, якіх баек вам давялося наслухацца ад маіх сяброў. Відаць, учора я так зачапіў іх за жывое, што яны дагэтуль не размаўляюць са мною.

— Яны занятыя більярдам.

— Спартсмены і будучыя хірургі са сталёвымі нервамі і здаровай псіхікай. Але не ў гэтым справа. Забойцу трэба шукаць за сценамі гэтага будынка.

— Пан Сокал сцвярджае адваротнае. Ён агледзеў парк...

Казімір не даў Бруна скончыць думку:

— Адзіны чалавек, каму ўчора пагражала смерць, гэта я. Ды і тое наўрад. Хіба што нейкае імгненне. А Вінцэнта ўсе любілі, у станоўчым сэнсе гэтага слова ён быў святы.

— Цяпер гэта гучыць парадаксальна,— заўважыў Бруна.— Давайце вернемся да вашай спрэчкі. Мяне цікавіць вашая канцэпцыя,— у пытанні прагучала іронія, але на твары Бруна захаваў зацікаўлены выгляд. Казімір адкінуў далонню валасы з ілба і схіліўся над сталом.

— Калі гэта на самай справе вас цікавіць, я апошнім часам займаюся міфалогіяй, у прыватнасці, нашым фальклорам. І ў мяне з'явілася ідэя зрабіць літаратурную апрацоўку народных паданняў пра Перуна, Вялеса, Ярылу. Стварыць літаратурны пантэон беларускіх паганскіх багоў. З дахрысціянскіх часоў да нас дайшло шмат цікавага. Ёсць над чым папрацаваць. Але паміж вусным і літаратурным словам розніца, як паміж скульптурай і жывапісам,— розныя мастацкія формы. Тое, што існавала тысячагоддзямі толькі ў вуснай форме, цяпер ператварыць у іншую мастацкую структуру, гэта значыць якасна змяніць. Такі твор будзе ў большай ступені належаць мне, а не народу. Аўтэнтычнага фальклору не існуе. З гэтым не хочуць пагадзіцца Дамінік і Фрыдэрык. Для іх міфалогія недатыкальная святыня, і я, у іхнім уяўленні, павінен рабіць нейкую абстрактную рэч.

Міфы — катэгорыя лагічная, гэтую выснову я зрабіў на пачатку сваіх даследаванняў. У народзе Космас з ягонымі Зямлёю і Небам, акіянамі і зоркамі, паветрам і падземным светам — успрымаюцца як разумовая цэласнасць. І чалавек атаясамлівае сябе з Космасам, Прыродаю і Зямлёю. Ён адчувае сябе часткаю адзінай цэльнай структуры, узаемазалежнай і ўзаемавыключнай. Чалавек — гэта Космас, і Космас — гэта чалавек. Хрысціянства давяло гэта да фетышызму, ператварыла Космас у Бога і супрацьпаставіла яго чалавеку. Раней беларусы нараджалі сваіх Багоў, а цяпер ператварыліся

ў рабоў. Ды і хрысціянства ўзнікла як рэлігія рабоў і застаецца культам рабства. Праўда, у магутных вялікіх народаў дзейнічаюць іншыя законы. Вось у нашых усходніх братоў. Вам вядомыя працы так званых хрысціянскіх славянафілаў? Яны ператварылі хрысціянства ў сродак і форму ажыццяўлення каланіяльнай палітыкі. Яны пішуць пра Бога як форму ўсеагульнай еднасці, безумоўна маючы на ўвазе, што іхні народ застанецца носьбітам базіснай мадэлі. Яны хаваюцца за трыяды Гегеля і Кузанскага і выводзяць прынцыпы еднасці, паводле якіх увесь свет павінен належаць адзінай імперыі з адзіным Богам, з адзінай мараллю і мовай. Або, як Дастаеўскі і Хамякоў, разважаюць на тэмы вялікай месіянскай ідэі, ізноў жа толькі сабе пакідаюць ролю носьбіта звышідэі, і толькі яны павінны выратаваць чалавецтва. Руская праваслаўная царква на ўвесь свет. Такія вонкава прыгожыя тэорыі, дзе лёсу свайго народа надаецца выключная роля ратавальніка чалавецтва, а астатнім народам — рабства, народжанае хрысціянствам, яго трыядай, паводле якой існуе тэзіс — антытэзіс — сінтэз, або раз'ядноўвае — з'ядноўвае — выключае, ці выключнае — звычайнае — незвычайнае, і гэтак далей. З такіх канструкцый лагічна вынікае, што мы — рабы, яны — носьбіты звышідэі, вялікай місіі, якая павінна давесці чалавецтва да ўсеагульнай еднасці і гармоніі.— Казімір Кушаль рэзка ўстаў з-за стала, дастаў з сакваяжа пляшку чырвонага віна і прапанаваў Бруна Чыку з прабачэннямі, што не мае магчымасці пачаставаць шаноўнага эксперта чым-небудзь больш далікатным.

— Міфалогія як светапогляд — сістэма сіметрычная,— працягваў размову Казімір.— Чалавечае цела і душа, паводле народных ідэй, знаходзяцца ва ўзаемазалежнай сувязі, а паводле хрысціянскай — адно з'яўляецца сродкам другога. Скажам, зямля — адзіны ўладар нараджэння і смерці, і гэтая зямля стварае нашых Багоў, а не Бог — Зямлю. У народнай міфалогіі існуе гармонія паміж чалавекам і Космасам, і няма лепшых і горшых, няма выключных і звычайных — усе роўныя перад Перуном, як перад Космасам. І не існуе Хрыста паміж Богам і чалавекам. У кожнага свой шлях да Бога і кожны можа стварыць свайго Бога, і толькі Зямля і Неба злучаюць усіх нас. Але пан Чык, відаць, стаміўся ад маіх разваг,— нарэшце вымавіў Казімір.

— Што асабліва закранула ўчора Фрыдэрыка і Дамініка? — спытаў Бруна і дакрануўся вуснамі да чаркі.

— Хутчэй за ўсё мая прэтэнцыёзнасць. Я замахваюся на святыя рэчы ў прамым сэнсе. Збіраюся напісаць стылізаваны пад фальклор міфалагічна-паганскі запавет, свайго роду тастамант беларускага паганства.

— Гэта зайздрасць? — пацікавіўся Бруна.

— Магчыма, але наўрад ці. Хутчэй пачуццё пыхі. Я прэтэндую на аўтарства Святога Пісання.

— Але ж твора яшчэ няма і няма пра што гаварыць? — здзівіўся Бруна Чык.

— Таму і ёсць аб чым спрачацца. Калі з'явіцца рукапіс, яны проста скажуць, што ў мяне нічога не атрымалася, ці што твор у мастацкім сэнсе слабы, што гэта стылізаваны плагіят, і яшчэ што-небудзь у гэтым сэнсе.

— Вінцэнт падтрымліваў вас ці Фрыдэрыка з Дамінікам?

— Вінцэнт наогул не ўмешваўся. Яго гэта не займала. Адно перажываў, што не атрымалася калядак.

— Вінцэнт першы пакінуў залу і падняўся наверх?

— Не, першая ўстала з-за стала пані Кастравіцкая, паскардзілася, што блага сябе адчувае, і паднялася наверх.

— Пан Казімір не заўважыў, яна заходзіла ў бібліятэку ці ў більярдную?

— Вядома, гаспадыня ходзіць праз бібліятэку, але я дакладна не памятаю.

— І следам за ёю наверх пайшоў Вінцэнт?

— Так.

— Праз бібліятэку?

— Так.

— У зале засталіся вы, Дамінік, Фрыдэрык і пан Адам Кастравіцкі. Што было далей?

— Гаспадар прапанаваў партыю, Фрыдэрык згадзіўся, і яны зайшлі ў більярдную. Я збіраўся быў пайсці да сябе. Ні ў кога не было настрою ладзіць свята, але Дамінік вырашыў выратаваць становішча і прапанаваў мне пераапрануцца медзвядзём, каб, нягледзячы ні на што, наладзіць свята. Мы прыхапілі з Вільні строі калядніка. Яшчэ перад вячэрай Вінцэнт зрабіў калядную зорку. Дамінік прынёс алебарду. Невядома, нашто, неяк аўтаматычна, я ўзяў алебарду з зоркай і пайшоў наверх. У бібліятэцы заўважыў мажардома Рафала і запрасіў яго на наш імправізаваны фэст. Наверсе мой пакой аказаўся замкнёным, я прытуліў зорку да сцяны, доўга па кішэнях шукаў ключ. Адамкнуўшы дзверы, я пакінуў алебарду на калідоры. А калі пераапрануўся і выйшаў са свайго пакоя, то пачуў, як цягнула смуродам — гарэў Вінцэнтаў пакой, а зорка з алебардаю зніклі. Вось і ўсё,— паціснуў плячыма Казімір.

— Вы як-небудзь можаце гэта вытлумачыць? — спытаў Бруна.

— Не.

— Вы каго-небудзь сустракалі на калідоры або на сходах, калі падымаліся да сябе?

— Не,— упэўнена адказаў Казімір.

Пасля размовы з Казімірам Кушалем эксперт вырашыў яшчэ раз пагаварыць з Адамам Кастравіцкім. У кабінеце ён знайшоў следчага, які за вялікім сталом схіліўся над пратаколамі. Зашклёныя стэлажы і ампірныя крэслы надавалі кабінету афіцыйны лад. Багдан Сокал адклаў папяровую папку і паказаў Бруна Чыку на крэсла перад сталом.

— Я шукаю пана Адама, каб яшчэ раз яго распытаць,— Бруна застаўся стаяць і засунуў рукі ў кішэні.

— Сядайце, калі ласка, пан Кастравіцкі выйшаў на хвілінку з мажардомам па гаспадарчай справе.

Бруна неахвотна апусціўся ў крэсла.

— Я раніцай даў некалькі тэлеграм у Вільню і Варшаву. Зараз мне патэлефанавалі з Друзгенікаў. Нічога вартага ўвагі. Яшчэ раз пераканаўся, што забойцу шукаць трэба тут.

— Пан следчы, відаць, спадзяваўся спіхнуць гэтую справу дэфензыве? — уголас паразважаў Бруна.

— Не, гэта занадта моцна, я не збіраўся нікому перадаваць гэтае забойства, але неабходна было высветліць палітычныя погляды студэнтаў. Ці не хаваліся за гэтым забойствам палітычныя матывы, але, як пан заўважыў, віленскую дэфензыву не цікавіць гэтая справа. Скажу шчыра, што ў мяне была надзея на палітычны паварот справы. Польскія ўлады з недаверам ставяцца да беларускіх арыстакратаў, таму мяне здзівіў нечаканы станоўчы водгук дэфензывы. Дый крымінальная паліцыя ў Вільні не знаходзіць нічога, за што можна было б зачапіцца. Быццам не людзі, а Божыя анёлы. І не хочацца зацягваць гэтую справу, усё на першы погляд проста раскладаецца,— следчы раскрыў папку і злосна стукнуў па стосе спісанай паперы.— Усе паказанні супадаюць, ніхто нікому не пярэчыць, ніхто звонку не мог трапіць у будынак. Я падумаў быў пра лёкая. Ён нядаўна звольніўся. Але выявілася, што ён у шпіталі з гарачкаю. Учора тут знаходзілася восем чалавек, з іх аднаго засеклі алебардаю, пяць — маюць алібі, двое пад падазрэннем, і цалкам,— следчы ізноў злосна ляпнуў далонню па стале,— цалкам ніякіх матываў, ніхто не меў аніякіх падстаў, каб забіць Кастравіцкага. Ды як непрыемна працаваць, калі табою пагарджаюць. Слова з іх не выцягнеш.

— Давайце сыходзіць з таго, што мы дакладна ведаем,— прапанаваў Бруна Чык.— Калі адсутнічаюць знешнія відавочныя матывы, то на хвіліну мы можам прыняць версію нематываванага забойства.

— Пан Чык схільны думаць, што тут дзейнічаў маньяк?— расчаравана спытаў следчы.— Усё можа быць, але гэта неяк занадта па-жаночы. Да таго ж маньякоў трэба лавіць тымі ж сродкамі, што і звычайных злачынцаў.

— Не, я не казаў, што мы маем справу з маньякам, я выказаў ідэю нематываванага забойства, калі першую ахвяру забіваюць дзеля таго, каб парушыць логіку следства і схаваць наступнае злачынства.

— Разумею,— пагадзіўся следчы,— але версія занадта прыгожая, каб мець права на існаванне. Пан эксперт — ідэаліст.

— Пана Сокала можа зацікавіць адзін факт, які я знайшоў у лістах Генрыка Кастравіцкага, бацькі Вінцэнта,— сум-

на вымавіў Бруна і перадаў следчаму скрынку з лістамі.

— Цікава, я не паспеў прагледзець архіў,— следчы рэзка выхапіў лісты і рассыпаў па стале.

— Вы знойдзеце ў іх, што ў Вінцэнтавага бацькі было пазашлюбнае дзіця, хлопчык, старэйшы за Вінцэнта.

— Значыць, у нябожчыка быў брат,— кіўнуў у адказ следчы, не адрываючы вачэй ад зжоўклых аркушаў.

— Так, і ён знаходзіцца ў маёнтку,— спакойным голасам вымавіў Бруна.

— Каго пан мае на ўвазе? — спытаў следчы.

— У лістах вы знойдзеце, што пазашлюбнае дзіця нарадзілася ад пакаёўкі-караімкі.

— Рафал Дашкевіч — пазашлюбны сын Генрыка Кастравіцкага? — ад нечаканасці следчы ледзь не падскочыў над сталом.— Так, гэта можа істотна паўплываць на справу, пане эксперт,— супакоена дадаў следчы.

На апошніх словах следчага ў пакой увайшоў Адам Кастравіцкі, і следчы адразу сустрэў яго пытаннем:

— Ці ведае пан Адам, што ягоны мажардом Рафал у нейкім сэнсе з'яўляецца сынам Генрыка Кастравіцкага?

— Так. Рафал мой пляменнік і гаспадараркай у маёнтку займаецца па сваім уласным жаданні,— неахвотна адказаў Кастравіцкі.

— Чаму мяне адразу не папярэдзілі, што мажардом — панскі сваяк? — зазлаваў следчы.

— Пан не пытаўся,— паціснуў плячыма гаспадар.

— Ён можа прэтэндаваць на частку спадчыны? — у лоб спытаў следчы.

— Генрык яго цалкам забяспечыў. Рафал нават за сваю службу ў маёнтку не бярэ грошай,— пачаў тлумачыць Кастравіцкі.

— Пан не адказаў на маё пытанне,— настойваў следчы.

— Я не юрыст, але вядома, што Рафалу належыць частка зямлі, і ён мае права на нейкую частку Генрыкавай спадчыны. Адно я ведаю дакладна, што пан следчы памыляецца і робіць захады не з таго боку. Рафал Любіў Вінцэнта, як малодшага брата.

— Прабачце, што ўмешваюся ў размову, але я маю адно пытанне да пана Адама,— Бруна ўстаў і абапёрся на высокую спінку крэсла.— Ты не заўважыў, з більярднай хлопцы ўзялі толькі алебарду, ці не знікла са зброі яшчэ што-небудзь?

Кастравіцкі на імгненне задумаўся і правёў далонню па стомленым твары:

— Магчыма. Мне здаецца, я не бачыў паляўнічага нажа. Дакладна не скажу, бо не звяртаў увагі. Ды гэта лёгка высветліць. Мы можам спусціцца наніз, і я пагляджу, што засталося на сцяне.

Следчага таксама зацікавіла пытанне эксперта, і яны ўтрох накіраваліся ў більярдную.

Фрыдэрык і Дамінік крыху збянтэжана перапынілі гульню.

— Зайздрошчу моладзі: у доме нябожчык, а яны забаўляюцца,— скептычна кінуў следчы.

Уважліва агледзеўшы калекцыю зброі, што аздабляла сцяну, Адам Кастравіцкі падышоў да Бруна Чыка і спалохана зашаптаў:

— Знік паляўнічы нож.

— Што? — умяшаўся следчы.

— Я не знаходжу паляўнічага нажа,— уголас вымавіў Кастравіцкі.

— Пан Чык лічыць, што гэта мае дачыненне да забойства? — спытаў следчы.

— Так, але вытлумачыць гэта я змагу пазней, мне неабходна ўдакладніць некаторыя дэталі,— адказаў Бруна і выйшаў з більярднай у залу. Ён спыніўся пасярод гасцёўні і нейкі час разглядаў антрэсолю, потым адышоў да фісгармоніі і адгарнуў рог цяжкога дывана. На бурштынавым паркеце бялела, быццам шнар, доўгая свежая драпіна. У більярднай стрэлілі кіем і глуха загрукаталі шары. Бруна Чык пасунуў на месца дыван і праз бібліятэку трапіў у квадратны перадпакойчык, які выходзіў у левую алькежу. Бруна пастукаў у вузкія філянговыя дзверы, што адразу за бібліятэкай, і апынуўся ў Дашкевічаў.

— Мне неабходна пагаварыць з панам Рафалам,— растлумачыў Бруна пакаёўцы Юзэфе.

— Рафал недзе наверсе, відаць, у кабінеце пана Адама размаўляе са следчым,— адказала Юзэфа і правяла далонню па буфетнай паліцы, быццам выціралa нябачны пыл.

Па-скандынаўску прыгожая, статная, блакітнавокая маладзіца цалкам не адпавядала невысокаму караіму.

— Пані Юзэфа каталічка? — спытаў Бруна, заўважыўшы на шыі пакаёўкі залаты ланцужок з тонкім крыжыкам.

— Так. Відаць, пан хоча даведацца, ці вянчаныя мы. Рафал, як усе караімы,— іудзей, і нас не павянчалі ў касцёле. Але хіба гэта істотна для пана эксперта?

— Прашу прабачэння ў пані Юзэфы. Я сам не ведаю, што істотнае, а што неістотнае ў гэтай справе,— адказаў Бруна і паглядзеў на гадзіннік.

— Пайду пашукаю Рафала наверсе,— у заключэнне вымавіў эксперт і, быццам нешта ўспомніўшы, спытаў: — Учора пасля вячэры пані Юзэфа была ў спачывальні гаспадыні. Ці не ўдакладніце, чым вы займаліся?

— Я сказала следчаму, што пані Кастравіцкая папрасіла ёй паваражыць. Я хутка прыбрала посуд і, прыхапіўшы карты, паднялася ў спачывальню. Усе жанчыны варожаць на Каляды. Мы не паспелі раскласці першы пасьянс, як пані Кастравіцкая адчула смурод:

— Пані сустракала каго-небудзь на калідорах?

— Не.

— Пані не заўважыла, калі знік паляўнічы нож са сцяны ў більярднай?

— Здаецца, учора ўвечары. Дакладна не скажу, але сёння раніцою я выпадкова заўважыла, што яго няма на месцы.— Юзэфа Дашкевіч змоўкла і глянула на дзверы. У пакой зайшоў мажардом і кінуў змрочны позірк на Бруна Чыка.

— Я чакаю пана Рафала,— не зважаючы на непрыхаваную агрэсіўнасць мажардома, вымавіў Бруна.

— Што пану трэба?

— Я хачу ведаць, чым вы займаліся ўчора пасля вячэры?

— Я пераказаў следчаму разы чатыры адно і тое ж, з мяне дастаткова,— злосна адказаў Рафал.

— Гэта непрыемна, але неабходна, ды я не следчы, а эксперт.

— Не бачу прынцыповай розніцы.

— Я займаюся гэтай справаю па асабістай просьбе пана Адама Кастравіцкага, які не надта давярае афіцыйным уладам.

— І добра робіць, што не давярае. Хіба гэтым ідыётам можна верыць? — Мажардом правёў далонню па чорных, што антрацыт, валасах.

— Учора я дапамог Юзэфе прыбраць посуд і пайшоў рыхтаваць пакоі для Вінцэнта і астатніх. Гэта заняло не шмат часу. Калі я скончыў і выйшаў на антрэсолі, то заўважыў, што Вінцэнта ў гасцёўні не было. Мне захацелася пагаварыць з ім, мы паўгода не бачыліся. Я вырашыў, што сустрэну яго ў алькежы і спусціўся наніз, не зазірнуўшы ў ягоны пакой.

У бібліятэцы я здагадаўся, што памыліўся, і Вінцук ужо наверсе, але пакуль я ў разгубленасці стаяў, у бібліятэку з алебардай у руцэ зайшоў Казімір. Ён запрасіў мяне пайсці разам з ім пакалядаваць. Я адмовіўся і вырашыў чакаць Вінцэнта ў бібліятэцы. Праз пяць хвілін наверсе закрычала гаспадыня і ў бібліятэку з гасцёўні прыбег Дамінік. Наверсе мы ўбачылі перапалоханага Казіміра.

— Пан Рафал каго-небудзь падазрае?

Мажардом не адказаў і зацята маўчаў. Бруна вырашыў працягнуць паўзу і ў чаканні адказу ўважліва разглядаў круглы твар мажардома. Юзэфа яшчэ раз разгублена правяла далонню па буфетнай паліцы. Бруна Чык вырашыў, нарэшце, развітацца з Дашкевічамі, як у пакой нахабна ўваліўся Багдан Сокал.

— Дзе Казімір Кушаль? — выбухнуў следчы.

— Што здарылася, пане Сокал? — спытаў Бруна.

— Не магу знайсці Казіміра, а з шафы ў кабінеце знікла алебарда, псякрэў! — вылаяўся следчы.— Хто і калі бачыў Казіміра апошні раз? — следчы ўчэпістым позіркам абвёў усіх прысутных.

— Я гаварыў з Казімірам гадзіны паўтары таму ў ягоным пакоі,— спакойна адказаў Бруна Чык.

Рафал не адказваў следчаму.

— Неабходна абысці ўвесь будынак, пачынаючы з гарышча і да скляпенняў,— загадаў Сокал і рашуча рушыў з пакоя.

У гасцёўні Бруна глянуў у акно. У цемры густа сыпаў снег.


Змiцер Макась 90.



Цяжкія сняжынкі таўкліся ў шыбу. Следчы зноў вылаяўся і, ні да кога не звяртаючыся, паразважаў уголас:

— Няўжо гэта Казімір? У такім разе ўсё робіцца зразумелым. Ён у прадчуванні арышту ўцёк і пацвердзіў усе нашыя падазрэнні. Калі на самай справе ён уцёк, то гэтага дастаткова, каб абвінаваціць яго ў забойстве.

У склепе пан Кастравіцкі пачаў частаваць чырвоным віном, і следчы памякчэў. Нават пачаў скардзіцца на благія прадчуванні. І што ад гэтай справы чакае ліхога. Ён расшпіліў чорны фрэнч і са збанком у руцэ прысеў на шырокую лаву.

— Я ніколі не хацеў займацца палітыкай, таму вось ужо ў гадах, а застаўся звычайным следчым. Кар'еру цяпер усе робяць на палітыцы. Моладзь спрытная пайшла. Не паспеюць справу пачаць, як ужо вышукваюць, хто ў якой партыі, якія кнігі чытае, якіх поглядаў прытрымліваецца. А я дык ведаю дакладна, што чалавек ідзе на злачынства або з-за грошай ці іншага матэрыяльнага інтарэсу,— следчы пачаў загінаць пальцы: — альбо з-за жанчыны — рэўнасць і гэтак далей; альбо з-за помсты — тут шмат варыянтаў.

— Пан Сокал не ўлічвае злачынства з-за ідэі,— Бруна Чык дапіў віно і паставіў збанок на паліцу.

— Можа, яшчэ пакаштуеш выдатны пяцігадовы портэр? — прапанаваў гаспадар, але Бруна адмовіўся і пакруціў галавою.

— А вось тут я не згодны. Забойства з-за ідэй ці палітычных матываў у сваёй аснове ўсё роўна абапіраецца на матэрыяльныя інтарэсы. Гэта можа тычыцца не асабіста забойцы, але ягоная ідэя ўскосным чынам абавязкова прывязана да матэрыяльнага свету,— следчы ўстаў і зашпіліўся.

— Пан Сокал лічыць, што любую ідэю можна вытлумачыць матэрыяльным інтарэсам?

— Так, безумоўна. І калі б я не быў у гэтым перакананы, то кінуў бы службу і падаўся ў святары.

— Цікава, як пан вытлумачыць ідэю адраджэння нацыянальнай рэлігіі з меркантыльнага боку?

— Дарма пан Чык наслухаўся гэтай лухты ад студэнтаў. Гэта не тычыцца справы.

Студэнты не бралі ўдзел у пошуках. Фрыдэрык і Дамінік засталіся чакаць у гасцёўні. Следчы Багдан Сокал, а за ім пан Чык і гаспадар з мажардомам педантычна агледзелі ўвесь будынак, нават спачывальню пані Кастравіцкай і скончылі Казіміравым пакоем. Следчы неахвотна сагнуўся і зазірнуў пад ложак.

— Псякрэў! — ён памацаў пад ложкам рукою і выцягнуў крыху ўчарнелую алебарду.— Гэтай алебардаю быў забіты Вінцэнт, але як яна трапіла ў Казіміраў пакой?

Пан Кастравіцкі разгублена паціснуў плячыма. Мажардом, унурыўшы голаў, узяў кароценькую качаргу і паварушыў жар у грубцы. Бруна Чык падышоў да вакна і падняў шыбу. Буйныя сняжынкі пакаціліся па шырокім падваконніку і пасыпаліся на дыван.

— Ці не Казімір там? — не паспеў вымавіць Бруна, як следчы ірвануўся да вакна. Каля падмурка на белай паверхні выгінаўся ледзь заўважны сумёт.

— Ты выпускаў сабак? — спытаў пан Кастравіцкі ў Рафала.

— Не, сёння пашкадаваў.

З вокнаў бібліятэкі на снег падала электрычнае святло. Ад падмурка ў бок парка цягнуўся пляскаты сумёт. Следчы з ліхтаром у руцэ адвярнуў мыском чаравіка стужку снегу пасярэдзіне выцягнутага грудка і папрасіў пана Чыка патрымаць ліхтар. Казіміраў труп быў прысыпаны снегам. Следчы перавярнуў Казіміра тварам дагары і выцягнуў з грудзей шырокае лязо паляўнічага нажа.

— Гэты нож знік з більярднай? — ён павярнуўся да Адама Кастравіцкага.

— Так.

Нябожчыка перанеслі ў зашклёную аранжэрэю, дзе ўжо ў глыбокай прамакутнай труне ляжаў Вінцэнт Кастравіцкі. У Друзгеніцкім касцёле была замоўлена імша. Пахаванне прызначана на панядзелак. Казіміра Кушаля паклалі на шырокую лаву.

Усе сабраліся ў вялікай зале. Покуль Багдан Сокал тэлефанаваў у Друзгенікі і Вільню, Юзэфа заслала стол абрусам і паставіла чаркі. Адам Кастравіцкі папрасіў Дашкевіча прынесці каньяк і чырвонае віно. Гаспадыня хуталася ў турэцкі цёплы шаль, седзячы ў скураным фатэлі, каля яе ног леглі два флег-

матычныя даберманы. Фрыдэрык і Дамінік селі за стол насупраць Кастравіцкага. Рафал Дашкевіч займаўся камінамі, то варушыў жар, то падкідаў сухія бярозавыя паленцы. Бруна Чык узяў са стала чарку і ўладкаваўся ў крэсла каля каміна. Следчы паклікаў з кухні Юзэфу і сеў паміж Кастравіцкім і Дамінікам.

— Казіміра Кушаля забілі паляўнічым нажом прыблізна ў адзінаццаць гадзін, магчыма, крыху раней. Казіміра ўдарылі ў грудзі нажом у ягоным пакоі і, відавочна, выкінулі праз вакно на двор.

— Я папрашу пана Сокала пакінуць усе анатамічныя развагі,— перапыніла следчага Ганна Кастравіцкая.

— Калі ласка, перайду адразу да сутнасці справы. Мяне цікавіць, хто чым займаўся ў адзінаццаць гадзін і дзе знаходзіўся ў гэты час. Пачну з сябе. Пасля вячэры я займаўся афармленнем афіцыйных папер па выніках папярэдняга расследавання. Прызнаюся, што сур'ёзныя падазрэнні выклікалі ўчарашнія паводзіны Казіміра, і ў мяне былі ўсе падставы для арышту, але, на жаль, я спазніўся. Горка пра гэта думаць. На мне ў нейкай ступені ляжыць віна перад нябожчыкам. Арышт выратаваў бы яго ад рукі забойцы. Парадокс: я не паспеў запоўніць пратаколы,— следчы вытрымаў паўзу і выпіў каньяк. Адам Кастравіцкі напоўніў чаркі.

— З ласкі пана Кастравіцкага я працаваў у ягоным кабінеце на другім паверсе. З дзевяці гадзін мне ўдалося пагаварыць спачатку з Рафалам Дашкевічам, затым па чарзе я выклікаў да размовы Дамініка Плятара, Фрыдэрыка Стральчэню. За імі ў кабінеце былі пан Кастравіцкі і пан Чык.

Прыблізна аб адзінаццатай мы ўтрох спусціліся ў більярдную і заўважылі знікненне паляўнічага нажа. Узнікла неабходнасць у яшчэ адным допыце Казіміра Кушаля. Яго не было ў сваім пакоі. Покуль мы былі ў більярднай, з шафы ў кабінеце знікла алебарда. Я абышоў усе пакоі другога паверху — Казіміра нідзе не было. А палове дванаццатай мы пачалі пошукі, вынікі якіх усе ведаюць. Цяпер, я лічу, неабходна па чарзе кожнаму выказаць свае меркаванні і ўдакладніць, дзе ён знаходзіўся з паловы адзінаццатай да адзінаццаці і чым займаўся на працягу гэтага часу. Магчыма, у некага ўзнікнуць пярэчанні, і таму прашу ўважліва паслухаць адзін аднаго,— следчы пакруціў галавою і абвёў доўгім поглядам усіх прысутных. Нікому не хацелася гаварыць, і следчы сам пачаў допыт.

— Казімір застаўся ў сваім пакоі, калі пан Чык выйшаў ад яго на калідор?

— Так.

— Пан каго-небудзь заўважыў на калідоры?

— Так, Рафала Дашкевіча.

— Пан Чык адразу зайшоў да мяне ў кабінет?

— Не, я ўзяў лісты Генрыка Кастравіцкага ў сваім пакоі і праз хвіліну быў у кабінеце.— Бруна Чык выцягнуў ногі і ўпёрся абцасамі лакіраваных чаравікаў у экран каміна. Следчы занатоўваў адказы.

— Калі другі раз вы апынуліся на калідоры, вы ўбачылі каго-небудзь?

— Не, на калідоры нікога не было.

— Значыць, Казімір заставаўся ў сваім пакоі?

— Магчыма.

— Гэта было, прыблізна, у дзесяць трыццаць.

— Так.

— Хто-небудзь з прысутных бачыў Казіміра Кушаля пасля дзесяці трыццаці?— следчы па чарзе абвёў усіх пільным позіркам.

Ніхто не адказваў, і следчы зноў звярнуўся да Бруна Чыка:

— Колькі часу забрала ў пана размова з Казімірам?

— Хвілін сорак.

— Аб чым ішла гаворка?

— Казімір падзяліўся са мною сваімі творчымі планамі і ў некалькіх словах апісаў учарашнія падзеі.

— Ён каго-небудзь падазраваў, што-небудзь выклікала ў яго падазрэнні?

— Я ўстрымаюся ад адказу на гэтае пытанне,— неахвотна вымавіў Бруна, і следчы выпаліў наступнае пытанне:

— Казімір некага баяўся? Ён адчуваў пагрозу ці ведаў, што нехта яму пагражае?

— Калі ўсур'ёз, не.

— Удакладніце, калі ласка, вашую думку.

— Пазней, калі пан следчы дазволіць, я выкажу свае развагі крыху пазней.— Бруна Чык зняў ногі з масянжовага экрана і паставіў крэсла бліжэй да каміна.

— Пан Чык ведае імя забойцы?— спытала пані Кастравіцкая, пераводзячы позірк то на Бруна Чыка, то на следчага.

— Пэўна, не,— кіўнуў Бруна.

Следчы здагадаўся, што не варта спяшацца і прымушаць Бруна Чыка выказвацца.

— Дазвольце мне весці допыт,— Багдан Сокал крыху павысіў голас і перапыніў наступныя пытанні Ганны Кастравіцкай.

— Дарэчы, дзе аб адзінаццатай гадзіне знаходзілася пані Ганна?

Гаспадыня ўцягнула шыю ў пуховы шаль і з абурэннем паглядзела на мужа, які сядзеў, схіліўшы голаў, побач са следчым.

— У маёй спачывальні, вядома. Пасля вячэры я не выходзіла на калідор і нават не глядзела на гадзіннік.

— Папрашу пана Кастравіцкага адказаць на гэтае пытанне,— следчы застрачыў самапіскаю ў нататніку.

— Пан Сокал ведае, што з кабінета я выйшаў разам з мажардомам. Мы вырашалі невялікую справу па гаспадарцы, і я пайшоў да пані Ганны, якая прасіла, каб я ўголас пачытаў ёй. Пані Ганна цяжка перажывае Вінцэнтаву смерць. Да адзінаццаці мы гаварылі, і я вярнуўся ў кабінет па томік Міцкевіча. Потым з панам Сокалам заходзіў у більярдную і зноў падняўся да пані Ганны.

— Пан каго-небудзь сустракаў на калідоры па дарозе са спачывальні ў кабінет?

— Не, хіба што Рафала, ён параіўся са мною, ці пускаць сабак на двор.

— Калі пан Кастравіцкі апошні раз бачыў Казіміра?

— За вячэраю,— Кастравіцкі разгублена паціснуў плячыма. Следчы павярнуўся да Рафала Дашкевіча, што доўгімі абцугамі варушыў у каміне жар.

— Што пан Дашкевіч рабіў на другім паверсе ў дзесяць трыццаць?

— Хацеў пагаварыць з панам Адамам.

— Вы чакалі гаспадара на калідоры?

— Так.— Рафал павесіў абцугі.

— Чаму ж не зайшлі да яго?

— З-за драбязы не хацелася турбаваць.

— Пан Рафал бачыў, як пан Бруна Чык выходзіў з Казіміравага пакоя?

— Так.

— Што пан Рафал рабіў пасля гэтага?

— Пайшоў да сябе. Потым вырашыў паглядзець грубкі на другім паверсе. Вярнуўся і абышоў усе пакоі для гасцей.

— Вы заходзілі да Казіміра?

— Так, але ў пакоі нікога не было.

— Вы бачылі каго-небудзь у пакоях ці на калідоры ў гэты час?

— Не, наверсе нікога не было. Да гаспадароў я не заходзіў. Потым убачыў пана Адама і спытаў пра сабак.

— Калі пан Рафал вырашыў вярнуцца наверх?— Следчы адарваўся ад нататніка і паглядзеў на Дашкевіча, які ўсё стаяў побач з камінам.

— У алькежы.

— Якой алькежы — правай ці левай?— спытаў мажардома Бруна Чык.

— У левай: я думаў ісці праз більярдную.

Бруна Чык папрасіў у следчага прабачэння, што ўмяшаўся ў размову, і Багдан Сокал прадоўжыў допыт Рафала Дашкевіча.

— Вы пачалі глядзець грубкі з Казіміравага пакоя?

— Не, з пакоя пана Чыка.

— Праз колькі хвілін вы зайшлі да Казіміра?

— Хвілін праз дзесяць.

— У пакоі нікога не было?

— Так.

Следчы павярнуўся да студэнтаў, што не вельмі ўважліва прыслухоўваліся да размовы. Дамінік гартаў на каленях часопіс «Калосьсе», які ледзь не на пачатку допыту выцягнуў з кішэні пінжака. Фрыдэрык пускаў у столь струмені тытунёвага дыму і час ад часу нахіляўся да Дамініка, каб зазірнуць у разгорнуты часопіс.

— Што скажуць панічы студэнты?

— Мы гулялі ў більярд, на другі паверх не падымаліся,— за абодвух адказаў Фрыдэрык.

— Да адзінаццатай гадзіны хто-небудзь з вас пакідаў більярдную?

— Так,— Дамінік адарваўся ад часопіса і паказаў у бок пакаёўкі Юзэфы, што сядзела на крэсле побач з Рафалам, склаўшы перад сабою рукі ў чаканні сваёй чаргі.— Пані Юзэфа можа пацвердзіць, што на хвіліну я заходзіў у бібліятэку. Пані Юзэфа ў гэты час прыбірала посуд у гасцёўні.

— Калі гэта было?— следчы павярнуўся да Дамініка.

— Прыблізна за дваццаць хвілін да таго, як вы разам з гаспадаром і панам Чыкам завіталі ў більярдную і разглядалі калекцыю зброі.

— Пан Фрыдэрык адзін заставаўся ў більярднай?

— Так, але не болей двух хвілін. Дамінік узяў з бібліятэкі нямецкую энцыклапедыю і вярнуўся ў більярдную.

Следчы запісаў адказы Фрыдэрыка і Дамініка і звярнуўся да пакаёўкі:

— Што рабіла пані Юзэфа з дзесяці трыццаці да адзінаццаці?

— Прыбірала са стала ў гасцёўні і мыла посуд,— пакаёўка паклала рукі на калені, але не паднялася і адказвала седзячы.

— Пані Юзэфа бачыла, як пан Дамінік Плятар з більярднай праз гасцёўню заходзіў у бібліятэку?

— Так, я складала абрус.

— Пані бачыла, як ён вяртаўся?

— Так, я склала абрус і сыходзіла на кухню. На калідоры азірнулася — пан Дамінік грукнуў дзвярыма ў бібліятэцы і праз залу скіраваўся да більярднай.

Следчы падняўся з-за стала і нетаропка, шырокімі крокамі пачаў праходжвацца па зале.

— На сёння дастаткова, з раніцы кожны падпіша свае паказанні на афіцыйным бланку, але цяпер я дазволю сабе яшчэ на колькі хвілін затрымаць усіх, каб зрабіць тое, што я, на жаль, не паспеў выканаць раней. Я збіраюся арыштаваць па падазрэнні ў забойстве Казіміра Кушаля аднаго з прысутных. Я не абмовіўся. Менавіта за аднаго Казіміра Кушаля, таму што Вінцэнта Кастравіцкага забіў іншы чалавек, і я таксама ведаю ягонае імя. На гэты раз я не збіраюся адкладваць арышт, бо ўсё адносна відавочна.— Следчы спыніўся каля дзвярэй, сашчапіў пальцы на жываце, узняў падбароддзе і выклаў сваю версію:

— Учора дзве асобы не мелі пэўнага алібі. У такіх выпадках амаль ніхто не мае пэўнага алібі, але два чалавекі — Кушаль і Рафал Дашкевіч — выклікалі падазрэнне. Гаспадыня, пані Кастравіцкая, у сваёй спачывальні варажыла з пакаёўкай, Фрыдэрык з гаспадаром гулялі ў більярд, Рафал знаходзіўся ў бібліятэцы, Дамінік быў у зале, але на другі паверх можна трапіць толькі праз адну з алькежаў, а для гэтага неабходна прайсці або праз більярдную, або праз бібліятэку. Такім чынам, і Дамінік Плятар быў выключаны з ліку тых, хто меў магчымасць здзейсніць забойства. Гэта значыць, што забіць Вінцэнта маглі або Рафал, або Казімір, які занёс алебарду на другі паверх. Відавочны факт. Зброя была ў Казіміра, і толькі ён меў магчымасць забіць Вінцэнта. Але я не знаходзіў матываў, нашто Казіміру ісці на гэтае злачынства. Вось гэтае пытанне не дазваляла мне канчаткова вырашыць гэтую задачу і зрабіць цалкам лагічную выснову, што менавіта Казімір Кушаль з'яўляецца злачынцам. Я зрабіў недаравальную памылку — адклаў на дзень арышт Казіміра — і спазніўся. Казімір ператварыўся ў ахвяру наступнага, не менш жудаснага злачынства.— Следчы дастаў з кішэні хустачку і выцер кропелькі вільгаці, што заблішчэлі на пачырванелым ад стомы твары.

— Цяпер вернемся да сённяшніх падзей. Амаль ніхто на момант злачынства не мае алібі, апроч хіба што Дамініка і Фрыдэрыка, ніхто. Узнікае шмат версій і падазрэнняў. Напрыклад, што Казімір бачыў забойцу, не прызнаўся і быў забіты як небяспечны сведка. Але што ў такім разе прымусіла Казіміра замоўчваць імя злачынцы? Калі гэта быў Рафал Дашкевіч, то наўрад Казімір меў падставы, каб не прызнавацца ў гэтым і прыкрываць Рафала. Казімір раней не быў знаёмы з Дашкевічам і ў змову з малавядомым яму чалавекам не ўступіў бы. Гэта нерэальна. Напрошваецца выснова, што менавіта Казімір Кушаль забіў Вінцэнта, і гэта мог выпадкова ўбачыць Рафал ці тым жа шляхам, што і я, прыйсці да гэтай думкі. Усе, апроч студэнтаў, ведаюць, што Вінцэнт даводзіўся зводным братам Рафалу Дашкевічу, і я схіляюся да пэўнай думкі: ці не з'яўляецца помста за брата падставаю для матываў злачынства?..— следчы падышоў да скамянелага Рафала і зашчоўкнуў тонкія сталёвыя бранзалеты кайданкоў на сціснутых у кулакі руках караіма, які не вымавіў ані гуку і ўтаропіў цяжкі позірк у падлогу. Следчы з інтанацыяй педагога звярнуўся да ўзбуджаных слухачоў:

— Рафал здагадаўся, што брата забіў Казімір Кушаль і, падпільнаваўшы момант, адпомсціў Казіміру, скарыстаўшы паляўнічы нож.

— Па-першае, нашто Казіміру было падпальваць Вінцэнтаў пакой? І, па-другое, хто ўзяў алебарду з шафы ў кабінеце і кінуў пад Казіміраў ложак?— Бруна Чык на адным дыханні выпаліў пытанні і адкінуў далонню з ілба пасму сівых валасоў.— Алебарду ўзяў мажардом,— сам адказаў Бруна і звярнуўся да акрыяўшага Рафала: — Гэта вы зрабілі?

— Я,— кіўнуў Рафал.

— Пан Сокал дакладна вытлумачыў паводзіны Рафала. На самай справе, мажардом вырашыў адпомсціць Казіміру за забойства Вінцэнта і ўзяў з шафы алебарду, каб ёю нанесці ўдар, але Казіміра ў ягоным пакоі не было. Рафал, не дачакаўшыся ахвяры, кінуў алебарду пад ложак і пайшоў да сябе. Ці, можа, я памыляюся, і пан Рафал, нарэшце, сам вытлумачыць свае паводзіны?

— Так, алебарду ўзяў я, але Казіміра ў пакоі не было,— Рафал Дашкевіч скарагаворкаю забубніў сабе пад нос,— я вырашыў, што заб'ю гада, бо гэта ён Вінака... Я здагадаўся і хацеў адпомсціць, ды не паспеў. Нехта апярэдзіў мяне.

Бруна Чык не даў выгаварыцца ўзведзенаму Рафалу:

— Ці на свае вочы бачыў пан Дашкевіч, як Казімір заходзіў у Вінцэнтаў пакой?

— Не. Але хто ж яшчэ, калі не ён? Наверсе адныя жанчыны былі, а ўнізе пан Адам з Фрыдэрыкам у більярднай, я ў бібліятэцы, з залы ніяк не трапіш наверх, апроч як праз більярдную ці бібліятэку. А болей ў доме нікога не было, хіба што прывід пана Генрыка.

Нечакана Бруна Чык спрытна падхапіўся з крэсла і выйшаў на сярэдзіну пакоя. Усе з цікавасцю назіралі за ягонымі рэзкімі рухамі. Каля стала ён спыніўся і ўзняў руку, паказваючы на балюстраду антрэсолі, што цягнулася праз залу і з'яўлялася часткаю калідора другога паверха. Да балясін было метры тры з паловай.

— На другі паверх можна трапіць праз антрэсолі!— задаволена вымавіў Бруна Чык і павярнуўся да збялелага Дамініка Плятара.

— Можа, пан эксперт прадэманструе, як гэта ў яго атрымаецца?— Плятар скрывіў вусны ў іранічнай усмешцы.

— Калі ласка, але спачатку спытаю гаспадароў, калі апошні раз у доме вашчылі паркет?

— Перад святам, дні тры таму,— адказала за разгубленую гаспадыню пакаёўка.

Бруна Чык папрасіў следчага саступіць на паркет і адвярнуў рог дывана, што ўпіраўся ў фісгармонію. Следчы з сур'ёзным выглядам памацаў шырокую драпіну на бліскучым навошчаным паркеце. Дамінік застаўся сядзець, а Фрыдэрык і Адам Кастравіцкі падышлі да Бруна Чыка, які ізноў паказаў на антрэсолі:

— Так да балясін немагчыма дацягнуцца, нават калі падскочыш ці станеш на крэсла, і то наўрад ці ўхопішся рукамі за карніз. Але дастаткова на метр пасунуць фісгармонію (гэта і было зроблена ўчора, бо засталася свежая драпіна

пад дыванам) і выкарыстаць інструмент у якасці прыступак, як адкрываецца яшчэ адзін шлях на калідор другога паверха. Маладому, спрытнаму чалавеку няцяжка падцягнуцца на балясінах і пераскочыць на той бок балюстрады. З гэтага вынікае, што ўчора на другі паверх такім чынам трапіў і затым спусціўся чалавек, які не хацеў карыстацца звычайнымі сходамі і спадзяваўся застацца незаўважаным. Паводзіны такога кшталту ўласцівыя злачынцу.

Дамінік Плятар, які быццам не слухаў Бруна Чыка, а разглядаў дробныя кветкі на вышываным абрусе, нарэшце адарваў позірк ад стала і з-пад ілба глянуў на следчага. Багдан Сокал з крыху скептычным выглядам сачыў за экспертам.

— Не варта цяпер соваць фісгармонію, гэта і так відавочна,— выкладаў свае развагі Бруна Чык,— таму я перайду да другога забойства. Пан Сокал дакладна высветліў, хто дзе знаходзіўся ў момант забойства Казіміра Кушаля. Я дазволю сабе паўтарыць, што Рафал Дашкевіч чакаў з алебардаю ў Казіміравым пакоі, каб здзейсніць свой намер і пакараць забойцу. Але давайце на хвіліну ўявім сабе, што гэтак усё і было. У нас атрымаецца іншы расклад, з якога вынікаюць супрацьлеглыя высновы. Казіміра ў дзесяць трыццаць не было ў ягоным пакоі, і Рафал Дашкевіч не сустрэў яго на калідоры. Значыць, крыху раней Казімір пайшоў у іншае месца. Калі гадзіны каля дзевятай я спаткаў Казіміра, то ён збіраўся спусціцца ў бібліятэку. Тут варта адзначыць яшчэ адну істотную акалічнасць — Казіміраў пакой знаходзіцца якраз над бібліятэкай, таму не цяжка здагадацца, што, магчыма, Казімір быў забіты не ў сваім пакоі, а паверхам ніжэй і, адпаведна, труп выкінулі праз акно ў бібліятэцы, а не, як лічыць пан Сокал, з Казіміравага пакоя. Такім чынам я звяртаю ўвагу пана Сокала на іншую арганізацыю фактаў, з якой вынікае, што забойцу трэба шукаць не на другім паверсе, а на першым. Такім мне ўяўляецца ход падзей.

На хвіліну ўзнікла ненатуральная, як у сне, цішыня. Яе разбурыў голас Даміника Плятара.

— Пан Чык робіць захады супраць мяне і Фрыдэрыка, але як пан вытлумачыць матывы злачынстваў?

— Цікавая версія,— следчы сам наліў сабе і ўзняў чарку з каньяком.— Пан Чык арганізаваў факты, ды не хапае самага істотнага, не хапае матываў злачынства, каб кагонебудзь абвінаваціць у гэтых жорсткіх злачынствах, неабходна ведаць, нашто ён гэта зрабіў?

— Не ведаю, наколькі сур'ёзна паставяцца да гэтай версіі судовыя ўстановы, але я выкажу свае меркаванні,— не надта ахвотна пачаў Бруна Чык.— Звычайна злачынца забівае ахвяру сыходзячы з нейкіх пэўных матываў, але не выключаецца ідэя нематываванага забойства, калі злачынца забівае першую ахвяру, каб парушыць логіку следства і схаваць матывы наступнага злачынства. Ствараецца прэцэдэнт, у якім першым гіне сведка злачынства, а потым ахвяра, а не наадварот. Скажам, нехта Х збіраецца забіць ці нейкім іншым чынам знішчыць Казіміра Кушаля, і гэты Х падпільноўвае такі момант, калі Казіміра можна выставіць у якасці або, у лепшым разе, сведкі, або нават забойцы. Х удае, што спрабуе наладзіць свята, падбівае Казіміра пайсці пераапрануцца, бярэ са сцяны ў більярднай алебарду і аддае яе Казіміру, а сам узбройваецца паляўнічым нажом. Калі Казімір праз левую алькежу падымаецца да сябе, то Х крыху пасоўвае фісгармонію, становіцца на інструмент і, падцягнуўшыся на балясінах, апынаецца на антрэсолях. На калідоры другога паверха Х заўважае, што Казімір пакінуў алебарду з зоркаю каля дзвярэй. Вось дык пашанцавала! Магчыма, у гэты момант узнікла ідэя стварыць прэцэдэнт нематываванага злачынства, магчыма, план гэтага злачынства быў складзены яшчэ нанізе. Мне здаецца, што так ці інакш, Х крыху павагаўся ў сумненнях, калі ўбачыў алебарду, як лепш выкарыстаць такі падарунак ад д'ябла. Х бярэ алебарду і забівае Вінцэнта. Забойцу неабходна адзначыць час злачынства, каб наклікаць падазрэнні на Казіміра, і ён падпальвае Вінцэнтаў пакой. Тым жа шляхам Х вяртаецца ў залу. А следства пачынае раскручвацца ў памылковым кірунку і заходзіць у тупік. Следчы, пан Сокал, не ведае, каго абвінаваціць — Казіміра ці Рафала, не знаходзіць матываў, і Х пачынае дзейнічаць ізноў. Гэтым разам ён скарыстоўвае той паляўнічы нож, якім збіраўся забіць першую ахвяру, калі б не падвярнулася алебарда. Выпадкова Х сустракаецца ў бібліятэцы з Казімірам. Ён дзейнічае не разважаючы, імгненна з'яўляецца думка выкарыстаць выпадковую сустрэчу. Х забівае Казіміра і выкідае труп праз вакно. Ён спадзяецца на тое, што следчы вытлумачыць знікненне Казіміра як уцёкі. Казіміра няма — значыць, ён уцёк ад правасуддзя, але гэтага не атрымалася: мы знайшлі нябожчыка, і пан Сокал абвінаваціў у злачынстве Рафала.

У мяне адразу выклікалі сумненне два ўзаемавыключальныя факты: алебарда як сродак злачынства і падпалены пакой. Казімір узяў алебарду ва ўсіх на вачах і калі б ён сам выкарыстаў яе такім чынам, то ніколі не стаў бы падпальваць пакой і чакаць, покуль заўважаць дым і смурод. Па логіцы, Казімір або не падпальваў бы пакой, або не карыстаўся б такой прыкметнай зброяй.

Прыблізна гэтыя ж развагі непакоілі пана Сокала, і ён марудзіў з арыштам Казіміра.

Бруна Чык перарваў прамову, запаліў папяросу і, зацягнуўшыся тытунёвым дымам, прайшоўся па пакоі. Даберманы каля фатэля Ганны Кастравіцкай напружана павялі галовамі. Гаспадыня паправіла шаль і папрасіла пана Адама наліць ёй кілішак віна. Бразнуў сталёвымі бранзалетамі Рафал, але следчы не спяшаўся здымаць з яго кайданкі, адно лагодна паляпаў яго па плячы, быццам супакойваючы, што ўсё высветліцца. Дамінік моўчкі піў каньяк, а Фрыдэрык, сашчапіўшы пальцы на патыліцы, фамільярна разваліўся на канапе. Усе застылі ў чаканні развязкі.

— Усё тое, што я расказаў, магло б існаваць на тым жа ўзроўні, што і версія пана Сокала, калі б я не паспеў пагаварыць з Казімірам Кушалем. Праўда, ён не ўспрымаў пагрозу як рэальную небяспеку, але падзяліўся са мною сваімі развагамі. Ён збіраўся напісаць літаратурны пантэон славянскіх багоў, стварыць у сваім родзе Святое Пісанне беларускай міфалогіі. Гэтыя намаганні пачынаючага літаратара ўзбудзілі юнацкі тэмперамент ягоных сяброў. На глебе рэлігійных перакананняў і моцна падагрэтыя віном, сябры пасварыліся. Для Казіміра гэтая спрэчка не была прынцыповай. Хвароба рэлігійнага фанатызму не разбурыла ягонай свядомасці. Я не буду пераказваць усё, што мне давялося пачуць, але гэтага было дастаткова, каб зрабіць наступнае адкрыццё. Забойства Казіміра Кушаля мела рэлігійныя матывы. Руку забойцы скіраваў рэлігійны псіхоз. Рэлігія, нават нацыянальная, ды якая заўгодна, здатная ператварыць чалавека ў вар'ята.

Фрыдэрык саскочыў з канапы і спыніўся каля Даміника, што круціў у доўгіх пальцах шкляную чарку.

— Ты забіў Вінцэнта і Казіміра!— не вытрымаў Фрыдэрык і, схапіўшы за пінжак, паставіў на ногі расслабленага каньяком, быццам пластылінавага, Даміника. Ягоны шкляны позірк слізгануў па Фрыдэрыку і скіраваўся ў падлогу.— Ты гэта зрабіў?!— крыкнуў Фрыдэрык і ўдарыў кулаком яму ў твар. Дамінік, што і так ледзь трымаўся на нагах, упаў на дыван. Багдан Сокал пераскочыў праз перакуленае крэсла і схапіў Фрыдэрыка за руку.

— Супакойцеся, пане Фрыдэрык,— загадаў следчы,— усё вырашыць суд,— следчы дапамог Дамініку падняцца і зняў з Рафала кайданкі.

Раніцою Багдан Сокал павёз Даміника Плятара ў мястэчка, але па дарозе Дамінік забіў следчага і выкінуў з машыны. Ён з'ехаў на старой «татры» ў невядомым напрамку. Болей у тых мясцінах ніхто яго не бачыў.

* * *

Бруна Чык вярнуўся ў Вільню толькі праз восем гадоў. Улетку 1944 года выпадкова заўважыў маладога мужчыну ў вайсковым фрэнчы, што выбег перад ім з брамы гатычнага будынка і ўскочыў у чорную машыну. Малады афіцэр некуды спяшаўся і не звярнуў увагі на Бруна Чыка. Машына хутка знікла за рогам. Бруна Чык доўга не мог успомніць, дзе ён бачыў гэты знаёмы, мужны, гарбаносы твар. Але пазней памяць старога эксперта аднавіла друзгенікскую трагедыю, і ён прыгадаў Даміника Плятара.

Гэта здарылася на пачатку ліпеня, якраз у той час, калі Вільня нікому не належала. Эксперт дакладна не разгледзеў, у якую форму быў апрануты Дамінік Плятар.

Вольга Благарэнка

Смерць Глікерыі Ферапонтаўны

Прысвячаецца незабыўнай Глікерыі Ферапонтаўне Гарыкрат

I

Калі Глікерыя Ферапонтаўна памерла, усе прыйшлі да яе на пахаванне. Бо паважалі. Прыйшла Калерыя Хрысанфаўна з Іпаціем Лонгінавічам, Леаніла Рамуальдаўна — адна, Навела Яўменаўна з Паліксеніяй Флягонтаўнай ды я. Нават дзядзька Сігізмунд прыйшоў.

З Калерыяй Хрысанфаўнай здарылася істэрыка. Іпацій Лонгінавіч хацеў паесці на памінках. Усе сабраліся вакол труны. А Глікерыя Ферапонтаўна ўзнялася з труны і сказала, што перадумала паміраць. Усе пайшлі дамоў. А дзядзька Сігізмунд з гора напіўся — больш няма як.

II

Аднаго разу Глікерыя Ферапонтаўна ішла па вуліцы. Раптам з неба ўпала цагліна. Забіла Глікерыю Ферапонтаўну. Глікерыя Ферапонтаўна памерла. Усе жудасна засмуціліся і прыйшлі да яе на пахаванне. Прыйшла Калерыя Хрысанфаўна з Іпаціем Лонгінавічам, Леаніла Рамуальдаўна — адна, Навела Яўменаўна з Паліксеніяй Флягонтаўнай ды я. Нават дзядзька Сігізмунд прыйшоў.

Калі труну неслі, яна ўпала. З яе выйшла жывая Глікерыя Ферапонтаўна. І ўсе пайшлі па дамах. А дзядзька Сігізмунд з гора напіўся — больш няма як.

III

Калі Глікерыя Ферапонтаўна мыла падлогу, з вядра з вадою выйшаў кракадзіл, адкусіў ён нагу. Яна засталася з адной нагою. Убачыўшы такую справу, Глікерыя Ферапонтаўна памерла. І мы пайшлі да яе на пахаванне. Калерыя Хрысанфаўна з Іпаціем Лонгінавічам, Леаніла Рамуальдаўна — адна, Навела Яўменаўна з Паліксеніяй Флягонтаўнай ды я. Нават дзядзька Сігізмунд прыйшоў. З Калерыяй Хрысанфаўнай здарылася істэрыка. Яна пачала плакаць у труну. Ад макрэчы Глікерыя Ферапонтаўна ачомалася. Пахаванне адмянілі. А дзядзька Сігізмунд з гора напіўся — больш няма як.

IV

Калі Глікерыя Ферапонтаўна ўбачыла, што дзядзька Сігізмунд п'яны, дык пачала біцца галавою аб сценку. Білася-білася, пакуль не забілася. Яе паклалі ў труну, і ўсе прыйшлі да яе на пахаванне. Калерыя Хрысанфаўна з Іпаціем Лонгінавічам, Леаніла Рамуальдаўна — адна, Навела Яўменаўна з Паліксеніяй Флягонтаўнай ды я. Нават дзядзька Сігізмунд прыйшоў. Іпацій Лонгінавіч хацеў паесці на памінках і таму рыпеў зубамі. Ад рыпення Глікерыя Ферапонтаўна ачомалася. І мы пайшлі з пахавання па дамах. А дзядзька Сігізмунд напіўся — больш няма як.

V

У адна тысяча васемсот дзевяноста другім годзе ад Нараджэння Хрыста ў нашым горадзе здарылася страшная эпідэмія халеры. Памерла больш як тысяча чалавек. І Глікерыя Ферапонтаўна таксама. Калі яна памерла, яе паклалі ў труну. Але ніхто прыйсці не змог, бо баяліся выходзіць з дому, каб, барані Божа, не падчапіць халеры. Не прыйшлі: Калерыя Хрысанфаўна з Іпаціем Лонгінавічам, Леаніла Рамуальдаўна — адна, Навела Яўменаўна з Паліксеніяй Флягонтаўнай ды я. Нават дзядзька Сігізмунд не прыйшоў. Калі Глікерыя Ферапонтаўна ўбачыла, што да яе ніхто не прыйшоў, яна ўзнялася з труны. І яе не пахавалі, бо яна з мёртвай стала жывая, а жывых жа хто хаваць будзе? А калі дзядзька Сігізмунд даведаўся пра гэта, дык з гора напіўся — больш няма як.

VI

Усе ўжо памерлі: Калерыя Хрысанфаўна з Іпаціем Лонгінавічам, Леаніла Рамуальдаўна — адна, Навела Яўменаўна з Паліксеніяй Флягонтаўнай ды я. А Глікерыя Ферапонтаўна яшчэ жывая. Кашмар нейкі! Калі дзядзька Сігізмунд даведаўся пра гэта, дык напіўся з гора — больш няма як.

Напэўна, і дзядзька Сігізмунд хутка памрэ.

Уведаўшы гэта, дзядзька Сігізмунд з гора напіўся — больш няма як.

Смяротная кара: за і супраць

Сяргей ЛУЧЫНОВІЧ,
пракурор

Упачатку XIX стагоддзя пачалася праца над праектам новага Крымінальнага ўлажэння, дзе ўпершыню ў гісторыі рускага крымінальнага заканадаўства была распрацавана сістэма пакаранняў, уключаная ў Агульную частку ўлажэння.

Праект прадугледжваў наступныя віды пакарання: смяротная кара, грамадзянская смерць (пазбаўленне ўсіх палітычных і грамадзянскіх правоў), бестэрміновае пазбаўленне волі, пазбаўленне волі і гонару, ганебныя кары, грашовыя штрафы, царкоўнае пакаянне.

Абмеркаванне праекта доўжылася больш як 10 гадоў, і ў 1824 годзе ён паступіў на разгляд у Дзяржаўны Савет. З-за нязгоды прыхільнікаў і праціўнікаў смяротнай кары згаданы праект так і не быў прыняты.

Імператар Аляксандр I знаёміўся з праектам, аднак свайго канкрэтнага стаўлення да смяротнай кары не выказаў.

Ідэйным натхняльнікам праціўнікаў праекту, з-за ўключэння ў сістэму пакаранняў смяротнай кары, быў відны грамадскі і дзяржаўны дзеяч таго часу граф М. С. Мардвінаў, які лічыў, што больш эфектыўнымі пакараннямі з'яўляюцца пазбаўленне волі і катаржныя работы. Вось адзін з яго довадаў: «Воін ідзе на смерць, ставячы грудзі супраць куляў і ядраў, за малы знак пашаны ў пятліцу... але ніхто не падвергне ні жыцця, ні дабрабыту свайго, калі б нароўні са смерцю катарга яго чакала... Гэтую ж думку можна аднесці і да самазабойства. Самазабойцы аддаюць сябе смерці, але ніхто яшчэ не аддаваў сябе катарзе».

Не абмяркоўваючы пазіцыі графа Мардвінава цалкам, я мяркую, што ён знайшоў у дадзеным выпадку не самы ўдалы аргумент немэтазгоднасці смяротнай кары.

Мой практычны вопыт дазваляе быць перакананым, што наяўнасць смяротнай кары ў цяперашнім заканадаўстве і судовай практыцы з'яўляецца для асобных злачынцаў асноўным «тормазам». Менавіта магчымасць «вышкі», а не маральны кодэкс будаўніка камунізму спыняе часам занесеную руку забойцы.

Я не ведаю ніводнага з асуджаных на смерць, які б не імкнуўся да замены вышэйшага пакарання на працяглае пазбаўленне волі. Тым часам не ведаю і адваротнага: каб асуджаны на 15-гадовае пазбаўленне волі хацеў бы аблегчыць свой лёс смерцю. Безумоўна, сярод людзей, пазбаўленых волі, ёсць самазабойцы, аднак гэта вельмі рэдкае выключэнне.

Аднак, як бы там ні было, думку графа Мардвінава паважалі, ягоныя довады былі прызнаныя перакананымі, і праект Крымінальнага ўлажэння правалілі ў Дзяржаўным Савеце.

Чытачу цікава будзе ўведаць, што пры Аляксандры I вышэйшая мера была прыменена за 25 гадоў да 24 чалавек. Пры гэтым няварта забывацца, што на гады царавання Аляксандра прыходзіцца Айчынная вайна 1812 года, калі і была вынесена ваенна-палявымі судамі пераважная большасць смяротных прысудаў.

Узыходжанне на расійскі трон імператара Мікалая I азначылася паўстаннем дзекабрыстаў 14 снежня 1825 года.

Да таго часу справы аб злачынствах, якія закраналі асновы дзяржаўнага ладу, а менавіта да такіх адносілася здзейсненае дзекабрыстамі, былі падсудныя вышэйшаму судоваму органу Расіі — Сенату. Аднак дадзеная справа разглядалася не Сенатам, а створаным па ўказанні імператара Вярхоўным крымінальным судом, членаў якога назначыў асабіста Мікалай I, у тым ліку і вядомага нам праціўніка смяротнае кары графа Мардвінава.

Адсутнасць адзінага крымінальнага закону абумовіла вынясенне прысуду са спасылкамі на розныя заканадаўчыя акты, што на сённяшні дзень з'яўляецца грубым парушэннем крымінальнага працэсу. У прыватнасці, у прысудзе згадваюцца: Улажэнне 1649 года, Воінскі статут 1716 года, Марскі статут 1720 года, Палявое крымінальнае ўлажэнне для дзейнай арміі ды іншыя акты.

Смяротны прысуд быў вынесены 36 удзельнікам паўстання на Сенацкай плошчы.

Аспрэчваючы законнасць прысуду, граф Мардвінаў выступаў супраць смяротнае кары, спасылаючыся на лізавецінскі Указ 1753 года, пра які згадвалася раней, акт, які скасоўваў смяротныя прысуды.

Мікалай I зацвердзіў смяротнае пакаранне праз павешанне (па прысудзе — адсячэнне галавы) толькі пяцярым асуджаным: К. Ф. Рылееву, П. І. Пестэлю, С. І. Мураўёву-Апосталу, М. П. Бястужаву-Руміну і П. К. Кахоўскаму, якія і былі пакараныя 13 ліпеня 1826 года на беразе Нявы каля царквы св. Тройцы.

Пры выкананні прысуду, пасля таго як на шыі асуджаных былі надзетыя вяроўкі, памост пад шыбеніцаю абваліўся. Пестэль і Кахоўскі павіслі, астатнія, выслізнуўшы з кепска зацягнутых петляў, упалі ўніз. Як сцвярджалі сведкі, ці то Рылееў, ці то Мураўёў-Апостал усклікнуў: «Праклятая зямля, дзе не ўмеюць ні скласці прысуду, ні судзіць, ні вешаць!»

Упершыню ў гісторыі нашага заканадаўства межы прымянення смяротнае кары былі досыць дакладна вызначаныя ў Зводзе законаў Расійскай імперыі 1832 года, які пачаў дзейнічаць 1 студзеня 1835 года. Яна магла назначацца толькі за найцяжэйшыя віды дзяржаўных злачынстваў: зламыствы супроць імператара і членаў імператарскага дому, ганьбаванне імператара і членаў імператарскага дому злымі і шкоднымі словамі, бунт, здраду і толькі ў выключных выпадках, калі гэтыя злачынства, як асабліва важныя, перадаваліся на разгляд і рашэнне Вяр-

---

Заканчэнне. Пачатак у №№ 8—10.

хоўнага крымінальнага суда. Ніякія судовыя інстанцыі, апрача Вярхоўнага суда, вынесці смяротны прысуд не маглі. Неабходна, праўда, адзначыць, што ваенныя суды маглі выносіць смяротны прысуд на падставе каранціннага Статута 1832 года і Палявога крымінальнага ўлажэння за воінскія злачынствы, здзейсненыя ў час ваеннага паходу.

У мэтах далейшага ўдасканальвання заканадаўства імператарам быў створаны асобны камітэт па падрыхтоўцы Улажэння аб пакараннях крымінальных і папраўчых 1845 года.

Пры падрыхтоўцы праекта Улажэння кіраўнік камітэту граф Д. М. Блудаў выказвае ў сваёй тлумачальнай запісцы наступнае меркаванне аб смяротным пакаранні. «Нельга не згадзіцца, што гэтая кара ёсць у пэўным сэнсе зло крымінальнага заканадаўства, перавышэнне, якое некаторыя філосафы-маралісты не зусім справядліва лічаць праціўным рэлігіі».

У праекце Улажэння аб пакараннях крымінальных і папраўчых 1845 года смяротная кара прадугледжвалася за здзяйсненне наступных злачынстваў: важнейшыя дзяржаўныя злачынствы, наўмыснае забойства бацькі і маці, другое, ужо пасля асуджэння, здзяйсненне асобамі, асуджанымі да катаргі, цяжкіх злачынстваў — забойстваў, падпалаў, разбою і рабаўніцтва; важнейшыя каранцінныя злачынствы.

Пры зацвярджэнні Улажэння імператар Мікалай I пакінуў смяротную кару толькі за важнейшыя дзяржаўныя і каранцінныя злачынствы. За гэта ж выказваўся і граф Блудаў.

Усяго смяротная кара прадугледжвалася санкцыямі сямі артыкулаў Улажэння 1845 года.

Потым ажно да 1917 года заканадаўства аб смяротнай кары заставалася практычна нязменнае.

Са смяротных прысудаў, якія ўвайшлі ў гісторыю, хачу нагадаць прысуд 1849 года, калі да расстрэлу былі асуджаны актыўныя ўдзельнікі гуртка М. В. Буташэвіча-Петрашэўскага, сярод якіх быў вялікі рускі мысліцель і пісьменнік Ф. М. Дастаеўскі.

У дзень пакарання ўсіх асуджаных узвялі на эшафот, а трох, сярод якіх быў і сам Петрашэўскі, прывязалі да слупоў, і салдаты падрыхтаваліся страляць. На шчасце, пакаранне не адбылося. Па загадзе імператара Мікалая I смяротная кара была заменена іншымі пакараннямі. Ф. М. Дастаеўскаму — 4 гадамі катаргі. Будучы асуджаным на смерць, Дастаеўскі з вялікай псіхалагічнай глыбінёю апісаў потым яе чаканне ў сваім бессмяротным «Ідыёце».

За час царавання Мікалая I было выканана 40 смяротных прысудаў.

На жаль, гэтая лічба адлюстроўвае толькі афіцыйную судовую статыстыку. Рэальная ж карціна дужа адрозніваласа ад статыстычнай, бо існавалі шпіцрутэны і прымяняліся цяжкія цялесныя пакаранні. Што гэта такое, я праілюструю рэзалюцыяй Мікалая I на смяротным прысудзе — «віноўных прагнаць скрозь 1000 12 разоў. Дзякуй Богу, смяротнай кары ў нас не было і не мне яе ўводзіць».

Думаю, што выжыць пасля такога пакарання практычна немагчыма. У тагачаснай статыстыцы таксама завуаліраваныя нормы пакарання не знайшлі свайго адлюстравання.

60-я гады мінулага стагоддзя адзначаны ў гісторыі Расіі не толькі адменаю прыгонніцтва, але і судовай рэформаю 1864 года, якая прывяла да ўвядзення ўсесаслоўных судоў, устанаўлення галоснасці судаводства, разгляду крымінальных спраў з удзелам прэстыжных засядацеляў, увядзення адвакатуры. Мы з патрыятычнай гордасцю можам канстатаваць, што судовая рэформа ўстанаўлівала адзін з самых дэмакратычных у тагачаснай Еўропе крымінальных працэсаў, што ніяк нельга сказаць пра цяперашні ў параўнанні не толькі з еўрапейскімі, але і нават з расійскім працэсам мінулага стагоддзя.

Абвастрэнне палітычнага жыцця краіны прывяло да нябачанай раней колькасці палітычных судовых працэсаў, а, як згадвалася вышэй, смяротная кара выканана 40 смяротных прысудаў.

На жаль, гэтая лічба адлюстроўвае толькі афіцыйную судовую статыстыку. Рэальная ж карціна дужа адрозніваласа ад статыстычнай, бо існавалі шпіцрутэны і прымяняліся цяжкія цялесныя пакаранні. Што гэта такое, я праілюструю рэзалюцыяй Мікалая I на смяротным прысудзе — «віноўных прагнаць скрозь 1000 12 разоў. Дзякуй Богу, смяротнай кары ў нас не было і не мне яе ўводзіць».

Думаю, што выжыць пасля такога пакарання практычна немагчыма. У тагачаснай статыстыцы таксама завуаліраваныя нормы пакарання не знайшлі свайго адлюстравання.

60-я гады мінулага стагоддзя адзначаны ў гісторыі Расіі не толькі адменаю прыгонніцтва, але і судовай рэформаю 1864 года, якая прывяла да ўвядзення ўсесаслоўных судоў, устанаўлення галоснасці судаводства, разгляду крымінальных спраў з удзелам прэстыжных засядацеляў, увядзення адвакатуры. Мы з патрыятычнай гордасцю можам канстатаваць, што судовая рэформа ўстанаўлівала адзін з самых дэмакратычных у тагачаснай Еўропе крымінальных працэсаў, што ніяк нельга сказаць пра цяперашні ў параўнанні не толькі з еўрапейскімі, але і нават з расійскім працэсам мінулага стагоддзя.

Абвастрэнне палітычнага жыцця краіны прывяло да нябачанай раней колькасці палітычных судовых працэсаў, а, як згадвалася вышэй, смяротная кара прымянялася менавіта за дзяржаўныя злачынствы. Амаль за 30 гадоў канца XIX стагоддзя, з 1866 па 1895 год, судамі было вынесена 137 смяротных прысудаў, з якіх выкананы 44, а 93 асуджаным смяротнае пакаранне было заменена катаргаю.

Прыкладам палітычнага працэсу можа быць справа аб забойстве імператара Аляксандра II, здзейсненым 1 сакавіка 1881 года, калі былі асуджаныя на смерць і пакараныя Жалябаў, Пяроўская, Кібальчыч, Гельфман і Міхайлаў. Некаторыя даследчыкі лічаць гэты прысуд празмерна суровым, бо гэтыя людзі непасрэдна не забівалі цара — забіў яго Грынявіцкі, які загінуў разам з імператарам.

Не ўдаючыся ў развагі з гэтае нагоды, прапаную чытачам пафантазіраваць і ўявіць сабе працэс над людзьмі, якія замахваліся б на Сталіна ці сённяшніх кіраўнікоў дзяржавы.

Вядомы рускі крыміналіст прафесар М. М. Гернэт у зборніку артыкулаў «Супраць смяротнай кары» пакінуў нам у спадчыну унікальны спіс асобаў, асуджаных на смерць, за перыяд з 1826 па 1906 год, калі ў Расіі адбываліся буйнейшыя палітычныя падзеі, у ліку якіх: паўстанне дзекабрыстаў 1825 года, паўстанні 1830—31, 1863—64 гг., сялянскія хваляванні 1861 года, дзейнасць петрашэўцаў і народавольцаў, забойства імператара і замахі на цароў, рэвалюцыя 1905 года. У гэтым спісе ўказаны не толькі прозвішчы і сацыяльнае становішча асуджаных, але і сутнасць злачынства, звесткі аб выкананні прысуду. За гэты перыяд судамі Расіі былі асуджаны на смерць 612 чалавек. З іх 262 чалавекі, пераважна афіцэры, за ўдзел у паўстанні 1830—1831 гг. былі асуджаны завочна, аднак ніводзін з іх не быў знойдзены. З 612 прысудаў былі выкананы толькі 131.

У нябачаных раней маштабах смяротная кара пачала прымяняцца ў пазасудовым парадку пасля падаўлення рэвалюцыі 1905 года, у перыяд так званай сталыпінскай рэакцыі.

Прафесар Гернэт дае наступныя даныя аб колькасці пакараных без вынясення прысуду: 1906 год — 574, 1907 год — 1139, 1908 год — 1340, 1909 год — 717, 1910 год — 129, 1911 год — 73, 1912 год — 126.

Характарызуючы такія маштабы, адзін з буйных тагачасных дзеячаў граф С. Ю. Вітэ пісаў: «...Можна быць прыхільнікам смяротнай кары, але сталыпінскі рэжым знішчыў смяротную кару і ператварыў гэты від пакарання ў простае забойства, часта зусім бессэнсоўнае, забойства па непаразуменні. Словам, з'явілася нейкая мешаніна

«МОЙ МЕЧ — ГАЛАВА З ПЛЕЧ!»

Фота Генадзя КАРЧЭЎСКАГА

ўрадавых забойстваў, названая смяротнымі карамі».

У 1908 годзе з'явіўся заклік аб заснаванні ў Расіі «Лігі барацьбы супраць смяротнай кары», якая прызнавала пакаранне смерцю несумяшчальным ні з асновамі хрысціянскае маралі, ні з ідэяй справядлівасці як асновы прававога парадку ў дзяржаве, ні з прынцыпамі разумнай крымінальнай палітыкі. Ліга лічыла смяротную кару нягодным сродкам рацыянальнай барацьбы са злачыннасцю і нават аховы дзяржаўнага і грамадскага спакою. Аднак у рэгістрацыі Лізе было адмоўлена.

У апублікаваных ужо матэрыялах я спрабаваў, імкнучыся да аб'ектыўнасці, ілюстраваць той ці іншы час колькаснымі паказчыкамі здзейсненых пакаранняў. Шмат іх было ці не, чытач можа меркаваць сам, параўноўваючы эпохі кіравання рускіх цароў і імператараў, апрача кіраўнікоў новае эпохі, бо тое, што адбылося пасля кастрычніка 1917 года, нельга параўнаць ні з грознымі, ні з крывавымі царамі, а хіба што з Апакаліпсісам.

Заканчэнне на стар. 50.

У НАШЫМ ДОМЕ ГОРА

Угледзьцеся ў гэтыя здымкі. Вось што прынёс на беларускую зямлю Чарнобыль. Усё больш і больш нараджаецца хворых дзяцей. Менавіта для іх у Мінску летась стварылі Дом дзіцяці № 1, ён знаходзіцца на вуліцы Разінскай, 29, што пралягае непадалёк ад станцыі Мінск — Таварная. Прызначэнне гэтай унікальнай лякарні — рэабілітацыйна - аднаўленчае лячэнне. Сёння яна ўжо не можа прыняць усё большую і большую колькасць хворых. Шмат хто з маленькіх пацыентаў памірае праз некаторы час жыцця (калі толькі можна назваць гэтак іхняе пакутлівае існаванне) у сценах гэтага дома. Тут знаходзяцца тры катэгорыі дзяцей: ва ўзросце да 1

года з цяжкой паталогіяй, якія вымагаюць шырокага медыцынскага абслугоўвання і ўзмоцненага дагляду, дзеці, якіх не навучаюць,— ідыёты, імбецылы і г. д., у іх трэба развіць мінімальныя сацыяльныя звычкі па самаабслугоўванні, і так званыя арганікі са спіннамазгавымі грыжамі і падобнымі захворваннямі. Імі павінны займацца і займаюцца спецыялісты высокай кваліфікацыі. Тут патрабуюцца медыкі-энтузіясты. Такіх людзей няшмат, але яны ёсць. Будзем удзячныя ім!

Цяпер у Доме Дзіцяці працуюць псіхіятр, урач-неўрапаталог і педыятры. Але трэба абавязкова павялічыць штат абслугі, вельмі не хапае медыцынскіх сёстраў, масажыстаў, інструктараў ЛФК...

Адно з набалелых пытанняў — спецыяльныя медыцынскія прыборы, абсталяванне, трэнажоры... Бракуе дзіцячых інвалідных калясак, вентрыкула-перытанальнага шунту нізкага ціску для аперыравання дзяцей са спінна-мазгавымі грыжамі, розных рэабілітацыйных сродкаў для аднаўленчага лячэння ў зале механатэрапіі.

Пажадана, каб часцей наведвалі гэты Дом навукоўцы-медыкі, вядучыя спецыялісты аховы здароўя. Тут, напрыклад, маюць намер пашырыць магчымасці рэабілітацыі дзяцей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. А гэтага без кансультацый са спецыялістамі ніколі не здзейсніш. Карацей, дзіцячая лякарня чакае ўвагі і клопату з боку грамадства, чакае дапытлівых, самаахвярных людзей, якія не ўнікаюць цяжкое працы.

Іосіф ЕСАКОЎ

Фота Віталя БАРЗДЫКІ

Шпаковский — 30

Галіна ДУБЯНЕЦКАЯ

◇ ◇ ◇

Сто разоў памру і ўваскрэсну
за хвіліны размовы з табой.
Ў танцы ветліва-стрыманых жэстаў —
да трымцення напяты спакой.

Ты ні словам не дапаможаш,
назіраючы з вежы ўгары,
як у пошуках брамы абходжу
этыкету шкляныя муры.

Толькі цягнеш з мяне павуціннем
жывыя карункі радкоў —
не адважваючыся спасцігнуць
сэнс пякучы пяшчотнейшай з моў.

Колькі горычы ў гэтым каханні,
колькі ценяў на кроплю святла...
Я цябе празрыстаю зданню
абдымаю праз холад шкла.

◇ ◇ ◇

Хваля адхлыне
вернецца вобмацкам
слова залстыне
выблісне позіркам

не наталіцца
снамі шалёнымі
зноў бліскавіцай
вочы зялёныя

крэсліць міжброўе
паскамі
паскамі
тоіць бязмоўе
пастку нам
пастку нам

хованкі
пошукі
мроі гарачыя
позіркаў дотыкі
моўлена
страчана

гонар люцыправы
лёдам праталіны
вызвалі
выправі
— Свечкі дапалены.

золкам апошнім
зоры схаваліся
божа нашто ж мы
ўратаваліся

ПАЧАТАК ЖНІЎНЯ

Пачатак жніўня, хмарнае світанне,
чаканае, неспадзяванае спатканне,
і ветразі пяшчотныя лілей,

і жар напаўсвядомага імкнення,
і жах напаўпрытомнага імгнення,
і вочы зор, і вогнішчы вачэй,—

усё, што не загіне і не ўскрэсне,
што працінае сцішанаю песняй
і ў плыні дзён, і ў бездані начэй:

пачатак жніўня, хмарнае світанне,
і слодыч ганарлівага маўчання,
і незваротнасць нашых вандраванняў
пад ветразямі белымі лілей.

ПЕРАКЛАД

(Мільён гадоў цягнулася расстанне...)
— Прыемна бачыць Вас, шаноўны пане.
(Паветра не ставала для дыхання...)
— Так, сумавала крышачку, мой пане.

Што ў свеце бачыла?..
(Твой цень — куды ні гляну...)
— Што ўсё падобна скрозь, вядома й пану.
Як бавілася?..
(Ды з тваёю зданню...)
— ...упадабала мройныя блуканні.
Што вынайшла?..
(Што ў ланцугах кахання
не навандруешся...)
— Што дома лепш, мой пане.

(А ты? Ці згадваў? Ці прыспешваў
дзень спаткання?..)
— А Вы як маецеся, мой шаноўны пане?
(О сілы! Сумаваў!! О мой непараўнаны!!!)
— То дзякую на добрым слове пану.

Пагляду спавядаецца пагляд.
Язык ласкава робіць пераклад.

Фота
Валерыя КАКРУЛЯ

МАЛІТВА

У капліцы Тваёй
запалі мяне ціхаю сьвечкай,
прад абліччам Тваім
у сутоньні мяне запалі.
На зьмярканьні сьвятла
блаславі мой самотны агеньчык,
на зьмярканьні душы і любові
на гэтай зямлі.
Прад абліччам Тваім
дай гарэць трапятліва і ясна,
чысьціню Тваіх рысаў
на хвілю замгліць не дазволь.
А як чэзнуць пачну,
загасі мяне воляю ўласнай
а бажніцы Тваёй,
дзе зьліваюцца міласьць і боль.

ДЗЕЛЯ ДАБРА СВАЁЙ

Беларусь наведаў Апостальскі Візітатар для беларусаў-католікаў за мяжою айцец Аляксандар Надсон. Ён ад імя нашых землякоў, што жывуць у Англіі, прывёз дапамогу ахвярам Чарнобыля. Сустракаўся з медыкамі, распытваў, чым яшчэ можа дапамагчы невялікая беларуская калонія ў Вялікабрытаніі. Як кіраўнік бібліятэкі імя Францішка Скарыны сустракаўся з дзеячамі культуры, моладдзю. У касцёле на Кальварыі айцец Аляксандар адправіў Службу Божую. На яе прыйшлі (хоць нядзеля была рабочая) людзі рознага веку, розных прафесій, бо ў Мінску гэта была першая імша паводле грэка-каталіцкага абраду праз 150 гадоў пасля таго, як цар скасаваў царкоўную унію на Беларусі.

Мы ведалі, што а. Аляксандра сёй-той, мякка кажучы, не любіць. Мы ўжо чыталі, што ён — агент ЦРУ. І на гэты раз не абышлося без інсінуацый. Аляксандра Надсона ў «Вячэрнім Мінску» назвалі нямецкім афіцэрам, ледзь не лідэрам Саюза беларускай моладзі, што дзейнічаў у час акупацыі. А яму не было тады і 18 гадоў. Сумнавядомая Т. Бумажкова «забыла» згадаць, што А. Надсон, выехаўшы з Беларусі, ваяваў у польскай арміі генерала Андэрса супраць фашыстаў і быў паранены. Зрэшты, чаму тут здзіўляцца: той, хто даваў інфармацыю Т. Бумажковай, быў зацікаўлены ў тым, каб, узвёўшы паклёп на святара, захавальніка беларускай культуры ў Англіі, яшчэ раз зняславіць «нефармалаў», якія мелі смеласць шчыра вітаць а. Аляксандра і разам з ім маліцца за Беларусь.

— Спачатку скажыце, як мне да Вас звяртацца... Гаворачы пра Вас, кажуць то Надсон, то Надсан...

— У прыязнай гамане зазвычай звяртаюцца да мяне — айцец Алесь.

— Будзьце ласкавы, айцец Алесь, распавядзіце пра музейна-бібліятэчны комплекс у Лондане, які вы ўзначальваеце.

— «Комплекс» — гэта гучыць надта ж паважна, як бы нешта вялікае. У канцы 50-х гадоў — яшчэ жывы быў біскуп Часлаў Сіповіч, мы былі кнігалюбы — мы вырашылі стварыць беларускую бібліятэку. У 1971 яна была адкрыта, назвалі гэтую бібліятэку імем Скарыны. Так што — нашай бібліятэцы ўжо больш за 20 гадоў. Маем 15 тысяч адзінак розных назваў кніг — пераважна на беларускай мове. Калі ж на іншых мовах, дык усё кнігі, якія датычаць Беларусі, іншых мы не збіралі, на іншыя кнігі ў нас не было ні

месца, ні часу, ні грошай. Пры бібліятэцы паўстаў маленькі музей, маем там цікавыя экспанаты. Але гэта не найважнейшае. Найважнешае — гэта бібліятэка. Нам хацелася захаваць ад знішчэння кнігі, якія трапілі на Захад і былі ў прыватных руках, вельмі часта бязглузда прападалі. Прыкладам, пасля смерці нейкага чалавека ягоная жонка, чужынка, магла без усялякага сумліву павыкідаць кнігі. І так часта прападалі вельмі каштоўныя кнігі. Нам шмат удалося знайсці, уратаваць.

Маем шмат старадрукаў, пачынаючы ад фрагментаў Скарынавай «Бібліі», Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года, розныя выданні Евангелля, выданні Супрасльскага манастыра XVII стагоддзя.

Асобна трэба сказаць пра архівы беларускіх пісьменнікаў на чужыне — многія з іх аддалі свае архівы нам у бібліятэку, так што можна іх вывучаць... Архівы беларускіх кампазітараў на чужыне: Куліковіча, Равенскага. Маем архіў беларускай эміграцыі — арганізацыяў розных краін. Гэтакім чынам, для гісторыкаў беларускай эміграцыі наша бібліятэка можа быць вельмі карысная.

— Хто вашы асноўныя чытачы? Ці шмат іх?

— Якраз беларусаў, можа, найменш. На эміграцыі яны трымаюцца крышку здалёку ад кніг... Затое прыязджаюць беларусы з Беларусі, беларусы з Польшчы, мы заўсёды радыя іх бачыць у сябе. І ёсць вельмі шмат не-беларусаў, якія карыстаюцца з нашай бібліятэкі. Калі ёсць такі асяродак, падобны нашаму, пачынаецца зацікаўленне беларускім пытаннем у свеце... Прыходзяць англічане, прыязджаюць амерыканцы, канадыйцы, аўстралійцы, з Ізраілю прыязджаюць, з усяго свету. Бывае каля 500 чытачоў у год. Для бібліятэкі з такім спецыяльным профілем — гэта вельмі шмат.

— Якія стасункі існуюць паміж беларусамі ў Англіі?

— У Англіі цяпер засталося якіх 3 тысячы беларускіх сем'яў. Раней было больш, але яны выехалі ў ЗША, Аўстралію, Канаду. Найбольшы асяродак ёсць у Лондане, збіраемся даволі часта — звычайна ў нас у бібліятэцы. Жыццё даволі актыўнае. У нас існуе Англа-Беларускае Таварыства, сябрамі якога з'яўляюцца беларусы і англічане (англічане — пераважна з Лонданскай Акадэміі, з навуковага свету). Вось ужо больш за 20 гадоў Таварыства праводзіць курс лекцыяў з гісторыі беларускае культуры, штогод — 6 лекцыяў. Часам робяць выступы госці, якія прыязджаюць з Беларусі: доктар Мальдзіс, Грыцкевіч... Трэба сказаць, што сярод беларусаў ёсць вельмі вялікае зацікаўленне тым, што робіцца на Бацькаўшчыне. Асобна скажу пра царкоўнае жыццё... Маем богаслужэнні па нядзелях — і тады таксама бываем разам. Часам прыязджаюць беларусы з іншых гарадоў — з Бірмінгему, з Ковентры. Так што трымаемся мы даволі добра яшчэ, жывем добра, і сустракаемся, нешта робім цэлы час.

— Кажуць, што Радзіма — гэта не столькі тое, што вакол цябе, што цябе атачае; самае галоўнае — каб яна была ў сэрцы...

— Пэўна, так. Але тая зямля, дзе нарадзіўся, па якой ходзіш, тыя людзі, сярод якіх жывеш,— гэта таксама вельмі важна. Мы гэтага пазбаўлены, і нам гэтага вельмі не хапае.

— Яшчэ кажуць, што настальгія — пачуццё чыста рускае...

— Не, гэта не ёсць расійскае. Гэта глыбокае пачуццё, якое ў душы кожнага чалавека. Кожнаму хочацца быць на сваёй роднай зямлі. Трэба толькі, каб гэтая туга не была хвараблівай, каб наша цяга да роднай зямлі не перашкаджала ў штодзённай працы. Урэшце, уся зямля ёсць Божая, дзе б мы ні былі. І мы можам працаваць дзеля дабра свае Бацькаўшчыны, пры якіх бы абставінах мы ні апынуліся.

А толькі сядзець і ныць... Такая настальгія — не вераю, характэрнай рысай якой нацыі яна з'яўляецца. Спадзяюся, што не беларускай.

— Да ўяўленняў пра даваенную беларускую эміграцыю найлепш стасуюцца Багдановічавы словы з «Эмігранцкай песні»:

Не рассталіся б мы з нашым краем,
каб было дзеля нас у ім хлеба...

Таму даваенную эміграцыю часта называюць эканамічнай. Як бы Вы назвалі пасляваенную беларускую эміграцыю?

— Эміграцыя пасля апошняй вайны — яна нацыянальна свядомая. Людзі выязджалі не толькі дзеля лепшага жыцця. Яны выязджалі дзеля палітычных прычынаў — не хацелі жыць пад пэўным рэжымам, але хацелі застацца беларусамі. Якраз гэтая, пасляваенная, эміграцыя зрабіла шмат добрага, вартаснага ў галіне развіцця беларускае культуры і пашырэння ведаў пра Беларусь у заходнім свеце.

— З якімі ацэнкамі падыходзяць на эміграцыі да вайны, ваеннага перыяду? Мусіць жа, яны адрозныя ад ацэнак, прынятых савецкімі гісторыкамі...

— Пра кожны час можна гаварыць розныя рэчы... Гэта быў той час, калі майму пакаленню трэба было фармаваць свой характар. 39-ты год, пасля 41-шы, 44-ты год... Гэтыя змены ўладаў, усё было такое пераходнае — поўнае змяшанне ў душы. Калі я пакінуў Бацькаўшчыну, мне было няпоўных 18 гадоў — якраз самы цяжкі час, калі мы павінны былі шукаць свае дарогі, а не было нікога, хто б мог пакіраваць. Мы часта заставаліся без бацькоў, без дапамогі, не маючы нават добрага прыкладу іншых. Мне здаецца, савецкія гісторыкі судзяць гэтае пакаленне вельмі жорстка, не ведаючы, якія гэта былі цяжкасці. Жыццё далёка больш складанае за нашыя ўяўленні пра яго.

Што ж, некаторыя з нас знайшлі, урэшце, сваю дарогу, іншыя зламаліся, пайшлі шукаць толькі матэрыяльнае багацце, хто — распіўся... Тое, што я стаў святаром,— тут ласка Божая.

Беларусы старэйшага пакалення... Іх абзываюць калабарантамі. Я думаю, што ніхто з іх ніякім калабарантам не быў. Так склалася ў гісторыі нашага народа, што мы заўсёды былі пад нейчай акупацыяй, і нават у гэтых цяжкіх абставінах шукалі нейкага выйсця. Бо іначай бы зусім нічога не было. Яны не былі лаяльнымі да немцаў — яны былі лаяльнымі да беларусаў. Не да Савецкага Саюза, не да Польшчы, не да Нямеччыны — да Беларусі. Так я ўважаю.

— Айцец Алесь, як Вы думаеце, якая з рэлігіяў найбольш адпаведная часу новага адраджэння на Беларусі?

— Гэта вельмі цяжкае пытанне, і кожны адказ тут можна дрэнна зразумець. Я думаю, што перадусім хрысціяне і хрысціянства могуць шмат даць для беларусаў — і асабліва для маладога пакалення, якое шукае нечага глыбейшага, духоўных ідэалаў. Наша трагедыя ёсць адна: Царква доўгі час была чужою для беларусаў. Але не трэба чакаць ад Царквы, каб яна займалася нацыянальным адраджэннем. Заданне Царквы адное — пашырэнне Валадарства Божага сярод людзей.

гутарку вяла
Таццяна ДУБАВЕЦ.

БАЦЬКАЎШЧЫНЫ



КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

НАРЫС ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Пасля рэлігійнай вуніі 1596 году каталіцтва на Беларусі было абвешчана дзяржаўнай верай, як у Польшчы. Каталіцтва давала права для заняцця вышэйшых урадавых пасад у Літве і Беларусі. Рэфармацыйны рух сярод паноў знік. Яго змяніла каталіцтва, якое было для беларускай шляхты тым шляхам, каторы правадзіў да вышэйшых пасад і да злучэння з польскаю шляхтаю. Калі адбылася царкоўная вунія, то ўсім стала ясна, што яна мела не рэлігійны, а палітычны кірунак, што яна таксама была шляхам не толькі для пашырэння каталіцтва, але і польскага ўплыву. Рэлігійнае пытанне злілося з пытаннем палітычным і нацыянальным, каталіцтва — з польскасцю. І да нашага часу астаўся гэты шкадлівы перажытак, калі і цяпер мы часта можам бачыць, як змешваюцца два разуменні: паляк і католік, рускі і праваслаўны. Ужо і ў тыя часы некаторыя з разумнейшых людзей разумелі ўсю несправядлівасць такога злучэння пытанняў рэлігійна-царкоўных з пытаннямі палітыка-нацыянальнымі. Такім быў, напрыклад, ксёндз Калінка, пісьменнік таго часу. У прадмове да напісанага ім жыцця св. Езафата ён піша: «І да цяперашніх часоў сярод каталіцкага духавенства рэдка спаткаеш чалавека, што шанаваў бы абрад і нацыянальнасць таго народу, сярод каторага ён працуе. Ім здаецца, што трэба зрабіць чалавека італьянцам або французам (а ў нас палякам), гэта найлепшы спосаб павярнуць яго. Гэта фальшывы погляд. Усе народы створаны богам, мілы богу, ды ўсе яны, не трацячы свайго нацыянальнага пачуцця, могуць прылучыцца да ўсясветнай царквы. Хто аб гэтым забывае, той сабе і справе веры шкодзіць, бо сее паміж усходнімі народамі думку, быццам каталіцтва — гэта толькі спосаб да дэнацыяналізацыі іх».

На Беларусі пачынаецца гвалтоўнае пашырэнне вуніяцтва і каталіцтва. На гэтым вырастае шмат і злачынства. Валынскі чашнік, пасол сойму Лаўрык Дравінскі так апісвае ў сваёй прамове на сойме (1620) рэлігійныя справы Рэчы Паспалітай: «...Якое йдзе пашырэнне божай славы пры дапамозе новавыдуманай вуніі? Ужо ў вялікіх гарадох цэрквы запячатаны, царкоўныя маёнткі раскрадзены, у кляштарах замест манахаў запіраюць быдла. Пяройдзем у Княства Літоўскае: там у прымежных з Маскоўскім гаспадарствам гарадох робіцца тое самае. У Магілеве і Воршы цэрквы запячатаны, свяшчэннікі разагнаны; у Пінску зроблена тое самае: кляштар Ляшчынскі перароблены ў карчму». (...)

(...) Зразумела, што такія факты выклікалі абурэнне і легальны пратэст сярод тых сацыяльных груповак, якія маглі гэта рабіць ці на пасяджэннях сойму, ці другім спосабам, напрыклад, у брацтвах, аб якіх мы будзем гаварыць далей. Сойму прыходзілася тады рабіць уступкі.

Так, напрыклад, пры каранацыі караля Уладзіслава IV (1632) сойм павінен быў выдаць так званыя артыкулы для замірэння народу, на аснове якіх прызнавалася легальнаю праваслаўная вера і праваслаўная іерархія. Але гэта легальнае палажэнне іншаверцаў, дысідэнтаў, як іх тады называлі, не было пэўным. Чым далей, тым усё больш і больш губіцца палітычны розум сойму. Усё часцей і часцей выдаюцца пастановы супраць дысідэнтаў, карысныя каталіком-шляхціцам, гандляром і рамеснікам, але шкадлівыя для гаспадарства.

У 1732 годзе была выдана, напрыклад, такая пастанова: «У людзей іншых вызнанняў (дысідэнтаў) адбіраецца права быць абранымі ў паслы на соймы, трыбуналы і ва ўсякія асобныя камісіі, што ўтвараюцца для якіх-колечы спраў. Правы іх раўнуюцца з правамі габрэяў». Сойм 1766 году ўхваліў пастанову караць смерцю тых, каторыя пяройдуць з каталіцтва ў другую веру. У 1766 годзе сойм ухваліў, як закон, такую прапазіцыю кракаўскага біскупа Солтыка: абвяшчаецца ворагам гаспадарства кожны, хто асмеліцца сказаць на сойме прамову на карысць іншаверцаў.

Гонячыся за тымі эканамічнымі, сацыяльнымі і палітычнымі карысцямі, якія ім сулілі каталіцтва і разам з ім польскасць, і не хочучы мець тых збыткаванняў, якія былі звязаны з праваслаўем і беларускасцю, шляхта літоўска-беларуская пачынае паступова пераходзіць у польска-каталіцкі лагер... (...) У складзе беларускае нацыі і на баку праваслаўнай веры застаюцца тыя слаі, якім каталіцтва і польскасць не прыносяць ніякіх эканамічна-палітычных выгад — гэта працоўныя масы народу, найчасцей сялянства [1].

Разам з палітычным і рэлігійным уплывам польскасці, а таксама і асобна ад яго, ішоў уплыў і культурна-нацыянальны. Беларуская шляхта, атрымаўшы палітычныя правы і веру Польшчы, пачала пераймаць польскі лад жыцця. Польскія звычаі і мова сталі яе ідэалам. Езуіты дзеля рэлігійных мэт закладалі польскія школы і друкавалі кнігі ў польскай мове. (...) Разумецца, гэтая польская «паліроўка» пашыралася толькі сярод тых грамадскіх станаў, якія даставалі шляхецкія вольнасці, якія вучыліся ў школах і чыталі кнігі... Усё менш і менш аставалася беларускіх паноў, якія хавалі беларускія звычаі, культуру й мову. (...) Але доўга яшчэ ўрадаваю, дзяржаўнаю моваю на Літве і Беларусі была беларуская мова. Урэшце было скасавана і гэта. Сойм у 1697 годзе выдаў такую пастанову: «*Писарз повиниен ние по руску, а по полску писаць*» [2]. З гэтага часу ўсе законы і ўрадавыя пастановы робяцца па-польску. Беларуская культура, звычаі і мова засталіся толькі ў тых, каму было не да «бляску», не да «паліроўкі»,— людзі вясковага мужычага стану і гарадскія працоўныя нізы...

Такім спосабам, Польшча з сацыяльнага боку прынесла нам уплыў панскі, з рэлігійнага боку — каталіцкі. Культурны і рэлігійны ўплыў пайшоў толькі на вышэйшыя грамадзянскія класы. Нізэйшы клас атрымаў ад Польшчы прыгон і няволю, астаўшыся пры сваёй бела-

Заканчэнне. Пачатак у №№ 1—10.

рускай мове і нацыянальнасці. Забіты і загнаны, пастаўлены ў стан «быдла», ён забыў нават, якую мову і якую нацыянальнасць ён захаваў. У яго цёмным розуме ўсё перапуталася і злілося. Пан, каталік і паляк — з аднаго боку; мужык і «тутэйшы» — з другога боку, сталі для яго розуму сінонімам. І да нашага часу астаўся гэты гістарычны перажытак, калі наш селянін лічыць, што пан, каталік і паляк — гэта ёсць словы, якія называюць адну і тую катэгорыю.

Трэба зазначыць, што асобныя групы на Беларусі ў працягу данага перыяду не паддаваліся польскаму культурна-нацыянальнаму, рэлігійнаму і сацыяльнаму ўплыву. Завязалася нацыянальна-культурная і нацыянальна-сацыяльная барацьба. У барацьбе гэтай прынялі ўдзел царкоўныя брацтвы і казацтва. Брацтвы ўзялі на сябе заданне быць павадырамі ў барацьбе нацыянальна-культурнай, а казацтва павяло з вялікаю энергіяю нацыянальна-сацыяльную барацьбу. І тая і другая барацьба аслабляла гаспадарства Рэчы Паспалітай і вяла яго да гібелі.

БРАЦТВЫ НА БЕЛАРУСІ

Брацтвы ў сваім далёкім мінулым даходзяць аж да паганскіх часоў, яны маюць свой корань у старажытных звычаях, якія калісь існавалі ў быце рускіх славян. Яшчэ ў часы... паганства ў нашых прародзічаў быў звычай святкаваць свае святы грамадою. На святах спяваліся спевы-малітвы, спевы-падзякі, вадзіліся карагоды, рабіліся ігрышчы. Гэтыя ігрышчы збіралі да сябе жыхароў не толькі аднэй сялібы. Часта, як кажа і летапісец, ігрышчы былі «межю селы». (...)

Калі прыйшло ў Полацкую Русь у свой час хрысціянства, то яно не руйнавала паганства, а проста спаткалася з ім, як з фактам, і пачало паціху зжывацца і зліваццa з ім. З новаю верою да нашага продка прыйшлі новыя нязнаныя дагэтуль багі: Хрыстос, Улас, Ян, Мікола і г. д. Хутка гэтыя багі пачалі зліваццa са старымі, добра вядомымі палаханіну багамі. Тое самае рабілася і са святамі. Святы на пачэсту старых паганскіх багоў пачалі зліваццa з новымі хрысціянскімі святамі. Свята нараджэння Хрыста злілося з святам сонца — каляды, свята Яна — з святам сонца — купалы, свята Іллі — з святам бога маланкі і грому Перуна і г. д. (...) Як і раней, святы павінны былі арганізавацца асобнымі таварыствамі. Гэтыя гурткі-таварыствы пачалі гуртавацца вакол парафіяльнай царквы і палажылі пачатак брацтвам. Брацтвы пачалі клапаціцца аб тым, каб у выдатнейшыя царкоўныя святы з большаю пыхай адбывалася набажэнства і каб усе сябры брацтва ў гэтыя дні былі на сваце. Рабіўся агульны сход усіх братчыкаў, пасля сходу варылася братчына, г. зн. мёд, якім і частаваліся як братчыкі, так і зазваныя на свята госці. (...) Па гарадох у брацтвы часам злучаліся цэхавыя, прафесійныя арганізацыі, якія мелі не толькі рэлігійна-царкоўныя мэты, але і мэты сваёй прафесіі. У Вільні, напрыклад, з вельмі старажытных часоў было кушнерскае брацтва, звязанае з цэхам, які выраблялў і гандляваў футрамі (шкурамі). (...)

Магдэбургскае права беларускіх гарадоў давала шырокія магчымасці для арганізацыі цэхавых брацтваў.

Такія арганізацыі былі і ў Заходняй Еўропе. Усім нам вядомае масонства выйшла з такога прафесійна-царкоўнага таварыства. (...)

З канца XVI веку і асабліва ў XVII стагоддзі брацтвы пачынаюць пашыраць сваю працу, беручы на сябе культурна-асветныя і нацыянальныя заданні. Пашырэнне брацтваў пачалося ўжо з часоў рэфармацыйнага руху на Беларусі. Ім прыйшлося дзеля абароны праваслаўнай веры звярнуць вялікую ўвагу на развіццё навукі, якая б давала грунт для барацьбы з рэфармацыйнымі тэорыямі [3]. За рэфармацыяй прыйшло на Беларусь узмацаванае, адроджанае каталіцтва з езуітамі на чале. Разам з каталіцтвам прыйшоў і нацыянальны польскі ўплыў. Былі ўтвораны дзве вуніі (1569 і 1596 г.), якія накладвалі руку на незалежнасць Беларусі. Перад магнацтвам, незадаволеным злучэннем, і брацтвамі сталі ўрэшце нацыянальна-культурныя і палітычныя заданні. Трэба было абараняць Беларусь як самастойную адзінку з сваім асобным нацыянальна-культурным тварам [4].

Найраней пачынае шырокую працу Львоўскае брацтва. За ім выступае на шлях шырокай грамадзянскай працы Віленскае брацтва. У XVII стагоддзі вядомыя брацтвы ў Магілёве, Воршы, Амсціславе, Слуцку, Менску, Полацку, Віцебску, Шклове, Крычаве і г. д. Найбольш брацтвы працуюць па гарадох, дзе сканцэнтравалася культура і капітал. (...)

Сябрам брацтва, апроч сяброў цэхаў, мог быць усякі дарослы грамадзянін. У склад брацтваў, апроч мяшчан, уваходзілі такім спосабам людзі і другіх станаў. Па вёсках сюды ўваходзіла сялянства. Вельмі часта ў складзе і нават на чале брацтваў стаялі прадстаўнікі літоўска-беларускай магнатэрыі, якая была ў палітычна-рэлігійнай апазіцыі да шляхты польскай і карыстала брацтвы для сваіх незалежніцкіх мэт. (...) Заможнейшыя братчыкі былі апекунамі і рукаводнікамі ніжэйшых элементаў брацтва, якія ад іх залежалі. Маючы на сваім чале апазіцыйную магнатэрыю, брацтвы маглі праз яе рабіць уплыў на сойм, маглі карыстаць з тых правоў, якія давала дзяржава шляхціцам. Шляхціц ці магнат-братчык у Вальным Сойме і на сойміках быў абаронцаю палітычных, нацыянальна-культурных, інтарэсаў братчыкаў, мяшчан і сялян...

З усіх бакоў, як з боку саміх праваслаўных, так і з боку пратэстантаў, мы маем звесткі аб адсутнасці адукацыі і нават бязграматнасці духавенства. Васіль Цяпінскі, вядомы нам перакладчык Евангелля на беларускую мову, гаворыць, што праваслаўныя свяшчэннікі не атрымліваюць аніякай адукацыі і нават не разумеюць славянскай мовы... Брацтвам прыйшлося і наперш ад усяго звярнуць сваю ўвагу на гэты недахват жыццяя. Трэба было даць асвету цёмным пастырам чалавечых душ, каб праз іх трымаць у сваіх руках масы. Для гэтай мэты трэба было ўтвараць школы і друкаваць кнігі. Брацтвы і асобныя братчыкі заснавалі на Беларусі шмат школ і друкарань, якія працавалі ў процівагу каталіцка-польскім школам і друкарням езуітаў [5]. Асабліва многа зрабіў у гэтым кірунку князь Канстанцін Астрожскі [6]. (...) Асобныя братчыкі і цэлыя брацтвы, беручы прыклад з Астрожскага, таксама не шкадавалі коштаў на пашырэнне асветы і адчынялі школы.

Вышэй гаварылася, што даўней на Беларусі быў пашыраны звычай так званага патранату заможных асоб і ўстаноў над цэрквамі і манастырамі. Часта патранат быў у руках такіх асоб і ўстаноў,

якія карысталі з гэтага патранату для сваіх уласных... мэт. Разумецца, такі патранат царква лічыла шкадлівым для сваіх інтарэсаў. Вось брацтвы і пачалі клапаціцца над цэрквамі, манастырамі, брацтвы маглі рабіць вялікі ўплыў на жыццё царквы, а праз яе на шырокія колы грамадзянства. (...) Вядома, напрыклад, што адзін толькі князь Астрожскі быў патронам больш як 600 цэркваў. Патронамі былі і іншыя братчыкі-магнаты з літоўска-беларускай палітычнай апазіцыі... Калі царква ці манастыр не маглі атрымаць такога заможнага і багатага братчыка, як Астрожскі, то апеку над ёю бралі другія парафіяне, якія для гэтай мэты складалі брацтва і ўваходзілі ў сувязь з іншымі брацтвамі. Лік брацтваў усё павялічваўся, шмат людзей з мяшчанскага і нават сялянскага станаў было ўцягнута ў гэтую створаную жыццём арганізацыю. Паміж асобнымі брацтвамі йшлі жывыя зносіны, багацейшыя арганізацыі рабілі матэрыяльную дапамогу бяднейшым. Каб мець большую моц, брацтвы прагнуліся атрымаць ад патрыярхаў так званую стаўрапігіяльнасць. Сутнасць стаўрапігіяльнасці была ў тым, што ўстановы, якія мелі яе, былі непадлеглымі ў адносінах да ўлады епіскапаў. Гэтая непадлегласць давала права вольнай крытыкі епіскапаў, а ў некаторых выпадках — нават права ўмешвацца ў чыннасць епіскапаў. Выдатнейшыя брацт-

Усевалад ІГНАТОЎСКІ

На варце беларускай культуры асталіся «худыя і няслаўныя» класы грамадзянства, якія разам з тым узялі на сябе і сацыяльную апазіцыю.

КАЗАЦТВА НА БЕЛАРУСІ

...Не маючы сілы змагацца з панам, мужык уцякаў ад яго туды, дзе аблогам ляжалі вольныя землі, куды панская дзяржава яшчэ не працягнула сваіх рук,— на поўдзень у шырокія дняпроўскія стэпы. (...) Казацтва, якое злажылася на паўднёвай Украіне [8] Рэчы Паспалітай, атрымала назву ўкраінскага.

Казацтва не ёсць з'явішча, выключна датычнае жыцця Рэчы Паспалітай. (...) Калі казак прыволжскі і донскі абураўся процiў свайго гаспадарства з прычын палітыка-сацыяльных, то казак украінскі, забраўшы ў свой склад беглых мужыкоў і з Беларусі, абураўся з прычын не толькі палітыка-сацыяльных, але і з прычын рэлігійных і нацыянальных [9]. Яма паміж заходнім казаком і гаспадарствам была куды глыбей, чым яма паміж гаспадарствам і ўсходнім казаком. Вось чаму казацкі пратэст на захадзе быў такі моцны, безупынны і крывавы. Казакі не былі зусім аднароднаю масаю. Яны... дзяліліся на дзве групы. Частка перамаглі палякі. (...) Атрымаўшы верх, польскі ўрад стаў рабіць на Украіне свае парадкі. Казакоў пакінулі толькі 6 тысяч, запісаўшы іх у так званыя рэестры, адабралі ад іх самакіраванне, начальнікамі над імі паставілі польскіх паноў. Рэшту казакоў зрабілі зноў мужыкамі. Усё гэтае адбылося ў 1638 годзе.

Толькі 10 гадоў казакі трывалі гэтую няволю. У 1648 годзе яны зноў паднялiся, як адзін чалавек, пад кіраўніцтвам вядомага атамана Багдана Хмяльніцкага. (...) З вялікаю збройнаю сілаю йшоў Хмяльніцкі на помсту ў Польшчу... Насустрач яму былі высланы польскія войскі, каторыя ён разбіў — першы раз пры Жоўтых Водах, другі раз пад Корсунем. Пад Корсунем казакі ўзялі ў палон польскіх гетманаў Каліноўскага і Патоцкага. Гэтыя перамогі Хмяльніцкага адгукнуліся на Беларусі мужыцкім паўстаннем: пад кіраўніцтвам рэестраўцаў мужыкі пачалі паліць панскія двары, біць паноў і зневажаць ксяндзоў. Каб перамагчы Хмяльніцкага, у Польшчы было склікана паспалітае рушэнне. Сабралася 40 тысяч шляхты, за імі йшло каля дзвюхсот тысяч слуг з лёгкім аружжам і цягнуліся панскія вазы і карэты. Рушэнне дайшло да Пілавіц і адсюль уцякло на-

КАРОТКІ НАРЫС

вы, як, напрыклад, Львоўскае і Віленскае, стаўрапігію атрымалі.

У XVII стагоддзі чыннасць брацтваў дайшла да вышэйшай ступені свайго развіцця. Гэта былі моцныя і вельмі багатыя арганізацыі. (...) Лік брацтваў з году ў год павялічваўся, і яны пакрылі тэрыторыю Беларусі даволі густою сеткаю. Пытанні, што ставіліся на агульных сходах брацтваў, датычылі не толькі... унутранага жыцця арганізацыі. Часта тут ставіліся і разглядаліся пытанні, што мелі агульнадзяржаўны і агульнаграмадзянскі характар. Грунтоўнейшым і часцейшым з гэтых пытанняў было пытанне аб абароне праваслаўнай веры і беларускай нацыянальнай культуры, як веры і культуры тых сацыяльных груп, якія былі большасцю ў складзе брацтваў. На пастаноўку і абарону гэтага пытання брацтвы выдзялялі з сябе энергічных, разумнейшых і вучонейшых людзей. Яны часта станавіліся на чале работы ў брацтвах і працавалі словам, пяром і друкарскім станком. (...)

Але барацьба была няроўная. З захаду йшоў не толькі культурны, але і палітыка-сацыяльны ўплыў. У польскі бок пачынае цягнуць... магнацкі клас беларускага грамадзянства, манячыся «вольнымі хрысціянскімі правамі Каруны Польскай», якія даюць ім эканамічную карысць. Палітыка-культурная апазіцыя беларуска-літоўскага магнацтва знікае, бо яна непрактычная для магнатаў. На кожным кроку мы спатыкаемся з такімі здарэннямі, што сыны і ўнукі вядомых магнатаў-братчыкаў ужо пераходзяць у той палітыка-культурны лагер, з якім змагаліся ў ранейшыя часы іх бацькі і дзяды (Астрожскія, Хадкевічы і інш.). (...) Магнацка-шляхецкая беларуская інтэлігенцыя кідае культуру працоўных мас народу, да якога яны належалі, і паварочвае ў польскі бок [7]. іх складалася з людзей (часта нават беглых шляхціцаў і мяшчан), якія на поўдні занялі добрыя землі, пабудаваліся і выдзелілі з сябе казацкую старшыну, якая звычайна пападала ў польскія рэестры [10]. (...) Казацкая маса складалася з беднаты, якая найчасцей не мела ні кала, ні двара. (...)

Казацкія паўстанні процi сацыяльна-эканамічнага, нацыянальнага і рэлігійнага ўціску ў Польскай дзяржаве пачаліся яшчэ з канца XVI стагоддзя. Лепшыя польскія каралі разумелі, якую небяспеку нясуць гаспадарству гэтыя казацкія паўстанні. Апроч таго, у іх магла вынікаць і думка аб тым, каб з дапамогаю казацтва ўзмацніць свае правы ў адносінах да шляхты, якая абмяжоўвала ўладу караля. Так адносіўся да казакоў Уладзіслаў IV (1632—1648). (...)

Ёсць паданне, што аднаго разу казакі прыслалі да Уладзіслава паслоў, каб паскардзіцца на тыя крыўды, якія над імі ўчыняюцца. Кароль, выслухаўшы казацкіх паслоў і не маючы рады абараніць іх парушаныя інтарэсы, быццам сказаў ім: «Вы маеце шаблі, самі абараняйце свае правы». Разумецца, казакі ведалі гэта і без караля, але словы караля толькі падкрэслілі для іх немагчымасць згоднага сужыцця Польшчы з вольным казацтвам. (...)

Казацкія паўстанні на Украіне пачаліся яшчэ з канца XVI стагоддзя. На чале казакоў стаялі атаманы — Касінскі, Лабада і Налівайка. (...) Казакі абралі сабе атамана гетмана Пётру Сагайдачнага, які стаў дзяржаўцам усёй Украіны. Усё гэта... не спадабалася паляком і пры першым здарэнні яны зноў пачалі рабаціць казакоў. Казакі на гэта зноў адказалі паўстаннямі ў пачатку XVII стагоддзя. На чале казакоў стаялі атаманы — Тарас, Паўлюк і Астраніца. Многа гадоў Польшча і Украіна паліліся агнём і заліваліся крывёю. Урэшце, ват не біўшыся з казакамі. (...) Дайшло да таго, што Польшча павінна была прасіць згоды. Згода была зроблена на такіх умовах: 40 тысяч казакоў павінна трымаць Польшча сваім коштам; на Украіну не могуць быць уведзены польскія войскі; праваслаўная вера мае правы пяршынства, і «візівіты» не могуць жыць і адчыняць свае ўстановы на тэрыторыі Украіны; урадавыя пасады аддаюцца выключна толькі праваслаўным; кіеўскі праваслаўны мітрапаліт атрымлівае ў польскай вышэйшай палаце (сенаце) месца, як і каталіцкія біскупы, і г. д.

Такая згода не здаволіла ні польскі ўрад, ні масы казакоў і мужыкоў. Польскі імперыялізм не мог супакоіцца, згубіўшы паўднёвыя тэрыторыі... Мужыкі зноў забурыліся, бо ў Польшчы сіла прыгону не была зменшана. Апроч таго, сярод казакоў з'яўлялася новая дробная шляхта, якая пачала накладаць руку на тых казакоў, якія масаю не ўвайшлі ў склад новай украінскай шляхты. Хмяльніцкі таксама бачыў, што яго палажэнне не моцнае як з боку Польшчы, так і з боку казацкага.

Хутка зноў пачынаецца змаганне Хмяльніцкага з палякамі. Яно цягнецца 4 гады і канчаецца тым, што Хмяльніцкі, шукаючы ратунку ад Польшчы і баючыся абаперціся рашуча на паўстаўшыя нізы, паддаецца пад апеку маскоўскага гаспадара Аляксея Міхайлавіча (1654 г.). Польшча, такім спосабам, сваёй палітыкаю адкінула ад сябе такую багатую тэрыторыю, як Украіна.

Казацкія паўстанні на Украіне маюць адносіны не толькі да гісторыі Украіны, Польшчы і Масквы, але і да гісторыі Беларусі, бо ў складзе ўкраінскага радавога... казацтва [11] быў значны процант казакоў, каторых выгадавала беларуская вёска і выгнала з роднай хаты няволя на Беларусі. Трэба адзначыць, што

паўстанні на Беларусі не мелі той моцы, як на Украіне, бо на Беларусі шмат было шляхецка-польскага элементу: тут увесь час было згуртована шмат польскага войска [12] на выпадак вайны з Масквою...

Усё ж такі казацка-мужыцкія паўстанні на Беларусі былі. Яны ўцягвалі ў рух забітае прыгнечанае сялянства і нізы гарадскога насялення. Лясы і балоты давалі магчымасць паўстанцам гуртавацца і выносіць змаганне з рэгулярнаю польскаю арміяю [13].

Першае казацкае паўстанне на Беларусі стаіць у звязку з паўстаннем Хмяльніцкага. Весткі аб разгроме шляхецкага войска пры Жоўтых Водах і Корсуні дайшлі да цёмных вясковых куткоў Беларусі. Усе, хто не мог зносіць сацыяльна-рэлігійнага і нацыянальнага ўціску, пачалі гуртавацца. На чале першых паўстанцкіх груп стаў Антон Нябаба. Да яго ў хуткім часе пачалі падыходзіць другія паўстанцкія групы. (...) Згуртавалася ўзброеная сіла каля 30 тысяч чалавек. Усё Папрыпяцце запалілася вялікім полымем паўстання. Беларускае сялянства падтрымлівала казакоў харчамі і грамадамі прылучалася да паўстанцаў. Спачувала руху і мяшчанства, якое вельмі часта станавілася на чале яго, маючы на мэце скінуць з сябе ярмо панскага феадалізму. Такія гарады, як Старадуб, Гомель, Лоеў, Брагін і Пінск, адчынілі казацкаму войску свае брамы. Асабліва многа крыві пралілося ў Пінску, дзе паўстанцы выразалі ўсіх шляхціцаў, палякаў, не шкадуючы нават старых, малых і жанок. Вялікія спусташэнні і забойствы былі зроблены паўстанцамі пад Магілёвам, Мсціслаўлем і па другіх гарадох, што прылучыліся да паўстання.

Чуткі аб паўстанні казакоў і мужыкоў разышліся па ўсёй Беларусі і Польшчы. Ніжэйшыя станы, якія спадзяваліся дабіцца лепшай долі, спачувалі ім. Шляхта глядзела на паўстанне са страхам і абурэннем. Як толькі ў Польшчы даведаліся аб казацкім і мужыцкім руху на Беларусі, то ўрад сабраў армію і дапаручыў змаганне з паўстанцамі літоўска-беларускаму гетману Янушу Радзівілу [14]... (...) Наймацней трымаліся казакі ў Пінску. Сюды былі зграмаджаны ўрадавыя войскі; горад быў абложаны... так, што нельга было ні з яго выйсці, ні ў яго ўвайсці. Доўга трымаліся паўстанцы, ведаючы, што літасці над імі не будзе. Урэшце, Пінск быў такі ўзяты прыступам, зруйнаваны і заліты крывёю абаронцаў. Казацкае паўстанне і ў іншых частках Беларусі было задушана, але не надоўга. Праз некалькі месяцаў дайшлі да беларускага мужыка чуткі аб тым, што Хмяльніцкі разбіў польскае шляхецкае войска пад Пілавіцамі. Зноў заварушыўся працоўны люд. (...) Паўстанне пашыралася не толькі па вёсках. Мяшчане, бачачы, што шляхта стаіць ім папярок дарогі, таксама прынялі ўдзел у паўстанні. Паўсталі такія гарады: Слуцк, Быхаў, Чарнобыль, Магілёў, Рэчыца, Мазыр, Бабруйск і інш. Януш Радзівіл, сабраўшы войска, пачаў барацьбу з казацтвам і паўстаўшымі мужыкамі і мяшчанамі. Лічбовая перавага была з паўстанцамі, затое ў іх не было добрай арганізацыі. (...) Хоць і з вялікаю патугаю, але Радзівіл справіўся з паўстаннем. У яго рукі папалі ўсе гарады. Найбольш бараніліся Рэчыца і Мазыр. На чале паўстанцаў Мазыра стаяў казацкі палкоўнік Міхаленка. Некаторыя гарады хоць і здаліся палякам [15], але праз нейкі час зноў падымаліся на барацьбу. Так, напрыклад, падняўся Бабруйск. Мяшчане Бабруйску, бачачы, што для іх няма ўжо ратунку, парашылі здацца на міласць палякаў [16]. Тады правадыры паўстання, на чале якіх стаяў атаман Паддубіч, ведаючы, якія мукі іх чакаюць, заперліся ў сваіх хатах, падпалілі іх і згарэлі там разам з сем'ямі і супрацоўнікамі па паўстанні.

Доўга не мог гетман Радзівіл спыніць паўстанне. Сярод топкіх балот і густых непраходных лясоў Беларусі доўга існавалі вялікія групы паўстаўшых мяшчан, мужыкоў і казакоў. Іх падтрымлівалі тыя мужыкі, якія не выходзілі з вёсак і не гублялі сваёй легальнасці; прысылаў ім дапамогу з суседняй Украіны й Хмяльніцкі. Часта гэтыя групы даходзілі да некалькіх тысяч людзей. Седзячы ў балотах, казакі арганізавалі напады на рэгулярнае польскае войска [17] і рабілі вялікія забойствы па маёнтках ваколічнай шляхты. Але йшоў час, лік казакоў змяншаўся, панская сіла павялічылася, і рух казацкі на Беларусі спыніўся. (...)

К пачатку XVIII стагоддзя Беларусь ужо не пратэстуе [18].

Заканчэнне на стар. 54.

ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

---

[1] У гэтым абзацы У. Ігнатоўскі атаясамлівае нацыянальнае і рэлігійнае. Праваслаўе не ёсць адзнака беларускасці. І ў той час не было. Пратэстант Васіль Цяпінскі і католік Леў Сапега былі не меншымі патрыётамі, чым праваслаўны Афанасій Філіповіч. Падругое, шляхта пераходзіла ў каталіцтва не толькі дзеля эканамічных і палітычных выгад. Люблінская і Берасцейская унія сталі магчымымі пасля таго, як Іван Грозны ўварваўся ў Вялікае Княства. Уздым прапольскіх настрояў у наступным стагоддзі адбываецца ў 1654—1667 гг.— калі рускае войска зноў уварвалася на тэрыторыю Беларусі і Літвы. Па-трэцяе, У. Ігнатоўскі зусім ігнаруе той факт, што амаль 75 працэнтаў беларускага насельніцтва былі грэка-католікамі (уніятамі), што праваслаўных было каля 7 працэнтаў. У тым, што беларуская мова не прапала, трэба думаць, ёсць немалая заслуга уніяцкай царквы, якая, захаваўшы амаль цалкам усходнюю абраднасць, не перайшла на польскую ці лацінскую мовы.

[2] Гэтая пастанова — прамы вынік царскага паходу на Беларусь і Літву 1654—1667 гг.

[3] Рэфармацыя была адной з прычын Берасцейскай уніі. Дзве артадасальныя царквы (праваслаўная і рымска-каталіцкая) злучылі свае намаганні ў барацьбе з пратэстанствам. Здаецца, гэтая думка акадэміка В. Ластоўскага вельмі слушная. Акадэмік У. Ігнатоўскі блізкі да такое высновы.

[4] Далейшы прыклад з Львоўскім брацтвам паказвае, што брацтвы баранілі найперш праваслаўе.

[5] У. Ігнатоўскі не згадвае чамусьці пра уніяцкія суполкі, пра ордэн св. Васіля (базыльянаў), якія друкавалі кнігі на старабеларускай. Адной з прычын заняпаду праваслаўных школ было тое, што ў іх панавала незразумелая простаму народу старабалгарская мова. Вядома таксама, што праваслаўнае духавенства адмовілася друкаваць кнігі ў жывой мове народа, хоць яму прапаноўваў зрабіць гэта беларускі магнат Рыгор Хадкевіч.

[6] Ён даў прытулак Івану Фёдараву, які мусіў уцякаць з Масквы.

[7] Заняпад праваслаўных брацтваў — адзін з вынікаў агрэсіі праваслаўнага цара Аляксея Міхайлавіча ў 1654—1667 гг. Насельніцтва Беларусі скарацілася ўдвая, гарады сталі пустыя.

[8] Слова «ўкраіна» азначала тады «ўскраіна».

[9] Тут трэба помніць, што ад 1569 г. Украіна — па волі тамтэйшай шляхты — стала складоваю часткай Кароны Польскай. Гэтым і тлумачыцца вастрыня канфліктаў паміж украінцамі і палякамі. У Вялікім Княстве, якое адстаяла сваю аўтаномію, землеўладальнікамі і ўрадоўцамі была амаль выключна «свая» шляхта, што змякчала канфлікты. Змякчала канфлікты і тое, што значная частка беларускіх сялян да таго часу стала грэка-католікамі (уніятамі). Далей мы ўбачым, што Хмяльніцкі пасылаў свае атрады на Беларусь. Гэта быў свайго роду «экспарт рэвалюцыі». Разварушыць народ удалося толькі на поўдні і ўсходзе — там, дзе больш было праваслаўных.

[10] Той, хто трапіў у рэестр, карыстаўся правамі шляхціца.

[11] Не толькі радавога.

[12] Гэта не так. Напагатове стаяла літоўска-беларускае войска. Палякі былі занятыя на Украіне. Прычыны аслабленасці канфлікту гл. у пункце 9 заўваг.

[13] Шляхтаю літоўска-беларускаю найперш.

[14] Тут зноў недакладнасць. Польскі ўрад не меў улады ў Вялікім Княстве. Армію накіраваў урад Вялікага Княства, і камандаваў ёю, як бачым, не гетман каронны (польскі), а гетман літоўскі.

[15] Літоўска-беларускаму шляхецкаму войску.

[16] Гл. заўвагу 15.

[17] Гл. заўвагу 15.

[18] У час вайны 1654—1667 г. некаторыя ўсходнія беларускія гарады, як піша М. Доўнар-Запольскі, віталі праваслаўнага цара. Але яны хацелі разам з рэлігійнай свабодай захаваць тыя свабоды, якія давала ім магдэбургскае права. Пабачыўшы, што цар пазбаўляе іх гэтых свабод, гарады выступілі супраць праваслаўнага войска. Не дачакалася палёгкі і сялянства. Вайна гэтая, нагадаю, выклікала прапольскія настроі ў шляхты і масавы пераход яе ў рымска-каталіцкую веру. Абсалютная большасць сялян стала грэка-католікамі (уніятамі).

ШЧЫРА

УРОКІ БУДОЎЛІ НА

Доўга я б'юся над тым, каб расказаць людзям праўду аб будаўніцтве жылля ў зоне стыхійнага бедства ў Арменіі, але дагэтуль усе спробы марныя. Выяўляецца, ніхто ў дзяржаўных інстанцыях не зацікаўлены ў тым, каб прааналізаваць падзеі, якія там здарыліся, і зрабіць якія-небудзь высновы. Ад пракуратуры БССР я атрымаў перадрукаваную адпіску Мінбуда, а ад МУС БССР аніякіх адказаў не атрымаў. Што ж, як гэта ні горка, але даводзіцца лішні раз пераконвацца ў антынароднасці нашай адміністрацыйна-камандnай сістэмы, якую вось ужо пяць перабудовачных гадоў мы беспаспяхова спрабуем пазбавіць улады.

Вядома, патыкаўшыся ў глухую бюракратычную сценку, можна было б махнуць рукою дый «грэсці пад сябе», калі б не ўсведамленне таго, што ім толькі гэтага і трэба, каб усе мы «маўчалі ў анучку», а яны хапалі б зароблeнае намі і насылалі на нас атрады міліцыі з аўчаркамі і дубінкамі, як гэта і было ў беларускім будаўнічым атрадзе ў Кіравакане.

Для мяне важна, што і на Беларусі неабходна шырокамаштабнае будаўніцтва жылля для адсялення сем'яў, якія трапілі ў аварыю пасля Чарнобыля. Як будзе арганізавана гэтая будоўля і якім чынам будуць выкарыстоўвацца выдзеленыя сродкі — вось у чым пытанне!

Расказаць пра ўсё, што было ў Кіравакане, практычна немагчыма. На будоўлях працуюць далёка не лепшыя прадстаўнікі роду чалавечага, ёсць там і раней судзімыя, і асобы з ненармальнымі сем'ямі, і некваліфікаваныя, малапісьменныя «рабацягі». Але агідным з'яўляецца зусім не гэта, а тое, як кіруюць гэтымі людзьмі, як з імі сябе паводзяць, якімі маральнымі прынцыпамі кіруюцца ў вытворчых і пабытовых адносінах іхнія начальнікі. Тут ужо не пра культуру, а пра элементарную подласць, дробнае хабарніцтва, падман і нахрапістае самавольства ідзе гаворка. Будоўля, верагодна, яшчэ адзін падводны рыф нашага складанага перабудовачнага часу, яшчэ адзін нарыў, які павінен неўзабаве прарвацца.

...У Арменіі, куды нас накіравалі на дапамогу, панавала самавольства, пачынаючы з пытанняў аплаты працы і выканання працоўнага заканадаўства ажно да фізічных распраў з рабочымі, якія «правініліся», не кажучы ўжо пра размеркаванне пабытовых выгод і матэрыяльных даброт з сацыяльных фондаў. Грамадскія арганізацыі былі паралізаваныя, юрыдычная дапамога адсутнічала, міліцыя выконвала толькі карныя функцыі супраць рабочых. Гэта пацвярджаецца многімі фактамі, вядомымі і пракуратуры, і Мінбуду рэспублікі.

Любы нармальны чалавек, трапляючы ў гэтае асяроддзе, адчуваў душэўны надлом і альбо з'язджаў, альбо сам рабіўся ўдзельнікам гэтага дзікага, жывога спектакля абсурду. На жаль, «слабы чалавек», а там можна было б зарабіць ажно паўтары тысячы ў месяц.

Вось і цярпелі дзеля заробкаў.

Цяжка вінаваціць у гэтым простых будаўнікоў, але няма і не можа быць прабачэння тым, хто ўзначальваў і хто кантраляваў гэтую будоўлю! Яна нават не на косцях (хоць былі там і трупы), яна на растаптанай маральнасці і здзеку з чалавечае вартасці ўзводзілася.

Але размова пра гэта атрымалася б доўгая і цяжкая, сёння я хачу звярнуць увагу толькі на тое, што можа закрануць непасрэдна выкарыстанне рэсурсаў для будаўніцтва жылля ахвярам Чарнобыля.

Па-першае, тое, што на ўсіх будоўлях краіны крадзеж будаўнічых матэрыялаў квітнее пышным букетам,— ні для кога не сакрэт. Уявіце, што рабілася ў Арменіі, дзе дзесяткі тысяч людзей засталіся без жылля. Аднак за маё дзевяцімесячнае знаходжанне там ніхто са злодзеяў асуджаны не быў. Страты? Вось толькі адзін факт: запрошаны на кантрольны абмер пабудаванага з раскрадзеных матэрыялаў прыватнага дому, галоўны інжынер СК-272 Л. Зубарэвіч вызначыў страты прыкладна ў 45 тысяч рублёў. Сам гэты факт сакрэтам ні для кога не быў, сакрэтныя засталіся толькі вынікі расследавання. Што ж згадваць пра самыя сапраўдныя маёнткі для кіраўнікоў трэста «Белкіраваканбуд» на тэрыторыі піянерлагера ў Шынарары, а тым больш пра вясёлыя паездкі процьмы правяральшчыкаў па экзатычных мясцінах Грузіі і Арменіі, натуральна, за кошт сродкаў, выдзеленых на будаўніцтва жылля.

Другое. Пра тое, што ў будаўніцтве часта прымяняюцца метады казнакрадства шляхам унясення ў плацежныя ведамасці «мёртвых душ», таксама ўсе ведаюць, як ведаюць і пра ліпавыя нарады. Дарэчы, трэба гэта не рабочым, бо яны на здзельшчыне, а тым, хто на акладах. Вядома, метады гэтыя не абышлі і Арменію. Спецыяльна па гэтым пытанні да нас прыязджаў рэвізор з Міністэрства будаўніцтва БССР Белахвосцік. Натуральна, нічога «процізаконнага» ён не выявіў.

ФОНЕ ПЕРАБУДОВЫ

І трэцяе, на маю думку, самае важнае. Усе рабочыя, прыцягнутыя да будаўніцтва ў Арменію, былі туды камандзіраваныя, што давала магчымасць не толькі ігнараваць іхнюю думку, але і проста пазбаўляцца ад няўгодных. У гэтых умовах казаць пра нейкі кантроль за дзейнасцю адміністрацыі з боку працоўнага калектыву проста смешна.

У асноўнай масе людзі працавалі там сумленна і не пакідалі будаўнічыя пляцоўкі іншы раз нават суткамі. І, вядома, змагаліся з несправядлівасцямі ўсімі сіламі. Яшчэ задоўга да таго, як краіну ўзбударажылі шахцёрскія забастоўкі, забаставалі рабочыя беларускага атрада ў Арменіі, патрабуючы навядзення элементарнага парадку. Але неўзабаве ніводнага лідэра забастоўкі ў атрадзе ўжо не было, а адміністрацыя павялічыла штат работнікаў міліцыі, якія выявілі свой імпэт у выкананні даручанай службы 23 ліпеня 1989 года пры масавым лупцаванні ні ў чым не вінаватых будаўнікоў.

У адказ на сварку некалькіх рабочых з міліцыянерамі камандаванне атрада міліцыі выклікала дапамогу з украінскага атрада і кінула сваіх падначаленых на прачэсванне жылога гарадка. Міліцыя ўрывалася ў баракі, ленінскія пакоі і з крыкамі: «Па кубрыках, гады! Сволачы!» — нагамі і дубінкамі біла ўсіх, хто трапляў пад руку.

З СУ-272 пацярпелі прарабы Амялюсік, Марозаў, рабочыя Выдронак, Бабенка, Цімафееў, Сярчэня і многія іншыя. «Зняццю» пабояў упраўляючы трэста № 5 «Белкіраваканбуд» Я. В. Струкачоў не спрыяў, нягледзячы на зварот да яго з такой просьбаю, а доктар знік. Зафіксаваць раненне ўдалося толькі рабочаму Мякішаву, бо ён не змог выйсці на працу з-за пералому двух рэбраў. Ён атрымаў даведку, але яму далі магчымасць паехаць дамоў у каротказрміновы адпачынак. На нашу калектыўную заяву пракурору Кіраваканаадміністрацыя трэста, работнікі пракуратуры і міліцыі адказалі намерам пасадзіць у турму некалькі чалавек за супраціўленне міліцыі. Адзінае, чаго ўдалося дамагчыся, гэта публічнага прабачэння за дзеянні міліцыі палкоўніка МУС, які прыбыў з Мінска. Аднак аб мерах, прынятых да вінаватых, нам так і не паведамілі.

Пасля гэтага скардзіцца на зверскія збіенні некаторых рабочых нападпітку проста няма каму.

Але і гэтыя дзеянні не маглі зламаць энтузіязму «нізоў», і мы спрабавалі нават выбіраць сваіх кіраўнікоў. Але зрабіць гэта нам не дазволілі.

Пералічваць усе факты самавольства кіраўніцтва проста няма сэнсу, бо цяжка згадаць хоць што-небудзь, што рабілася б у адпаведнасці з дзяржаўнымі ці маральнымі законамі, і ў вытворчай, і ў сацыяльнай сферы.

Некалькі высноў. Сістэма прыцягнення рабочых на буйныя будоўлі метадам камандзіравання ад розных арганізацый наўмысна адпрацавана ў нетрах будаўнічых карпарацый з мэтаю прыхаваць факты самавольства і казнакрадства. Бо праз два-тры месяцы склад будаўнічых упраўленняў цалкам абнаўляецца і ніхто нічога «не ведае».

Сумненні замежных лідэраў і грамадскасці ў мэтазгоднасці дапамогі Савецкаму Саюзу, у тым ліку і для ліквідавання вынікаў чарнобыльскай трагедыі на Беларусі, на маю думку, маюць важкія падставы, бо камандна-бюракратычнай сістэме ўсё роўна, якія грошы транжырыць на вецер і хапаць у свае кішэні. Цяперашняя партыйна-гаспадарчая структура зліта ў адно цэлае, і любога, хто крочыць «не ў нагу» з ёю, яна выціскае са сваіх шэрагаў, не грэбуючы пры гэтым ніякімі метадамі. Без кантролю незалежных ад яе асоб давяраць ёй велізарныя матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы нельга ні ў якім разе.

І яшчэ.

Сістэма гэтая зусім не збіраецца здавацца, і абараніць ад яе чалавека проста няма каму, не прадугледжаны ў ёй такія звёны. Што можна было адказаць рабочаму Выдронку на ягоныя надрыўныя крыкі: «За што ж нас білі? Людзі мы ці жывёлы?!»

Гэтая сістэма ўсіх нас знявечыла, некага меней, некага да канца. Нас усіх вучылі нібыта дыялектычнаму матэрыялізму, але стараліся выбіць з мазгоў паняцце пра тое, што жыццё — ёсць барацьба, і за годнае жыццё трэба змагацца. Мы гэтага не ўмеем, і сумленных людзей вытоптваюць з жыцця як пустазелле, тым больш што яны не ўмеюць аб'ядноўвацца ў зграю, каб загрызці свайго працаўніка, як робіць гэта названая сістэма. Няўжо і гарбачоўская перабудова ўвойдзе ў гісторыю толькі як «адліга» перад скочваннем нашае імперыі ў цёмную прорву?

Тыя, хто тонуць, зазвычай топяць свайго выратавальніка, і, здаецца, усе мы ідзём на дно.

Што ж... Ратуйся, хто можа?

Генадзь САХАРАЎ

И. Савченко '90

Савецкі Джэксан

З Уладзімірам Прасняковым мы дамовіліся сустрэцца ў 16 гадзін. Меркавалі, што да гэтага часу закончацца здымкі фрагментаў фільма «Спявае Уладзімір Праснякоў». Але яны закончыліся толькі ў шэсць вечара: Праснякова многае не задавальняла, пераздымалі, па некалькі разоў запісвалі адну і тую ж песню.

І ўсё гэта ішло ўжо некалькі гадзін. Як ён яшчэ стаіць на нагах?! А Валодзя танцаваў — і як!— скакаў, лазіў па вяровачнай лесвіцы... Дзве з паловаю гадзіны ішло без антракту яго выступленне ў 15-тысячным СКК імя Леніна.

Са сцэны яго літаральна прывялі пад рукі. Ён вінавата ўсміхнуўся: «Сёння нам папрацаваць не ўдасца. Давай заўтра, добра?». Але калі я назаўтра прыехаў у комплекс, Праснякоў зноў быў на сцэне — рэпетыцыя.

— Гэта сама меней гадзіны на дзве. Раней са сцэны ён не пойдзе,— сказаў мне Алег Навумавіч Няпомняшчы, дырэктар групы. Пакуль Валодзя рэпеціруе, размаўляю з яго «менеджэрам»:

— Так атрымалася, я ўсё жыццё з «зоркамі». Быў галоўным адміністратарам у Алы Пугачовай, працаваў з Сафіяй Ратару... Працаваць з Прасняковым я рашыўся не адразу. Ён мне падабаўся як спявак, ён страшэнна таленавіты... Але я яго вывучаў як чалавека. Першае ўражанне ад яго можа быць такое: капрызлівая зорка, вельмі забяспечаны малады чалавек. Але ў ім няма меркантыльнасці, азлобленасці, зайздрасці. Ён не церпіць хлусні. Калі я зразумеў гэта, то прыняў рашэнне.

Ён сам сябе прыдумаў. Яго шлях на сцэну не быў лёгкі. Усё было — і неразуменне: «Чаму спявае фальцэтам?», не прымалі і яго раскаванасці ў паводзінах, адзежы...

— Цяжка працаваць з Валодзем?

— Увогуле працаваць з зоркаю складана. Трэба жыць жыццём зоркі. Я мушу ведаць, што ён еў, як сябе пачувае, якія адносіны з групаю, як ён спаў, нарэшце. Ім цікавяцца многія замежныя фірмы. І я мушу быць у курсе ўсяго. Ад яго самаадчування, настрою і жадання працаваць залежыць якасць канцэртаў.

У Ленінградзе мы атрымалі такія водгукі: «Найвышэйшы прафесіяналізм, высокае мастацтва, эстрада з вялікае літары». Усё гэта дзякуючы працаздольнасці Праснякова. Вядома, адчуваецца ўплыў і ўрокаў Алы Барысаўны.

Ледзь Праснякоў, закончыўшы рэпетыцыю, спусціўся са сцэны, як яго з усіх бакоў «узялі ў ціскі»: папулярны вядучы музычных праграм ленінградскага тэлебачання Дзіма Спіцын са сваёй камандаю, малады, але ўжо вядомы паэт з вершамі, фатограф з просьбамі... Алег Навумавіч прыняў на сябе іхнія атакі, даўшы мне магчымасць спакойна пагаварыць з Уладзімірам.

— Валодзя, перад канцэртам ты адпачываеш на чорных прасцінах. Чаму?

— Можна, я гэта пакіну пры сабе? Ты гарбату будзеш піць?

— Ты завёў сабе ахоўнікаў. У гэтым і праўда ёсць неабходнасць?

— Цяпер з'явілася. Ведаеш, экзальтаваныя прыхільніцы гатовыя разарваць на шматкі, вар'яткі нейкія, нават камень могуць у мяне кінуць. Былі ўжо выпадкі.

— ТАСС паводле вынікаў хіт-парадаў 1988 года паставіў цябе на свой музычны Алімп побач з Пугачовай і Лявонцьевым. Але яны ішлі да сваёй славы доўга... А ў цябе ўсё з паўабароту: аншлагі, папулярнасць.

— Ты памыляешся. Была процьма праблем, як у кожнага нармальнага чалавека. «Зрэзалі» ў Юрмале, на ЦТ не пускалі, казалі: «Гэта не савецкія спевы». Усё было. У мяне нават тэорыя нарадзілася: пасля імклівага, «выбуховага» поспеху,— ну, напрыклад, спеў шлягер і назаўтра прачынаешся зоркаю,— дык вось, пасля такога поспеху зазвычай пачынаецца рух уніз. А калі рост паступовы, поспех будзе больш трывалы.

— У прэсе шмат пісалі пра ваш трыумф з Алай Пугачовай у Амерыцы.

— Прымалі выдатна, хаця першы мой канцэрт быў няўдалы. Выконваючы песню «Чорны кот», я выйшаў на сцэну ў ролі хулігана, стылягі. Амерыканцы не зразумелі і падумалі, што я імі пагарджаю. А потым усё было адмыслова.

— Там табе прапанавалі запісаць пласцінку?

— Мы падпісалі кантракт з адной фірмаю тэрмінам на 5 гадоў на мае выступленні, гастролі па амерыканскім кантыненце, у Японіі. У Лос-Анжэлесе я запішу свой дыск. Хоць, напэўна, хацелася б больш выступаць у нашай краіне. У Амерыцы цяжка чым-небудзь здзівіць.

— Што цябе больш за ўсё ўразіла ў Амерыцы?

— Адносіны паміж людзьмі.

— Тваё тэатралізаванае шоу — гэта спроба стварыць на эстраднай сцэне спектакль паводле законаў тэатральнай драмы?

— Практыка паказала: да гэтага мы яшчэ не дараслі. Наша публіка ўспрымае толькі тэксты песень і практычна не зважае на мелодыю, аранжыроўкі, сола на гітары. У Амерыцы пасля кожнага віртуознага сола, складаных галасавых пасажаў — апладысменты. Наша публіка гэтага не заўважае.

Тут, у Ленінградзе, я зрабіў памылку, дазволіўшы «стаячы» партэр. Вядома, людзям хочацца патанцаваць, але ўжо і сэнс песень да іх не даходзіць. Прыйшлося многае «апусціць» з праграмы.

— Нават перад канцэртам ты рэпеціруеш кожны дзень па 2—3 гадзіны. Навошта? І так усё адладжана, вельмі прафесійна.

— Канцэрт для мяне — гэта жыццё. Я нараджаюся ў пачатку канцэрта і паміраю ў канцы. Каб пражыць гэтыя дзве з паловаю гадзіны на ўзлёце, трэба страшэнна шмат працаваць.

— Вялікая папулярнасць стварае процьму праблем?

— Ведаеш, гэта і шчасце, і трагедыя адначасна. Жыць цяжка, але інакш я ўжо не магу. Сёння я не магу спакойна прайсці па вуліцы, схадзіць у кіно, палазіць па дахах... Вось і целаахоўнікаў, якія цябе так зацікавілі, прыйшлося завесці.

— Як звычайна праходзіць твой дзень?

— Па-рознаму... Але заўсёды пачынаецца з пытання: «Дзе б паесці?» У гасцініцах, рэстаранах непрыкметна гэта зрабіць не ўдаецца. У Ленінградзе хоць з гэтым няма праблем. У рэстаране «Пулкаўскі» афіцыянтам працуе мой сябра. Удзень заўсёды рэпетыцыі і, галоўнае, увечары канцэрт.

— Ты не крыўдуеш, калі цябе называюць «савецкім Майклам Джэксанам»?

— Не, я люблю танцаваць. У мяне свой стыль, і калі ён нагадвае ў нечым манеру Джэксана — нічога ў гэтым не бачу благога. Гэта было б неразумна адмаўляць. І потым, у нас у краіне любяць пастаянна некага называць іншым.

— Валодзя, нашы чытачы хвалююцца: Хрысціна Арбакайтэ стала тваёй жонкаю? Я задаю гэтае пытанне толькі таму, што ў прэсе багата пісалі пра тваю дружбу з дачкою Алы Пугачовай.

— Я зразумеў. Усё, што звязана з Хрысцінаю, для мяне — святое. Гэта адзінае, што ў мяне ёсць і чым

STELMASHENOK SERGEY '90

я вельмі-вельмі даражу. Таму я хачу пакінуць гэта ў сабе і нічога не казаць. Пра мяне і так ужо ўсё ведаюць. Нават тое, якія ў мяне шрамы і якія трусы я нашу. Тыя, каму хочацца, каб я быў жанаты з Хрысцінаю, няхай думаюць, што яна мая жонка. Тыя, каму гэтага не хочацца, няхай так не думаюць. На гэты конт — ніякіх удакладненняў.

(Найбольш уведлівым прыхільніцам Праснякова паведамляю: Хрысціна па-ранейшаму носіць на лацкане курткі значок з Валодзевым партрэтам.)

— Што ты больш за ўсё цэніш у жыцці?

— Сяброў! Я жыву і ўсё раблю для іх.

— У адным інтэрв'ю год назад ты казаў: «Я баюся ўсіх гэтых патрэбных знаёмстваў, дзелавых кантактаў, багатых дамоў, людзей з сувязямі. Паспрабую абысціся без іх». Як, атрымалася?

— Атрымалася. Мне ніхто не дапамагаў. Я ніколі нічога ні ў кога не прасіў. Сам прыйшоў да поспеху, і так будзе заўсёды.

— Валодзя, колькі ты атрымліваеш за канцэрт?

— Не ведаю. Мая фірма — тэатр песні — вырашае, каму колькі заплаціць. Але мы не кааператыў, таму атрымліваем разы ў тры менеі. Грошы мне не патрэбныя. З-за грошай страчваеш сяброў. Ужо было такое. Мне хапае на жыццё, на тое, каб купіць штаны, паесці. Я хачу працаваць і не думаць пра грошы.

— Сёння поспех, авацыі, кветкі, а што далей?..

— Гэтае пытанне я задаю сабе апошнім часам. Раней я неяк не задумваўся. Але цяпер адкрываю ў сваёй натуры шмат новага, нечаканага. Гэта радуе. Напрыклад, я ніколі не думаў, што ўмею гуляць у більярд. Ніколі не гуляў. Нядаўна паспрабаваў — атрымалася.

А ўвогуле я хацеў бы быць бацькам. І яшчэ — адкрыць у нашай краіне горад дзяцінства, нешта накшталт Дыснейлэнда. Усё магчымае я дзеля гэтага зраблю.

Інтэрв'ю браў
Сяргей ШЭШЫН.

СУМНЫЯ, ІРАНІЧНЫЯ І СУР'ЁЗНЫЯ НАТАТКІ АБ 2-М УСЕС

І ДОЖДЖ ЗМЫВАЕ

Вольга КРАЎЧАНКА

«Зноў свята ў нашым доме!» Не памятаю, дзе я пачула гэты выраз, але ён вельмі добра падыходзіць да ліпеньскіх падзей у Віцебску, калі на фестываль польскай песні з'ехаліся «зоркі» польскай і савецкай эстрады, замежныя госці, аматары польскай песні, тэлебачанне... І закруцілася кола...

Як вядома, сэрца фестывалю — гэта прэс-цэнтр, куды сыходзіцца не толькі афіцыйная, але і неафіцыйная інфармацыя. Толькі з'явішся, а табе адразу што-небудзь новенькае падняcуць. Напрыклад: у Летнім амфітэатры рабочыя выпадкова ўпусцілі паветраны шар (ці, як па-навуковаму кажуць, мангальф'ер). Дырэкцыя год яго шукала, заплаціла вялікія грошы, а ён, «несвядомы», знік разам з рэкламай у паветры. Добра, хоць з сабой нікога не прыхапіў...

Альбо такая гісторыя: Уладзіслава Баркоўская з Літвы даволі катэгарычна выказала свае адносіны да адмовы прыбалтаў удзельнічаць у фестывалі: узяла ды прыехала. Мужная дзяўчына, згодны! «Смеласць трэба падтрымаць»,— вырашыла журы, і Уладзіслава апынулася сярод канкурсантаў. А тут раптам тэлебачанне схамянулася, што не можа асвятліць залу, таму ні рэкламы на шчытах разглядзець, ні настрой людзей паказаць...

Але, нягледзячы ні на што, фестываль пачаўся, і нават непагадзь нікога не спалохала. Віцябчане — народ загартаваны, трывалы: схаваліся пад парасоны, захуталіся ў плашчы і...

«У вас, здаецца, дожджык пайшоў!»— спрабуе жартаваць польскі вядучы Багуслаў Сабчук. Крыўдна, што гэта быў адзіны жарт нашых вядучых. Бо часам зала проста сумавала, як гэта адбылося на вечары беларускай эстрады, які быў падобны больш на ўрадавы канцэрт. Да таго ж «зоркі» нашы дэманстравалі сваё мастацтва пад фанаграму. «Фанера!»— крычалі ў зале, але на гэта ніхто не рэагаваў. Хто ведае, можа ў будучым гэты фестываль увойдзе ў гісторыю музычнага жыцця як першы «фанерны» фестываль рэспублікі. А пакуль, як заўважыў намеснік міністра культуры БССР У. П. Рылатка, «усё залежыць ад духоўнасці і этыкі самога выканаўцы, а глядач хай сам вырашае, як яму ставіцца да артыста».

Самымі «духоўнымі» ў гэтых адносінах на фестывалі былі канкурсанты. Усе 26 салістаў і

І ДОЖДЖ ЗМЫВАЕ ЎСЕ СЛЯДЫ

ЮЗНЫМ ФЕСТЫВАЛІ ПОЛЬСКАЙ ПЕСНІ

10 ансамбляў працавалі без фанаграмы і працавалі па меры сваіх магчымасцей. Вось толькі магчымасці былі сціплыя. І гэта, перш за ўсё, тычыцца нашых ансамбляў. Таму зразумела, чаму польскія журналісты на пытанне, якая група запомнілася асабліва, адказалі: «Любэ» — вось тыпова руская група (што «Любэ» была госцем фестывалю, спадзяюся, зразумелі).

А журы прыйшлося паламаць галаву, бо, як вядома, нават мноства нулёў у суме нічога не дае. Вынікі гэтай гіганцкай работы былі ашаламляльныя. Трэцяе месца, напрыклад, атрымала група «Львавяне» толькі за тое, што дзве экстравагантныя салісткі ансамбля даволі рытмічна тупалі на сцэне і на ўсю моц крычалі ў залу, што «każdu swego pana ma» («Кожны мае свайго пана»).

Што рабіць! «Когда нету гербовой, пишут на простой».

Такім чынам, што мне запомнілася на конкурсе, акрамя дажджу?

Пластычны Фаік Агаеў з Азербайджана (лаўрэат трэцяй прэміі) за некалькі хвілін выступлення паказаў міні-спектакль: з'яўляўся на сцэне і са свечкай у руках, і разам з прыгажунямі, якія кружыліся вакол яго ва ўсходнім танцы.

Лаўрэатамі другой прэміі сталі Вікторыя Наскова з Віцебска, студэнтка музычнага вучылішча, і Алена Лукашэнка, выкладчык дзіцячай музычнай школы ў Пінску. Увогуле, Алене не пашанцавала: паспрабуй выступіць пасля «Атас! Да здравствует рабочий класс!» Але Алена паказала, што ў яе не толькі добры голас, але і моцныя нервы.

Калі да гледачоў выбягаў Валерый Цуркан, то нібыта цень Лявонцьева мільгаў па сцэне. Гэта, відаць, і пакарыла журы. Але ж мне таксама здалося, што Цуркан быў адным з лепшых сярод салістаў. Ну а пэўнае перайманне Лявонцьева! Дык гэта ўсё ж такі лепей, чым быць эпігонам Віктара Вуячыча.

У мяне адбылася кароткая размова з містэрам гран-пры:

— Я вельмі шмат працую,— гаворыць Валера.— Іншы раз даю па два, тры канцэрты. Няма часу ні сям'ёй абзавесціся, ні кватэру атрымаць. Але я «стралец» — так што пасля 27, як абяцае гараскоп, у мяне будзе ўсё...

Іншы раз гараскоп не хлусіць, так што, на ўсялякі выпадак, запомніце Валерыя Цуркана... І Наталлю Патапенка з львоўскага ансамбля «Дністраны» — у яе моцны, а галоўнае, своеасаблівы голас, і яна таксама стала лаўрэатам першай прэміі.

І трэба зноў паспачуваць журы. Засядалі і дзень, і ноч, з парламенцкім тэмпераментам вырашалі, хто лепшы: Алена Кузьміна альбо Карынэ Амбарцумян. Абедзве спяваюць джаз, абедзве прыгажуні. Эх, калі б гэта быў конкурс прыгажосці! Памералі б аб'ём клубоў і пастанавілі. А тут зайшлі ў тупік. І дзве чароўныя дзяўчыны паехалі з Віцебска ў рангу лаўрэатаў. Але гэта ўсё дэталі. Былі і агульныя праблемы.

У мінулым годзе ў рэдакцыю «Крыніцы» пасля публікацый артыкула пра І-ы фестываль польскай песні прыйшло шмат лістоў. Адны лічылі, што гэта справа патрэбная, неабходная для ўмацавання сяброўскіх адносін з Польшчай, другія абураліся: «Яны разбураюць нашы помнікі, разбіваюць пасольствы, а мы будзем іх песні спяваць!». Між іншым, так разважаюць многія камерцыйныя дырэктары прадпрыемстваў-спонсараў, таму сёння дамаўляцца з імі больш складана. А што будзе заўтра? І ці патрэбны фестываль увогуле? Так што я пайшла да адказных асоб па інтэрв'ю не з простай цікаўнасці. Гаварылі шмат, але самы істотны дыялог адбыўся з панам Міхалам Ягелам, намеснікам міністра культуры і мастацтва Рэспублікі Польшча.

Размову з ім глядзіце на старонцы 37.

Фота Яўгена КОКТЫША

ЎСЕ СЛЯДЫ

АПАНЕНТЫ І АПАЛАГЕТЫ РОКУ

Неяк быў на дыхтоўнай імпрэзе «Інтэр-поп-шоу» ў Мінску, дык свядомасць чамусьці пастаянна вяртала мяне адтуль у пачатак 80-х, калі не было гэтай дыхтоўнасці, піратэхнікі, светлавых эфектаў, дый увогуле добрай апаратуры, але ўвага канцэнтравалася выключна на канцэрце, выключна на музыцы. А сама ж гэтая музыка — рок — лічылася тады страшэннай крамолаю, і канцэрты часцей за ўсё праходзілі, мякка кажучы, неафіцыйна.

«Няўжо перанасычэнне?» — падумае нехта.

Ды якое там перанасычэнне: сапраўднага року цяпер не болей, чым тады. А рок-сцэну завалілі масавым рок-таварам.

Памятаю, быў у нас, журналістаў — прыхільнікаў року, у пачатку 80-х важкі контраргумент супраць ягоных крытыканаў: чаму навучыць танная эстрада з яе «тремя колонками в двести ватт, что о любви моей кричат», у той час як рок — гэта шлях ад простага да складанага, на якім ёсць і палымяная публіцыстыка, і мастацкае асэнсаванне з'яў жыцця. Дый з дзвюх формаў успрымання музыкі — спажыванне або асэнсаванне — мы праз рок намагаліся прапагандаваць другую.

І вось менавіта на тым «Інтэр-поп-шоу» раптам прыйшла думка: «За што змагаліся?»

Публіка дзіка лямантавала ў аднолькавай захопленасці ад сацыяльных дзідаў «Ронда», ад танных, сяк-так скляпаных шлягераў Газманавых, ад вострых... пустэлек «Чорнай кавы».

Падумалася: «Ці не лепшае гэта сведчанне марнасці спадзяванняў на тое, што мастацтва выратуе свет? У мастацтве, як і ў камерцыі, усё больш перамагае не ўнутраны змест, а якасная знешняя ўпакоўка».

Зрэшты, такая сітуацыя — толькі вынік. А ў чым прычына?

Давайце пачытаем нашу музычную крытыку: большасць «папулярных» артыкулаў пра сімфанічную музыку пераконваюць, што яна лепшая за рок, бо не грыміць, спрыяе добраму душэўнаму настрою. Гутаркі пра рок-музыку нярэдка абмяжоўваюцца развагамі пра веданне або няведанне нот, пра пісьменнасць і прафесіяналізм.

Я не супраць пісьменнасці, не супраць прафесіяналізму. Гэта ўсё добра. Але мы ж пра мастацтва разважаем!

А гэтак жа і куфаль піва спрыяе добраму душэўнаму настрою, і інструкцыя па карыстанні прасам можа дэманстраваць ідэальную пісьменнасць. Дык хіба мастацтва не вышэйшая катэгорыя, каб яго аналізаваць на падставе тых самых катэгорый?

Вось і тлумачэнне даўнім развагам пра тое, чаму нават добрыя ўзоры мастацтва і зацікаўленая публіка не гарантуюць яшчэ дыялогу паміж імі. Проста адсутнічае сувязное звяно — сапраўдная крытыка, а не тая, якая апусцілася да ідэалізацыі знешняй формы і яе ўплываў, а не зместу і ўплываў духоўнасці.

І мастацтва памерла.

Спачатку ў формах масавай культуры, а потым...

Не, не памерла і ў масавай...

Фестываль «На Доўгім Бродзе». Большага балагану, бадай, не адшукаеш. І кантынгент — паспрабуй разбярыся ў гэтым «доўгім збродзе»: збой за збоем ідзе, памылка за памылкаю.

І вось на сцэне — нікому не вядомы «Магічны крышталь» з Рэчыцы. Не падумайце, што аб'яўляю адразу неверагоднае адкрыццё. Тут таксама былі памылкі, збоі. Але менавіта тут я зразумеў, чаго не хапала на «Інтэр-поп-шоу»: тут музыканты выходзілі на сцэну не майстэрства (якога яшчэ няма) дэманстраваць, а вынесці на суд людзей свае развагі, параіцца з імі. А тое, што ім ёсць што сказаць, што іхняя творчасць не ў штудзіраванні акордаў, а ў мысленні, пацвярджае і мова, з якой яны выходзяць на дыялог: нашая зганьбаваная, «нікому не патрэбная» родная беларуская мова.

Зрэшты, не ў мове справа. Хутчэй, у шчырасці. А яшчэ ў адчуванні жыццёвага подыху пэўнай культуры і ўжывання ў яе. Калі ёсць гэта, прыйдуць і майстэрства, і прафесіяналізм.

На жаль, у нас багата якія крытыкі сабаку з'елі на пільнаванні прафесіяналізму, а пра духоўнасць проста забываюць. Выходзіць, тое, што ўзнаўляецца шляхам пэўнага цыклу практыкаванняў, становіцца даражэйшым за непаўторны цуд, дадзены духам,— талент.

Памятаю, у рэдагаваны мной музычны выпуск «Нотны аркуш» у газеце «Чырвоная змена» малады журналіст Усевалад Крамушчанка прынёс артыкул пра рок-гурт

«Мроя». Быў студзень 1987 года, калектыў тады яшчэ мала хто ведаў, дый пасля двухгадовай службы ў арміі ён ніяк не мог наладзіць удалы канцэрт. Але У. Крамушчанка прапаноўваў нам не рэестр поспехаў, а развагі аб важкім духоўным патэнцыяле таго, што пачуў на адным з правальных канцэртаў «Мроі». І мы артыкул апублікавалі.

І вось тады мяне літаральна збянтэжыла рэакцыя нашага вядомага крытыка рок-музыкі Зм. Падбярэзскага, які таксама нярэдка друкаваўся ў «Нотным аркушы». Ён сказаў: «Навошта вы лажаеце

сваю газету?» Потым у нас са Зміцерам дайшло і да вастрэйшых спрэчак у друку наконт «неперспектыўнай», як яму здавалася, каманды. Але пераканаў калегу не я, а сама «Мроя», якая хутка «дабрала» тое, чаго ёй не хапала на сцэне, і яе духоўны патэнцыял выбухнуў.

А паспрабуй дабяры духоўнасці віртуозны «Фарпост»? Паспрабуй з амплуа выдатнага пацяшальніка перасяліцца ў сэрца свайго слухача?

Хацеў бы звярнуць увагу яшчэ на адзін цікавы аспект.

Возьмем тры беларускія (і беларускамоўныя) гурты: «Мроя», «Уліс», «Рэй».

«Мроя» і «Уліс» вельмі розныя паводле стылістыкі (цяжкавагавы стод-рок і напружана-нервовая, інтрыгуючая хваля), але яны з задавальненнем робяць сумесныя канцэрты. Самі музыкі «Уліса» (самай тэхнічнай беларускай каманды) з павагай ставяцца да музыкаў «Мроі» (хуліганаў беларускай рок-сцэны). Тым часам «Мроя» адмаўляецца выступаць з роднасным цяжкарокавым «Рэем», з якім «Уліс» увогуле не кантактуе.

Калі глядзець толькі на знешнія прыкметы (стылістыка, прафесіяналізм), дык сітуацыя застаецца для нас невытлумачальнай. А калі паглыбімся ў духоўны свет музыкаў?

Сяржук Краўчанка з «Уліса» неяк сказаў:

— Рок — гэта спосаб жыцця. Нам не па дарозе з тымі, хто толькі грае рок дзеля публікі. З «Мрояй» мы робім агульную справу.

Ад сябе дадам, што гэта і мая справа жыцця — Беларусь. Цераз рок таксама.

Запытаеце: а няўжо «Рэй» тут чужы?

Не сказаў бы апрыёрна, але такое ўражанне, што «Рэй» удала далучыўся да нас і нашых аднадумцаў, ён дапамагае нам у нашай справе, але ягонай справаю гэта не стала. Прыгадаем 1989 год, калі гурт мяняў аднаго за адным гітарыстаў, вакалістаў, менеджэраў, мову... Так-так, з цалкам беларускамоўнага станавіўся цалкам рускамоўным і нават цалкам англамоўным. Праўда, усё ж вярнуўся ў родную стыхію, і ягоны магнітафонны альбом «Каб не стылі душы» не менш папулярны сярод адраджэнскай моладзі, чым мроеўскі «Зрок», напрыклад.

Бадай, гэта якраз тая сітуацыя, дзе і патрабуецца пільнасць крытыкі. Трэба не адстойваць ці ганьбаваць пэўныя калектывы або нават напрамкі музыкі, а думаць, разважаць, аналізаваць пэўную з'яву, бо з'явы мастацтва ёсць адбіткі з'яў жыцця.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА

На здымках: Аляксандр Саладуха. «Мроя».
Сяржук Сокалаў-Воюш.

Фота Яўгена КОКТЫША, Уладзіміра ПАНАДЫ і Цімура ГРЫБА

ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ

І ДОЖДЖ ЗМЫВАЕ ЎСЕ СЛЯДЫ

РАЗМОВА З ПАНАМ МІХАЛАМ ЯГЕЛАМ

— Трэці раз я прыехаў на Беларусь, бо асабіста надаю вельмі істотнае значэнне гэтым кантактам. Мы жывем побач, таму ў Польшчы ёсць беларусы, а на Беларусі жывуць палякі. Трэба прызнаць, што ў вашай краіне не ўсе задаволены гэтым фестывалем. Ёсць людзі, якія лічаць, што гэта свайго роду паланізацыя. Я баюся, што калі эліта польскай і беларускай інтэлігенцыі не знойдзе агульнай мовы, не сядзе за круглы стол, каб пагутарыць абсалютна пра ўсё з найбольшай шчырасцю, дык неўзабаве можа нарадзіцца канфліктная сітуацыя.

Кажу гэта таму, што менавіта цяпер, калі вы больш упэўнена можаце вырашаць уласны лёс, калі адчуваецца такая прага культывацыі беларускай мовы, дзяржаўнай незалежнасці, было б няшчасцем і для вас, і для нас, калі б на паверхню вырваўся нейкі антыпольскі комплекс.

— У Віцебску падпісана дамова аб культурным супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Польшча і Беларуссю. Ці з'яўляецца падпісанне дамовы пераходам ад слоў да справы?

— Сённяшнія нашы кантакты вызначае дэідэалагізацыя. Тут няма ніякіх прэамбул, няма спасылак на «рашэнні з'ездаў партыі». Гэта проста спроба фіксацыі таго, што павінна быць рэалізавана ў галіне культуры дзвюма рэспублікамі на дзяржаўным узроўні.

— Мы ведаем, што лёс Віцебскага фестывалю ў многім залежыць ад таго, ці будзе праводзіцца фестываль у Зялёнай Гуры.

— На маю думку, фестываль у Зялёнай Гуры праводзіць неабходна. Пра гэта гаворыцца ў дамове, якая была падпісана паміж Польшчай і СССР. Незалежна ад таго, што ў нашай краіне змяніўся ўрад, мы не здымаем з сябе адказнасці. Новаму ўраду вельмі важна захаваць сяброўскія адносіны паміж суседзямі.

Разумею, што сур'ёзнае інтэрв'ю кантрастуе з лёгкім, часам не вельмі высокапрафесійным узроўнем фестывалю. Але што зробіш, калі сёння песні і жыццёвыя праблемы, плёткі і палітыка так цесна перапляліся, што іх немагчыма падзяліць...

Скончыўся фестываль. Ад'язджаюць апошнія ўдзельнікі. Да ад'езду я вырашыла яшчэ раз наведаць Летні амфітэатр.

Зноў ішоў дождж. Драўляныя лаўкі нудліва пабліскваліў прыцемках. І ўжо нічога не нагадвала пра фестываль, акрамя таго ж дажджу. Але ў мяне раптам падняўся настрой. Добра, калі ёсць свята. Нават калі яно і такое...

B.B. King




КРЫЖНЯ
POGHUK

На Уздзеншчыне, на маляўнічым беразе ціхага Нёмана ёсць куток, які быў некалі месцам паломніцтва тысяч людзей. Тут у мінулым стагоддзі жыў і працаваў таленавіты беларускі прыродазнавец Наркевіч-Едка, імя якога ведаў вучоны свет. Так, гэта было калісьці. Але час мінуў. Засталася толькі памяць чалавечая ды некалькі паўразбураных пабудоў. Бачыць гэта і думаць пра тое, што мы не ўмеем захоўваць нашае багацце. Вось дзе ўжо праўда: што маем, не захоўваем, страціўшы — плачам.

Спецыялісты, аматары старасвеччыны, ведаюць, што на тэрыторыі Міншчыны знаходзіцца больш як 4 тысячы помнікаў. Гэта амаль трэцяя частка гісторыка-культурнага багацця рэспублікі. Больш за 3 тысячы з іх ахоўваецца дзяржавай. Хіба што зусім абыякавага чалавека пакіне раўнадушным архітэктурная своеасаблівасць адноўленых у апошнія гады Спаса-Прэабражэнскай царквы ў Заслаўі ці былога касцёла ў Раўбічах. Многія мінчане атрымалі магчымасць слухаць арганную музыку пад скляпеннямі касцёла св. Роха. Адметнасцю сталіцы стала Траецкае прадмесце. Хутка, мы спадзяёмся, загучаць мелодыі Баха, Моцарта, Вівальдзі ў Вілейскім Доме мастацтваў. Адрэстаўравана Слуцкая брама — помнік XVIII стагоддзя ў Нясвіжы. За мінулае дзесяцігоддзе адрэстаўлены 198 новых помнікаў на брацкіх магілах воінаў, партызанаў і падпольшчыкаў, больш як 500 стэл і абелісказ рэканструяваныя і замененыя. Разгарнулася праца па захаванні нацыянальных святынь — знакамітых гісторыка-культурных ансамбляў у Нясвіжы і Заслаўі.

Але будзем аб'ектыўныя. Падстаў для неспакою яшчэ хапае. Многія каштоўнейшыя помнікі дагэтуль маюць варты жалю выгляд, амаль трэць збудаванняў, асабліва твораў драўлянага дойлідства, патрабуюць рамонту. Асобныя з іх не маюць ахоўнага статусу, безнаглядныя. Напрыклад, са 168 былых культавых устаноў 96 увогуле не выкарыстоўваюцца. Не лепшым чынам выглядаюць і палацава-паркавыя комплексы, і шэраг грамадзянскіх будынкаў, няпростая сітуацыя склалася і з помнікамі археалогіі. А колькі яшчэ помнікаў гісторыі, асабліва ваеннае мінуўшчыны, сёння безыменныя?

Нягледзячы на 12-гадовую жыццядзейнасць закона «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры», за апошняе дзесяцігоддзе знішчана нямала гісторыка-культурных каштоўнасцей. Прывяду толькі некалькі прыкладаў. Увесну 1986 года пад прэтэкстам упарадкавання зямель знесены могільнік — помнік археалогіі раннеславянскага перыяду ў в. Скарынічы Мінскага раёна. Не ўратаваў яго нават ахоўны знак. «Мінская праўда» ўжо пісала пра тое, што падобны лёс спасціг увосень 1987 года курганы эпохі Старажытнай Русі каля в. Даўжаны на мяжы Мінскага і Валожынскага раёнаў. Праз недагляд і некампетэнтнасць выканкома Красненскага сельсавета былі дапушчаны грубыя парушэнні пры рэканструкцыі помніка на брацкай магіле ў в. Краснае Маладзечанскага раёна: знішчаны высечаныя на мемарыяльнай пліце прозвішчы загінуўшых. Праз нядбайнасць арандатараў (у прыватнасці, вытворчага аб'яднання «Белрэстаўрацыя») да трывожнага стану быў даведзены помнік XIX ст.— сядзіба «Белае лецішча».

Ці пакараны «недасведчаныя» віноўнікі, па загадзе якіх нажамі бульдозераў выварочваліся спарахнелыя астанкі нашых продкаў, утоптвалася ў нябыт наша гісторыя? Дзе там! Выяўляецца, заканадаўства, закліканае стаяць на ахове духоўнае памяці народа, тут недасканалае і бяссільнае.

Нескладаныя разлікі паказваюць: каб захаваць гісторыка-культурную спадчыну ў цяперашнім яе стане, інакш кажучы, прадухіліць фізічнае разбурэнне прыроднай сты-

хіяй і ажыццявіць своечасова рэстаўрацыю помнікаў, рэспубліцы патрэбна прыкладна 500 мільёнаў рублёў і дзесяціразовае павелічэнне магутнасцей вытворчага аб'яднання «Белрэстаўрацыя». Пакуль што дзяржава выдзяляе бюджэтных асігнаванняў на год больш за шэсць мільёнаў, прадугледжваючы надалей павялічыць аб'ём асваення толькі ў 1,5—2 разы. Калі рэальна супаставіць пажаданае з магчымым, то ў бачнай перспектыве многае з нацыянальнае спадчыны загіне.

Дзе выйсце? Некаму гэта здасца банальным, але пачынаць трэба са змены наяўнай структуры і стварэння адзінай сістэмы кіравання аховай гісторыка-культурнае спадчыны на чале з рэспубліканскім камітэтам і гасразліковымі інспекцыямі ў абласцях. Гаворка ідзе не пра «буйнамаштабную» адміністрацыю альбо службу, што налічвае, як у Вялікабрытаніі, да тысячы работнікаў, а пра цэнтральны орган з дзесяткам высокакваліфікаваных спецыялістаў і развітай сістэмаю фінансавання, вядома, пры росце долі сродкаў з дзяржаўнага бюджэту на выкананне самых тэрміновых кансервацыйных работ. Сёння такая мадэль аўтаномнага органа кіравання знаходзіць найбольшую падтрымку ў краінах Заходняй Еўропы, напрыклад, у Галандыі, некаторых землях ФРГ. І не таму, што гэта модна, а з-за неадкладнасці, якой вымагае рашэнне ўсіх наяўных праблем. Такі орган можа быць і ў структуры Міністэрства культуры БССР. І тут, лічу, варты ўвагі вопыт Літвы, дзе пры Міністэрстве культуры створаны і паспяхова працуе навукова-метадычны савет па ахове помнікаў, у штаце якога археолагі, архітэктары, гісторыкі — усяго 12 спецыялістаў.

Калі гаварыць пра эканамічны рэгулятар, то, на маю думку, варта неадкладна правесці экспертную ацэнку, каб дакладна вызначыць гістарычную і архітэктурна-мастацкую каштоўнасць кожнага архітэктурнага помніка. Тады, у сваю чаргу, будзе прасцей вылічыць іх балансавы кошт і нарэшце ўстанавіць стаўкі арэнднай платы для тых прадпрыемстваў або ўстаноў, якія іх арандуюць. Перамовы аб неабходнасці такой ацэнкі, адпаведнага ўрадавага рашэння надта ўжо зацягнуліся. Прадбачу пярэчанні: маўляў, справа няпростая. Але ў цяперашніх умовах яна жыццёва неабходная. Мяркуйце самі. Калі развязаць гэты клубок, мы зможам без перашкод перадаць нерухомыя помнікі на баланс дзяржаўным органам — упраўленням культуры, нават толькі таму, што ў іх з'явіцца эканамічны рычаг. Бо арэндная плата — гэта тая дадатковая крыніца грашовых сродкаў, якіх цяпер так адчувальна не хапае на рэстаўрацыйную справу.

А так што атрымліваецца? Арганізацыя займае будынак, які ўяўляе сабою гістарычную і архітэктурную каштоўнасць, і плаціць мізэрныя сумы за метраж. А дзяржава шукае сродкі на яго рамонт і рэстаўрацыю. На жаль, такі спрошчаны падыход пазбаўляе ўладальніка пачуцця сапраўднага гаспадара. Узяць хоць бы той жа паважаны Саюз кінематаграфістаў БССР. За многія гады арэнды помніка — касцёла Сымона і Алены — маглі б адлічыць грашовыя сродкі на рэстаўрацыю «роднага» дома. Тады сотні тысяч рублёў з дзяржбюджэту, расходаваныя на рэканструкцыю Дома кіно, можна было б выдзеліць на аднаўленне любога іншага помніка, які не мае гаспадара. І, вядома, уладальніку павінна быць гарантавана права на атрыманне крэдытаў і выдзяленне яму асігнаванняў.

Больш таго, пры такой пастаноўцы справы з'яўляецца магчымасць для стварэння гасразліковай інспекцыі. Ёсць такі вопыт у г. Ленінградзе і вобласці. Не заглыбляючыся ў дэталі, скажу, што асноўнай яе функцыяй можа стаць кантроль за станам помнікаў, за ходам рэстаўрацыі, за выкананнем рэжымаў забудовы ахоўных зон і г. д.

Бясспрэчна, патрэбна ацэнка помнікам архітэктуры і археалогіі. У Літве, напрыклад, з гэтай мэтаю прыняты вельмі важны для юрыдычнай аховы помнікаў дакумент — «Правілы ацэнкі археалагічных помнікаў». Адсутнасць такога акта ў нас дазваляе спакойна жыць разбуральнікам. А нашыя суседзі, напрыклад, за разбурэнне квадратнага метра могільніка плацяць па 50 рублёў штрафу, гарадзішча — 100 рублёў, кургана —5 тысяч рублёў. Атрыманыя штрафы ідуць на даследаванні і магчымае аднаўленне помнікаў.

Улічваючы абмежаваную магутнасць аб'яднання «Белрэстаўрацыя» і павялічаны аб'ём работ, нам трэба смялей разгортваць фарміраванне студэнцкіх атрадаў, асабліва маладзёжных брыгад па рамонце і тэрміновай кансервацыі помнікаў. Такія думкі ўзніклі ў мяне пры нядаўнім наведванні пасёлка Першамайск, што на той самай Уздзеншчыне. Есць там ужо часткова разбураны помнік архітэктуры перыяду Рэнесансу. Глядзеў на паўразбураныя муры, на падгнілы дзіравы дах і думаў: нaўрад ці яму наканавана дачакацца рэстаўратараў. Пры нашай непаваротлівасці, недахопе рабочых рук, сродкаў. Аднак не пакідаць жа помнік без даху пад адкрытым небам да лепшых часоў. Па логіцы, выйсце абавязаны знайсці мясцовыя Саветы. І выпадак такі не адзінкавы, калі павінны, але не шукаюць. Скажам шчыра, яны пакуль мала выяўляюць ініцыятывы ў арганізацыі тых самых кааператываў па рэстаўрацыі, гасразліковых майстэрняў, часам з-за адсутнасці будаўнічых матэрыялаў, механізмаў, цяжкага фінансавага становішча, але нярэдка з прычыны пэўнай інертнасці. Так, трэба прызнаць, «астаткавы прынцып» у адносінах да культуры ўсё яшчэ жыве. Таму, калі весці размову пра стварэнне мясцовага грашовага фонду на рэстаўрацыю, то тут дарэчы паставіць настойліва пытанне аб адлічэнні даходаў турысцкімі прадпрыемствамі ў бюджэт выканкомаў, па тэрыторыі якіх праходзяць экскурсійныя маршруты. Вось тады ў мясцовых органаў відавочна павысіцца зацікаўленасць і адказнасць за лёс гістарычнае ці культурнае рэліквіі.

Вядома, у справе выратавання унікальных нацыянальных помнікаў без грамадскай ініцыятывы не абысціся. У апошнія гады рост палітычнай, нацыянальнай і культурнай самасвядомасці ў краіне даў першыя парасткі патрыятычнага парыву, асабліва ў моладзі. Нямала высакародных пачынанняў ёсць і ў нас у рэспубліцы, вобласці. Арганізуюцца зборы калектыўных узносаў, уносяцца індывідуальныя ўклады, адкрываюцца спецыяльныя фонды для пабудовы новых помнікаў. Мы ведаем мноства прыкладаў бескарыслівай працы тысяч мінчукоў, студэнтаў, рабочых калектываў, якія выйшлі на суботнікі па рэстаўрацыі Траецкага прадмесця. Заслугоўвае і сёння ўсялякай падтрымкі ініцыятыва калектыву навукова-вытворчага аб'яднання «Інтэграл» аб правядзенні сёлета шасці суботнікаў, па рэгенерацыі аднаго з найбольш старажытных куткоў сталіцы — Верхняга горада. Але гэта толькі пачатак. Хацелася б верыць, што ў недалёкай будучыні масавы грамадскі рух па захаванні помнікаў разгорнецца паўсюдна. Словам, работа ўсім знойдзецца. Аб'ектамі для аднаўлення могуць быць і Верхні горад, і дом Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў в. Малая Люцінка Валожынскага раёна, і музей паўстання 1863—1864 гг. у в. Плябань. Ці вазьміце, напрыклад, памятныя мясціны гістарычных бітваў на Міншчыне ў Айчынную вайну 1812 года, дзе ў недалёкай перспектыве маглі б прайсці турысцкія маршруты. Няхай народныя сродкі будуць нават нязначныя, але гэтая справа набудзе статус народнае значнасці, шчырае праявы нацыянальных пачуццяў.

Не менш важны спосаб уратавання безнаглядных твораў архітэктуры — перадача помнікаў не толькі рупліваму гаспадару — арандатару, але і ва ўласнасць прадпрыемству, установе, інакш кажучы, уладальніку, які змог бы неадкладна выканаць комплекс рамонтна-рэстаўрацыйных работ. Для тых, хто па «штатным абавязку» далучаны да лёсаў помнікаў, пытанне не новае. Аднак, на жаль, «думаем» пра гэта шмат, а жыццё настойліва патрабуе ад нас больш энергічных, калі хочаце, рашучых дзеянняў, да таго ж яшчэ і разумнага падыходу ў выбары ўласніка помніка, аддаючы ўсё-такі перавагу ўстановам культуры. Таму гэтую задачу — а зыходзіць трэба з актуальнай эканамічнай сітуацыі — неабходна ўзвесці ў ранг першачарговых, бо фарсіраваць паўмерамі вечную праблему захавання помнікаў — значыць загубіць справу, пакінуць урэшце па-за полем зроку дзесяткі найкаштоўнейшых рэліквій.

Сёння наспела патрэба ў радыкальнай перабудове дзейнасці таварыстваў аховы помнікаў усіх узроўняў, іх пярвічных арганізацый. Думаецца, тут трэба пачаць перш за ўсё з перагляду складу прэзідыума Рэспубліканскага Савета, маючы на ўвазе яго фарміраванне толькі з грамадскасці, інакш кажучы, прадстаўнікоў навукі і культуры, моладзі — словам, з тых, хто даражыць духоўнай спадчынаю. Не выключаю магчымасці абрання старшынямі прэзідыумаў энтузіястаў аховы помнікаў з ліку навуковай і творчай інтэлігенцыі, спецыялістаў, як гэта зрабіла таварыства ў Мінску. Ахоўная палітыка рэальна вылучае для абмеркавання і такое пытанне, як ступень незалежнасці інспектара Таварыства ад мясцовых органаў. І, вядома, галоўнае — асноўным прынцыпам у дзейнасці Таварыства павінна стаць самакіраванне і добраахвотнасць. Будзем шчырыя, ва ўмовах дэмакратыі і галоснасці працаваць па-ранейшаму, калі дамінаваў «валавы» падыход, час ужо ніяк не дазволіць.

Цяпер у вобласці закончана распрацоўка доўгатэрміновай мэтавай праграмы «Спадчына», у якой вызначаны комплекс мер па глыбокім вывучэнні гістарычнае праўды, нацыянальнае культурнае спадчыны, яе захаванне і памнажэнне. Напярадзе вялікая праца. І таму менавіта цяпер, як ніколі, усім нам важна памятаць словы Р. Гамзатава: «...хто стрэліць у мінулае з пісталета, у таго будучыня стрэліць з гарматы».

Фота Алега БЕЛАВУСАВА

Пра камерцыйную хвалю, хлопчыкаў-прастытутак і згубленыя ідэалы мінулага

Ігар Гукоўскі

Амаль адначасна на экраны кінатэатраў выйшлі два фільмы з удзелам папулярнага па выніках апытання часопіса «Советский экран» акцёра 1989 года Дзмітрыя Харацьяна. Першы — «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя». Другі — «Пысачка». Абодва фільмы — тыпова камерцыйныя, і Харацьян, калі ўлічыць большасць ягоных папярэдніх работ (асабліва «Гардэмарыны, наперад!»), стаў не толькі ўлюбёнцам гледачоў, але і надзейна захапіў лідэрства ў кінематографе пацяшальнага плана. Тут я ўгледжваю непасрэдную ўзаемасувязь. У апошнія два-тры гады адбылася рэзкая камерсіялізацыя кінамастацтва і, адпаведна, пераарыентацыя гледача з сур'ёзнага жанру на лёгкі, а паколькі Харацьян апынуўся на вяршыні хвалі, яму і аддадзены галасы чытачоў нават такога, здавалася б, прэстыжнага, аўтарытэтнага і, як ні круці, сур'ёзнага выдання, як «Советский экран».

Можна глянуць шырэй і знайсці аналагі гэтаму працэсу ў іншых сферах масавай культуры, напрыклад, у рок-музыцы. Хто змагаецца цяпер за верхнія радкі ў хіт-парадах? Жэня Белавусаў, Дзіма Малікаў і іншыя выканаўцы пацяшальнага накірунку, эстрадныя матылькі.

Гэта ўсё баявыя карпусы камерцыйнай арміі, якая адзіным фронтам пачала атаку на нас, радавых гледачоў, слухачоў, чытачоў. У аматараў мастацтва старое гвардыі ёсць абарончы сродак: крытэрыі, сфарміраваныя эпохай застою, якая, пры ўсіх цяперашніх на яе нападках,

«Дзе мастацтва, якое ачышчае душу дабром? Рэжысёры нашы заняліся пераважна пацяшальнымі жанрамі, і ніхто не хоча зразумець, што гэта не магістральны шлях мастацтва. Што нельга забывацца пра яркую асобу на сцэне, экране, што трэба лячыць людзей верай».

Я. ЛЯВОНАЎ

(«Советский экран», № 1, 1990 г.)

трэба прызнаць, выхавала гледача, здольнага думаць і адрозніваць зерне ад мякіны. У маладога пакалення, якое толькі ўступае ў жыццё, такога абарончага сродку няма, і атручаныя кулі перабудовачнага кінематографа трапляюць у цэль надзейна.

Прызнаюся, гады тры назад зачаткі айчыннага камерцыйнага кіно не маглі не радаваць мяне. І на самай справе, час быў запоўніць гэтую прагаліну ў нашым мастацтве кіно. І я, як, напэўна, большасць кінагледачоў, неабыякавых да лёсу айчыннага кінематографа, разлічваў на тое, што, нарэшце, побач з сур'ёзнымі, праблемнымі, складанымі сацыяльна-псіхалагічнымі і філасофскімі работамі, на экранах дадуць месца дыхтоўнаму пацяшальнаму кіно. Прайшоў час, і можна зрабіць несуцяшальную выснову: надзеі гэтыя, на жаль, не спраўдзіліся.

Па-першае, за апошнія гады амаль не ствараліся сур'ёзных фільмаў (прымем такую трохі ўмоўную тэрміналогію — І. Г.), а сярод тых, што створаны, шэдэўраў, дальбог, нягуста. Ну што прыходзіць на памяць? «Пакаянне», «Слуга»... Усё? Возьмем рэпертуар мінскіх кінатэатраў першае паловы мая і ўбачым спрэс засілле камерцыйнага кіно: «Белая косць», «Пысачка», «Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя», «Ідэальнае злачынства», «Крымінальны квартэт», «Сувенір пракурору», «Панове авантурысты», «Мой муж — іншапланецянін»... Пералічваць можна яшчэ доўга. А калі гэты спіс прадоўжыць імпартнай прадукцыяй?.. Дадатак будзе важкі. Я цяпер гавару не пра якасны ўзровень, ён, вядома, розны. Гаворка пра іншае: пра дыктат пацяшальнага кіно, якое выцесніла сур'ёзныя жанры. А калі ўлічыць, што для прыкладу мы ўзялі пройгрышны для камерцыйнага кіно час (пачатак мая: свята 1 Мая, Дзень Перамогі — экраны кінатэатраў па традыцыі аддаюцца ваенна-патрыятычным кінастужкам), становіцца відавочным зрух у бок лёгкага жанру.

Па-другое, не спраўдзіліся надзеі і на разнастайнасць пацяшальнага кіно. Ствараецца ўражанне, што ўсе кінастудыі і гасразліковыя творчыя аб'яднанні ў справе выбару тэм дзейнічаюць нібыта па камандзе. Спачатку нам прапанавалі букет з «Маленькай Веры» і «Інтэрдзяўчынкі». Цяпер нам прапаноўваюць новае спалучэнне «кветачак», вырашчаных у аранжэрэях вынаходлівых кінематаграфістаў новага пакалення, якія думаюць перш за ўсё аб пракатным поспеху сваіх дзетак, што «паважаюць і любяць гледача», як адзначана ў рэкламнай афішы да кінафільма «Пысачка». Ну, наконт таго, чаго ў іх болей, любові да гледачоў ці заклапочанасці сваімі прыбыткамі, у мяне свая досыць пэўная думка. Надта ўжо непатрабавальная гэтая любоў, зусім як у герояў іхніх кінакарцін. Раней нам у дружным парыве дэманстравалі прастытутак-жанчын. Цяпер як па камандзе з'яўляецца новы герой — прастытутка-мужчына, прычым, па традыцыі не ў адным фільме, а адразу ў двух, і, трэба думаць, па той жа традыцыі неўзабаве іх будзе нашмат болей: тэма, пачатая ствараль нікамі «Фуфла» і «Пысачкі», як паказвае пракат, выйгрышная і можа ўзбагаціць яшчэ не адну творчую групу. Тэму гэтую можна будзе распрацоўваць як залатаносную жылу, пакуль не вычарпаюцца яе каштоўныя запасы ці не будзе знойдзена новае радовішча.

Таленавітыя акцёры, чый талент варты лепшага выкарыстання, не атрымліваючы іншых запрашэнняў, ахвотна здымаюцца ў падобных «кінашэдэўрах» з пацяшальнае абоймы. А што застаецца рабіць, не заставацца ж без працы. Вось і ў «Пысачцы» нават невялікія ролі аддадзены такім майстрам экрана, як Лія Ахеджакава, Галіна Польскіх і Леанід Кураўлёў. У «Прыватным дэтэктыве...» зноў нагадвае пра сябе паўзабыты ўжо Спартак Мішулін. Але даю галаву на адсячэнне, ніводны з названых акцёраў не назаве сярод любімых роляў свае апошнія работы. Прычына не ў зніжэнні прафесіяналізму акцёраў ці іх патрабавальнасці да сябе, а ў агульным зніжэнні планкі патрабаванняў да кіно. Так што ў гэтай сітуацыі чакаць ад іх большага было б проста наіўна.

Іншая справа Дзмітрый Харацьян, які сыграў галоўныя ролі ў абодвух фільмах, выбраны рэжысёрамі флагманам пацяшальнага кіно. Яму ўжо, здавалася, тут поўная прастора, усе ўмовы самавыявіцца. Але, выяўляецца, і камерцыйнае кіно патрабуе сур'ёзнага да сябе стаўлення. Харацьян здымаўся адначасна і ў «Прыватным дэтэктыве...», і ў «Пысачцы». Пафарбаваны ў белы колер для першага фільма, ён нават не стаў перафарбоўваць валасы для другога. Дэталь, можа, і неістотная, але дужа паказальная, бо, пачынаючы са знешнасці і заканчваючы ўнутранай сутнасцю, якая агаляе сябе ў жэстах, у выразе вачэй, самых, здавалася б, няўлоўных дэталях, Харацьян у абодвух фільмах амаль аднолькавы. Ён зусім не імкнецца індывідуалізаваць сваіх герояў, людзей вельмі розных і непадобных, і іграе іх нібыта па адных і тых самых нотах. Магчыма, яму проста не ўдалося іх індывідуалізаваць з-за тых тэмпаў, у якіх праходзілі здымкі: «Пысачку» ж, напрыклад, зляпілі ўсяго за два-тры месяцы.

Ад такога «галопу па Еўропе» фільм прайграў не меней, чым нерэалізаваныя здольнасці артыстаў. Такое адчуванне, што сцэнарый да канца не прадуманы. Так, напрыклад, не атрымала завяршэння сюжэтная лінія ўзаемаадносін герояў Ахеджакавай і Кураўлёва. Аўтары нібыта не ведалі, што з ёй рабіць далей, і вырашылі проста абсячы. Тое ж самае фінал фільма: прыйшоў час закругляцца і на экране з'явілася слова «канец».

Не хачу катэгарычна адносіць «Пысачку» да няўдалых работ. У параўнанні са сваім братам «Фуфло», дзе таксама дзейнічае мужчына-прастытутка, ён зроблены без падманлівых прэтэнзій на элітарнасць і глыбокі псіхалагізм. У ім няма сексуальных сцэн, якія мяжуюць з «чарнухаю», няма імкнення сканцэнтраваць усю ўвагу на поўнай нікчэмнасці, якая прадстаўлена як нешта татальнае ў нашым жыцці. У прынцыпе, пры больш сур'ёзным і нетаропкім стаўленні да працы мог бы атрымацца нядрэнны эратычны фільм, як гэта і задумвалася ягонымі ствараль нікамі. Асабіста я ад таленавітае творчае групы чакаў большага, не выключаючы і творчы патэнцыял аднаго з найцікавейшых акцёраў сённяшняга дня Дзмітрыя Харацьяна. Як на маю думку, дык у ранейшых сваіх работах, нават у юнацкіх («Розыгрыш», «Зялёны фургон») ён больш арганічна «ладзіў» са сваімі героямі.

А па вялікім рахунку стаўленне да кіно, у тым ліку да камерцыйнага, трэба мяняць. Не думаю, што ў гэтым нам вельмі дапамагаюць «карціны», пазбаўленыя сантыментаў, павучэнняў і нуднага маралізатарства, створаныя прафесіяналамі, якія «паважаюць і любяць гледача». Не дапамагаюць. І атручаныя кулі па-ранейшаму ляцяць у глыбока «любімага» гледача, прабіваючы навылёт, вядома, у першую чаргу моладзь. Гэтыя кулі ў лепшым разе дзейнічаюць як снатворнае, бо паток, «пазбаўлены сантыментаў», нацэлены на ўскрыццё самага нікчэмнага ў нашым жыцці, і толькі на гэта («Фуфло»), прытупляе боль, дзейнічае наркатычна. Агаляючы перад намі ўсё негатыўнае, немагчыма паказаць, наколькі яно дрэннае, як немагчыма ўбачыць чорную кропку на чорным аркушы паперы. А ў горшым разе гэтыя кулі дзейнічаюць як атрута, уплываюць на свядомасць маладых людзей і прымушаюць глядзець на свет праз прызму тых сумніцельных маральных крытэрыяў, па якіх жывуць інтэрдзяўчынкі і суперхлопчыкі, цяперашнія героі айчынных кінаэкранаў, бо вакуум, створаны на месцы таропка разбураных ідэалаў мінулага, нечым усё такі запаўняецца.



ЗЯМЛЯ БЕЗ ВОЛІ

II. ГАСПАДАРКА І ГАСПАДАР

Леанід ЕКЕЛЬ

Пасля неміласэрнага дажджу, які бязбожна паліваў усё жывое і нежывое, раптам выглянула сонца. Нібыта жахнуўшыся з таго, што неба вырабіла з зямлёю, разам з ветрам прынялося яно за працу. І вось зніклі некуды, расталі шэрыя, набрынялыя вільгаццю камякі ваты, што так шчыльна каторы ўжо дзень сцягвалі неба. Падсохлі палі і дарогі. І насталі дні надзіва цёплыя й ясныя. У такую пару добра трапіць на лясную паляну, дзе так файна назіраць ды слухаць: як кружляюць у паветры лісты, як недзе за пералескам ракоча трактар, як удалечыні перагукваюцца грыбнікі.

Празрыстая сінеча, спакой і сцішанасць уваходзяць у душу, як у лёгкія — паветра. І светла ад усяго гэтага, і шкада нечага. Але вось нечакана вынырне з-за краю лесу запознены жураўліны клін, і штосьці здрыганецца ўсярэдзіне. І нясцерпнае жаданне рухацца, адчуваць хуткасць сарве з месца, таропка вывядзе на дарогу...

АДНОЙЧЫ ПОЗНЯЙ ВОСЕННЮ

У адзін з такіх цудоўных дзён позняе восені я ехаў у калгас «Чырвоная змена». Ад шчодрага сонца ды чырвані лістоты ў аўтобусе было неяк асабліва ўтульна. Пачувалася ў дарозе лёгка, і яна зусім не здавалася вымушанай неабходнасцю. Хоць неабходнасць такая, вядома, была...

Нашаму брату журналісту няма нічога больш прыкрага, крыўднага, няўдзячнага, як пісаць пра чалавека, пра якога ўжо пісана-перапісана. Гэта ўсё роўна што ісці па ўбраным полі і збіраць каласкі, радуючыся ім гэтаксама ж, як і вялікаму ўраджаю. Кузьма Іванавіч Шаплыка, старшыня калгаса «Чырвоная змена», Герой Сацыялістычнай Працы — якраз той самы чалавек, пра якога прынята казаць: «Ягонае імя не сыходзіць з газетных палос». І, дальбог, ёсць за што. Аднак сутнасць не ў гэтым. І зусім не жаданне напісаць чарговую ўхвальную оду прывяло мяне ў знакаміты калгас на Любаншчыне, а унікальнасць сітуацыі. Амаль паўстагоддзя Шаплыка ўзначальвае «Чырвоную змену». І ўсе гэтыя гады калгас нязменна быў і ёсць сярод лепшых у рэспубліцы. Якую ж трэба выпрацаваць тактыку, як весці гаспадарку, каб не вылецець з сядла і не ўдарыць тварам у гразь? Не страціць давер людзей і не запляміць сваё імя. Што рухае гэтым чалавекам і дзе знаходзіць ён сілы?

Толькі шчырасць і давер далі б адказы на гэтыя зусім не простыя пытанні. Але ці мог я разлічваць на такое сяброўскае стаўленне да мяне чалавека, з якім ніколі не быў знаёмы? Безумоўна, не. Я суцяшаў сябе надзеяй, што галоснасць, якая ўзняла забаронныя шлюзы, адчыніла сакрэтныя замкі змрочных сейфаў, можа асвятліць і самыя патаемныя куткі чалавечае душы. Выклікаць з яе скарбонак думкі, што столькі часу заставаліся незапатрабаваныя...

За працоўным сталом Кузьма Іванавіч сядзеў неяк бачком, нібыта ўсім выглядам сваім падкрэсліваў, што не ён тут гаспадар, а кожны, хто пераступае парог кабінета старшыні. Спакойны сялянскі твар, сівыя валасы. Строгі касцюм добра прыстае да хударлявае, стройнае фігуры. Гледзячы на яго, ніколі не падумаеш, што старшыні даўно ўжо пераваліла за семдзесят...

Гаворыць ціха. Слухае ўважліва. І ўсё-такі я з нецярпеннем чакаў прапановы аб'ехаць гаспадарку: характар старшыні раскрываецца не ў ягоным кабінеце. Колькі разоў назіраў, як няветлівыя (на першы погляд), затузаныя старшыні, што неўпапад адказваюць на пытанні, імгненна ператвараліся ў гаваркіх, цікавых суразмоўцаў, варта было ім адно вырвацца на прастору са сваіх цесных кабінетаў-клетак. Але чаканні мае спачатку не спраўдзіліся. Вось ужо больш як гадзіну кружляем мы то па асфальце, то па гравійцы, то па прасёлках — ад фермы да фермы, ад вёскі да іншае. Аднак Кузьма Іванавіч не робіцца больш гаваркі. Хіба што зрэдку скажа: «Вось гэтую вёску лічылі неперспектыўнай. А мы — дамы паставілі,

Заканчэнне.
Пачатак на стар. 8.

Афармленне Сяргея СТЭЛЬМАШОНКА

лазню ды клуб, дарогу праклалі. Жыве вёска!» Альбо: «А гэтую ферму, калі будавалі комплекс, павінны былі ліквідаваць. А мы — і комплекс збудавалі, і ферму захавалі. Жыве ферма!» І столькі стрыманае радасці ды гонару чулася ў гэтых словах: «Жыве вёска! Жыве ферма!»,— што няцяжка было зразумець, аб чым баліць ягоная галава найбольш.

Спрадвеку мужык, ставячы і нават паставіўшы ўжо новую хату, ніколі не разбураў старой. Ей заўсёды знойдзецца месца ў гаспадарцы — такая жыццёвая мудрасць. Але хіба можа генеральная лінія ўлічваць нейкую там жыццёвую мудрасць? Ніколі! На тое ж яна і генеральная. Яна — ад мужыцкіх генералаў, а не ад мужыкоў...

«Якой жа цаною ўдалося адстаяць сваё, Кузьма Іванавіч?»— хацелася запытацца мне ў старшыні. Але я не спяшаўся з пытаннямі.

У Рэдкавічах, роднай вёсцы старшыні, спыніліся ля Дому культуры. Па сутнасці — гэта сапраўдны Палац. А ўжо пра Палац у Сарочах і казаць не прыходзіцца: асобая гэта тэма.

— Зазірнём?.. Паглядзім, як кааператары робяць рамонт.

— Кааператары?

— Але. Пяць чалавек з Салігорска. Трое, праўда, на іншым аб'екце. Працуюць як след.

Праўду кажа Кузьма Іванавіч. На такую працу глянуць — адна любата. І якасна, і прыгожа. Вядома, ёсць у гэтых людзей непасрэдная зацікаўленасць. Але ёсць і іншая неадменная ўмова, без якой усялякая творчасць — пусты гук. Ніхто не вісіць у іх над душою, ніхто не дыктуе загады. А без волі не можа быць і гаспадара на зямлі. Дый ніхто гэтую зямлю сваёй лічыць не будзе...

Мы вярталіся ў Сарочы, і сонца ўслед за намі паволі апускалася за далягляд. На бураковым полі сялянкі, акружыўшы груду буракоў, зразалі бацвінне. Заўсміхаліся, адказаўшы на прывітанне Кузьмы Іванавіча, а потым, перапыняючы адна адну, загаманілі пра сваё. Некага падводзіць транспарт, і буракі на ўчастку ляжаць пад адкрытым небам. Удараць маразы — і канец буракам. Некага хвалююць расцэнкі. А нехта і са сваім асабістым — зранку трапіць да старшыні не заўсёды можна. На кожнае пытанне — грунтоўны адказ. І людзі адчувалі сябе спакойна ды ўпэўнена.

— Учора быў у Мінску на гаспадарчым актыве. Да нас адна просьба: болей мяса ды малака. Хто ж накорміць народ, як не мы, сяляне?..

Слухаюць сялянкі моўчкі, згодна ківаюць. Рукі, патрэсканыя ад працы, з вяроўкамі вен... Гэтае «болей», «болей» даўно праела ім душу. Ды хіба ж іхняя віна, што ад калгаснага «болей», здабытага неверагодна цяжкай працаю, не становіцца болей прадуктаў у магазінах? Нібыта правальваюцца вынікі іхняй працы ў бяздонную прорву...

— А, можа, раздадзім зямлю калгаснікам? Хто колькі пажадае. І няхай кожны гаспадарыць па-свойму,— нечакана прапануе Шаплыка.

— Бог з вамі, Кузьма Іванавіч! Мы з калгаса — нікуды! І старшыні нам іншага не трэба.

Едзем далей. Старшыня маўчыць. Усміхаецца нечаму свайму. Адчуваю, што нездарма спытаўся ён у сялянак аб зямлі. І ці не дзеля мяне прагучала гэтае пытанне?..

— Ну, а калі сур'ёзна, Кузьма Іванавіч, фермер — гэта хоць у якойсьці ступені ўратаванне, ці чарговая памылка?

— Я б так пытанне не ставіў. Сельская гаспадарка — не поле цудаў. Чараўнікам ды прарокам прадуктовага звышбагацця тут рабіць няма чаго. Калі не ведаеш магчымасцей кожнага гектара і кожнай галіны гаспадаркі, калі табе што ні чалавек, дык цёмны лес, калі чаканні ды «віды» на ўраджай, мяса, малако не маюць практычнага ды навуковага абгрунтавання, то на зямлі ты сляпы і глухі. Толькі паслядоўны рух ад вітка да вітка ўсіх галін, а не асобна ўзятай у шкоду іншым, дадуць урэшце жаданыя вынікі. Забяспечаць стабільнасць.

Мы звыкла паўтараем, што ў прыродзе ўсё ўзаемазвязана. А ў сельскай гаспадарцы — гэта не проста ўзаемасувязь, а хутчэй — замкнёнае кола. Паспрабуй атрымаць мяса ці малако, не маючы ўдосталь кармоў. А як можна разлічваць на высокія ўраджаі, калі ў зямлю не ўнеслі гной? Хімія тут не ўратуе. Зрэшты, усё гэта — найпрасцейшыя ісціны.

Дык вось, пра фермерства. Гэта заканамерная з'ява. І калі б стала яна масавая ды натуральная, мажліва, і адрадзіўся б гаспадар, пра якога столькі цяпер гаворыцца. Аднак тут багата «але». Ну вось, да прыкладу. Калі, скажам, раней селяніну зямля была даражэйшая за жонку і дзяцей, дык цяперашні селянін найчасцей яе не тое што не любіць (гэта мякка сказана)— ён зямлю ненавідзіць. Ды так ненавідзіць, што яблыню ля хаты не пасадзіць, градку не зробіць, лопуху ды пустазелля не скосіць з двара ці гарода. Як такому даверыць зямлю? Ці заезджаму «перакаці-поле»? Не ўжо, калі зямлю аддаваць, дык у надзейныя, залатыя рукі. І быць упэўненым, што зямля ад бацькі-працаўніка пяройдзе ягоным сынам. Працавітым і адданым зямлі, як ён...

Каля невялікага будынка «газік» прытармазіў.

— Гэта больнічка нашая. А ў сутарэнні якраз і працуюць трое кааператараў. Справа ў тым, што ў нас выяўлены лекавыя гразі. А ў тым вось прывабным доме, што побач з больніцай, будзе пансіянат для

адзінокіх пенсіянераў. Яны ўсе свае сілы паклалі на калгас. Дык хіба ж можа ён цяпер адвярнуцца ад іх? У іх, можа, самыя горкія дні, калі няма сілы схадзіць па ваду, напаліць грубку...

Не заўважылі, як зусім сцямнела. І дамовіліся прадоўжыць нашую гутарку заўтра.

«МНЕ ТОЛЬКІ РАНАК ПЕРАЖЫЦЬ...»

Працоўны дзень толькі пачаўся, а ў вачах у старшыні ўжо чытаецца стома. Яшчэ маўчаць тэлефоны, яшчэ не ўздыхнула на поўныя грудзі гаспадарка, яшчэ багата вялікіх і малых праблем не патрабавалі да сябе пільнае ўвагі, а ў вачах — стома. Можа, ноч надта малая, каб зняць дзённае напружанне, а можа, за гады старшынства гэтай стомы назбіралася столькі, што ніякаму адпачынку не зняць яе ўсю... Можа быць...

— А што для вас, Кузьма Іванавіч, самае цяжкае?

— Перажыць ранак.

Усміхнуўся, бо заўважыў у маіх вачах неразуменне. Растлумачыў:

— З сямі гадзін раніцы ў маім кабінеце ўжо добры тузін калгаснікаў. І ў кожнага — свой асаблівы клопат. У аднаго — гаспадарчы, у другога — канфлікт, у трэцяга — сямейная праблема. Так, не дзівіцеся: што набалела на душы — з тым і ідуць да старшыні. Вось і даводзіцца мне за гэтую гадзіну быць у ролях і кіраўніка, і трацейскага суддзі, і духоўніка. І кожнаму трэба дагадзіць. Дзевяноста дзевяць разоў зробіш чалавеку дабро — і ўспрымаецца гэта так, быццам інакш і быць не можа. А зробіш хоць адзін раз штонебудзь не так — і ты ўжо дрэнны. Трэба ўвайсці ў становішча чалавека, які прыйшоў да цябе з просьбаю, паглядзець на справу ягонымі вачыма. Адмахнешся раз, другі: маўляў, праблемы вашыя мне дробязь, пыл — і вось ужо адчужэнне паміж табою і людзьмі. І тады нават не думай пра свой аўтарытэт: цябе будуць цярпець з боязі, каб не прыслалі каго-небудзь горшага. Вось такая дыялектыка...

Мне толькі ранак перажыць, а цяжар гаспадарчага клопату возьмуць на свае плечы спецыялісты. У кожнага свой абавязак.

— Вы верыце ў шчаслівую зорку?

— Не, веру толькі ў чалавека.

— Пытаюся таму, што нават беглае знаёмства з вашай гаспадаркаю міжволі падводзіць да думкі: шчаслівы лёс збярог «Чырвоную змену» ад жорсткага дыктату райкома, райвыканкома. Інакш было б усё так, як усюды. Дык што гэта на самой справе: лёс ці процістаянне?

— Рэальнае жыццё нашмат складанейшае за тое, што іншы раз з наскоку малююць вашыя калегі дый пісьменнікі таксама. Ну, а выступаць у ролі цяляці, якое бадаецца з дубам, мне неяк не даспадобы. Дый патрэбы ў гэтым няма. Чым бясконца выпрабоўваць моц уласнага ілба, лепш моцна паставіць на ногі даверануюю табе гаспадарку. Даказваць абгрунтаванасць сваёй пазіцыі трэба не словамі, а тонамі і цэнтнерамі. Выявіш сябе ў справе годна — і з табою будзе лічыцца апаратны работнік любога рангу...

Дык вось, старшынёю мяне выбралі 27 снежня 1944 года. Спаленыя дашчэнту вёскі, знявечаныя палі, убогія зямлянкі, дзе знайшлі прытулак салдацкія ўдовы ды знясіленыя з голаду падлеткі. А яшчэ — чатыры кані, дзве каровы ды пяць авечак. Вось і ўся гаспадарка. А на захадзе яшчэ грымела вайна і ішлі адтуль пахавальныя. Яны касілі і без таго замучаных жанчын, вырывалі з сэрца апошнюю надзею. Потым, праз гады, згадваючы гэтых калгасніц, я часта пытаўся ў сябе: «А ці ёсць у чалавека мяжа магчымасцей? І якой трэба валодаць сілаю волі, каб пасля страшэннага ўдару лёсу ўзняцца на ногі і ісці на катаржную працу?» І хто ведае, можа, вось гэтыя ўспаміны і дапамагалі мне выстаяць у цяжкія хвіліны...

Памятаю, неяк увесну, паматаўшыся за дзень, выйшаў я да поля, дзе аралі шматпакутныя бабы. Сем — у пастронках, адна за плугам. Узяўся за ручкі плуга.

— Ты ж, Кузьма, здаровы, як бугай. Давай да нас у пастронкі,— упікнула мяне адна жанчына.

Я запрогся, і мы паволі, як бурлакі баржу, пацягнулі па скалечаным полі быццам свінцом наліты плуг. Зрабілі круг, другі, і калі знясілеўшы ўпалі на зямлю, у аднае жанчыны, як крык болю, вырвалася з грудзей:

— Божачкі! Калі ж прыйдзе чалавечае жыццё? І ці ўбачым мы што іншае, апрача слёз ды балота?

— Ды што вы, жанкі! Мы тут горад пабудуем! І будзеце вы жыць у гарадскіх умовах — з электрычнасцю, вадою і газам. Няхай адно вайна скончыцца...

Горкі смех, падобны на рыданне, быў адказам на мае словы. А праз шмат гадоў пасля тае размовы прыходзіць да мяне бабка — і адразу з парогу заяўляе: «Памятаеш, Кузьма Іванавіч, як ты абяцаў нам горад пабудаваць? Дык вось, давай кватэру. Цяжка хадзіць і па ваду, і па дровы». Далі, вядома. Каму ж даваць, калі не такім людзям?..

Але перш чым аграгарадок у Сарочах стаў рэальнасцю, колькі ж часу мінула! Колькі сілы пакладзена, каб рэзрух і галеча (у вёсцы не было ні хлеба, ні солі, ні газы, ні запалак — агонь здабывалі, як пячорныя людзі, і цудам захаваўся адзін «Буквар», а паперу вучням служылі старыя шпалеры, газеты, здаралася — і бераста) кашмарным сном адышлі ў нябыт. Але ж было ўсё гэта! Было! І мы хутчэй забудзем уласныя імёны, чым нашую мінуўшчыну...

Спаквяля жыццё ўваходзіла ў каляіну. І наспеў час, калі «Чырвоная змена» стала тым, чым ёсць сёння. А чым менавіта — думаю, вы ведаеце...

Не вельмі захапляючыся лічбамі, скажу пра галоўнае, пра тое, што, як на маю думку, адрозніваe «Чырвоную змену» ад іншых гаспадарак. Усесаюзную славу калгасу прынесла ў 1948 годзе цян-шанская расліна кок-сагыз. Да вайны ды і ў пасляваенныя гады яе карані давалі сыравіну для натуральнага каўчуку. Нялёгка было вырасціць капрызлівую расліну на асушаных тарфяніках, але яшчэ цяжэй глыбокай восенню выкапаць карані. Трошкі пашкодзіш — і няма малака, выцекла. У першыя гады выкопвалі 30—40 цэнтнераў каранёў з гектара, а ў 1948— па 80. Гэта была перамога! А ўвесну 1949 года перадавым каўчукаводам А. А. Шаплыка, П. І. Галай, брыгадзіру трактарнай брыгады Г. П. Сушчэню і старшыні калгаса К. І. Шаплыку прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Балоты — даўні вораг палешукоў. І толькі разумнае, не на пагібель навакольнага асяроддзя іхняе асушэнне, магло даць калгасу палі, без якіх нельга было і думаць пра нешта сур'ёзнае. І тут свая гісторыя: першая камуна дэмабілізаваных чырвонаармейцаў БВА ў цэнтры Мар'інскіх балотаў, якую праславіў Янка Купала ў паэме «Над ракой Арэсай», легендарныя грабары — землякопы, здольныя выдаваць на-гара за дзень да ста кубаметраў. Гэта — канец дваццатых гадоў. Але ўжо тады людзі ўпэўніліся, што ў «залатога дна» ёсць і сваё дно — іржавы, ці быццам цвіллю пакрыты, мёртвы пясок. І чым больш лапаціць верхні слой тарфянікаў, тым хутчэй можна ўбачыць гэтае непрывабнае і бясплоднае дно. Так само жыццё падказала ідэю аб спецыяльнай ахоўнай службе, якая б жорстка кантралявала кожны меліяраваны гектар.

«Чырвоная змена» ўзбуйнялася, будавалася, механізавалася, аўтаматызавалася, але не гэта і не мільённыя прыбыткі было самамэтаю. Небагата каштуе гаспадарка і яе кіраўнікі, калі даярка горш за карову жыве. А зусім нядаўна такое злачыннае патуранне, узведзенае ў ранг дзяржаўнага, грамадскага клопату, ледзь не вартасцю лічылася. «Калгас — не дзеля дзяржавы, а дзеля калгаснікаў»,— вось галоўная спружына, якая запусціла будаўніцтва жылля (у «Чырвонай змене» пабудавана 250 кватэр), падштурхнула да перагляду тарыфаў, напоўніла банальны выраз «клопат аб людзях» канкрэтнай штодзён-

най справаю.

«...У кожнага пачатку ёсць два бакі. Адзін — будзённы, у клопаце аб хлебе надзённым і аб усім, што нельга адкласці на заўтра, нельга даверыць нікому іншаму. Другі бок — святочны, гэта тое, аб чым толькі марыш, што дамалёўвае фантазія. Дамалёўвае адвольна, не баючыся ўпрыгожванняў. Гэты бок не імгненны. Яго выношваеш гадамі. А здзяйсняеш усё жыццё». Так кажа К. І. Шаплыка ў сваёй кнізе «Село шагает в завтра». Як толькі пабываеш у Сарочах, адразу зразумееш, што меў на ўвазе старшыня: яго вялікая мара аб новым сяле, калі не сказаць — сэнс жыцця, стала рэальнасцю. А такое дадзена не кожнаму...

Чаго каштуе адзін толькі Палац культуры, навукі і спорту, увенчаны серабрыстаю каронаю. Ад яе нават у пахмурны дзень ідзе мяккае, цёплае святло. Велічны і грандыёзны, шматзальны, з цудоўнай бібліятэкаю, аграларабораторыяй, зімовым і летнім садам з экзатычнымі раслінамі, з рознымі студыямі, з басейнам, багата яшчэ з чым. Гэта — сапраўдны цэнтр культурнага жыцця калгаса.

У праект пабудовы аграгарадка ўклала свой талент і душу Алена Георгіеўна Заборская. А калі трагедыя абарвала яе жыццё, справу дачкі давёў да канца бацька — Георгій Уладзіміравіч Заборскі. Разумеючы, што ад гэтага залежыць будучыня, К. І. Шаплыка не падразаў крылы архітэктарам і будаўнікам жорсткай эканоміяй сродкаў... дзеля эканоміі. Хаця пайсці на гэта было не проста.

У калгасе няма кадравай праблемы. Моладзь не пакідае вёску...

ПЫТАННЕ ЎСІХ ПЫТАННЯЎ

Такім чынам, ёсць гаспадарка. Ёсць сапраўдны кіраўнік. А гаспадар? Ці ёсць поўнаўладарны распараджальнік зямлі і прадуктаў, якія яна дае?

Даць адназначны адказ цяжка. Бо ад забараняльных і абмежавальных інструкцый ды цыркуляраў, якія цяжкімі гірамі па-ранейшаму вісяць на руках і нагах старшыні, не вызваляць ні Залатыя Зоркі, ні самы высокі аўтарытэт.

Ёсць прыкрая статыстыка: сумленны старшыня, які душою хварэе за справу, у сядле трымаецца ў сярэднім 5 гадоў. Потым — вызваленне ад пасады, следства і нават — турма. Кузьма Іванавіч, як вядома, стырнавы ўжо амаль 50 гадоў. Відаць, у свой час яму дапамагло партызанскае братэрства. Па сваім характары Кузьма Іванавіч не той чалавек, хто будзе даводзіць адносіны да стану, пра які кажуць: «Найшла каса на камень». Не абразіць сябе бяздумным і непаслухмяным згодніцтвам — тым самым часам пакінуць апошняе слова за сабою. Гэта ўжо дыпламатыя. Урэшце, лепшая апора і абарона — справа, якая гаворыць сама за сябе.

Але галоўнае, думаю, не ў гэтым. Калі старшыня разам са сваімі калгаснікамі прайшоў усе кругі пекла і не мае патрэбы адводзіць вочы пры сустрэчы з любым чалавекам — у яго душы закладзена несакрушальная сіла. Гэта — з аднаго боку. А з другога — у такі калгас, як «Чырвоная змена», заганяць людзей сілком не трэба было. З балотам адзін не паваюеш. Таму рашэнне аб'яднацца прадыктавана самім жыццём. Так што на фоне раз'ятранага выкрыцця калгасна-саўгаснай сістэмы (і ў гэтым ёсць шмат справядлівага) калгас-мільянер «Чырвоная змена» выглядае астраўком, дзе ўсё ж такі існуе (няхай і далёкі ад ідэальнага) парадак і дабрабыт. І гаворачы пра крызіс калгасаў, пра іх няздольнасць накарміць народ, заклікаючы да іх ліквідацыі, нельга ўсіх і ўсё валіць у адну груду. Так мы сапраўды пазбавімся апошняга.

...Ужо паставіў кропку, як нечакана падумалася — не, не пра Шаплыку,— наогул: калі старшыня — чалавек паднявольны, дык ці зможа ён даць волю на калгаснай зямлі таму ж фермеру? Выходзіць, сама сістэма робіць фермерства немагчымым — ці што? Вось дзе пытанне ўсіх пытанняў.

КОЛА ЗНАЁМСТВАЎ

Мне 25 гадоў. Студэнт медінстытута. Кантактны, займаюся спортам (альпінізмам). Цікаўлюся навінкамі ў вобласці навукі і мастацтва. Буду рады, калі напіша сціплая, сімпатычная дзяўчына.

Мой адрас: 210026, г. Віцебск, вул. Даватара, д. 20, кв. 112. САВІНКОВУ Віталю.

Мне 16 гадоў. Вучуся на першым курсе Вільнюскага гандлёвага тэхнікума. Захапляюся эстраднай музыкай. У вольны час чытаю, вяжу. Буду рада, калі на мой ліст адгукнуцца мае будучыя сябры.

Мой адрас: ЛССР, 232041, г. Вільнюс, вул. Гяню, д. 22, кв. 35. СКАЎДЗІТЭ Сігітэ.

Рызыкую застацца ў адзіноце! Амаль усе мае сябры жанатыя, а мне ніяк не шанцуе. Жыву ў сельскай мясцовасці, жыллём забяспечаны. Мне 26 гадоў, працую шафёрам. Па характары — вясёлы, ніколі не засмучаюся. Вельмі люблю дзяцей. Хацеў бы пазнаёміцца з добрай, чуллівай дзяўчынаю, якая цэніць у людзях пачуццё гумару і магла б стаць вернай спадарожніцаю ў жыцці.

Мой адрас: 222211, Мінская вобл., Смалявіцкі р-н, п/а Куркава, в. Каменка, ШЛЕМІНУ Аляксандру.

Завуць мяне Ларэта Янкаўскайтэ. Мне 18 гадоў. Працую кухаркаю, таму выдатна гатую. Апрача таго, шмат чытаю, люблю спорт. Хацела б перапісвацца з беларускімі хлопцамі і дзяўчатамі, даведацца пра іх інтарэсы і захапленні.

Пішыце на адрас: 234501: Літва, Марыяпальскі р-н, в. Вішак'ё Руда, ЯНКАЎСКАЙТЭ Ларэце.

З мэтаю стварэння сям'і хацеў бы пазнаёміцца з добрай, гаспадарлівай жанчынаю гадоў 36—40. Сам я быў жанаты, але развёўся. Цяпер мне 40 гадоў. Працавіты. Магу працаваць на любой тэхніцы. Спіртным не захапляюся. Жыву ў сельскай мясцовасці і вельмі люблю прыроду.

Мой адрас: 222341, Мінская вобл., Валожынскі р-н, п/а, Камень, в. Далідовічы, МАЗАНІКУ Генадзю.

Вучуся ў вышэйшай ваеннай вучэльні. Мне 20 гадоў. Сам з Мінска. Захапляюся ўсходнімі адзінаборствамі, радыёэлектронікай. У вольны час люблю слухаць сучасную эстрадную музыку. Хацеў бы знайсці сабе сяброў.

ВІКТАР С.

Мне 18 гадоў. Вучуся ў тэхнікуме дакладнага прыборабудаўніцтва. Люблю чытаць, падарожнічаць. Па характары — замкнёная. Можа, гэта і з'яўляецца перашкодаю знаёмству.

СВЯТЛАНА К.

Мне 17 гадоў, жыву ў Мінску. Як усе мае равеснікі, люблю слухаць музыку, чытаць, спрабую пісаць сама. Па натуры чалавек сціплы. У чалавеку перш за ўсё цаню вернасць, абавязковасць. Усе, хто адчувае сябе самотным, хто лічыць сябе не такім, як усе, хто хоча знайсці сабе вернага сябра, пішыце мне.

СВЯТЛАНА С.

Хацеў бы спаткаць добрую чуллівую дзяўчыну, якая не падвяла б у цяжкую хвіліну. Пра сябе: 29 гадоў, рост 186 см, вочы шэрыя, адукацыя вышэйшая, фізік. Жыву і працую ў Мінску. Не куру, ніколі не піў. Жанаты не быў. Люблю спорт, музыку і «яе» — фізіку.

ГЕНАДЗЬ Б.

Мне 31 год, рост 158 см. Працую педагогам. Так ужо атрымалася, што дагэтуль не знайшлося чалавека, якому б я была неабходная. Жыццярадасная, кантактная, люблю дзяцей, але, на жаль, адзінокая. Чакаю і спадзяюся, што калінебудзь усё-такі будзе сапраўдны сябра.

НІНА Х.

АД РЭДАКЦЫІ:

Нагадваем, што адрасоў рэдакцыя не высылае. Калі вы хочаце пазнаёміцца з аўтарам аб'явы, напішыце яму (ёй) ліст і дашліце ў «Крыніцу», абавязкова ўказаўшы на канверце імя адрасата і нумар часопіса, у якім была надрукавана аб'ява. Ліст будзе дасланы на ўказаны адрас.

У 1991 годзе традыцыйная рубрыка «Кола знаёмстваў» дае свае старонкі і грамадзянам Заходняй Еўропы і Амерыкі, якія жадаюць знайсці сяброў у нашай краіне.

Калі вы хочаце:

— пазнаёміцца з замежнымі равеснікамі,

— знайсці спадарожніка ў жыцці ў любым кутку зямнога шара,

— абмяняцца інфармацыяй аб розных маладзёжных плынях,

ПІШЫЦЕ НАМ У ЧАСОПІС

«МОЙ

У папярэдніх публікацыях, шаноўны чытач, мы зрабілі вельмі павярхоўны экскурс у гісторыю развіцця заканадаўства аб смяротнай кары і практычнага яе прымянення ў нашай Айчыне, падышоўшы да таго моманту, калі «самадзяржаўны», «рэакцыйны», «эксплуататарскі», «антычалавечы» (і г. д.) лад гвалтоўна быў звергнуты не самымі шырокімі масамі, ідэйныя правадыры якіх дэкларавалі другі лад — самы «дэмакратычны», «прагрэсіўны», «справядлівы», «гуманны» (і г. д.). Мяркую, што аб'ектыўная палітычная ацэнка тагачасных падзей яшчэ наперадзе, я ж бачу перад сабою задачу паказаць, наколькі гэта мажліва, з чаго пачалося развіццё савецкага крымінальна-прававога заканадаўства аб смяротнай кары.

Літаральна ў першыя дні пасля прыходу да ўлады Другі Усерасійскі з'езд Саветаў дэкларараваў адмену смяротнае кары ў нашай краіне. Аднак праходзіць усяго два месяцы і 21 лютага 1918 года СНК РСФСР, які ўзначальваў У. І. Ленін, прымае дэкрэт «Сацыялістычная айчына ў небяспецы!» У гэтым дакуменце, дзе гаворка ішла пра надзвычайныя меры, дапускалася магчымасць расстрэлу на месцы, інакш кажучы, без суда і следства, за здзяйсненне злачынстваў спекулянтамі, пагромшчыкамі, непрыяцельскімі агентамі, контррэвалюцыйнымі агітатарамі, германскімі шпіёнамі.

Я не маю даных, якія б сведчылі аб тым, хто ж быў натхняльнікам і аўтарам гэтага дакумента, але напярэдадні, у студзені 1918 года, У. І. Ленін казаў: «Пакуль мы не прыменім тэрору — расстрэлу на месцы — са спекулянтамі нічога не выйдзе... Апрача таго, з рабаўнікамі трэба таксама дзейнічаць рашуча — расстрэльваць на месцы».

На падставе названага дэкрэта 23 лютага таго ж года ВЧК публікуе заяву, у якой указвалася, што ВЧК «...не бачыць іншых мер барацьбы з контррэвалюцыянерамі, шпіёнамі, спекулянтамі, граміламі, хуліганамі, сабатажнікамі і іншымі паразітамі, апрача бязлітаснага знішчэння на месцы злачынства».

На маю думку, менавіта з лютага 1918 года вядзе адлік прававое беззаконне, якім пазначана пасля гісторыя нашай Радзімы. Па-першае, рашэнне аб смяротнай кары, а дакладней, аб расправах было прынята не заканадаўчым, а выканаўчым органам, якім быў Саўнарком. Па-другое, расстрэл на месцы без суда і следства — гэта па сутнасці не пакаранне, а забойства, бо не ўстанаўлівалася прызнанне складу злачынства і віны. Такім чынам, прадвызначаўся суцэльны адвольны гвалт супрацоўнікаў ВЧК, якія маглі караць і мілаваць паводле свайго меркавання.

16 чэрвеня 1918 года Наркамюст РСФСР (і зноў ведамасны нарматыўны акт, а не закон) прымае пастанову, якая вызваляе рэвалюцыйныя трыбуналы ад любых абмежаванняў у выбары пакарання. Гэтай пастановай рэўтрыбуналам, разам з ВЧК, таксама давалася права неабмежаванага прымянення расстрэлу.

Апраўдваючы пазасудовую расправу са сваімі працаўнікамі, У. І. Ленін у лісце да амерыканскіх рабочых ад 20 жніўня 1918 года пісаў: «...Не можа быць паспяховай рэвалюцыя без падаўлення супраціўлення эксплуататараў. Мы ганарымся тым, што рабілі і робім гэта. Мы шкадуем аб тым, што недастат-

Заканчэнне.
Пачатак на стар. 20.

кова цвёрда і рашуча робім гэта».

І нарэшце, апафеозам «прававой» бойні з'явілася пастанова СНК РСФСР ад 5 верасня 1918 года «Аб чырвоным тэроры».

За дзевяць месяцаў (чэрвень 1918 — люты 1919 года) супрацоўнікамі ВЧК было расстраляна на тэрыторыі 23 губерній 5496 чалавек, з якіх толькі 800 — крымінальныя злачынцы! Як тут не згадаць менш за 200 чалавек, пакараных смерцю па прысудах (а не забітых без суда і следства) расійскіх судоў з 1826 па 1906 год.

Выказваючы пратэст і боль, выкліканыя паўсюдным беззаконнем, вядомы рускі пісьменнік У. Г. Караленка пісаў у 1920 годзе А. В. Луначарскаму: «Смяротныя пакаранні без суда, смяротныя пакаранні ў адміністратыўным парадку — гэта бывала найвялікшай рэдкасцю нават тады (да кастрычніка 1917 года — С. Л.). Я думаю, што не ўсякія сродкі могуць сапраўды ісці на карысць народу, і не сумняваюся, што ўзведзеныя ў сістэму адміністратыўныя расстрэлы, якія працягваюцца ўжо другі год, не належаць да іх ліку».

Як і цяпер, у той час лозунгамі і пастановамі падмянялі жывую справу, а закон ігнараваўся выканаўчай уладаю. 8 студзеня 1918 года Надзвычайны IV Усерасійскі з'езд Саветаў (вышэйшы заканадаўчы орган краіны) прымае пастанову «Аб рэвалюцыйнай законнасці», а ў чэрвені 1919 года Дэкрэтам ВЦВК былі пашыраны правы ВЧК у прымяненні расстрэлу.

Пытанне аб смяротнай кары разглядалася V Усерасійскім з'ездам Саветаў, які праходзіў у ліпені 1918 года. Адстойваючы непазбежнасць прымянення смяротнай кары і выступаючы супраць левых эсэраў, яе праціўнікаў, У. І. Ленін казаў: «...Мяне, чалавека, які нагледзеўся партыйнага рознагалосся, рэвалюцыйных спрэчак, не здзіўляе, што ў такі цяжкі перыяд павялічваецца колькасць людзей, якія кідаюцца ў істэрыку і крычаць: я пайду ВЦВК і СНК смяротная кара была фармальна адменена, аднак розныя агаворкі і ўмовы ў гэтым дакументе дазволілі рэвваентрыбуналам толькі ў тым жа 1920 годзе асудзіць на смерць 6541 чалавека.

Выступаючы праз месяц пасля прыняцця пастановы «Аб адмене прымянення вышэйшай меры пакарання» на IV канферэнцыі губернскіх надзвычайных камісій, У. І. Ленін казаў: «Так што, хоць па ініцыятыве т. Дзяржынскага пасля ўзяцця Растова і была адменена смяротная кара, але ў самым пачатку рабілася агаворка, што мы зусім не закрываем вочы на магчымасць аднаўлення расстрэлаў. Для нас гэтае пытанне вызначаецца мэтазгоднасцю. Само сабою разумеецца, што Савецкая ўлада захоўваць смяротную кару даўжэй, чым гэта выклікаецца неабходнасцю, не будзе, і ў гэтым дачыненні адменаю смяротнай кары Савецкая ўлада зрабіла такі крок, які не рабіла ніводная дэмакратычная ўлада ні ў адной буржуазнай рэспубліцы».

Палажэнне аб смяротнай кары ў Крымінальным кодэксе РСФСР 1922 года, як і ў цяперашнім КК БССР і іншых саюзных рэспублік, не ўключалася ў сістэму пакаранняў, а было выдзелена ў асобны артыкул. А ў 1926 годзе быў прыняты новы КК РСФСР, у якім рамкі прымянення смяротнай кары былі значна скарочаныя.

У канцы 20-х гадоў пад кіраўніцтвам М. В. Крыленкі распрацоўваўся праект новага КК РСФСР. У аснове праекта ляжала тэорыя гвалтоўнага беззаконня, калі падставаю для прыцягнення да крымінальнай адказнасці з'яўляўся не факт здзяйснення злачынства, а небяспечнасць чалавека, якая вызначалася ягонай класавай прыналежнасцю, інакш кажучы, гаворка ішла не пра крымінальнае пакаранне, а пра меры класавага падаўлення. У праекце гэтага кодэкса ўвогуле адсутнічалі санкцыі за злачынства, а прысуд, у тым ліку і смяротны, павінен быў выносіцца зыходзячы з правасвядомасці суддзяў.

тычнай дзейнасці карнае сістэмы савецкай дзяржавы.

Пра сталінізм у нас цяпер гаворыцца і пішацца багата. Я дам толькі адзін прыклад палітычнай і дзяржаўнай двудушнасці.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 мая 1947 года была дэкларованая адмена смяротнай кары. Аднак у той самы час выдаецца сакрэтная дырэктыва, згодна з якою гэтае пакаранне магло прымяняцца спецсудамі Міністэрства дзяржаўнай бяспекі. Дзеянне Указа, як і пастановы ВЦВК і СНК 1920 года, было паралізавана выканаўчымі органамі.

У 1949 годзе СССР выносіць на разгляд сесіі Генеральнай асамблеі ААН прапанову аб адмене смяротнай кары ва ўсім свеце. Тым часам у краіне пануюць нябачаны тэрор і жудаснае беззаконне.

Заканадаўчым шляхам смяротная кара была ўведзеная зноў у 1950 годзе за асабліва небяспечныя дзяржаўныя злачынствы, а з 1954 года і за наўмыснае забойства.

Сёння смяротная кара як альтэрнатыўная мера пакарання прадугледжана санкцыямі 31 артыкула КК БССР, што складае больш за 12 працэнтаў ад агульнай колькасці артыкулаў. З трыццаці аднаго злачынства, за якія прадугледжана смяротная кара, пятнаццаць — воінскія, здзейсненыя ў ваенны час ці на баявым дзяжурстве. Да астатніх злачынстваў, за якія можа быць назначана пакаранне смерцю, адносяцца: здрада Радзіме; шпіянаж; тэрарыстычны акт; тэрарыстычны акт супраць прадстаўніка замежнай дзяржавы; дыверсія; бандытызм; дзеянні, якія дэзарганізуюць работу выпраўленча-працоўных устаноў; ухіл ад прызыву па мабілізацыі; фальшываманецтва; парушэнне правоў аб валютных аперацыях; крадзеж у асабліва буйных памерах; забойства пры абставінах, якія робяць віну асабліва цяжкай; замах на жыццё работніка міліцыі ці народнага дружынніка; угон паветранага судна.

На гэтым, шаноўныя чытачы, мы заканчваем тэму, якая, я спадзяюся, была вам небескарысная. У наступным годзе, калі вы таго пажадаеце, мы маглі б прадоўжыць размову пра маральныя праблемы прававой дзяржавы, злачынства і пакарання. У тым ліку і пра мэтазгоднасць смяротнай кары ў нашым грамадстве.

Афармленне
Канстанціна ВАШЧАНКІ

Сяргей ЛУЧЫНОВІЧ, пракурор

МЕЧ — ГАЛАВА З ПЛЕЧ!»

з Саветаў. Спасылаючыся на дэкрэты, якія адмяняюць пакаранне смерцю. Але благі той рэвалюцыянер, які ў момант вострай барацьбы спыняецца перад непахіснасцю закону. Законы ў пераходны час маюць часовае значэнне. І калі закон перашкаджае развіццю рэвалюцыі, ён адмяняецца ці выпраўляецца».

Якія тут могуць быць каментарыі, калі кіраўнік дзяржавы, лідэр кіруючай партыі і ідэйны натхняльнік усіх падзей падмяняе закон палітычнай мэтазгоднасцю.

17 студзеня 1920 года пастановаю Вось што было запісана ў арт. 32 праекта: «Расстрэл можа быць прыменены толькі ў выпадках перакананасці суда ў немагчымасці іншым спосабам прадухіліць паўторныя злачынствы з боку дадзенай асобы або ў выпадках асобай неабходнасці асабліва застрашыць класавых ворагаў». Такая фармуліроўка прыводзіць да бязмежнага адвольнага гвалту судоў.

На шчасце, праект так і не стаў законам. Аднак наступныя падзеі нашай гісторыі сведчаць, што ягоныя прынцыпы знайшлі сваё ўвасабленне ў пра-

Віцебская вобласць, райцэнтр. Шэры-шэры вечар і яшчэ шарэйшы дождж. Дождж гэты будзе ісці сорак дзён — так кажуць мудрыя бабулі. Усё плыве і калышыцца, гарадскі пасёлак Шаркаўшчына нагадвае старую шлюпку ў цэнтры акіяна. Дрэвы, дамы, мясцовыя жыхары, установы і жывёлы плывуць бясконца ў далёкія бязрадасныя землі. Па волі лёсу і я плыву разам з імі, і да болю шкада мне адзіных сваіх туфляў, бо дарогі тут, асабліва ў дождж, не любяць дамскага абутку — яны ўжо звыкліся з гумавымі ботамі. Іду і згадваю нешта энцыклапедычнае.

«Шаркаўшчына — адно з старадаўніх селішчаў паўночнай часткі Беларусі. Маёнтак Шаркаўшчына ўпершыню згадваецца ў пачатку XVI стагоддзя — у 1503 годзе ён быў перададзены князем Вялікім (каралём) Аляксандрам багатаму памешчыку Юрыю-Дзеспат-Зяновічу за асаблівыя заслугі. З гэтага часу маёнтак стаў перадавацца ў спадчыну... Як пасёлак Шаркаўшчына ўпершыню запісаная ў летапісах 1763 года...» І далей — багатая гісторыя, імёны і даты. Цяпер Шаркаўшчына — невялікі драўляны гарадок з рэчкаю Дзіснай пасярэдзіне, з сямю тысячамі людзей і без гарачай вады. Праўда, ёсць у ім некалькі цагляных дамоў, і вада ў іх бывае гарачая, але толькі ўзімку. Усё астатняе — як і ўсюды: ёсць бібліятэка і Дом культуры, кінатэатр і школы, дзіцячыя садкі і бальніца, ёсць дзве царквы...

ВАСІЛЬ, УЛАДЗІМІР І АНАТОЛЬ І ЎСІХ ЖУРБОТНЫХ РАДАСЦЬ.

Такім чынам, я плыла па дажджлівай вуліцы, і дождж ішоў такі, быццам ніколі ён і не пачынаўся — заўсёды быў: і выплыла я да царквы. І тут убачыла людзей, і вялікая была мая радасць, бо нікога дагэтуль не сустракала, хіба што сабака міма прабег. Людзей было трое, яны працавалі: Васіль, Уладзімір і Анатоль — рэстаўратары. Паваленыя крыжы, вёдры з тынкам, вычварныя інструменты, у вачах — любасць. Не хапала ім толькі палатняных кашуль, падпяразаных матузамі, ды вузкіх раменьчыкаў на цёмных ілбах, якія б стрымлівалі непаслухмяныя пасмы.

— Ці працуе царква?

— Працуе. Толькі нядаўна, і бацюшкі свайго няма — прыязджае з Новага Пагосту на святы і выхадныя... Усярэдзіне ўжо ўсё зроблена, засталася толькі званіца, ды знадворку рамонт.

Гэтыя людзі — прыезджыя, з Гомеля. Вандруюць па Беларусі, рэстаўруюць занядбаныя храмы. Уваходзяць — у склады, клубы, крамы, ці ў пустыя лядашчыя будынкі, а выходзяць, пакідаючы за плячыма вернутыя, адроджаныя цэрквы. Віцебская вобласць — багатая на іх: амаль што ў кожнай вёсцы ёсць і царква і касцёл. Хоціць працы тут Васілю, Уладзіміру і Анатолю, патрэбныя цяпер іхнія рукі, не абысціся без іх. Няшмат часу міне — і зазіхаціць царква Усіх Журботных Радасць пасярод Шаркаўшчыны светлым выратавальным караблём з абноўленымі крыжамі і светлымі надзейнымі сценамі. І прыйдуць да яе нашчадкі, і іхнія нашчадкі, і тых нашчадкаў нашчадкі, і не будуць яны ўжо ведаць аб бязверным і падманным стагоддзі дваццатым, калі свяцілішча было збэшчанае і вера асмяяная. І толькі цьмяная, трывожная чутка даляціць да іх пра тое, што быў такі час, які давёў: чорт нават і ладану не баіцца...

ЯК КУРОРТНЫ ГАРАДОК...

— Як жывецца ў Шаркаўшчыне людзям? — спыталася я.

— Ды як жывецца? Паціху. Людзі працуюць, у крамах нічога няма, пацехі ж кожны сабе сам шукае. А пацехі найчасцей якія — самі ведаеце... Нядаўна вось ехалі на машыне, ледзь спыніцца паспелі — чалавек на дарозе ляжыць. Выйшлі перапалоханыя — нехта забіў? А можа блага зрабілася? Ці, можа, памёр? Падышлі — не варушыцца... А нахіліліся — дыхае цяжкім гарэлачным духам, спіць. Жывы і здаровы!

— Чаму ж так?

— Нуда, пэўна...

Так, праз некалькі дзён і я ўбачыла тое самае. На галоўнай вуліцы, непадалёк ад аддзела міліцыі, ляжаў чалавек у светлым касцюме і з чаравікам пад галавою, ляжаў — не варушыўся. Дзень быў цёплы і сонечны, дзеці і дарослыя хадзілі побач і слухалі то лагодны храп, то стогны — нешта ж сніў такое...

— І ўся сям'я іхняя, міленькая, гэткая,— сказала мне бабуля, заўважыўшы, як я гляджу на яго.— І маці ягоная, і сястра, і браты, і жонка... Усе п'юць, у хаце — бруд, быццам і не хата зусім. Якія гаспадары, такія і бацькі. Дзеці ў інтэрнаце, панараджалі ж — вось дзяржава і выхоўвае. А ім пляваць на гэтых дзяцей, як і на сябе пляваць...

— Чаму ж так? — спыталася я зноў...

— А хто ж яго ведае? Бязрукія людзі, безгаловыя, дурныя, усё жыццё сваё прапілі.

...Але праходзіў дождж, і ўзнімалася сонца, і зазіхацела Шаркаўшчына сінімі і зялёнымі фарбамі, і кідаліся ў вочы прыгожыя і спакойныя кветкі ў гародчыках — і чырвоныя, і жоўтыя, і белыя, і ўсялякія... Побач з міліцыяй дзяўчынкі ірвалі лебяду парсючкам, ды пад гасцінічную страху дзве ластаўкі і галубка насілі страву сваім птушанятам. Зранку мяне будзіў сваім радасным сонечным крыкам певень, і каровы мыкалі, калі ішлі ў лугавіны паблізу гасцініцы. Жанчыны і мужчыны на веласіпедах ехалі на працу, у некаторых на раме сядзелі хлопчык ці дзяўчынка, абыякава і звыкла глядзелі дзіцячымі яснымі вачамі на дарогу. Ранак тут цудоўны, ён пахне сырадоем і ліпавым мёдам. У гэты час, пакуль яшчэ зачыненыя крамы і не з'явілася дзённая стома, разумееш, што шэрае толькі здалёк здаецца шэрым, а падыдзі бліжэй, уліся ў

* У нататках выкарыстаны вершы Аляксандра Блока.

яго — і поўная нізка вясёлкавых фарбаў цёплымі прыскамі аслепіць вочы...

— У вас ёсць мара? — пытаюся я ў бібліятэкаркі Аліны Эдмундаўны Яблонскай.

— Цяпер не ведаю... У юнацтве, вядома, была. Кудысьці паехаць, убачыць новае і прыгожае...

— Ці здзейснілася яна?

— Ды я амаль што нідзе і не была. Так толькі, збольшага. Кожны адпачынак — на поўдзень, і ўсё...

— Цяпер — шкада?

— Аб чым гаворка?.. У гэтыя гады ўжо не пра тое думаеш... Напэўна, не шкада. Бо зразумела: дзесь лепей, але там пабудзеш — усё роўна дахаты цягне. Засмуткуеш, надакучыць. А нашая Шаркаўшчына, як светла — што курортны гарадок, і лепш за яе нічога няма для мяне... Цяпер больш за ўсё хачу, каб дачка не хварэла.

— Ці шмат у вас чытачоў?

— Увосень і ўлетку мала прыходзіць — сельгаспрацоты, лес, трэба назапасіць хоць што-небудзь, чытаць няма калі. Не паспееш — узімку галодны будзеш сядзець. Нават калі б не было ў жыхароў Шаркаўшчыны спрадвеку прысядзібных участкаў — давялося б іх заводзіць, бо другога выйсця не знайшлося б. У краме ж анічога няма, і няма на што спадзявацца...

І я пайшла ў краму.

На прылаўках — шакалад «Гомельскі». Прыхільнікі разнастайнасці знойдуць кукурузныя палачкі і соль. Каб купіць хлеб, трэба мець незвычайную інтуіцыю — прадбачыць, калі яго прывязуць, бо інакш можна спазніцца і застацца ні з чым. Дарэчы, з хлебам і праўда ў Шаркаўшчынскім раёне катастрофа. Аднаго разу ўбачыла велізарную чаргу, у якой людзі даўно ўжо, пэўна, стаялі. Крама была зачыненая, і людзі сядзелі на скрынях, туліліся да плоту. Чакалі, чакалі, чакалі... Было гэта ў вёсцы Германавічы.

— Што тут будуць прадаваць? Абутак? Мэблю? Ці, можа, гарэлку?

— А не, дзетачкі,— адказала мне лядашчая бабулька ў старадаўняй плюшаўцы.— Хлеба чакаем.— Павольна і звыкла сказала і зноў паглыбілася ў цярплівае сваё старажытнае чаканне.

І адразу ж выпырхнула з гурту маладая цяжарная жанчына, забалабоніла:

— Паўдня стаім, паўдня, зранку чаргу займаем, і гэтак кожны дзень. Хлеб даюць усяго пятнаццаць хвілін, хоць плач. І няма куды адысці: вернешся — «не пазнаюць», кожны хоча купіць. Белага дык зусім няма. А хто працуе — увогуле не купіць. Самі бачыце, якая чарга — старыя ды малыя. Паўдня праходзіць, а ў гаспадарцы — бязладдзе: свінні галодныя, карова не доеная, і агарод пустазеллем зарос, і ў хаце непрыбрана. А мне дык страшна — у чарзе нараджу — дык і мяне, і дзіця затопчуць з-за гэтага хлеба...

І пайшла я сваёй дарогаю, няздольная нічым гэтым людзям дапамагчы... Думала пра нашу савецкую дзяржаву, якая не можа людзей хлебам накарміць, і прыгадала Ісуса Хрыста, які сямю боханамі накарміў «чатыры тысячы чалавек, апрача жанчын і дзяцей». І стала мне шкада людзей, што жывуць у гэты дзіўны час — нібыта ўсё ёсць і ўсё добра, а ў чарзе па хлеб паўдня стаяць даводзіцца...

ХАЧУ, КАБ ЯНЫ БЫЛІ ГАСПАДАРАМІ СВАЕЙ ЗЯМЛІ...

Але я не спяшаюся пакідаць вёску Германавічы, і вас, чытач, запрашаю ненадоўга затрымацца ў ёй.

Месца гэта незвычайнае. Па-першае, сёлета ўвесну яго наведалі іншапланецяне — і дзеці, і дарослыя бачылі святлісты шар у небе, а потым пачалі адбывацца жудасныя цуды. Праз дзень, на ўроку фізкультуры ля школы, усе дзеці, дабягаючы да аднаго і таго ж месца, падалі і пераставалі валодаць сабою, а ў адной дзяўчынкі быў прыпадак, падобны да эпілептычнага. Пасля гэтыя дзеці некалькі дзён адчувалі занядужанасць... Па-другое, тут захаваўся маёнтак пана Шырана, пабудаваны ў XVIII стагоддзі, і ў гэтым маёнтку ў свой час быў Напалеон, якога запрасіла на баль мясцовая шляхта, і паляваў у тутэйшых лясах.

Таццяна ДАШКЕВІЧ

«МНЕ ХАТЫ ШЭРЫЯ ТВАЕ...»

ДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ СТАЛІЧНАГА ЖЫХАРА ПРА СУЧАСНУЮ ПЕРЫФЕРЫЮ

Па-трэцяе, тут знайшлі селішча нашых продкаў VIII стагоддзя. І яшчэ... Справа ў тым, што знайшла я тут тое, што вельмі жадала знайсці — крыніцу святла. У кожнай мясцовасці ёсць абавязкова такі чалавек, ад якога ідзе святло, і людзі да яго хінуцца і вераць яму. Такі чалавек якраз і жыве не дзеля сябе — гарыць увесь дзеля іншых, а іначай ён і не быў бы прыкметны. Тут гэта — сціплая і добрая, неспакойная вясковая настаўніца-славесніца Радчонак Ада Эльеўна. Рупліва і беражліва ставіцца яна да нашае мінуўшчыны, збірае па крупіцах ягоныя рэшткі, захоўвае іх і любіць. Гісторыя і культура, мова і лёс, боль і радасць народа знайшлі прытулак у яе клапатлівай і апантанай душы.

— Школа наша цалкам перайшла на беларускую мову. Ёсць у нас суполка «Пурпуровыя ветразі» — дзеці самі прыдумалі назву. І песні спяваюць толькі на беларускай мове.

Ада Эльеўна ў вясковай школе стварыла два музеі, і трэці ўжо сабраны, матэрыялы і экспанаты. Адзін з іх — музей рэвалюцыйнай і баявой славы. Школьнікі самі хадзілі па вёсках і шукалі рэчы, лісты, дакументы, пісалі ветэранам лісты і вялі пошук. Я бачыла кнігу вод-

Заканчэнне на стар. 64.

Усевалад ІГНАТОЎСКІ

КАРОТКІ НАРЫС

АГУЛЬНЫ ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД

Люблінская вунія 1569 году, як мы ведаем, далучыла Беларусь і Літву ў склад Рэчы Паспалітай Польскай. Літоўска-Беларускае гаспадарства павінна было перастаць існаваць незалежна. З гэтага часу Беларусь жыве адным жыццём з Польшчай [1].

Праз тры гады пасля Люблінскай вуніі памёр апошні кароль з дому Ягайлавага, Жыгімонт Аўгуст [2]. Гэта быў разам з тым і апошні наследны кароль. З 1572 года пачынаецца эпоха выбраных соймам каралёў. Каралеўская ўлада часта перарываецца бескаралеўямі, якія цягнуцца ад смерці караля да абрання яго наступніка. Бескаралеўі цягнуцца часам цэлыя гады і наносяць вялікую шкоду гаспадарству, аслабляючы цэнтральную дзяржаўную ўладу.

На першы пачатак бескаралеўе цягнулася больш году. Запоўнена яно палітычным бязладдзем і анархіяй. Шляхта разбілася на некалькі партый, змагаючыся адна з другою наўкола пытання аб каралі. Кожная з партый дамагалася здабыць каралеўскую карону свайму кандыдату. Найбольш вядомымі і папулярнымі з кандыдатаў былі: Фёдар, царэвіч Маскоўскі, сын Івана IV Грознага, Эрнест, прынц Аўстрыйскі, і Генрых Анжуйскі, прынц Французскі. Партыя Фёдара складалася з літвінаў і беларусаў, на чале яе стаяў менскі кашталян Глебавіч. Перагаворы з Грозным наконт Фёдара не далі нічога. Палякі патрабавалі, каб Фёдар зрабіўся каталіком і каб да Рэчы Паспалітай былі далучаны Смаленск і Полацак [3]. Грозны смяяўся з гэтага, гаворачы, што Фёдар «не красная девица», што пасагу яму не належыць; лепш няхай палякі дадуць яму Кіеў. Проці гэтай кандыдатуры былі ўцекачы з Масквы — Курбскі, Цяцерын, Сарыгозін і інш. Яны добра ведалі слабавольны характар царэвіча Фёдара, поўную адсутнасць у яго не толькі палітычнага, але й наогул звычайнага розуму, што гэта, па словах Грознага, «не цар, а панамар». Яны разумелі, што дзякуючы ўсяму гэтаму каралём Польшчы быў бы не Фёдар, а яго бацька Іван Грозны, ад тэрору якога яны і ўцяклі з Масквы. Не дагаварылася панства і з Эрнестам Аўстрыйскім, які выяўляў рашучы характар. Пасля доўгіх размоў і перагавораў быў абраны за караля Рэчы Паспалітай Генрых Французскі [4]. Пракараляваў ён вельмі нядоўга (1573—1574). Прыехаўшы ў Варшаву і пабачыўшы, што караляваць у Рэчы Паспалітай не так лёгка, як, напрыклад, у Францыі, Генрых праз 6 месяцаў неспадзявана для палякаў... уцёк з Польшчы на сваю бацькаўшчыну. Там ён хутка заняў каралеўскі пасад пасля смерці свайго старшага брата Карла IX.

Зноў пачалося бескаралеўе, якое пагражала зацягнуцца на доўгі час. Толькі ў 1576 годзе каралём Польшчы [5] быў абраны сяміградскі ваявода Стэфан Баторы (1576—1586) [6]. Гэта быў разумны і выдатны палітычны дзеяч і вельмі здольны ваяка. З вялікаю карысцю для Рэчы Паспалітай ваяваў ён з Масквою (працяг Лівонскай вайны...). (...) Найраней войскі былі пакіраваны на Полацак, які ў папярэднія часы адышоў да Маскоўскага гаспадарства. Войскі аблажылі Полацак. Весці аблогу было вельмі цяжка: горад меў моцныя муры і замчышчы, апроч таго, была вельмі мокрая восень, што перашкаджала акопным работам і падвозу харчоў для арміі. Аблога зацягнулася. (...) Нягледзячы на храбрую абарону..., урэшце, удалося дабіцца сваёй мэты, і Полацак быў узяты. Баторы, паважаючы храбрасць абароны, абяцаў тым, хто мае намер вярнуцца ў Маскоўшчыну, даць вольны выезд, а тым, хто захоча застацца,— даць права вольнага жыцця ў Полацку [7]. Калі маскоўскія войскі безаружныя выходзілі з гораду, сам кароль даглядаў за тым, каб яго абяцанне не было парушана...

Пасля выйсця маскоўскіх войск пачаўся грабеж гораду. (...) У час грабяжу загінула ад пажару і каштоўная полацкая кнігарня. Сярод рукапісаў кнігарні загінулі такія цікавыя рукапісы, як, напрыклад, пераклад св. Пісання, напісаны рукою славянскіх апосталаў Кірылы і Мяфодзія, і летапіс Крывіцка-Полацкай зямлі [8]. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што раней, калі Полацак... перайшоў у рукі Івана Грознага, шмат чаго было вывезена ў Маскву. Усё гэта, зразумела, наносіла вялікую шкоду Беларускай зямлі.

Праз нейкі час войскі Стэфана Баторага ўзялі другарадныя крэпасці Сокал і Сугну, якія былі пабудаваны Іванам Грозным, а таксама і гарады Веліж, Усвят і Вялікія Лукі. У 1582 годзе Баторы пачаў аблогу... Пскова, якога ён не здолеў ужо ўзяць. Абедзве дзяржавы пасля некалькіх гадоў змагання былі вельмі аслаблены вайною, і распачаліся... перагаворы аб згодзе. Згода, урэшце, была падпісана... у 1582 годзе. Маскоўскае гаспадарства павінна было прызнаць перамогу Рэчы Паспалітай і аддало ёй усю Лівонію і гарады Полацак і Веліж.

Што датычна да Беларусі, то для яе гэтая вайна карыснай не магла быць, бо руйнаваўся яе набытак, што добра відаць з разгрому Полацку. Яшчэ відней гэтае стане, калі мы дабавім, што згодна весткам сучаснікаў, увесь край, больш чым на 50 вёрст вакол Полацку, зрабіўся за часы Лівонскай вайны лясною пушчаю. Зніклі вёскі, зніклі нівы, знік і чалавек, працаваўшы тут у ранейшыя часы. (...)

Па смерці Стэфана Баторага зноў пачалося бескаралеўе, якое цягнулася каля году. На пасад Рэчы Паспалітай магнатамі і шляхтай быў абраны Жыгімонт III Аўгуст (1587—1632) са шведскай каралеўскай фамілії Ваза [9]. Гэта быў выхаванец і прыхільнік езуітаў, вельмі добры каталік і надта няздольны кароль. Ён даваў кірунак сваёй чыннасці не паводлуг палітычных, дзяржаўных мэт, а паводле свайго рэлігійнага настрою. Гісторыя адчыніла яму вялікія магчымасці для ўплыву на жыццё Маскоўскага гаспадарства, але дзякуючы сваёй някемнасці палітычнай ён гэтых магчымасцяў не скарыстаў як трэба. Масква якраз перажывала смутныя часы, вялікую сацыяльную і палітычную разруху. На маскоўскі пасад быў абраны сын Жыгімонта Уладзіслаў. У разумнейшых палітыкаў Рэчы Паспалітай, напрыклад, у вядомага гетмана [10] Жалкеўскага вынік цікавы план утварэння славянскага гаспадарства, у склад якога ўвайшла б і Масква і на чале якога б стала Польшча. Жыгімонт папсаваў увесь імперыялістычны план свайго гетмана сваёй упартай каталіцкай палітыкай. Ён больш цікавіўся пашырэннем каталіцтва, чым пашырэннем тэрыторыі гаспадарства.

У часы гэтага караля зноў на тэрыторыі Беларусі йшла крывавая вайна. З восені 1609 году да восені 1611 году йшла аблога Смаленску, і Жыгімонт з вялікім войскам стаяў пад горадам, пакуль урэшце не ўзяў яго. Само сабой разумеецца, што гэтая армія кармілася тым, што можна было ўзяць з Беларусі. Потым на працягу 7 гадоў праз Беларусь бесперарыўна праходзілі войскі, якія йшлі ў Маскву і вярталіся адтуль у Польшчу. Усе гэтыя войскі таксама карміліся з Беларусі. Шмат народу было сарвана з тэрыторыі Беларусі як у рэгулярную армію, так і ў прыпад-

---

Заканчэнне.

Пачатак на стар. 28.

ковыя вайсковыя групы...

Толькі ў 1618 годзе ў невялічкай вёсцы Дзяўліне (каля Масквы і Тройца-Сергіевай лаўры) адбылося часовае замірэнне паміж Масквою і Рэчаю Паспалітаю.

Але барацьба не скончылася. Справа ў тым, што Уладзіслаў, абраны раней на маскоўскі пасад, не хацеў адрачыся ад сваіх правоў на Маскоўскае гаспадарства. З гэтым не мог згадзіцца рускі цар Міхаіл Раманаў, абраны на маскоўскі пасад у 1613 годзе. Калі каралём Польшчы [11] зрабіўся... Уладзіслаў (...1632—1648), змаганне пайшло зноў, і зноў гэтае змаганне адбывалася на тэрыторыі Беларусі.

Моцнае маскоўскае войска лікам у 32 тысячы людзей пачало руйнаваць Беларусь і аблажыла Смаленск. На дапамогу Смаленску... прыйшоў Уладзіслаў з арміяй, каторы і прымусіў масквічоў здацца. Вайна цягнулася далей, але ўжо без усякай карысці для Уладзіслава. Пасля двух гадоў вайны (1632—1634) пачаліся перагаворы аб згодзе. Паслы Масквы і Рэчы Паспалітай... падпісалі «вечную згоду». Смаленск і іншыя гарады, згубленыя Масквою за часы смуты, засталіся зацверджанымі за Рэчаю Паспалітаю. Уладзіслаў, з свайго боку, адмовіўся ад правоў на маскоўскі пасад. (...)

У палове XVII стагоддзя скончыўся казацкі рух на Украіне. Ён скончыўся тым, што Украіна... паддалася пад «цара ўсходняга праваслаўнага». Дзеля гэтага ў часы кіравання польскага караля [12] Яна Казіміра (1648—1668) і маскоўскага гаспадара Аляксея Міхайлавіча (1645—1676) зноў пачаліся войны паміж Масквою і Рэчаю Паспалітаю, а руйнавалася паводлуг звычаю зноў Беларусь. Руйнаванне Беларусі йшло 13 гадоў, з 1654 да 1667 году [13].

У Беларусь увайшло маскоўскае войска амаль што не ў 200 тысяч людзей. Яно разбілася на чатыры часткі. Першая армія, на чале якой стаяў сам цар, пайшла на Смаленск і аблажыла горад. Другая армія праз усю цяперашнюю Віцебшчыну пайшла на Полацак, трэцяя — на Магілёў, чацвёртая — на поўдзень ад Магілёву. Застагнала, задымілася ад надужыццяў і пажараў Беларусь, пакрылася крывёю чалавечаю. Уся праца спынілася; што было здабыта цяжкай працаю — руйнавалася. Найраней здаўся Смаленск, ваявода якога Піліп Абуховіч быў падкуплены маскоўскім золатам. Цяпер былі насцеж адчынены маскоўскаму войску вароты на ўсю Беларусь, і яно пайшло ўперад... Прайшло некалькі месяцаў, і ў руках маскоўскага гаспадара апынуліся гарады Магілёў, Віцебск, Менск, Горадня, Коўна, Вільня, Трокі. (...) Усяго было ўзята Аляксеем Міхайлавічам больш чым 200 гарадоў, мястэчак і замкаў. Пасля таго, як былі здабыты абедзве сталіцы былога Літоўска-Беларускага гаспадарства, Вільня і Трокі, маскоўскі гаспадар пачаў тытулаваць сябе «ўсяе Вялікія, Малыя і Белыя Русі самадзержцам».

У гэты самы час на Рэч Паспалітую з поўначы напалі шведы, а з поўдня — украінскія казакі. (...) Выратавалася гаспадарства толькі дзякуючы таму, што пачалася барацьба паміж шведамі і маскоўскім царом, які зрабіў замірэнне з палякамі [14] і пачаў вайну са шведамі, а Рэч Паспалітая ў гэты час крыху паднялася на ногі, і справы яе пайшлі лепш. Калі зноў, пасля замірэння, Масква пачала вайну з Рэчаю Паспалітаю, то ўжо яна не мела вялікай для сябе карысці. (...) Урэшце змучаныя гаспадарствы павінны былі ў 1667 годзе зрабіць у Андрусаве (недалёка ад Смаленску) замірэнне на 13 з палавінаю гадоў.

Умовы замірэння былі такія. Маскоўскі гаспадар адмовіўся ад Літвы і Беларусі, здабытых яго войскамі, але затрымаў за сабою Смаленск з акалічнымі землямі... Да Масквы яшчэ адышла Левабярэгавая Украіна і на правым беразе Дняпра — Кіеў. Кіеў быў адступлен Маскве на два гады, але застаўся за ёю назаўсёды. Адзін з артыкулаў замірэння даваў маскоўскаму гаспадару права заступніцтва за праваслаўных жыхароў Польшчы.

У часы кіравання... Міхала Вішнявецкага (1669—1673) і Яна Сабескага (1674—1696) барацьбы паміж Рэчаю Паспалітаю і Масквою не было. Рэчы Паспалітай прыйшлося змагацца з туркамі. Каб атрымаць дапамогу Масквы ў гэтым змаганні, Ян Сабескі ў 1686 годзе згадзіўся падпісаць «вечную згоду» з Масквою на ўмовах Андрусаўскага замірэння. Маскоўскі ўрад ужо адкрыта абвясціў сябе патронам праваслаўных у Рэчы Паспалітай. У грамаце згоды абгаворана недатычнасць праваслаўных епархій і пасвячэнне епіскапаў кіеўскім мітрапалітам, які залежаў ад Масквы. Гэтыя артыкулы давалі маскоўскаму ўраду права ўмешвацца ў хатнія справы Рэчы Паспалітай.

У часы кіравання караля Аўгуста II (1697—1733) [15], сучасніка Пятра Вялікага, на абшарах Беларусі, Украіны і Вялікарусі адбывалася добра вядомая ўсім Паўночная вайна. І тут папляцілася Беларусь за чужыя інтарэсы. Пётр, каб лепш падрыхтавацца да вайны ў сваіх межах, паслаў свае войскі на Беларусь, каб яны тут затрымлівалі шведаў. З 1701 году аж да 1709 году Карл «увяз в Польше» і на Беларусі. Зноў руйнаваліся гарады і вёскі, зноў Беларусь была тэрыторыяй вайны [16]. Расія карыстае са слабасці Рэчы Паспалітай і ўмешваецца на грунце папярэдніх трактатаў у хатняе жыццё аслабелага суседа. Вядома, што па затрабаванні Пятра Аўгуст II у 1720 годзе выдаў грамату, якая забяспечвала правы праваслаўнай беларускай епархіі.

Па смерці Аўгуста II рускія войскі прыходзілі на Беларусь і Польшчу, каб пасадзіць на каралеўскі пасад яго сына Аўгуста III (1733—1764). Гаспадарства ў часы яго кіравання перажывае хатнюю анархію, будуючы сабе труну. Кароль, не маючы моцы спыніць бязладдзе, жыве ў сваёй бацькаўшчыне, у Саксоніі, толькі часам наязджаючы ў Варшаву. Рэлігійны ўціск праваслаўных і пратэстантаў прымусіў іх шукаць абароны свайго права за межамі Рэчы Паспалітай. Беларускі праваслаўны архіепіскап Георгій Канiскі, ездзіўшы ў Расію на каранацыю Кацярыны II, звярнуўся да яе з просьбаю аб абароне праваслаўнага насялення ў Рэчы Паспалітай. Тое самае рабілі прадстаўнікі польскіх пратэстантаў у... нямецкіх дзяржавах — Аўстрыі і Прусіі. Паступова падгатаўляўся той грунт, абапіраючыся на каторы адбыліся падзелы Рэчы Паспалітай у часы апошняга яе караля Станіслава Панятоўскага, які каралявaў пад імем Аўгуста IV (1764—1795) [17].

КАНЕЦ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Каля паловы XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая перажывала стан поўнага развалу. Уся палітычная ўлада ў дзяржаве была ў руках шляхты, якая выкарыстала з свае палітыка-сацыяльнай «залатой» вольнасці толькі ў сваіх класавых інтарэсах. Другія станы гаспадарства і нават кароль не мелі ніякіх правоў. (...) Дайшло да таго, што шляхта мела права складаць у гаспадарстве ваенныя саюзы для абароны сваіх класавых інтарэсаў і правоў (так званыя канфедэрацыі) і законна падымаць бунт проціў караля (рокаш), калі ён парушаў шляхецкія правы. Кароль не заставаўся ў даўгу ў шляхты. Каб бараніць сябе, ... кароль павінен быў шукаць апоры пры чужаземных дварох, і чужаземныя дзяржавы атрымалі поўную магчымасць умешвацца ў хатнія справы Рэчы Паспалітай.

Шляхта, з свайго боку, папала ў рукі

КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ

Барскія канфедэраты, змагаючыся з праваслаўным насельніцтвам, якое было ў большасці мужыцкім, выклікалі даволі шырокія паўстанні так званых гайдамакаў (мужыкоў, што казакавалі ў Правабярэжнай Украіне). Да гайдамакаў далучылася і дробная праваслаўная шляхта. На чале паўстання стаў запарожац Максім Жалазняк. Найкрывавейшым эпізодам паўстання была вядомая Уманская разня.

Калі разгарэлася паўстанне і прыняло выразны сацыяльны кірунак, то паміж рускім урадам, які з'явіўся наводзіць парадкі, і Барскай канфедэрацыяй адразу адбылася згода. Абедзве стараны прыняліся за паўстанцаў. Пачалася расправа. Рускі праваслаўны ўрад абманам злавіў праваслаўнага Жалазняка і выслаў яго ў Сібір, пакараўшы раней

багацейшых сваіх прадстаўнікоў, якія і зрабіліся сапраўднымі гаспадарамі ў дзяржаве. Соймы ў апошнія часы не маглі зусім працаваць дзякуючы прынцыпу аднагалоснасці. Даволі было падкупіць ці ўгаварыць якога-колечы... пасла сойму, каб ён не згаджаўся з пастановаю сойму, і ён мог яе сарваць сваім... «не позвалям» (liberum veto). Пры такіх умовах можна было прыпыніць кожную рэформу, вельмі карысную для гаспадарства, якая чамусь не спадабалася якому-колечы крыкліваму шляхціцу-паслу.

У грамадзянскім жыцці Польшчы[18] таксама панавала поўнае бязладдзе. Магнаты вялі сапраўдныя войны паміж сабою і крыўдзілі як драбнейшую шляхту, так і другія станы грамадзянства. Шляхта наогул здзекавалася і крыўдзіла мяшчан і мужыкоў. Каталікі рабілі ўціск над некаталікамі, так званымі дысідэнтамі. Дысідэнты ў адказ на ўціск, не маючы абароны ад дзяржавы, павінны былі складаць канфедэрацыі і звяртацца да чужаземнай улады. Суседнія дзяржавы, разумеецца, карысталіся з такога палажэння Рэчы Паспалітай.

У 1767 годзе дысідэнты... дзеля абароны сваіх парушаных каталіцкаю шляхтаю правоў утварылі саюз з цэнтрам у Слуцку, так званую Слуцкую канфедэрацыю. Гэтую канфедэрацыю падтрымлівалі дзяржаўныя прадстаўнікі Расіі, Прусіі і Аўстрыі[19]. Калі сойм адмовіўся ўхваліць пастановы, якіх дамагаліся чужаземныя паслы і канфедэрацыя, то ў Варшаву былі ўведзены рускія войскі, заарыштаваны правадыры крайне каталіцкай партыі сойму, і сойм павінен быў здацца. У 1768 годзе сойм ухваліў пастанову, што ўсе дысідэнты ў Польшчы[20] не павінны прыгнятацца за іх рэлігійныя перакананні і маюць тое самае права, што й каталікі[21]. Расійскаму ўраду было дадзена права аберагаць правы дысідэнтаў і сачыць за недатычнасцю асноўных законаў Рэчы Паспалітай. Такім спосабам Расія атрымала як бы пратэктарат над Польшчаю.

У адказ на гэта ўтварылася супрацыўная канфедэрацыя ў г. Бары[22], каторая паставіла сабе за мэту абарону паменшаных, з яе погляду, правоў каталіцтва і незалежнасці сойму. (...) «кнутом». Паўстанцаў і іх прыхільнікаў... вешалі, катавалі. Вельмі пашыранай карай было адсякванне рук і ног. Вялікі лік бязногіх і бязрукіх жабракоў на Беларусі доўга сведчыў аб гайдамацкім паўстанні. А палажэнне ў Польшчы[23] не паправілася, бо, расправіўшыся з паўстанцамі, Расія рукамі Суворава прыкончыла і з канфедэратамі.

Пасля гэтага Прусія, Аўстрыя і Расія паставілі пытанне аб змяншэнні Польшчы, якая не можа сама справіцца са сваімі землямі. Згода паміж суседзямі хутка адбылася. Прусія ўзяла сабе Памеранію і кавалак Вялікай Польшчы — тыя землі, якія былі паміж Прусіяй і Брандэнбургам, Аўстрыя прылучыла да сябе Галіцыю. Расія атрымала ваяводствы Магілёўскае, Мсціслаўскае і частку Полацкага. (...) Так адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай у 1773 годзе.

Падзеі 1773 г.[25] прабудзілі рэфарматарскі рух сярод разумнейшых слаёў шляхты Рэчы Паспалітай. У сваіх думках яны трымаліся ідэй французскай асветнай філасофіі і літаратуры. Вялікая французская рэвалюцыя... падняла іх палітычны настрой і задумаць рэформу Польшчы[26]. Скарыстаўшы рэфарматарскі настрой большасці паслоў сойму, рэфармацыйная партыя, на чале якой стаяў граф Патоцкі, правяла праз сойм новыя... законы, вядомыя пад назвай канстытуцыі 3 мая 1791 году. (...)

Па новай канстытуцыі прапанаваўся такі строй Рэчы Паспалітай. Заканадаўчая ўлада належыць да двухпалатнага пастаяннага сойму, які абіраецца на два гады. Выканаўчую ўладу мае кароль, не выбраны, як гэта было раней, а наследны. Пастановы ў абедзвюх палатах ухваляюцца не аднагалосна, а большасцю галасоў, дзякуючы чаму касуецца стары звычай liberum veto. Міністры нясуць адказнасць перад соймам. Касавалася права шляхты на ўтварэнне вольных канфедэрацый. Шляхта, як і раней, лічылася пануючым станам у дзяржаве. Мяшчане дасталі права пасылаць сваіх паслоў у сойм. Апроч таго, яны атрымалі права купляць зямлю па-за межамі гарадоў і праз землеўласніцтва збліжацца сацыяльна і палітычна з шляхтаю. Буржуазія, такім

спосабам, дастала нейкае права, якое адпавядала запытанням таго часу. Але палажэнне сялян зусім не змянілася. Прыгон астаўся, як і раней, ва ўсёй моцы. Толькі і новага было, што пану давалася магчымасць вызваляць мужыка ад прыгону і паляпшаць яго жыццё, калі на тое была яго добрая воля і панская ласка. Абвешчана была свабода веры, аднак жа за каталіцтвам пакідалася палажэнне пануючай у гаспадарстве веры. Канстытуцыя, апроч таго, абвясціла поўнае зліццё Польшчы і Літоўска-Беларускага гаспадарства ў адзіны і непадзельны арганізм.

Як мы бачым, новая... канстытуцыя ўтварылася пад уплывам Вялікай французскай рэвалюцыі. Праўда, яна вельмі далёка адыходзіла ад буржуазных яе запатрабаванняў у бок старога феада-

лізму. Але і такая канстытуцыя была не па густу звычайнай шляхецкай масе. Скора шляхта для абароны сваіх парушаных... вольнасцяў злажыла Таргавіцкую канфедэрацыю... Яны, згаварыўшыся яшчэ раней з рускім урадам, звярнуліся да царыцы Кацярыны з заяваю, што яна, паводле пастановы сойму 1768 году, павінна абараняць стары строй Рэчы Паспалітай. Разумеецца, рускія войскі не прымусілі сябе доўга чакаць. Яны падтрымалі канфедэратаў і занялі Варшаву. Прускі кароль з свайго боку... заняў сваімі войскамі заходнія правінцыі Польшчы. Зноў вынікла пытанне аб кампенсацыі дзяржаў, якія патурбаваліся і зрабілі парадак у Рэчы Паспалітай. На гэты раз Расія й Прусія запатрабавалі ў сойме, скліканым ў Горадні, згоды на аддачу ім за фатыгу зямель. Пасля бескарысных спрэчак з прадстаўнікамі «дапамогшых» дзяржаў, паслы сойму, бачачы, што няма рады абараніць тэрыторыі ад захвату, замоўклі зусім. У такім нямым пасяджэнні сойм прасядзеў да глыбокай ночы. Гэтае маўчанне было растлумачана, як згода, і адбыўся другі раздзел зямель Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй і Расіяй. Прусія забрала Данцыг і Вялікую Польшчу, а Расія — Валынь, Падолію і Менскую акругу. Астатнія землі Рэчы Паспалітай былі абвешчаны фармальна пад пратэктарам Расіі. Варшава была занята рускімі войскамі.

Патрыёты, нягледзячы на ўсе беды, якія абрушыліся на Рэч Паспалітую, нягледзячы на здраду з боку рэакцыйнай шляхты, не пакідалі сваіх планаў аб тым, каб выратаваць сваю айчыну. Не маючы магчымасці працаваць адкрыта, яны павінны былі ўтварыць тайную арганізацыю і цэнтр яе перанесці ў замежныя землі. Мэтаю арганізацыі была барацьба за непадзельную і незалежную Рэч Паспалітую з канстытуцыяю 1791 году. Гэтыя арганізацыі былі і ў Польшчы, Літве, Беларусі. Яны працавалі сярод шляхты і мяшчан. Да сялянскіх слояў іх праца амаль што зусім не даходзіла.

Паўстанне пачалося адразу пасля другога раздзелу. У 1794 годзе паўстаннем былі ахоплены такія гарады, як Кракаў, Варшава, Вільня і Горадня. У Варшаве пасля таго, як яна была захоп-

лена паўстанцамі, злажыўся Часовы Урад, каторы абвясціў вайну Расіі і Прусіі. Дыктатарам і галоўным начальнікам над усімі збройнымі сіламі быў абраны Тадэвуш Касцюшка, вядомы яшчэ раней як абаронца канстытуцыі 1791 году ад Таргавіцкай канфедэрацыі. Сын дробнага шляхціца на Беларусі, ён вучыўся раней у Бярэсці, потым у вайсковай школе Чартарыйскага [27] ў Варшаве, адкуль, як здольны вучань, пасылаўся на скарбовы кошт у Францыю. Тут ён захапіўся рэвалюцыйным духам і пасля нядоўгага жыцця ў Польшчы паехаў у Амерыку, дзе абараняў незалежнасць Злучаных Штатаў ад Англіі. Там ён выдзеліўся сваімі здольнасцямі і храбрасцю і вярнуўся дадому як рэфарміст і змаганнік за новую Польшчу [28].

У пачатку паўстанне мела поспех. Была захоплена Варшава, і рускія войскі прымушаны былі пакінуць горад з вялікімі стратамі. Тое самае адбылося ў Вільні і ў другіх гарадох. Касцюшку ўдалося разбіць некалькі раз асобныя рускія групы. Паўстанцаў падтрымлівалі ў пачатку сяляне, каторым Касцюшка асобнаю адозваю абяцаў волю.

Цікава зазначыць, што адразу выявіліся нейкія нязгоды паміж асобнымі правадырамі паўстання. З Вільні Касцюшка атрымаў вестку, што Найвышэйшая Літоўска-Беларуская Рада, на чале якой стаяў Ясінскі [29], галоўны начальнік над літоўска-беларускімі збройнымі сіламі, «прысвоіла сабе самазванна ўладу і ўводзіла дух нязгоды, што разрывае вунію двух братніх народаў». Касцюшка павінен быў напісаць ліст Ясінскаму, у якім вінаваціў яго ў сепаратызме. Скора паўстанцы пачалі адчуваць патрэбу ў сродках. Тыя ахвяры, якія раней паступалі ў вялікім ліку, скараціліся. Перамяніўся настрой сялянства ў адносінах да паўстання, бо хутка стала ясна, што абяцанкі Касцюшкі так і астаюцца абяцанкамі, што шляхта і не думае аб вызваленні сялян. Сялянства як у Польшчы, так і на Беларусі не падтрымлівае ўжо паўстанцаў.

Пры такіх абставінах не трудна было справіцца з паўстанцамі.

Першы ўвайшоў з войскамі на землі Польшчы прускі кароль з заходняга боку. Праз нейкі час процію войск Польшчы выправіла свае сілы Аўстрыя, заняўшы паўднёвыя землі. Кацярына II, урачыста вызначыўшы, што Рэч Паспалітая зробіцца «гибельным горном, угрожающим спокойствию и безопасности соседей», пакіравала свае войскі з усходу пад кіраўніцтвам... Суворава. Доля Рэчы Паспалітай вырашалася ў бойцы паміж рускімі і польскімі войскамі пад Мацяёвіцамі, недалёка каля Варшавы. Польскія войскі былі разбіты, Касцюшка быў паранены і ўзяты ў палон [30]. Пасля крывавага штурму была забрана ваколіца Варшавы Прага (1794). Варшава павінна была здацца. У горад былі ўведзены, апроч рускіх, аўстрыйскія і прускія войскі. Па ўсім краі паўстанцкія групы былі знічтожаны. Апошні кароль Рэчы Паспалітай Аўгуст IV (Станіслаў Панятоўскі) павінен быў адрачыся ад пасаду і пераехаў на жыццё спачатку ў Горадню, а потым у Пецярбург, дзе й памёр праз некалькі гадоў. Паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй адбыўся апошні, трэці падзел Рэчы Паспалітай у 1795 годзе. Расія з гэтага падзелу атрымала заходнюю частку Беларусі і ўсходнюю частку Літвы, што злажыла губерні Віленскую, Горадзенскую і Коўенскую. Апроч таго, да Расіі была прылучана і Украіна да Заходняга Буга. Аўстрыя і Прусія прылучылі да сваіх зямель рэшткі польскіх зямель.

Рэч Паспалітая як дзяржава перастала існаваць, а Беларусь увайшла ў склад царска-дваранскай Расійскай імперыі. Пачаўся новы перыяд беларускае гісторыі.

БЕЛАРУСІ

---

[1] Нагадаю, што аб'яднаная, федэратыўная дзяржава называлася «Рэч Паспалітая абодвух народаў», што Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае мела свой сойм, урад, сваё войска, свае межы.

[2] Як вялікі князь, Жыгімонт Аўгуст быў апошнім Гедымінавічам.

[3] Гэтыя гарады былі заваяваныя Іванам Грозным на пачатку Лівонскай вайны.

[4] У літаратуры яго называюць Генрыхам Валуа.

[5] І вялікім князем літоўскім.

[6] Сяміградзе (Трансільванія) цяпер у складзе Румыніі. Стэфан (Іштван) Баторы, або Сцяпан Батура, як яго называюць у помніках беларускай пісьменнасці, па жаночай лініі паходзіў з роду Гедымінавічаў. Стаўшы каралём і вялікім князем, ён размаўляў толькі па-лацінску або па-венгерску.

[7] Справа ў тым, што ў 1563 г. Іван Грозны раздаў сваім ваяводам і дваранам або знішчыў амаль усіх жыхароў Полацка і яго ваколіц.

[8] Летапіс быў вывезены ў Маскву. У XVIII ст. яго бачыў рускі гісторык Таціщчаў. Ёсць звесткі, што Кацярына II загадала знішчыць гэты летапіс, бо ён не адпавядаў афіцыйнай вялікадзяржаўнай рускай тэорыі, паводле якое беларусы толькі й марылі аб тым, каб быць пад рукою праваслаўнага цара.

[9] Маці Жыгімонта Вазы — Кацярына — была дачкою Жыгімонта Старога.

[15] Гетмана кароннага (польскага).

[11] І вялікім князем літоўскім.

[12] І вялікага князя літоўскага.

[13] У час вайны Вялікае Княства страціла кожнага другога жыхара. Менавіта выніку гэтае вайны ўзмацніліся польскія і каталіцкія ўплывы на Беларусі, а старабеларуская мова перастала быць дзяржаўнаю ў Вялікім Княстве.

[14] І Вялікім княствам Літоўскім.

[15] Аўгуст II Дужы быў курфюрстам саксонскім. У гісторыю ён і яго сын, Аўгуст III, увайшлі як Сáсы.

[16] Рускія войскі спрычыліся да разбурэння Сафійскага сабора і Полацку. Святыня, страціўшы першапачатковы выгляд, была пазней адбудавана ўніятамі. У гэтай вайне Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара.

[17] Станіслаў Панятоўскі пачынаў кар'еру як пасол Рэчы Паспалітай у Расіі. Там ён стаў каханкам вялікай княгіні Кацярыны Аляксееўны, будучай царыцы Кацярыны II, яна і пасадзіла яго каралём.

[18] Рэчы Паспалітай.

[19] Пры ўтварэнні Слуцкай канфедэрацыі даходзіла да таго, што адзін шляхціц падпісваўся і за сябе, і за суседзяў. Яе ініцыятарам можна назваць расійскага пасла. Справа ў тым, што Расія і Прусія дамовіліся аб супольных дзеяннях супраць Рэчы Паспалітай у 1764 г. У 1768-м настаў час дзейнічаць.

[20] У Рэчы Паспалітай.

[21] Паляжэнні пастановы распаўсюджваліся толькі на шляхту.

[22] Горад у Заходняй Украіне.

[23] У Рэчы Паспалітай.

[24] Рэчы паспалітай.

[25] Памылка друку. Першы падзел Рэчы Паспалітай адбыўся ў 1772 г.

[26] Рэчы Паспалітай.

[27] Князь Адам Юры Чартарыйскі будзе потым сенатарам і міністрамзамежных спраў Расіі.

[28] Пра Касцюшку і падзелы Рэчы Паспалітай чытайце: Я. А. Юхо. За вольнасць нашу і вашу. Мн., «Навука і тэхніка», 1989.

[29] Якуб Ясінскі быў радыкальным дзеячам і патрыётам Вялікага Княства.

[30] Т. Касцюшку змяніў наш зямляк Тамаш Ваўжэцкі. Пазней цар Павел I выпусціць Касцюшку з вязніцы.

Падрыхтоўка тэксту і каментарыі Анатоля СІДАРЭВІЧА.

Людміла САЯНКОВА,
Людміла ПЕРАГУДАВА

ШЧАСЛІВЫ НЕШЧАСЛІВЕЦ

Ён і праўда шчаслівы: што хацеў — тое здымаў, што здымаў — тое атрымлівалася. Усе фільмы — розныя, непадобныя адзін на адзін: «Бераг прынцэсы Люсьскі», «Зімародак», «Хлеб пахне порахам», «Сын старшыні», «Узбочына», «Ціхія троечнікі», «Дзяржаўная граніца», «Бацькі і дзеці», «Дуброўскі». Розныя яны і па мастацкіх вартасцях. Але ніводны з фільмаў не прайшоў незаўважаны. Больш таго, усё помніцца і цяпер. І што зусім нечакана — адчуваеш сапраўдную душэўную патрэбу ў некаторых з іх. Згадайце фільм «Бацькі і дзеці»... «Шчаслівым нешчасліўцам» кінарэжысёр **Вячаслаў НІКІФАРАЎ** стаў, як нам здаецца, з таго самага дня, калі ўзначаліў Саюз кінематаграфістаў БССР. Чаго толькі ні здарылася з тае пары: і добраахвотны выхад шасці сакратароў са складу праўлення, і пазачарговы (ён жа надзвычайны) з'езд кінематаграфістаў БССР, і неадназначная сітуацыя з фільмам Аркадзя Рудэрмана «Тэатр часоў перабудовы і галоснасці», і досыць вялікі паток выказаных недавераў, і звышстамляльны паядынак паміж кінастудыяй і саюзам, і прамыя пагрозы па тэлефоне... Атмасферу хаосу і нядобразычлівасці не назавеш спрыяльнай для творчага адраджэння кінасаюза.

— Вячаслаў Аляксандравіч, ці лёгка ўзначальваць творчы саюз?

— Шчыра: нялёгка. І, прызнаюся, я пазбавіўся дужа многіх надзей і аптымізму.

— Але ў вас усё-такі не знікла жаданне бачыць сваё дзіцятка ўзмацнелым?

— Не, не знікла. Я ніколі не меў ілюзій наконт кіраўніцтва. Бо прафесіі «кіраўнік творчага саюза» няма і быць не можа. У мяне ёсць свая прафесія. Але я спадзяваўся — магчыма, самалюбіва,— што змагу ў такой якасці зрабіць нешта канкрэтнае, адчувальнае. Інакш нельга. І гэта мяне ўтрымлівае ад таго, каб узяць самаадвод.

— А вы і праўда лічыце, што можна стварыць адзіны, паўнацэнны творчы саюз? Існуе думка, што ён зусім не патрэбны. Высветлілася, што ва ўсіх розныя інтарэсы, розныя пункты гледжання і аб'ядноўвацца ў адно цэлае няма сэнсу. Маўляў, патрэбныя проста групы па інтарэсах.

— Як гэта — групы па інтарэсах? Па прафесіях?

— Не. Па поглядах, светаадчуваннях.

— Ну не. Для гэтага патрэбны студыі, яшчэ нейкія фарміраванні. Але саюз як творчая арганізацыя шматкамі, кавалкамі існаваць не павінен. У мяне дастаткова аптымізму, упэўненасці ў тым, што саюз можа быць адным цэлым.

— Аднак пазачарговы (часцей кажуць — надзвычайны) з'езд (дый не толькі з'езд) паказаў, што разброд ёсць, што з'яднаць усіх практычна немагчыма.

— Гэты з'езд атрымаўся трохі бязладны. Мы хіба што на крыві не закліналі: толькі не апусціцца да сварак. Вырашылі, што будзем імкнуцца да таго, каб кансалідавацца і выпрацаваць пэўную платформу. А яна ў нас была. Беларускі кінематограф стаіць перад неабходнасцю выпрацоўкі канцэпцыі нацыянальнага кінематографа. Гэта даўняя ідэя, але ўсе нашыя сваркі замінаюць яе ажыццяўленню. Аднак з'езд мусіў адбыцца. І добра, што ён адбыўся.

— Нават у такім выглядзе? На нашую думку, з'езд паказаў якраз ступень культуры (дакладней, адсутнасць такой) кінематаграфічнага асяроддзя.

— Рыбараў добра тады сказаў: «Чаму мне ўсё гэта непрыемна? Бо гэта пазбаўляе мяне задавальнення спрэчкі». А сапраўды, істэрычнасць, азлобленасць не толькі пазбаўляюць нас задавальнення спрэчкі, яны пазбаўляюць нас задавальнення займацца сваёй справаю, задавальнення паважаць сябе. Аднак лічу, што менавіта з'езд падштурхнуў да неабходнасці выпрацаваць сваю праграму кіно, укараніць яе ў свядомасць, у каналы кіраўніцтва рэспублікі.

— Гэтая праграма развіцця кіно — як адзін з магчымых варыянтаў адраджэння беларускай нацыянальнай культуры?

— Ды як хочаце! Назавіце гэта базавай мадэллю рэспубліканскага кінематографа. На ўсе пытанні пакуль няма адказу. Як гэта будзе адбывацца? Якім чынам будзе фінансавацца? Якую тему лічыць прыярытэтнай? Што — прыйдзе «генерал» і выпрасіць для нас што-небудзь? Ці зноў будзе, як раней: хто першы прыбяжыць у кабінет, у каго больш рэгалій, за тым і праўда? Ці зноў сто гадоў даводзіць, што нам вельмі патрэбны друкаваны орган беларускага кіно, калі хочам, каб развівалася яго тэорыя, гісторыя, каб расла і множылася беларуская школа кіно? Мы павінны зрабіць на Беларусі тое, чаго ў нас ніколі не было. Комплексная, навуковая праграма, узгодненая з усімі жыццёва важнымі бакамі культуры і эканомікі рэспублікі,— вось што нам трэба.

(Дзеля гэтага В. Нікіфараў выступіў увосень 1989 года ініцыятарам правядзення дзелавых гульняў «Нацыянальнае культурнае адраджэнне Беларусі», запрасіўшы прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, філосафаў, сацыёлагаў, культуролагаў, эканамістаў. Кінематаграфістаў было мала. З рэжысёраў ігравога кіно — адзін: В. Нікіфараў.— Кар.)

Трэба, каб у Дзяржплане існавала магчымасць дадатковага фінансавання найважнейшых тэм. Не трэба вечна добрага дзядзьку шукаць. А то ва ўсім у нас так: ходзім, просім.

— Здаецца, у вас не павінна быць падставы для песімізму. Калі праграма будзе задзейнічана... Дарэчы, а ці цяжка сумяшчаць «сакратарства» ў саюзе і «рэжысёрства» на студыі?

— У такой сітуацыі сумяшчаць ніяк нельга. Што-небудзь абавязкова «закульгае». У мяне так атрымалася, што фільм «Дуброўскі» павінен быў выйсці на экраны чатыры гады назад, а выйшаў толькі летась.

— Ці задаволены вы сваёй творчасцю?

— Бачыце, я не з тых герояў, якія адразу нешта задумваюць, а потым чакаюць, шукаюць. Я быў больш наіўны, бо захоўвалася павага да вытворчасці, студыі. Заўсёды меркаваў: што ёсць у сцэнарным партфелі студыі, тое і трэба рабіць. Толькі з першай карцінаю — «Бераг прынцэсы Люські» — мне пашанцавала. Гэта была сумленная работа. Проста прапанавалі, і я з радасцю згадзіўся. А потым усё здымаў у адпаведнасці з планамі студыі. «Зімародак», «Хлеб пахне порахам»... Цяпер ужо можна пэўна сказаць: гэтыя сцэнарыі валяліся падоўгу, іх ніхто не рашаўся браць. А я гэтага не разумеў. Недзе на «Сыне старшыні» ўсвядоміў, што можна сапсаваць руку, страціць густ, прывыкаючы рабіць толькі тое, што трэба.

— Відавочны парадокс: выконваючы студыйныя, планавыя тэмы, вы ўсё ж кожны раз траплялі ў цэль, рабіліся вядомым, набывалі аўтарытэт, з вамі пачалі лічыцца як з рэжысёрам.

— Напэўна, гэта зноў жа ад бязрыб'я, на агульным фоне. Калі б на студыі было болей таленавітых рэжысёраў са сваімі тэмамі...

— Вы кожны раз, за што ні браліся, былі такі розны. «Фруза», а потым — раптам! — «Бацькі і дзеці». Калі з'явілася экранізацыя тургенеўскага рамана, усе паглядзелі на вас зусім інакш. Было адчуванне калі не шоку, дык здзіўлення, нечаканасці: Нікіфараў, які паставіў адну з серый «Дзяржаўнай граніцы» (даруйце ўжо, цягамоціну нейкую), той самы Нікіфараў — і раптам — прарыў...

— А вы ўсё-такі яшчэ раз паглядзіце «Дзяржаўную граніцу». Мне яна падабаецца.

— Баімся, што застанемся пры сваёй думцы... Кажуць, што на працягу ўсяго жыцця кінематаграфіст здымае адзіную карціну. Вядома, узнікаюць новыя тэмы, сюжэты, нават жанры, але яны складваюцца ў адзін фільм. Калі вы згодныя з гэтым, дык як тады называецца ваша адзіная карціна?

— Вы справядліва заўважылі, што фільмы вельмі розныя. І я лічу гэта з'явай нармальнаю. Бо прафесійны рэжысёр павінен умець працаваць у любым жанры. Усе фільмы — па сутнасці адзін фільм. І тут вельмі важна, каб гэты адзіны фільм уяўляў сабою мадэль свету. Я так думаю даўно. Проста не заўсёды гэта ўдаецца. Яшчэ ў часы «Прынцэсы Люські» я зрабіў такі запіс для сябе: «У фільм трэба цягнуць усё, ставіцца да яго як да свету, які трэба насяляць». Усё ўмясціць немагчыма, але імкнуцца да гэтага трэба. Гэта адна з маіх працоўных гіпотэз, якая мне вельмі дапамагае.

— Апошнім часам вы надаяце ўвагу выключна экранізацыі. Спрэчкі на тэму «Экранізацыя: добра ці дрэнна? Быць альбо не быць?», здаецца, прыкметна сціхлі. Ваш фільм «Дуброўскі», відавочна, выкліча новую хвалю дыскусій. Ці гатовыя вы да гэтага? І яшчэ. Існуюць два віды экранізацый, іранізуюць нашы кіназнаўцы: фільм, цітры якога пачынаюцца з партрэта аўтара буйным планам, важкі том з экранізаваным творам, разгортваецца кніга і... пачынаецца фільм, які здымаецца даслоўна, усё роўна як чытаецца даслоўна раман; і другі від экранізацыі — так званае «паводле», дзе імя вялікага патрэбна рэжысёру часам толькі як драпіроўка да ўласных фантазій. «Дуброўскі» — «класічны твор» ці «паводле»?

— Гэтыя дасціпныя кіназнаўчыя дзяленні дужа ўмоўныя. Тут не хапае для універсальнасці яшчэ аднаго жартаўлівага вызначэння: аўтарская экранізацыя. Дый хоць на маім прыкладзе... «Дуброўскі» — «паводле», але ў сэнсе мовы і аўтарскага падыходу гэта зусім традыцыйнае, акадэмічнае прачытанне. «Паводле» ў тым сэнсе, што ў тэксце я нічога не мяняў, але паказаў усё настолькі па-аўтарску, што вы твор можаце не пазнаць.

— ???...

— Перш чым прачытаць сцэнарый (сцэнарысты О. Нікіч і Я. Грыгор'еў), я, вядома, перачытваў, і не аднойчы, арыгінал. І не сумняваўся: фільм будзе! Для мяне было вельмі важна, што Дуброўскі (як і Базараў) — сучасны герой, калі хочаце — герой будучыні, герой надзеі.

— У гэтай сувязі хочацца згадаць інтэрв'ю з вамі, апублікаванае ў «Знамени юности» яшчэ ў 1984 годзе. Вось што вы казалі пра Базарава: «Базараў — тып нашага часу. Ён максімаліст, рамантык, гуманіст, ён адзін з тых людзей, ад якіх патыхае надзеяй». Дуброўскі — такі ж герой, які нясе надзею. Але якую надзею?

— У інстытуце нам колісь казалі, што карысна любую, самую складаную гісторыю паспрабаваць перадаць у двух словах. Заўсёды ставіўся да гэтага скептычна. А потым зразумеў: гэта дакладны спосаб вылучыць з твора самае галоўнае. Дык вось, «Дуброўскі», калі коратка,— гэта адмаўленне ад помсты. Воляю лёсу, не маючы ніякага дачынення да канфлікту свайго бацькі і Троекурава, ён, Уладзімір Дуброўскі, баявы афіцэр, разумнік, уцягваецца ў машыну помсты. Чалавек, які страціў усё,— яму засталося адно помсціць. Думка гэта няхітрамудрая, але вечная. Усё чалавецтва калі-небудзь прыйдзе да гэтай думкі...

Інтэрв'ю на гэтым больш лагічна абарваць. Бо апошняя фраза выдатна падыходзіць да нашага цяперашняга жыцця. Мы задавалі пытанне Вячаславу Нікіфараву задоўга да падзей у Азербайджане, задоўга да фашысцкага ўсплёску антысемітызму. І як хочацца верыць, што словы, сказаныя рэжысёрам, стануць словамі надзеі: чалавек адмовіцца ад помсты як ад спосабу вырашаць канфлікты. Надзеяй патыхае і ягоная вера ў магчымасць адраджэння сапраўднае творчае садружнасці.

Я зрабіў тую карціну па ўласным жаданні і лічу, што яна — лепшае з усяго «створанага» мною ў войску. Вялікая, два на тры з паловаю метры, складзеная з двух кавалкаў тоўстае дыкты, карціна была задняю сцяной агромністае клеткі для папугаяў.

Клетку, па загаду начальніка клуба, змайстраваў сталяр Ігар, у абавязкі якога ўваходзіла рамантаваць клубную мэблю, якую салдаты, пад час кінасеансаў і паседжанняў трыбуналу, няшчадна псавалі, і рабіць мне падрамнікі ды планшэты. З тыдзень Ігар пілаваў рэйкі, збіваў іх у рамы, абцягваў сеткаю, ладзіў дзверкі, канструяваў і, нарэшце, адгарадзіў амаль палову перадпакоя фоталабараторыі. Адзінае, што псавала выгляд выдатна зробленай клеткі,— задняя сцяна.

— С-с-сцяна паганая. Дык-кты няма прыгожай,— Ігар з папяросай сядзеў у клетцы.— Я к-к — каду, па-па-пугайчык! — Колцы дыму разбіваліся аб сетку.

За сваю службу, а яна ўжо набліжалася да фіналу, мне давялося столькі напісаць самых разнастайных лозунгаў, партрэтаў правадыроў, аформіць штабных і вулічных стэндаў, што куды ні ўпінаўся позірк, ён абавязкова трапляў на вынікі маёй працы. З пачатку службы мяне захапляла ўласнае майстэрства і грандыёзныя памеры выкананых прац, але пад «дэмбель» мне пачало рабіцца брыдка ад трафарэтна-адкрытых твараў чырвонаармейцаў, ад ордэнаў, зорак і зорачак, сярпоў, аўтаматаў і лаўровага вецця... Пачало ванітаваць ад паказнога аптымізму, і я з ахвотаю проста фарбаваў сцены і крэсліў на іх літары, якія складаліся ў словы,— удумвацца ў сэнс напісанага я перастаў.

Мне захацелася намаляваць Афрыку ці, можа, не Афрыку, а проста поўдзень — Гавайскія выспы, бачаныя ў кіно ды на глянцавых старонках часопісаў. Мне захацелася цёплага мора, пальмаў, стракатых кветак, бананаў... Белай пены на хвалях і лёгкіх аблокаў, якія гоніць па блакітна-зялёным небе цёплы пасат,— мне захацелася таго, што я мог толькі сніць на вузкай панцырнай сетцы ў халоднай цёмнай казарме.

Я закатаў белаю фарбай дыкту, адклаў усе тэрміновыя заказы, за якія ніхто не скажа «дзякуй», і заняўся «Афрыкай». На вуліцы было мінус трыццаць, а вокны майстэрні былі непразрыста-белымі ад крупчастага шэраню.

«Афрыка! Афрыка! Афрыка!» — спяваў я і прытопваў па бетоннай падлозе, а рукі малявалі разгалістыя, як парасоны, пальмы, залацістыя плады, размаітыя кветкі і ўзорную лістоту. «Афрыка!» Я захапляўся аксамітам пяску, ядвабам празрыстых хваляў, маціцовым далягляда і белымі ветразямі, пульхнымі, як падушкі.

Сталяр Ігар сядзеў за маёй спінаю і цяжка ўздыхаў. У майстэрні было халодна, ён накінуў на плечы ватоўку і грэў азяблыя рукі аб слоік з гарбатай.

— К-к-лас! Дзевак бы с-с-сюды! Намалюй х-х-оць адну, а, Валодзік? — з захапленнем вымавіў Ігар.

Страх сапсаваць карціну спыніў мяне, і я адмовіўся. Зразумела, што я мог намаляваць, бо адчуваў сябе, можа, першы і апошні раз за ўсю службу мастаком. Але жанчыны... Прыгажосць жаночага цела на гэтай карціне была непатрэбнай, залішняй. Прырода і цёплае мора хавалі ў сабе і неслі амаль фізічную жаноцкасць. Я адклаў пэндзлі, памыў рукі і сеў побач з Ігарам.

Начальнік клуба — прапаршчык Рацыёнаў — зацокаў языком і адразу палез пальцамі да карціны.

— Баб намаляваць трэба. Толькі зусім голых. Каб яны распрануліся і...— прапаршчыкавы вочы заліла алейная смуга, а на твары выступіла чырвань.— Я цябе прашу,— начальнік клуба паправіў гальштук і расшпіліў гузікі кіцеля.— Намалюй пару афрыканачак, дзеля мяне, га!...

Праз некалькі гадзін карціна, шчыльна, як шклом, залітая нітралакам, была ўладкаваная ў клетку. Яна закрыла сцяну і адразу змяніла няўтульны і вузкі пакой фоталабараторыі. Праз дробную сетку карціна глядзелася выдатна. Вялікая, цёплая, яна дыхала паўднёвым сонцам, супакойвала глянцавымі пералівамі хваляў, бурштынам пяску і васковым святлом, якое сыходзіла ад гронак бананаў...

Прайшоў, можа, які тыдзень, цяжкі дух нітралаку паспеў выветрыцца і ў клетцы з'явілася некалькі пар яркіх папугаяў. Ігар прыцягнуў невялікае дрэўца, я яго расфарбаваў, і засохлая яблыня ператварылася ў нетутэйшую расліну. Размаітыя папугаі весела скакалі па галінах, дзяўблі фарбу, скрыгаталі і шчоўкалі крывымі дзюбамі, сядалі на сетку і злосна хапалі за пальцы, калі хто хацеў дакрануцца да іх шаўкавістых пёраў. Вялізнае памяшканне клуба напоўнілася

НАВЕЛА



скрыгатлівымі галасамі паўднёвых птушак.

Неяк хутка папугаі прыжыліся і пачалі пладзіцца. Праз колькі месяцаў іх было амаль немагчыма палічыць. Начальнік клуба быў задаволены, а вось цельпукаваты Толік Франчук — памочнік фатографа і мой зямляк — зусім збіўся з ног. Яму хапала клопату і ў роце — ён служыў першыя паўгода, а тут яшчэ птушкі. Толік па шэсць разоў на дзень чысціў клетку, засыпаў пакорм, падвешваў кавалачкі крэйды, мяняў ваду.

Калі які папугай уцякаў, а гэта здаралася нярэдка, Толік бегаў па зале і шапкай спрабаваў загнаць яго спачатку ў пакой, а потым злавіць і закінуць у клетку. Ён ненавідзеў папугаяў, а яшчэ больш начальніка клуба, які прыдумаў і ўсклаў на яго абавязкі па нагляду за клеткай. Мы з Ігарам спачувалі Толіку і клікалі дырэктарам інкубатара, але ніколі не дапамагалі.

Нават у гэткай агромністай клетцы птушкам зрабілася цесна, дужэйшыя пачалі дзяўбсці слабейшых. Некалькі папугаяў загінула. Абурэнню начальніка клуба не было межаў. Ён крычаў на Толіка, бегаў па клубе змрочны і чапляўся да ўсіх, хто трапляўся на вочы.

Каб паменшыць колькасць папугаяў у клетцы, прапаршчык пачаў гандляваць птушкамі. Занятак гэты аказаўся выгадным, чаго начальнік клуба не чакаў.

Папугаі, якія маглі размаўляць, каштавалі ў некалькі разоў даражэй. Калі прапаршчык Рацыёнаў гэта зразумеў, вырашыў, што і клубныя выхаванцы павінны размаўляць, а каб яны размаўлялі — іх трэба вучыць.

Дрэсуру папугаяў ён хацеў даручыць сталяру Ігару. Але той заікаўся, ды і словаў добрых ведаў мала. Пачэсны абавязак абрынуўся на Толіка Франчука, да войска студэнта журфака. А Ігару было тэрміновае заданне — зрабіць шэсць асобных клетачак, каб з кожным з абраных папугаяў былы студэнт праводзіў індывідуальныя заняткі.

Клеткі былі зробленыя за два дні. Цяпер заместа адной вялікай Толіку даводзілася прыбіраць яшчэ шэсць. Ён бегаў па клубе змрочны, схуднелы і праклінаў птушак і самога сябе.

Начальнік клуба хадзіў шчаслівы, ён быў упэўнены ў добрых выніках салдацкай дрэсуры.

Магчыма, так і было б. Але нехта са штабных афіцэраў знайшоў у некага з «дзядоў» пачак парнаграфічных здымкаў. Высветлілася, што здымкі былі аддрукаваныя ў клубнай фоталабараторыі. А калі так, дык Толіка — «дырэктара інкубатара» — пасадзілі на пяць сутак на «губу», куды ён пайшоў з вялікаю ахвотаю, у спадзяванні, што там ён зможа адпачыць ад папугаяў.

Прыбіраць за птушкамі і карміць іх было загадана Ігару.

— Я н-не-не магу! Т-т-варыш п-п-рапаршчык...

— Зможаце, таварыш салдат. Гэта за-гад! — злосна крыкнуў прапаршчык.

Пяць дзён Ігар даглядаў папугаяў, а калі даведаўся, што Толік з «губы» трапіў у шпіталь і невядома, ці вернецца ў клуб, то з усяе сілы ўдарыў нагой па клетцы і крыкнуў: «Б-б-б-б-дзь!» Ад хвалявання словы не вымаўляліся.

Увечары ён падмёў клеткі, памяняў ваду, пасыпаў ежы, адчыніў заледзянелае акно і пайшоў начаваць у казарму. Раніцай, адразу пасля пад'ёму, Ігар прыбег у клуб, зачыніў акно і ўключыў вялікі каларыфер. Калі ў памяшканні зрабілася цёпла, Ігар выключыў каларыфер і пайшоў сустракаць начальніка клуба.

— Та-та-та-та-м! — Ігар паказваў рукой на дзверы фоталабараторыі,— та-таварыш п-п-прапаршчык, м-м-м-м-ор!

— Што? Хто памёр? — начальнік клуба пабег у лабараторыю.

Амаль усе папугаі ляжалі ў чыста падмеценых клетках, некаторыя сутаргава падрыгвалі стракатымі крылцамі.

— Г-г-гэта мор! М-мор! Эпідэмія, т-т-варыш прапаршчык,— гучна вымавіў Ігар.

Начальнік клуба разам з загадчыкам лабараторыі сабралі птушак у кардонную скрыню. Прапаршчыкі доўга іх разглядалі, абнюхвалі, спрачаліся, нават каштавалі птушыны пакорм, але нічога падазронага не знайшлі.

— Згнаю заіку, згнаю на «губе»,— шаптаў начальнік клуба, але без сталяра ён быў як без рук.

— Правільна,— падтакваў другі прапаршчык.

Праз тыдзень тэрмінова спатрэбіўся герб. Дыкты не было і давялося скарыстаць палову задняй сцяны, якраз той кавалак, дзе былі пальмы і бананы.

Сонечная Афрыка, як пад снегам, знікла пад водаэмульсіёнкай, а на яе месцы з'явіўся ярка-чырвоны герб, намаляваны мною без імпэту і захаплення.

У чэрвені я атрымаў ліст ад свайго вайсковага сябра — сталяра Ігара.

Ён апісваў далёкае, але да драбніц знаёмае жыццё. З ліста я даведаўся, што начальнік клуба перайшоў служыць у ЛТП, прапаршчык-фатограф паціху друкуе парнаграфію, а герб ад дажджоў і спёкі аблушчыўся. На ім праступілі паўднёвыя расліны і дзе-нідзе пачалі праглядваць залацістыя бананы. Штабны афіцэр, які гэта заўважыў, спалохаўся і ноччу прымусіў герб зняць і да раніцы зрабіць новы.

Яшчэ Ігар напісаў, што новы начальнік клуба збіраецца таксама завесці папугаяў...

Уладзімір СЦЯПАН

ГАВАЙСКІЯ ВЫСПЫ

Цяжка стала нашым партыйным прапагандыстам, ох, як цяжка! Вось, для прыкладу, гэты нязносны адраджэнскі рух, які не хоча згадзіцца з партыйнай ісцінай, што беларусы — гэта чысцюсеньскія расейцы... Калісь такіх адпраўлялі проста ў Курапаты,— добрыя часы былі, а сёння?.. Сёння, на вялікі жаль, даводзіцца змагацца з гэтымі ерэтыкамі менш бліскучымі спосабамі і пераконваць беларусаў, што ўсё беларускае, калі не выходзіла па-за рамкі этнаграфізму, было злоснай выдумкай і інтрыгай палякаў, немцаў, Ватыкану і, можа, яшчэ кагосьці — на згубу «единой и неделимой матушки России». А без яе, вядома, Беларусь была б горкай сірацінаю.

Не здзейснілі гэтай задачы Сямашкі і Мураўёвы, Мясніковы і Цанавы, хаця з усіх сіл стараліся. А ў наш час няраз падводзілі і свае «разоблачители» нацыянальнага руху. Ну, хаця б Круталевіч, які пакланяўся... догме аб неіснаванні БНР, пасля чаго хітра «прапіхаў» безліч фактаў, якія гавораць, што была яна зусім дарэчнай дзяржавай, адно толькі — кароткатрывалай.

Сёння, пры гэтай кашмарнай галоснасці, на такіх ненадзейных памагатых спадзявацца рызыкоўна. Ды нялепшай аказалася і «Група хуткага адпору» Савелія Паўлава, якая толькі кампраметавала партыйнае кіраўніцтва рэспублікі. Але, як гаворыцца, хто шукае, той знойдзе. Таму невыпадкова на нашым гарызонце хутка заззяла новая зорка, гэтым разам у асобе Таццяны Бумажковай, якая лёгка і паспяхова апярэдзіла ўсіх ранейшых «разоблачителей». Выключныя здольнасці і глыбокія веды гэтага чарговага карыфея «передовой» навукі прадэманстраваў «Политический собеседник», змяшчаючы ў снежаньскім (1989 г.) выпуску адказ Бумажковай на ліст Язэпа Міхалевіча.

Галоўнай мэтай гэтай публікацыі была спроба палітычнай дыскрэдытацыі беларускага адраджэнскага руху, што, вядома, не можа не выклікаць нашага зацікаўлення. Заўважым лаяльна, што такая мэта ЦК КПБ, «ПС» і аўтараў не выходзіць па-за рамкі палітычнай барацьбы і ў такім плане не з'яўляецца нічым вынятковым. Аднак такая мэта дасягаецца толькі ў двух выпадках: калі палеміст абапіраецца на гістарычную праўду або калі ён свядома яе фальсіфікуе, ведаючы, што ніхто не зможа гэты фальш запярэчыць. Як жа з гэтай дылемай справіліся Бумажкова і «ПС»?

Вось жа «ПС» вуснамі Міхалевіча заяўляе: *«У 1919 годзе пры дапамозе кайзера Вільгельма ён (Антон Луцкевіч — рэд.) стварыў БНР. Блізкім яго сябрам і аднадумцам быў Радаслаў Астроўскі — прэзідэнт БНР у часы гітлераўскай акупацыі»*. Праўда гэта ці фальш? Падумайце, чытачы, самі: па-першае, у 1919 г. у Нямеччыне ўжо не было ніякага кайзера, па-другое, БНР паўстала не ў 1919 г., а на пачатку 1918 г. І тагачасны кайзер, Вільгельм II, ніколі яе не прызнаў. Далей, БНР была створана Радай Усебеларускага з'езда, а не Луцкевічам, і ўрэшце ў час гітлераўскай акупацыі БНР не існавала, і таму Астроўскі не мог быць яе прэзідэнтам. Цяпер палічыце, спадар рэдактар «ПС», колькі хлусні вы прапусцілі толькі ў гэтых двух цытаваных сказах!

Але «карона» ўсё ж належыцца спадарыні Бумажковай, якая спрабавала дыскрэдытаваць лідэра БНФ, Зянона Пазняка, і яго аднадумцаў. Ды як жа тут выказаць сувязь Пазняка з пілсудчыкамі ці гітлераўцамі, калі ён увогуле іх не бачыў, хіба што ў кіно? Вось таму і ўзялася яна за Зянонавага дзеда — дзеяча Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД) і рэдактара яе органа «Беларуская Крыніца», Янку Пазняка, які восенню 1939 г. быў арыштаваны энкаведзістамі і знайшоў вечны спачынак ці не ў Курапатах.

Бумажкова сцвярджае, што ў акупіраванай палякамі Заходняй Беларусі БХД «цвела пышным цветом» і падбірала ўсіх, хто ненавідзеў Савецкую Беларусь, а заснавальнікам такой злачыннай партыі быў м. інш. Янка Пазняк, які ў рэдагаванай ім газеце «Беларускія Крыніцы» (?!) захапляўся гітлерызмам. Адным словам, як можна здагадацца, заслужыў, гад, на Курапаты.

Няма сумнення, што, фармулюючы такія закіды, Бумажкова лічыла на непісьменнасць чытачоў. Дарэчы, мяркуйце самі:

ПА-ПЕРШАЕ — БХД афармілася ў маі 1917 г. у Петраградзе, а яе закладчыкамі былі ксяндзы Ф. Абрантовіч і Л. Хвецька, а таксама Б. Эпімах-Шыпіла і іншыя асобы, сярод якіх Янкі Пазняка не было.

ПА-ДРУГОЕ — не «пышным цветом» квітнела БХД у міжваенны перыяд, але пастаянна праследавалася польскай дзяржаўнай і касцельнай адміністрацыяй, якая лічыла яе «збальшавізаванай», м. інш. за радыкальную аграрную праграму (зямля сялянам без выкупу). Таму невыпадкова КПЗБ лічыла БХД патэнцыяльным саюзнікам, аб чым сведчаць іхнія перагаворы аб стварэнні агульнага Народнага Фронту. У 1936 г. БХД ператварылася ў Беларускае Народнае Аб'яднанне (БНА), якое працягвала супрацоўніцтва з камуністамі на платформе змагання за беларускую школу. Менавіта такую «злачынную» і «антысавецкую» партыю ўзначаліў Янка Пазняк. Варта дадаць, што супрацоўніцтва з КПЗБ не адабрала нацыяналістычная групоўка ксяндза Вінцука Гадлеўскага, якая выступіла з БНА.

Урэшце, ПА-ТРЭЦЯЕ,— адносіны хадэцыі да гітлераўскай Нямеччыны па сутнасці не адрозніваліся ад тагачасных адносін урада Савецкага Саюза. Вось што напярэдадні Другой сусветнай вайны аб гэтым пісала «Хрысціянская думка» (10.XII, 1938):

«Апошнімі часамі Нямеччына вельмі цікавіцца ўсходняй Еўропай — СССР, дзе распаложаны Украіна і Беларусь... не дзеля таго, што хоча памагчы ўкраінцам і беларусам збудаваць сваю дзяржаву, але дзеля таго, што гэтым спадзяецца разваліць СССР, адчыніць для свайго промыслу вялікі рынак збыту і дабрацца да хлебнага багацця Украіны, ды лясного багацця Беларусі (...) Гэта аднак не значыць, што беларусы павінны ўжо цяпер баяцца нямецкіх планаў і ўжо цяпер з імі змагацца. Не! Трэба толькі ведаць, што няма нікому бескарыснай помачы і што найкарыснейшая — толькі ўласная сіла. Дзеля гэтага не можна слепа захапляцца Гітлерам, ані іншымі дабрадзеямі, бо кожны добры, але спярша для сябе, а пасля для другога».

Як бачым, палемічныя прыёмы Бумажковай абапіраюцца не на праўду, але на звычайную хлусню, разлічаную на гістарычную несвядомасць нашага грамадства. Пры гэтым не варта згадваць пра такую «дробязь», што ўнукі не нясуць адказнасці за дзеянні сваіх дзядоў, незалежна ад таго, добрымі ці дрэннымі яны былі.

Класічным метадам прапаганды..., накіраванай супроць беларускага адраджэнскага руху, з'яўляюцца спробы даказаць яго пераемнасць ідэйнай спадчыны нямецкай акупацыі. Гэтым метадам ахвотна паслугоўваецца і Бумажкова, дзякуючы якой мы даведаліся, што Міхась Забэйда-Суміцкі, Янка Шутовіч, Ларыса Геніюш і Наталля Арсеннева былі фашысцкімі лакеямі, нейкім чынам віноўнымі за «кроў і смерць, слёзы і рабства нашых людзей». Праўда, Бумажкова не займаецца такімі дробязямі, як доказы злачынстваў гэтых выдатных дзеячоў нашай культуры, хаця такую патрэбу бачыць і робіць, бедная, што ў яе моцы. Так, напр., у выпадку Арсенневай яна стасуе прыём падобны да справы Пазня-

Публікацыі часопіса «Политический собеседник» прыцягваюць увагу не толькі «Крыніцы», «Літаратуры і мастацтва». Часопіс уважліва чытаюць у Польшчы тыя беларусы, якія вядуць упартую барацьбу за сваё выжыванне на адвечнай бацькоўскай зямлі. Беларускія патрыёты ў Польшчы выдатна разумеюць: іх жыццё як народа залежыць ад таго, што будзе з беларускаю мовай, культурай у БССР. І зусім зразумела, чаму іх хвалюе тое, што адбываецца ў нас.

Тут мы публікуем рэпліку з беларускага часопіса «Кантакт», што выходзіць у Польшчы. Не зусім падзяляючы аўтаравы ацэнкі, мы дазволілі сабе нязначныя купюры і змену загалоўка, а ў астатнім цалкам пагаджаемся з пазіцыяй «Кантакту»: палеміка павінна весціся сумленна, без перакручвання фактаў.

ПАДШЫЎКА

БАДАЙ ШТО ХОПІЦЬ...

ка: Арсеннева ў час акупацыі пісала вершы, а ейны муж, Францішак Кушаль, забіваў і паліў жывымі безабаронных беларускіх сялян! Што, чытачы, цяжка вам паверыць? Ну, тады прачытайце рапарт самога Кушаля, які цытуе Бумажкова: *«...жыхары вёсак Пяршайскай вобласці Доры, Дубоўцы, Мішаны, Даўгулёўшчыны, Лапіцы, Сярэдняе Сяло, Раманаўшчына, Нелюбы, Палубоўцы і Макрычаўшчына жыўцом спаленыя разам з забудаваннямі вёсак... ніякага следства не праводзілі, толькі зганялі жыхароў пераважна старых, жанчын і дзяцей у асобныя будынкі, якія пасля запаляліся. У Дорах жыхары былі сагнаныя ў царкву і разам з царквой спаленыя. Кушэль. Менск.*

Напомню, что злодеяния эти покрывались бело-красно-белым флагом».

Здаецца, Бумажкова вас ужо пераканала... Аднак, чытачы, пачакайце крыху і гляньце на гэтыя кропачкі, купюры ў рэпрадукаваным тэксце рапарту. Што ж там прапушчана? Магчыма, нейкія малаважныя дробязі? Для задавальнення вашай цікавасці прапануецца арыгінальны тэкст Кушаля. Вось ён:

«У другой палове ліпеня месяца г. г. нямецкія аддзелы СС праводзілі ачыстку ад партызанаў на тэрыторыі Валожынскага павету. Пры гэтым гэнымі аддзеламі былі жыхары вёсак Пяршайскай воласці: Доры, Дубоўцы, Мішаны, Даўгулёўшчыны, Лепіцы, Сярэдняе Сяло, Раманаўшчына, Нелюбы, Палубоўцы і Макрычаўшчына — жыўцом спаленыя разам з забудаваннямі вёсак.

Аддзелы СС ніякага следства не праводзілі, толькі зганялі жыхароў пераважна старых, жанчын і дзяцей у асобныя будынкі, якія пасля запаляліся.

У Дорах жыхары былі загнаныя ў царкву і разам з царквой спаленыя.

Кушэль

Менск 6.VIII. 1943 г.

Цяпер ужо без асаблівых доследаў вы можаце зрабіць самастойны вывад не толькі аб рапарце Кушаля, але і аб этыцы Бумажковай. Яна ж свядома прапусціла тыя словы Кушаля, якія сведчаць, што выканаўцамі злачынства былі не беларускія фарміраванні, але нямецкія аддзелы СС, і менавіта яны ніякага следства не праводзілі. Вядома, і згаданыя Бумажковай бел-чырвона-белыя сцягі тут ні пры чым — немцы ж мелі свае... Сам жа рапарт быў адрасаваны беларускай Радзе Даверу і выкрываў СС-аўскія злачынствы, пад час якіх загінулі м. інш. родныя браты Кушаля.

Пасля гэтага чарговага ашуканства Бумажковай няма асаблівай патрэбы разглядаць іншыя яе адкрыцці. Аднак варта пракаменціраваць змешчаны ёю «Ілюстрацыйны матэрыял». Вось здымак № 2 з групай беларускіх каталіцкіх святароў, якіх Бумажкова назвала «верными холопами фашистских палачей». Сярод гэтых «халопаў» мы бачым замучаных гестапаўцамі ксяндзоў Станіслава Глякоўскага і Вінцэнта Гадлеўскага, а таксама Язэпа Гэрмановіча (літаратурная мянушка — Вінцук Адважны), які ў той час знаходзіўся ў далёкай Маньчжурыі, а на здымку прадстаўлены як «уніяцкі святар з Украіны». Хоціць? Не зусім. На гэтым здымку бачым яшчэ ксяндза Тамаша Падзяву, якога Бумажкова перарабіла на Татарыновіча. Ну, а пра апошняга «фашысцкага халопа» — замучанага ў савецкім лагеры ксяндза Адама Станкевіча нават гаварыць непрыстойна.

У гэтых адносінах цікавы таксама здымак № 5, які прадстаўляе групу дзеячоў створанага ў лютым 1944 г. у Менску Беларускага Культурнага Згуртавання. На ім, з волі Бумажковай, знайшоўся прафесар Вацлаў Іваноўскі, які загінуў на пачатку снежня 1943 г. і, відаць, з тамтога свету прыбыў на сход БКЗ. Іваноўскім яна назвала кампазітара Міколу Шчаглова-Куліковіча, а Езавітавым — Вячаслава Селях-Качанскага. Урэшце пад здымкам Адама Бычкоўскага віднее подпіс «Прэзідэнт БЦР Р. Астроўскі»... Хіба ўжо хоціць...

Г. Б.

гукаў: удзячныя, незабытыя былыя ваяры, цяпер старыя, пакінулі ў ёй самыя светлыя свае пачуцці — пачуцці, якія захоўвае ў глыбінях сваіх памяць, пачуцці вяртання і вечнасці.

Ёсць у музеі гэтым адно сведчанне і трывожнага пагібельнага 1917 года. Нядбайна-хутка напісаная паштоўка: «Дарагая сястрыца Тэкля, не едзьце пакуль што ў Петраград, бо з 25 кастрычніка ідзе грамадзянская вайна, а сёння — першае лістапада. Перамір'е, а што будзе далей — невядома. Керанскі наступае на Петраград другім корпусам. Ёсць дзве тысячы забітых і ў горадзе шмат ахвяр». (Да Шаркаўшчыны паштоўка дайшла, але ж ці паспела ўчас?)

У панадворку школы — помнік ваярам, светлыя ліхтары, кветкі і дрэвы. Ада Эльеўна мімаходам выдрала сакавітае сцябло лебяды, і я прыкмеціла, што кветнікі добра дагледжаныя, і кветкам тут расці вольна і лёгка. А побач — маёнтак пана Шырана, той самы, у якім быў Напалеон. Цяпер тут у адным крыле дзіцячы садок, а ў другім таксама музей — краязнаўчы. Хатнія рэчы, абрадавыя атрыбуты, сабраныя ў ім, зрабіліся ўжо экзатычныя, забыліся: збаны, верацёны, маслабойкі, ступы, дзежы, ільняныя палотны, калаўроты, званочкі з клеймамі пачатку XIX стагоддзя... Дакранулася да званочкаў Ада Эльеўна — пакой напоўніўся дзівосным малінавым звонам. Чытач, калі хочаце пачуць голас бацькаўшчыны — едзьце ў Германавічы, пабудзьце ў гэтым цудоўным музеі, дакраніцеся да званочкаў — і яны празвіняць вам аб далёкіх дарогах з ростанямі і ваўкамі, аб багатым п'яным шляхецкім вяселлі, і слязьмі параз'ліваюцца ў аповядзе аб чыёйсьці нечаканай-негаданай смерці і аб цяжкасці апошняга шляху; і паўтораць вам пакутныя стогны парадзіхі і плачы немаўлятаў, і аглушаць вас залпамі паляўнічых стрэльбаў і лямантамі лісіц, зайцаў і качак. І пачуеце вы ў пералівістым гэтым гомане старадаўні голас ветру і поля, ракі і снегу, глыбінны голас Зямлі Беларускай.

Скарбы трэцяга музея, якога пакуль яшчэ няма, ляжаць цяпер у бязладдзі і чакаюць, калі скончыцца рамонт у зале. Гэта будзе мастацкі музей. Работы Язэпа Драздовіча, мастака, адданага роднай сваёй Шаркаўшчыне, чакаюць свайго часу... Старадаўнія цымбалы, скрыпкі, гармонікі... У непарадку стаяць партрэты, краявіды Германавіч, стракацяць сакавітымі сіня-чорна-шэра-бэзавымі фарбамі, і зялёнымі, і бардовымі, узятымі ў вячэрняй Шаркаўшчыне і начной, роднай і старажытнай...

— Ада Эльеўна, вы нават не ўяўляеце, якую працу зрабілі...

— Адно мучыць — няшмат засталося жыць, болей за палову жыцця прайшло... Каб паспець усё давесці да ладу, ніводнае драбніцы не абмінуць. Я цікава жыву, і падабаецца мне маё жыццё, але балюча глядзець на людзей. Чалавек жа можа жыць толькі працаю. Вось калі нашу культуру арганізуюць па-сапраўднаму — тады можна будзе і жыццё змяніць, і сябе. У нас у раёне большая частка работнікаў культуры не мае адукацыі, не баліць у іх галава аб людзях. Клубы зачынены, цікавыя людзі не прыязджаюць... Толькі і застаецца — танцы і выпіўка, выпіўка і танцы. Дзякуй Богу, цяпер касцёл адчынілі — і моладзь ходзіць туды. А людзі нашы нябедна жывуць — ёсць ва ўсіх і машыны, і матацыклы, ды вось не хапае культуры і духоўнасці.

— Чаго б вы хацелі пажадаць сваім вучням?

«МНЕ ХАТЫ ШЭРЫЯ ТВАЕ...»

— І школьнікам, і сваім дзецям зычу, каб былі яны гаспадарамі сваёй зямлі, сваёй б а ц ь к а ў ш ч ы н ы.

Так, Адзе Эльеўне ёсць чым ганарыцца і ёсць што сказаць, і хочацца ёй ад усяго сэрца пажадаць, каб спраўдзілася яе надзея.

БУДУЧЫНЯ ЎЖО ВЯДОМАЯ...

Лёсы падобныя адзін да аднаго, быццам блізняты...

Была ў мяне яшчэ адна сустрэча з настаўнікам. У кнігарні (дарэчы, вельмі багатай — прыязджайце, не пашкадуеце) я пазнаёмілася з Зояй Аркадзьеўнай Атаманчук. Маладая і прыгожая, разумная і жвавая, яна доўга расказвала мне пра школу, пра тутэйшых дзяцей, пра сябе. Зоя Аркадзьеўна — адна з самых любімых настаўніц у школе, кожны ўрок яе — свята. Я зацікавілася: як адчувае сябе малады спецыяліст у райцэнтры, як жыве?

— Здаецца, што гэтае глухое месца, глыбінка, высмоктвае сілы, іншы раз рукі апускаюцца. Усё, што ёсць у мяне добрага, кудысьці знікае з кожным годам. Праца, вязанне, чытанне... Раз на месяц хаджу ў кіно, ды лепей не хадзіць — фільмы прывозяць старыя ці дрэнныя. Адна любоў да школы і ратуе. Але як узняць, разварушыць, абудзіць дзяцей? Здаецца, часам атрымліваецца, але не так, як хацелася б, не на поўную моц. Дзеці — затарможаныя, пасіўныя... Агульная бескультурнасць, нібы цень, ляжыць і на іхніх тварах. У школу ходзяць так ужо неахайна адзетыя! Усё роўна ім, як выглядаюць. Большасць дзяцей практычна нічым не цікавіцца. Не чытаюць — лянота, не гарыць душа...

— Якая ў іх будучыня? — пытаюся я, і твар у настаўніцы робіцца яшчэ больш сумны.

— Яна, на жаль, ужо вядомая... Хлопчыкі паедуць у Глыбокаўскае СПТВ, куды школа іх свядома «спіхвае». А там — школа распусты, тое, што недабрана было ў гэтай навуцы дома, вучань там за два гады атрымае цалкам. Вяртаюцца хлопцы шафёрамі і трактарыстамі, пасля працы і ў выхадныя будуць яны прыходзіць у рэстаран і папаўняць найбольш распаўсюджаны тут кантынгент. Дзяўчынкі?.. Вучылішчаў

Заканчэнне.
Пачатак на стар. 52.

для іх у нас няма, у школе падрыхтоўка такая, што ў ВНУ не пойдзеш — і ў выніку яны працуюць прадаўцамі, балазе тут можна ўладкавацца без адукацыі... Нярадасная будучыня... Часам нават думаю: усе сілы школе аддаю, а нібыта марна. Такое ўражанне, быццам нейкі праклён над нашымі дзецьмі. Лёсы падобныя адзін да аднаго, нібы блізняты. У кожным двары на Шаркаўшчыне ўсё роўна як маленькая Шаркаўшчына — гэтак усё аднолькава. Шкада мне выпускнікоў і школьнікаў, у нейкім сэнсе і сябе шкада. Іншы раз хочацца ўсё кінуць, забыцца на ўсё і паехаць у другое месца, дзе я была б патрэбная і магла б прынесці карысць. Калі б было такое месца — паехала б не задумваючыся.

І мне стала цікава, што думаюць, што ж любяць, пра што мараць тутэйшыя дзеці. І я знайшла іх — гэта былі хлопчыкі, і, вядома, на веласіпедах — бо хлопчыкі ўсюды веласіпедныя асы. Вадзік, Ваня і Ан-

тось скончылі ўсе свае хатнія справы і цяпер мучаліся думкаю: чым заняцца?..

— Каталіся-каталіся — надакучыла,— сказаў Ваня.

— Як жывяце, хлопчыкі?

— Усялякае бывае. Як дождж — маркотна, а няма дажджу — спраў багата.

— Ці любіце Шаркаўшчыну?

— Любім.

— А ці ёсць горад, яшчэ лепшы за Шаркаўшчыну?

— Мінск! Вільня! Масква! Польшча!

— Дурань ты, якая Польшча!.. Гэта ж краіна!..— паправіў Антося Вадзік.

— Не, Польшча! — не суняўся той.

— А ці ты быў у Польшчы? — пытаюся я.

У адказ хлопчык глядзіць на мяне яснымі вочкамі і расчаравана круціць галавою.

— А я быў у Мінску,— сказаў Сяржук, ён толькі што падышоў, з ключом на шыі і паўтарагадовай сястрычкай Кацяй на руках (няма з кім пакінуць).— Там у цырку мядзведзі ламбаду танцавалі...

— А кім вы марыце стаць?

— Я — таксістам! Я — трактарыстам! Шафёрам... Машыністам...

— А можа, кім-небудзь яшчэ — што ж вы ўсе хочаце вадзіцелямі быць?

— А кім яшчэ? Вадзіцелем цікавей.

Што я магу сказаць пра гэтых дзяцей? Яны вельмі сімпатычныя і нашмат шчырэйшыя, дабрэйшыя і больш даверлівыя за сталічных дзяцей. Яны і мне дасталі веласіпед, і я ездзіла з імі па Шаркаўшчыне і слухала расказы пра іхняе жыццё. Ёсць у іх цыркавы гурток — іхняя радасць і вольны час. Кожнае дзіця марыць аб сцэне, а яны дык нават выступаюць на ёй, ездзяць па раёне са сваёй праграмаю. Ёсць у іх рэчка і лес, дзівосны зялёны дзіцячы свет, і веласіпеды, якія ўмомант, нібы боты-хуткаходы, могуць перанесці куды хочаш. Іх дзянькі яшчэ да гадоў падобныя, і сонца іхняе пакуль што не мае плямаў, і думкі чыстыя і бязвінныя, і душы — светлыя. Хаця ўжо ведаюць яны, што можа стацца такое — узяў чалавек ды памёр. І ведаюць яны, што носіцца над імі, скрозь пільнуе жудасная чорная сіла — радыяцыя, і баяцца яны яе і не баяцца — куды ж дзенешся? Ёсць яна — і ўсё тут. І ведаюць яны, што ёсць на зямлі яшчэ адна згубная сіла — гарэлка, і ўжо вось яе адразу прыкмеціш, калі ў чалавеку паселіцца. Гадзіць яна чалавека, кідае ў бруд ягонае цела і спаганьвае ягоную душу, мову чалавечую, і ліхі робіцца чалавек ад гарэлкі — не дай Божа сябраваць з ёю. І яшчэ яны ведаюць... «Таты ў нас няма»,— такія словы ведаюць, і вочы апускаюць, і цішэй гавораць пасля... І, як і ўсе дзеці, любяць яны прысмакі, а ў Шаркаўшчыне аніякіх прысмакаў не прадаецца, апроч шакаладу «Гомельскі» і гомельскіх вафляў, а для самых маленькіх — гомельскае дзіцячае харчаванне. І ядуць дзеці гомельскія ласункі, ведаючы пра тое, што ёсць такая згубная сіла — радыяцыя, якая нясе самыя страшныя хваробы і нават смерць, але так хочацца прысмакаў, а апрача гомельскіх — ніякіх іншых не бывае. Куды ж дзенешся?.. І дзеці тутэйшыя, як кажуць, з малаком маці і харчаваннем «Малютка» ўсмоктваюць «сваю долю» смяротнае атруты... Шаноўныя людзі ва ўладзе, прашу вас, укленчваю перад вамі — не нішчыце хаця б тых, хто па волі лёсу нарадзіўся пасля аварыі і ў больш-менш «здаровай» мясціне, не карміце дзяцей заражанымі прадуктамі — дзеці ж яны! А калі вы лічыце, што ўсе шанцы згублены і ўжо ўсё роўна нічога не зменіш — дык скажыце пра гэта гучна і выразна: калі вы не можаце дапамагчы — людзі самі знойдуць выйсце, бо кожная жывая істота, уявіце, хоча жыць і здароваю быць і жыццё б аддала дзеля здароўя дзіцяці свайго. Хачу нагадаць, што ў Маскве харчавання з Беларусі не купляюць, хаця і ў маскоўскіх крамах цяпер мала што ёсць. Нават адносна «чыстая» Віцебская вобласць выклікае ў масквічоў дрыготку ў каленях і млоснасць, жаданне адысці як мага далей ад прылаўка. А тут, у Шаркаўшчыне, дзеці ядуць гомельскія прадукты, таму што **іншых у краму не прывозяць**. Прашу вас — злітуйцеся, пашкадуйце іх, звярніце на іх сваю ўвагу...

Дзеці ў Шаркаўшчыне ведаюць, што прывезлі, каб пабудаваць дарогу, друзу з Гомельскай вобласці, што... пабудавалі новую школу, «скарыстаўшы» пясок, прывезены з Прыпяці. Што ж, у школе вучацца дзеці — вось ужо год адвучыліся. Кожны першакласнік дакладвае мне:

— Найвышэйшы ўзровень радыяцыі ў адзінаццатым пакоі ля дошкі...

Бацькі хадзілі і пісалі, прасілі і плакалі, але школу ж ужо пабудавалі, не бяда, радыяцыя не вышэйшая, чым у якім іншым месцы. Трэба ж дзецям недзе вучыцца, абрыдла туліцца ў старой шко́ле, а новая — прыгожая і раскошная, у ёй дзецям будзе весела і цікава, і наогул, пайшлі б вы... Куды яшчэ трэба пайсці бацькам? Ці, можа, няма куды болей, і трэба супакоіцца, уздыхнуць і шторанак асуджана, з цяжкім сэрцам, падаваць сваім дзецям сняданак і цалаваць іх у родныя светлыя лобікі, выпраўляючы на ўвесь дзень у прыгожую і шыкоўную школу, і штовечар сустракаць і шукаць у іх прыкметы хвароб, чакаць, што ж будзе далей і чым уся гэтая навука скончыцца?.. Бо бываюць чалавечыя сэрцы непрабівальныя, і дзівішся — чым, чым яшчэ паспрабаваць прабіць браню іхнюю, калі скура чалавечая і дзіцячая журба не могуць прымусіць іх пакутаваць і шкадаваць, і слёзная пратока не можа змыць абыякавасць?!. Няўжо выдаткаваныя на школу некалькі тысяч рублёў каштоўнейшыя і мілейшыя за дзіцячае здароўе?..

У ПАНСКАЙ СТАЙНІ — БАЛЬНІЦА, А Ў ПРЫБІРАЛЬНІ — АПТЭКА.

А бальніца ў Шаркаўшчыне старая, нікуды нявартая. Як сказала

тэрапеўт Раіса Станіславаўна Рымчонак, «усе хваробы нашага грамадства адлюстраваліся ў нашай бальніцы». І вось калектыў падабраўся цудоўны, і хворыя задаволены той увагаю чуллівых і сапраўды міласэрных людзей. Але... Невялічкі драўляны гарадок на ўскраіне пасёлку — гэта і ёсць бальніца.

— Гэта яшчэ нам пашанцавала, што ў нашым будынку жыў пан. Мы ж працуем у помніку архітэктуры,— кажа заўтэрапіяй Мікалай Валянцінавіч Манкевіч.— У іншых аддзяленнях — яшчэ горш. А ў Германавічах у панскай стайні бальніца, а ў прыбіральні — аптэка...

Згадаўся адзін сумны жарт: што для пана стайня — для быдла клуб...

Хворыя не скардзяцца — з чым толькі ні звыкся наш чалавек. Прыбіральня на вуліцы. Умывальнікі толькі ў працэдурнай і ва ўмывальні, цякуць. Гарачай вады няма. Ёсць ванна, але ёй практычна не карыстаюцца з-за адсутнасці гарачай вады. Даводзіцца на выхадныя хворых адпускаць дахаты, каб памыліся. Адпачываюць хворыя... у калідоры. Добра, калі на дварэ лета — яны могуць пайсці ў сад, а сад — выдатны. Але калі зіма ці дождж — сядзець ім у цёмным калідоры. Цёмным таму, што лямпаў не хапае. У палатах зашмат ложкаў, штор няма. Яшчэ месца адпачынку — сталовая, дзе пасля вячэры адстаўляюць убок сталы і ставяць тэлевізар. Шашкі, шахматы, радыё, газеты, бібліятэчка ёсць. Медыцынскі персанал прыкладае ўсе намаганні, каб хоць трохі навесці парадак, але ў такіх умовах, згадзіцеся, чытач, гэта складана. Праўда, цешыць персанал тое, што і ў іхнім раёне з'явілася новая бальніца — у вёсцы Лужкі. Але на яе будаванне і абсталяванне даў сродкі калгас. А хто дапаможа Шаркаўшчыне? Атрымліваецца так, што няма таго, хто даў бы грошы на новую бальніцу, а гэта ж — раённы цэнтр, і сюды вязуць найцяжэйшых хворых, а вось, напрыклад, штатываў, каб зрабіць кропельніцу, тут усяго тры. Калі будзе чатыры «цяжкіх» хворых — чацвёрты можа памерці...

І я пайшла, здзіўленая і абураная: дактарамі і сёстрамі ў такіх халодных і старых хатах наведзены парадак, чысціня ідэальная, усё стэрыльна і надзейна, у палатах светлыя сцены заспакаяльных колераў, знадворку хаткі прыгожа пафарбаваныя, і сад тут цудоўны... І людзі гэтыя шкадуюць, што магло б быць нашмат лепей, і жадаюць гэтага, і ў саміх бы атрымалася, але ж калі пабудуюць такую новую патрэбную бальніцу? Калі дактары змогуць ушчыльную ўзяцца за галоўную сваю справу — лячыць, калі перастануць спатыкацца аб побыт і марнаваць на яго сілы?

Мухі, макароны, пад'ёмны кран, хатка на курыных ножках, а таксама нястача паветра ў затхлай прасторы

І вось плыла я па Шаркаўшчыне, хаця дажджу ўжо не было, але я плыла, і здавалася мне яна ці то бясконцай і аднастайнай шэрай вадою, ці то гразкай і глухой багнаю. Я абуралася і слупянела, задавала пытанні і сама маўчала ў адказ... Пярэстыя гародчыкі і свежае неба вярталі мяне да рэчаіснасці, дзяўчынкі, што гулялі ў валейбол, траплялі ў мяне мячом і прымушалі вярнуцца ў свет гэты, ды я сама дзівілася: чаму ж я дзіўлюся! Усё — нармальна, усё як след, а інакш быў бы рай, а не Шаркаўшчына...

І я вярнулася да жыцця і пайшла ў рэстаран, бо захацелася есці.

Клумбы і лаўкі, на якіх наведнікі рэстарана наладзілі перакур... Я ўвайшла ў прасторную залу, прысела ў кутку. Якая ж тут была занядбанасць!.. Зялёныя клятчастыя абрусы, заплюханыя памідорамі і ўсыпаныя хлебнымі крышкамі, соллю... Гаманлівымі чародамі лётаюць мухі, прысаджваюцца то на сентыментальна, то на агрэсіўна настроеных наведнікаў...

И каждый вечер друг единственный
В моем стакане отражен
И влагой терпкой и таинственной,
Как я, смирен и оглушен.

Але, тутэйшыя п'яніцы мала падобныя да блокаўскіх. І справа не ў латыні, з якою яны, ведама ж, не знаёмыя, а ў нечым іншым... Шыкоўнае слова «рэстаран» страціла тут ушчэнт святочны свой сэнс. Тутэйшыя аматары хмельнага пітва «гуляюць» у кірзавых ботах і фуфайках, франты — у спартыўных касцюмах. Гультаяватыя, сонныя афіцыянткі сноўдаюцца між столікаў і носяць бутэлькі шампанскага і «каньякі» ў вялікіх збанах з-пад соку. Страву гатуюць у рэстаране адзіную, «фірмовую» — «свініну з макаронамі». Дый тая попыту не мае — народ моцны, п'е не закусваючы. Ніводнае жанчыны ў рэстаране не ўбачыла — сорам... Праўда, ёсць адна выгода: выцвярэзнік — насупраць. Добра, што хоць гэта прадумалі архітэктары. Напэўна, ведалі, што рэстаран ператворыцца ў «распівалаўку», і не мелі ілюзій адносна культурнага адпачынку жыхароў райцэнтра Шаркаўшчына.

А непадалёк стаіць Дом культуры. З ім здарылася вельмі пацешная гісторыя: праект «завярнулі» на 180 градусаў, і фасад апынуўся ззаду!.. «Хацінка, хацінка, павярніся да мяне перадам, да лесу задам...» Але ж Дом культуры — гэта вам не хацінка, яму цяжкавата паварочвацца. Вось і глядзіць ён фасадам у поплавы, дзе пасвяцца коні і каровы, і рэчка Дзісна ўпэўнена струменіць свае воды між зялёных сенажацяў, а задам пазірае на твары чалавечыя, зачараваныя навакольлем роднага пасёлку. А ў новай школе будаўнікі забыліся на... пад'ёмны кран. І ўзнікла пытанне: ці то школу сапсаваць, ці то кран раскідаць? І, вядома, замест таго, каб упільнаваць дзяцей ад радыяцыі, раскідалі кран, а школа засталася... А людзі — што людзі? Паплачуць, пасмяюцца і забудуцца, звыкнуцца. Кажуць, што раней яшчэ горш было...

— Усе хочуць, каб лепей было,— кажа ўжо знаёмая вам настаўніца Зоя Аркадзьеўна — а ўвогуле, і цяпер ужо лепш стала. Вось асфальт ёсць, а раней не было — па глінішчы хадзілі. Другая школа ў нас з'явілася, праўда, радыеактыўная, але ж і ў наш Дом культуры пачалі калектывы заязджаць, вядома, не першародныя, аднак...

Так, нічога... Што і казаць...

Испепеляющие годы!
Безумья ль в вас, надежды ль весть?
От дней войны, от дней свободы —
Кровавый отсвет в лицах есть.

Я хацела знайсці ў Шаркаўшчыне штосьці дзівоснае — і знайшла. Дакладней — не знайшла. Помніка Леніну. Ехала сюды ў аўтобусе і, мінуючы гарадкі і пасёлкі, бачыла на галоўных вуліцах розных ленінаў: з працягнутай рукою і з адстаўленай нагою, у кепцы і без яе, на высокіх пастаментах і на нізкіх, высокіх і невялікага росту, белых, шэрых, чорных і серабрыстых, а адзін дык быў нават залацісты!.. І, вядома, зацікавілася я, які ж ён у Шаркаўшчыне. Выявілася — аніякага няма. Затое ў шаркаўшчынскіх «вярхах» ідзе вайна. «Вярхі» падзяліліся на два лагеры — адзін «за», другі «супраць» устанаўлення помніка. Дарэчы, некаторыя з тых, хто «супраць», ужо багата згубілі і амаль страцілі свае кавалкі хлеба надзённага. Прынамсі ім ужо прапанавалі «падумаць», і прамаўлялася загадкавая фраза: «самі сабе жыццё псуяце...» Дык вось, тыя, хто «супраць», тлумачаць сваю пазіцыю так:

— Помнік Леніну не з'яўляецца пільнай патрэбаю ў нашым пасёлку. Тым больш, што ён паглынае багата грошай — 30 тысяч. Таму, дарагія таварышы, наўрад ці мы з ім зажывём лепей... Звярніце ўвагу: гэта раённы цэнтр, а дзіцячых пляцовак, стадыёнаў, парку адпачынку — няма. Усе вольныя ад пабудоў мясціны зараслі лебядою і крапівою — пасуцца на іх рагатыя і нерагатыя жывёліны. У дзіцячых садочках месцаў не хапае, кватэр маладым спецыялістам таксама бракуе...

Але тут бярэ слова другі лагер:

— Дазвольце, таварышы, хіба вам дрэнна жывецца?.. Вам павінна быць сорамна — мы, як самая свядомая частка насельніцтва, а-ба-вя-за-ны-я ўвекавечыць памяць...

Што кажуць потым, шаноўны чытач, вы ведаеце... Праз год я абавязкова прыеду сюды, каб паглядзець: ці ўвекавечаная памяць? А можа, з'явіцца новы дзіцячы садочак? А можа, тутэйшыя дзеці атрымаюць арэлі і каруселі? А можа, вясёлая моладзь пасля працы будзе ганяць мяч на новым стадыёне? А можа, праз год мне скажуць: «Спрэчка працягваецца» — і я ўбачу знаёмыя рагатыя масы там, дзе спадзявалася ўсё ж такі ўбачыць дзяцей, і знаёмыя рагатыя масы прамыкаюць мне штосьці вясёлае і жыццярадаснае — напрыклад, гімн з назваю «За і супраць»?

УСІХ ЖУРБОТНЫХ РАДАСЦЬ — ВЫСОКАЯ ЦАРКВА

...І закончваўся дождж у душы маёй, і многія маркоты пакідалі мяне, і ведала я ўжо — усе маркоты часовыя, і толькі адна назаўжды застанецца — журба галоўная: ці правільна жыву і хто ведае гэта? І субота надыходзіла, і царква Усіх Журботных Радасць, новая, адчынялася і парафіян запрашала, і царква Прачысценская, старая, драўляная, за ракою ў званы званіла, у родныя званы. Царква новая — бедная на абразы царква, і бацюшка ў ёй прыезджы, а на людзей багатая — шмат людзей, нават у дзвярах натоўпам стаяць. І ходзіць са свечкаю староста Анатоль Мікалаевіч Паддагель.

Староста — гаспадар царквы, а без гаспадара яна — нібыта чалавек без сэрца.

Была я ў гасцях у Анатоля Мікалаевіча. Жыве ён у невялічкай жоўтай хатцы, гарод свой (як і ва ўсіх тут), у панадворку калодзеж, клад дроў. Позна ўжо было, аднак пусціў мяне ў хату і толькі пасля запытаўся, хто я і адкуль. Потым паволі і доўга расказваў пра свае нягоды, пра сваю барацьбу за царкву, і здавалася яму, што так і трэба было, што гэта — нармальна.

— Царква наша збудаваная ў 1781 годзе. Наша парафія ўжо даўно хадайнічала за яе. Калі мы высветлілі год яе збудавання ў Менскім архіве, на нас звярнулі ўвагу. І мы пачалі збіраць грошы на рэстаўрацыю...

Так, царква адбудавана нанова цалкам за кошт парафіян — ніхто нічым не дапамог, ніхто не падумаў хаця б пра выратаванне помніка архітэктуры. Затое выкарыстоўвалі, як маглі. Спачатку — традыцыйна: у царкву ссыпалі зерне. Потым ператварылі яе ў раённы Дом культуры: купал і алтар знеслі, зрабілі балкон для гледачоў, эстраду... З'язджалася моладзь з навакольля, танцавала, шмат не думаючы. Пабудавалі новы Дом культуры — у царкве размясцілася крама ўцэненых тавараў...

— Усё гэтае барахло пазвальвалі ў бязладдзі, прадаўцы не працуюць, крама зачыненая, усё гніе, сэрца не вытрымлівае...

Анатоль Мікалаевіч хадзіў і ездзіў, цярпліва пісаў прашэнні і збіраў подпісы — дзе ён толькі ні быў! Канцавым пунктам стала Маскоўская камісія па справах рэлігіі пры Савеце Міністраў... Дазволілі!.. Па інстанцыях, марудна, але ўсё ж дайшло рашэнне да раёна! А «раён» ужо вырашыў зрабіць у царкве які-небудзь музей... Ды, дзякуй Богу, прасторы музею ў ёй не хапала... Паўтара месяца рэвізавалі ўцэненыя тавары...

— 4 сакавіка нам аддалі ключы. Таго ж дня мы і ўзяліся за працу. На Вялікдзень царкву асвяцілі — дзевяць бацюшкаў было, такі быў фэст, такая прыгажосць!..

А да Вялікадня трэба было зрабіць і знайсці ўсё: іканастас і царскія дзверы, вокны і рамы, купал і званы, абразы. Добра, што хоць крыж і Евангелле захавалі парафіяне... Працаваць даводзілася дзень і ноч, а больш за ўсіх дык самому Анатолю Мікалаевічу: да пенсіі ён быў сталяром...

— Цяпер хораша, гэтая царква — высокая,— казала мне ягоная жонка.— Прачысценская царква — нізкая, увесну ўсё навокал вадою затапляе, адна маленькая выспа застаецца. Толькі на лодках і дабіраліся... А гэта ж цэнтр, і аўтобус ходзіць. Людзі з вёсак прыязджаюць, і з дзецьмі,— вунь хоць у краму зайсці, дзецям булачку купіць ці што...

* * *

Была субота, і людзі ішлі па вуліцы ўжо быццам трохі іншыя — нейкія «выхадныя». І зноў сонца ўзнялося, і не здаваліся маркотнымі твары і шэрым адзенне, і далёкая хмарка несла быццам не туман, а дождж залаты — гэтак светла выглядала яна здалёк. «Хуткая дапамога» парадзіху павезла... Недзе магнітафон моцна зайграў... Маладыя з ЗАГСа выйшлі з кветкамі — субота, свята... Да мяне ў гасцініцу забег развітацца і заадно забраць папку са сваімі вершамі мясцовы дзядзька Сцёпа-міліцыянер, участковы Эдвард Вялічка, самы высокі чалавек раёна, майстар спорту, не паліць, не п'е, ды яшчэ і вершы піша і малюе...

— Толькі я не самы высокі, напэўна. Аднойчы на пошце бачыў хлопца, дык яшчэ вышэйшы. Хаця, можа, не тутэйшы ён быў...

Вядома, я ўпэўненая: не мясцовы гэты хлопец... Інакш і быць не можа...

І села я ў аўтобус, і зноў праплыла перада мною Шаркаўшчына, быццам самотны каўчэг, але ўжо не далёкі, а блізкі. Праплылі жаночыя твары ў хустках, і драўляныя хацінкі з кветнікамі, і сабакі на ланцугах у будках, і кошкі чорныя — прыдарожныя, і шэрыя — хатнія, і праплылі мужчыны ў светлых суботніх шапках, тупаючы па сваіх мужчынскіх справах, і дзеткі, стракаткія і жвавыя, і каровы, што пакланіліся нізка зялёнай і сакавітай роднай траве... І здалося мне, што ўсё гэта сон...

Я вярталася дадому, у сталіцу.

«МНЕ ХАТЫ ШЭРЫЯ ТВАЕ...»

Фота Ігара САЎЧАНКІ

СІЛА ЛОГІКІ

Так здарылася, што Ганна Максімаўна, у якой Маськоў заўсёды стрыгся апошнія гады, у той дзень была накіравана на нарыхтоўку кармоў. Пасля кароткіх ваганняў Маськоў рашыўся — колькі таго жыцця! — і сеў у крэсла, якое абслугоўвала падазрона маладая цырульніца.

— Як будзем стрыгчы? — спыталася яна.

«Пачалося»,— з сумам падумаў Маськоў і дыпламатычна адказаў:

— Стрыгчы будзеце толькі вы, я проста пасяджу ў крэсле.

— Здымаць шмат?

— Колькі хочаце, толькі галаву не здыміце.

Наташа (так звалі дзяўчыну), здавалася, не падзяляла легкадумнага стаўлення кліента да справы. Узброіўшыся нажніцамі і грабеньчыкам, яна размашыстымі жэстамі пачала вызначаць профіль будучай прычоскі. Нажніцы так ліха лёталі ў яе руках, што Маськоў трохі інстынктыўна тузануўся, ухіляючыся ад нацэленага ў самае вока інструмента, і толькі маланкавая прыродная рэакцыя ўратавала яму зрок.

— Вушы адкрыем?

— Я вас цудоўна чую. Але можна і адкрыць.

— Абавязкова адкрыем. Скроні падняць?

— Калі лічыце патрэбным. Але яны ў мяне, здаецца, не падалі.

— Падымем. Патыліцу вышэй?

Маськоў моўчкі выцягнуў шыю.

— Маўчыце, значыцца, згодны, зробім вышэй.

Задаўшы яшчэ некалькі пытанняў, Наташа змоўкла. Нейкі час чуліся толькі лязг нажніц і гудзенне машынкі. Нясвежая прасціна, мёртвай пятлёю зацягнутая на шыі, надзіва тупая брытва і нясцерпнае казытанне ў носе ператварылі стрыжку ў сапраўднае пекла.

Закончыўшы працу, Наташа адклала ўбок інструменты.

— Асвяжымся?

— У якім сэнсе? Зрэшты, я не супраць,— не падумаўшы, згадзіўся вымучаны Маськоў.

Наташа накіравала пульверызатар у твар кліенту і з жалезнай вытрымкай разрадзіла ва ўпор чвэрць флакона вадкасці без колеру, смаку і паху. У Маськова перахапіла дыханне, ён пасінеў, зачхаў і доўга прыходзіў у сябе.

— Вось і ўсё. З вас руп сорак.

Маськоў зняў акуляры і ўбачыў у люстэрку непаўнацэнную асобу з нізка скошаным лобам пітэкантропа, развесістымі лапухамі вушэй і смела адкрытымі залысінамі. Уражаны жудаснай карцінаю, кліент прыдушаным хрыплым паўшэптам прамовіў банальнейшую фразу:

— Прашу падаць кнігу скаргаў.

— Дазвольце,— капрызліва надзьмула вусны Наташа,— вы чымсьці незадаволены?

— Вы ўгадалі.

— Чым жа?

— Вы ператварылі мяне ў пляшывую гіену.

— Хіба я?

— А хто ж?

— Давайце разбяромся. Вы прасілі зняць як мага болей валасоў?

— Я прасіў?

— Але і не былі супраць. Вы згодныя былі адкрыць вушы?

— Можа быць, але якое гэта мае значэнне?

— Мае! Я хіба не пыталася, куды зачэсваць грыўку, прамыя ці касыя скроні рабіць, у якім выглядзе аформіць патыліцу — полькі ці паўбокса?

Маськоў звяў. Што тут скажаш?

Уладзімір ДУБРОЎСКІ

10 ЛЕПШЫХ КНІГ ГОДА

Мікола ЕРМАЛОВІЧ:

«НЕ ЛЮБЛЮ ДЫЛЕТАНЦТВА...»

Кніга Міколы ЕРМАЛОВІЧА «Па слядах аднаго міфа» заваявала ўмоўны прыз чытацкіх сімпатый: паднялася на першае месца ў хіт-парадзе «Крыніцы». Кніга выклікала вялікую зацікаўленасць чытачоў, якім неабыякавы гістарычны лёс Беларусі. У даследаванні распрацавана і аргументавана выкладзена новая канцэпцыя ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага — дзяржавы ў першую чаргу беларускай.

З аўтарам кнігі-пераможцы гутарыць студэнт факультэта журналістыкі БДУ Максім ГІЛЕВІЧ.

М. Г. — Мікола Іванавіч, нашу гутарку хочацца пачаць вось з такога пытання...

М. Е.— Даруйце, але пачаць яе хочацца мне. Не магу не адзначыць адну дэталь. Цікавая атрымліваецца паралель. Успомніў я адну акалічнасць, калі мне пазванілі з рэдакцыі «Крыніцы» і назвалі таго, хто будзе са мной гутарыць,— гэта значыць вас. Справа вось у чым. У 1966 годзе я ўпершыню стаў героем газетнага артыкула. Называўся ён «Замест удзячнасці». Артыкул падтрымаў мяне ў цяжкі для мяне час. Тады якраз я пісаў «Па слядах аднаго міфа», і аўтар, апрача ўсяго іншага, успомніў гэтую маю работу некалькімі добрымі словамі. А напісаў той артыкул супрацоўнік «ЛІМа» і... ваш бацька Мікола Сямёнавіч Гілевіч, якога сёння больш ведаюць як пісьменніка Міколу Гіля. З тае пары мінула амаль чвэрць веку, і толькі цяпер мая кніжка дайшла, нарэшце, да чытача, толькі цяпер пра яе зноў згадвае прэса. Вас жа не было яшчэ ў той час? Выходзіць, спатрэбілася дзеля гэтага, каб выраслa цэлае пакаленне, і сёння ў мяне бярэ інтэрв'ю сын таго чалавека, які першы напісаў пра мае даследы...

М. Г.— Сапраўды, цікавая і нечаканая для мяне сітуацыя, ці, як вы кажаце, паралель. Я, сорамна прызнацца, дык і не ведаў... Як жа так магло здарыцца, Мікола Іванавіч, што вашай кнізе спатрэбілася столькі часу, каб прыйсці да чытача? Вы ж распрацавалі канцэпцыю ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, абапіраючыся на гістарычныя крыніцы розных часоў і земляў — хронікі і летапісы. Чытаючы «Па слядах аднаго міфа», спазнаючы кірунак вашага даследавання, мімаволі трапляеш пад уладу моцнага ўражання: «Божа, як гэта ўсё проста! Чаму ж гэтага не бачылі, не разумелі раней?!» Дык — чаму не бачылі, не разумелі і, больш за тое, з пенай на вуснах даводзілі адваротнае?

М. Е.— Спачатку, пэўна, трэба сказаць некалькі слоў пра тое, як я зацікавіўся гэтым перыядам нашай гісторыі.

Пачалося ўсё недзе ў сорак чацвёртым — сорак пятым годзе. Я працаваў на сваёй радзіме, у Дзяржынску, завучам школы. І аднойчы давялося правесці ўрок гісторыі ў восьмым класе, тэмай якога было татара-мангольскае на-

шэсце і ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага. Пачаў я рыхтавацца да ўрока, чытаць падручнік і бачу: пра татара-мангольскае нашэсце так падрабязна напісана — і што ў 1237 годзе занялі Разань, а ў 1238 — Уладзімір, у 1240 — Кіеў, і гэтак далей. А пра ўтварэнне Вялікага княства сказана ўсяго толькі, што вось літоўскі князь Міндоўг, які падначаліў сабе літоўскія землі, заваяваў так званую Чорную Русь з горадам Навагародкам і зрабіў яго сталіцай дзяржавы. І ніякага тлумачэння, як заваяваў, чаму заваяваў, што там і як было на самай справе. Тут у мяне і ўзнікла падазрэнне: чаму ж гэтак павярхоўна ўсё? Дзе факты? Тады я, вядома, не мог заняцца гэтым падрабязна, але недзе ў свядомасць мне гэта запала, і пазней, калі ўжо больш-менш пачаў займацца навуковай працай, падступіў я да гэтага пытання.

Перш за ўсё стаў чытаць літаратуру. Усе манаграфіі, усе буйнейшыя працы пра Вялікае княства Літоўскае, што выйшлі ў дарэвалюцыйны час: Антановіча, Дашкевіча, Любаўскага... У 1959 годзе ў Маскве выйшла кніга Пашуты «Образование Литовского государства»... І вось што мяне здзівіла: колькі ні чытаў, не бачыў, як жа мог Міндоўг заваяваць Навагародак. Усюды сцвярджалася, што заваяваў, але нідзе гэта не даказвалася.

Тады я стаў чытаць нашы летапісы, лівонскія хронікі, і быў зноў вельмі здзіўлены. Па-першае, прыйшоў да высновы, што ў той час пад Літвой разумелася не сучасная Літва, а тэрыторыя цяперашняга нашага Верхняга Панямоння. Глядзіце, Войшалк заснаваў манастыр паміж Наваградкам і Літвой, прычым ля вёскі Ла́ўрышава. Я дастаў карту, знайшоў Лаўрышава. Думаў, што яно на паўночны захад ад Наваградка, у бок Літвы, выявілася ж, што на паўночны ўсход. Тады я павёў пальцам ад Наваградка праз Лаўрышава далей і ўткнуўся ў вёску... Літва Стаўбцоўскага раёна. А далей — Менск ужо...

Пра тое, што летапісная Літва і Літва сучасная — не адно і тое ж, здагадваліся і некаторыя іншыя даследчыкі. Рускі гісторык Бяляеў, разглядаючы паход Яраслава Мудрага на Літву, выказаў мімаходзь такую думку, што нейкая частка Літвы знаходзілася недзе каля Прыпяці. А ў 1950 годзе таксама рускі даследчык Насонаў у сваёй кнізе «Русская земля и образование древнерусского государства», разглядаючы падзеі, звязаныя з Валадаром Глебавічам, які хадзіў у лясах пад Літвою і з ёю перамог свайго праціўніка, выказаў думку, што Літва знаходзіцца недзе паблізу ад Менскага княства.

Цікава, што ўсе падзеі з летапісаў, дзе ўпамінаецца Літва, пацвярджаюцца і тапанімікай: пад Слонімам — вёска Літва, у Ляхавіцкім раёне на ўзбярэжжы Шчары — Літва, у Уздзенскім і Стаўбцоўскім раёнах — Літва (гэта якраз на мяжы старажытнага Менскага княства). Літва ёсць і ў Маладзечанскім раёне, побач з вёскай Палачаны, на рацэ Нёманская Бярэзіна (рака была мяжою паміж Полацкам і Літвой).

Цяпер ужо я зразумеў, з якой нагоды Міндоўг прыйшоў аднекуль з-пад Вільні ў Навагародак і тут заснаваў сваю сталіцу. Ды таму, што ён пад Вільняй і не быў, а Навагародак знаходзіўся, магчыма, нават на тэрыторыі Літвы, — недарэмна ж Яраслаў Мудры пасля паходу на Літву заснаваў гэты горад.

Па-другое, што тычыцца ўтварэння дзяржавы. Усюды сцвярджаецца, што Міндоўг заваяваў Чорную Русь. Я гляджу ў Іпацьеўскі летапіс і пад 1251 годам бачу, што Міндоўг заняў... Літву! Вы ведаеце, для мяне гэта было нечаканасцю, бо нідзе ў кнігах не прыводзіліся гэтыя словы. Нідзе!

Стаў далей глядзець, як жа ўпамінаецца ў крыніцах Міндоўг. Аказалася, што ўсюды — як найміт. У 1219 годзе ён абавязаўся разам з іншымі балцкімі князямі ваяваць супраць Польшчы, потым ён разам з навагародскім князем выступае супраць Конрада Мазавецкага, пазней ваюе на баку Данілы Галіцкага, а затым яго запрашаюць куроны — племя, што жыло непадалёк ад Балтыйскага мора,— каб ён дапамог ім ваяваць з крыжакамі. Там пацярпеў няўдачу і быў выгнаны з Літвы. Так ён трапіў у Навагародак.

Ну, а што такое Чорная Русь? Згодна з ранейшымі даследчыкамі, яе адзінае прызначэнне — быць заваяванай Літвой. Пачаў я вывучаць дакументы. Тут якраз выйшла кніга Гурэвіча «Древности Белорусского Понеманья». Аказваецца, Навагародак у гэты час стаў буйнейшым эканамічным і культурным цэнтрам. Полацк ужо аслабеў (немцы адабралі Ніжняе Падзвінне), і супернікам яго стаў Навагародак, які пачаў пашыраць межы свайго ўплыву. А на мяжы паміж Полацкам і Навагародкам аказалася Літва, і таму, каб пашырыць уладу на Полацк, трэба было заваяваць Літву.

Ранейшыя даследчыкі лічылі — раз Міндоўг у Навагародку, значыць, ён заваяваў горад. У той жа час перад імі быў яскравы прыклад другога літоўскага перабежчыка, Даўмонта, які ўцёк у Пскоў, прыняў праваслаўе і быў абраны князем. Значыць, з'яўленне якога-небудзь літоўскага князя ў славянскім горадзе не абавязкова было звязана з заваяваннем. Тое самае адбылося з Міндоўгам. Ён таксама з многімі баярамі, згодна з Густынскім летапісам, пад 1246 годам прыняў веру Хрыстову ад Усходу. І яшчэ адна цытата: «вражбою бо за ворожьство с ними Литву зане». Ясна сказана, што ён нейкае «ворожьство» меў да гэтых князёў, што ён ім помсціў. Таму навагародскія баяры і ўзялі Міндоўга, ведаючы, што менавіта ён з большай зацікаўленасцю будзе заваёўваць для іх Літву. Ён і ваяваў. Галіцка-валынскія князі, убачыўшы ўсё гэта і скарыстаўшы літоўскіх князёў, што ўцяклі ад помсты Міндоўга, зрабілі тры паходы на Навагародак, прымусіўшы яго адмовіцца ад Літвы. І толькі праз дзесяць гадоў Войшалк, сын Міндоўга, зноў жа літвін, заваяваў з пінянамі Літву, пабіўшы многіх літоўскіх князёў. І гэта, зноў жа, не прыводзілася ў кнігах. Там сцвярджалася, што заваяванне праводзілася ў інтарэсах літоўскіх феадалаў. Што ж гэта за інтарэсы, калі іх знішчалі?!

У выніку сваіх доследаў я прыйшоў да высновы, што Вялікае княства Літоўскае было менш за ўсё літоўскай дзяржавай. Найперш яно было беларускай дзяржавай. І ў поўнай назве — Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае — да Літвы адносілася слова «Жамойцкае», да Беларусі — «Літоўскае», «Рускае» — да Украіны. У кнізе я паказваю, што міф аб заваяванні Беларусі, аб Літоўскай дзяржаве з мяжой пад Мажайскам з'явіўся недзе ў XVI стагоддзі, калі Масква пачала прад'яўляць прэтэнзіі на беларускія і ўкраінскія землі — маўляў, жамойцкія князі, скарыстаўшы аслабленне Русі мангола-татарамі, захапілі яе землі, узялі пад сваю апеку і абарону.

Ну вось, калі я ўсё гэта падсумаваў, я і напісаў гэтую кніжку.

М. Г.— Быў 1966 год. Кніжка ж выйшла ў 1989 годзе...

М. Е.— Тады, у 1966-ым, мне задалі тое ж самае пытанне, што і вы напачатку гаворкі: «Вы што, першы такі разумнік? Няўжо не бачылі нічога ранейшыя даследчыкі?» Так, не бачылі. Не бачылі таму, што фактычна гісторыяй Вялікага княства Літоўскага займаліся тэндэнцыйна. Возьмем хоць бы сабе украінскіх даследчыкаў, тых жа самых Антановіча, Дашкевіча. Дашкевіч нават у адным месцы сказаў, што праўдападобных крыніц, што Літва заваявала Чорную Русь, няма. Сказаў, але чамусьці сам не рашыўся гэта вытлумачыць. Чаму? Ды таму, што не хацеў тлумачыць.

А рускі гісторык Пашута (дарэчы, па паходжанні, кажуць, наш зямляк) дык увогуле ўсюды «Беларусь», «беларускія гарады» ўжывае з адным эпітэтам — «подвластные Литве». Другога эпітэта ў яго няма. А ў прадмове ён раптам гаворыць, што ў сувязі з развіццём нашай навукі шэраг аргументаў і высноў пераглядацца будуць, і чым хутчэй гэта адбудзецца, тым лепш. Навошта ж ты, ведаючы гэта, пісаў абышто? Прытым, глядзіце: такая вялікая праца, такая бібліяграфія, і ў той жа час Густынскага летапісу — няма. Хай ты не згодны з нечым, але ж— ты павінен абвергнуць!

Далей. Сучасны ўжо даследчык Гудавічус у 1985 годзе ў артыкуле «Літва Міндоўга» разглядае гэтую праблему. І робіць самы натуральны мантаж з паасобных мясцін Іпацьеўскага летапісу аб Войшалку! Тое, што Войшалк з пінянамі і навагародцамі прыйшоў у Літву, ён выкідае. А тое, што Літва прыязна сустрэла свайго гаспадара,— гэта ёсць. Што ён пачаў уладарыць на зямлі Літоўскай і ворагаў сваіх знішчаць і знішчыў іх незлічонае мноства, а многія «побегоша камо кто куда» — гэта зноў апускае. Атрымліваецца, што важна не тое, што піша Гудавічус, а тое, што ён апускае! Гэта ж яўная тэндэнцыйнасць.

«Разумнікам» я аказаўся таму, што тым даследчыкам, якіх я згадваў, душа і сэрца не балелі, а нашы, беларускія даследчыкі, не мелі права нават намякнуць на тое, што Вялікае княства Літоўскае было беларускай дзяржавай,— гэта быў вялікі ідэалагічны грэх. Мы ж усю гісторыю былі бездзяржаўнымі, і толькі ў 1919-ым нас «облагодетельствовали» і далі нам дзяржаву! Вы ж пачытайце Абэцэдарскага, ён жа там так і гаворыць: толькі фашысцкія недабіткі могуць сцвярджаць, што Вялікае княства Літоўскае было беларускай дзяржавай. Яшчэ ў 1987-ым годзе Ігнаценка з універсітэта (яшчэ адзін Ігнаценка ёсць у Акадэміі навук) абураўся: маўляў, з артыкулаў Ермаловіча можна зразумець, што Вялікае княства Літоўскае было беларускай дзяржавай. Яшчэ ў 1987-ым было вялікім грэхам гэта сцвярджаць! А літоўскія даследчыкі выкарысталі ўвесь саюзны друк, каб расказаць, як Літва заваёўвала Беларусь і якая вялікая была літоўская дзяржава. Фактычна яны нас, нашу гісторыю абакралі...

А тады я занёс сваю кніжку ў «Полымя», у часопісе яе хацелі надрукаваць. Ды прачы-

талі і спалохаліся: ай, кажуць, занясіце лепш у Акадэмію. Я занёс Глебку. Глебка паглядзеў: «Вы ведаеце, лепш Улашчыку пашліце...» Я завёз Улашчыку[1], ён пачаў цягнуць, цямніць, намякаць, што я не ўсё даказаў і г. д. Так яна і не пабачыла свету.

Аднак я даў экземпляр маёй працы хлопцам, і яны яе размножылі. Не ведаю дакладна, колькі экземпляраў зрабілі, але, здаецца, нямала, бо мне паказвалі, яшчэ і аўтограф пакінуць прасілі.

М. Г.— Зараз ваша кніга надрукавана, хоць, на жаль, і мізэрным тыражом. Яна імгненна знікла з кнігарняў і стала бібліяграфічнай рэдкасцю. Якая ж рэакцыя на яе ў Маскве, ды, скажам, у Вільні?

М. Е.— Цішыня. Усе маўчаць...

М. Г.— Мікола Іванавіч, многія ведаюць вас як вельмі стараннага і карпатлівага даследчыка гістарычных дакументаў. І менш за ўсё мне хацелася б падвяргаць сумненню праўдзівасць і шчырасць вашай працы. Але адкажыце, калі ласка, ці бачыце вы ў ёй нейкія слабыя месцы, нейкія такія моманты, абгрунтоўваючы якія вы больш кіраваліся інтуіцыяй, чым фактамі?

М. Е.— Я стараўся па магчымасці ўсё абгрунтаваць. Кніжка невялікая, а спасылак ажно 326! Іншымі словамі, я стараўся ўсе свае палажэнні пацвердзіць дакументальна. Асабліва крыніцамі, прытым іменна першапачатковымі крыніцамі: хронікамі, летапісамі... Я параўноўваю летапісы адзін з адным, шукаю, які з іх больш праўдзівы...

М. Г.— Вы гаворыце пра першакрыніцы. Працуючы над кнігай, вы шмат імі карысталіся, і гэта натуральна — пісаць гісторыю, не абапіраючыся на неаспрэчныя факты, немагчыма...

М. Е.— Так, і вельмі шкада, што гісторыя не захавала многія беларускія летапісы. Вядома, каб былі ў нас Полацкія летапісы, Навагародскія, Смаленскія, мы, вядома, больш шырока ведалі б сваю гісторыю. А так ад Полацкага летапісу засталося толькі некалькі фрагментаў, якія ўвайшлі ў Іпацьеўскі летапіс, і некалькі фрагментаў Навагародскага летапісу, якія ўвайшлі ў склад Галіцка-Валынскага летапісу. Вось і ўсё. Таму для нас каштоўнае кожнае слова. Часта нашы даследчыкі возьмуць нешта ў асноўным тэксце, а што ў другім варыянце летапісу — яны і не глядзяць. А там жа часам нават больш праўдзівая інфармацыя.

М. Г.— І на заканчэнне, Мікола Іванавіч, пытанне традыцыйнае. Над чым вы зараз працуеце, чым парадуеце шматлікіх чытачоў — аматараў, даследчыкаў, проста патрыётаў сваёй зямлі, гісторыі, дзяржавы?

М. Е.— Цягну далей «Старажытную Беларусь»[2]. Калі пачынаў — у галаве была ясная канцэпцыя, а як пачаў дэталізаваць — усё цяжкасці і цяжкасці. А калі ўжо ўзяўся, то павінен зрабіць грунтоўна. Я не люблю дылетанцтва — ухапіў факцік і распісвай. Трэба падыходзіць, даследаваць усё грунтоўна, усебакова. Гэта і буду рабіць, наколькі хопіць маіх сіл і здольнасцей.

АД РЭДАКЦЫІ:

Для вызначэння дзесяці лепшых кніг 1990 года ўтворана журы, у якое ўвайшлі:

Лявон ВОЛЬСКІ — саліст рок-гурта «Мроя»,

Віктар КАРАМАЗАЎ — празаік,

Уладзімір САВІЧ — мастак,

Віктар ШНІП — паэт,

Сяргей ШУПА — перакладчык.

---

[1] Мікола Улашчык (1906—1986) — беларускі гісторык, знаўца крыніц, археограф.

[2] Гэтая праца апублікавана ў часопісе «Маладосць» (1988, №№ 7—12; 1989, №№ 7—9).

Славамір Адамовіч прыйшоў на філфак БДУ, маючы за плячамі немалы досвед. Вершы ягоныя хтосьці назаве хуліганскімі, але ёсць для іх яшчэ адно вызначэнне — эпатажныя. Іх можна прымаць і не прымаць, але нельга не згадзіцца з тою думкаю, што кожны мае права глядзець на рэчы па-свойму.

Славамір АДАМОВІЧ

* * *

Кожнай ночы прыходзіць брыдкая
істота,
Раскрывае нахабную пашчу
І мяне паглынае з крывёю і потам,
Проста так, сухама і нашча.

І тады ажываюць хімеры
прышласці
Па той бок філасофіі зла і дабра.
І за Бога абраўшы Фрэйда ці
Ніцшэ
Новы люд планетарны крычыць ім
«Ура».

Рассыпаюцца плёны чырвоных
вернікаў.
Пад нагамі арганіка ў выглядзе мас,
Масам хочацца многа салодкіх
пернікаў,
Бо яны, як-ніяк, а рабочы клас.

Ну а ў шэрых завулках тусуюцца
люмпены
Ды на шкелік парфумы шукаюць
рубля.
Іх пячорныя лбы ад маленства
насуплены
І чакае іх толькі вакзальная бля...

* * *

Дзве татуіроўкі
На маіх грудзёх:
Віселья з вяроўкай
І турэмны лёх.

Можа, я з адчаю,
Можа, з дурнаты
Ў іншы свет адчалю
Ў дзень Усіх Святых.

Не мяне да Бога
Прызаве анёл —
Ў пекла мне дарога
На гарачы кол.

ШОРАХІ

Ледзь толькі пагасне святло у пакоі,
Ледзь толькі паспее агмень азалець,
З'яўляюцца шорахі шыхтам, як воі,
І ўраз па кутох пачынаюць шумець.

Нахабна ў шуфляды залазяць, да
рання
На почапках віснуць уніз галавой.
Здаецца, нібыта я чую дыханне
Іх душаў плюгавых у цемры
начной.

Мне золка, як зверу ў лядашчай
бярлозе,
Мне шорахі-шпегі жыцця не даюць:
Сваім шаргаценнем па бруднай
падлозе
Яны мне вантробы на свет дастаюць.

Іх цэры з-за чорных шпалераў
смяюцца,
Ў старой шыткаўніцы яны грамадой
Міжсобку шальмуюць мяне
і злуюцца,
Што ўпарта імкнуся я мець супакой.

На кніжных паліцах, дзе столькі
паснула
Раманных герояў, багоў,
прыгажунь,—
Там шорахі шорхнуць з часоў
Вельзевула,
Там месяц глядзіць на іх з неба, як
лунь.

І я ў гэтым кодле не йму паратунку,
Бо толькі пад ранне сціхае мой
боль,
Калі, пакідаючы брудныя шлункі,
Знікаюць начніцы скрозь белую
столь.

ФАЙНА

Файна, што столькі куфаек
сцягаўшы,
Змог я, нарэшце, купіць гарнітур,
Чорны капелюш і вузенькі
гальштук,
Скрып чаравічны ды плашч
і каптур.

Файна, што ўрэшце сабе я дазволіў
Снеданне ўранні, а ў поўдзень —
абед,
Зрэдчас вячэру, і крыху сваволі,
Радасці жменьку і жменьку манет.

Файна, што — восень, што мілыя
твары
Почасту бачу ў пакоі маім.
Файна, што здуру не трапіў на нары,
Файна, што грэе мне ногі кілім.

Файна, калі нарачанскія сосны
Помніць я здольны ў лайне
гарадоў.

Файна, як файна, о Божа мілосны,
Меці надзейных і мужных сяброў.

Файна, калі дастаткова ў каханні
Цёплага позірку, еднасці душ,
Усмешкі крывіцкай дзяўчыначкі
Фані,
Файна, калі апантанасцю дуж.



Нібыта ў мяккім малачаі,
Альбо ў драсёне ля дарог.
Файна а трэцяй гадзіне уночы
Верш напісаўшы, прылегчы й
засnуць,
Сон сабе высніць пад ранне
прарочы...
Файна, калі твае песні пяюць!

ГОСЦЯ

Да мяне заходзіць краля
З кампліментамі і без,
Цыгарэту пекна паліць
І танцуе паланэз.

Мы з ёй двое пляжым віны
І вячэру на сямёх,
І нікога без даніны
Не пушчаем на парог.

Мне знаёмы яе зубы,
Яе вусны, яе стан,
Давядзе мяне да згубы
Белай кралі халістан.

Я пяю для кралі гімны,
Я ёй лускаю гарэх,
Я з ёй ціхі і нястрымны,
Я здзяйсняю з ёю грэх.

Русы волас белай кралі
Пстрыкне шпількай залатой
І рассыплюцца каралі
Пад настырнаю рукой.

Пояс чорны з дэрматыну
Аб'яднае дзве душы
І па моры эратыну
Паплывем, як па шашы.

* * *

О як прыгожа твае рукі нам
Нам сцелюць першы раз пасцель.
Паклалі ціха свае лукі
Амуры-зводнікі на хмель.

Кілім смарагдавы хавае
Ступні тваіх маленькіх ног,

Твая сукенка у фатэлі.
Твой станік. Пацеркі, што так
Блішчаць прывабліва. І келіх,
А ў ім віна знаёмы смак.

Пад лёгкай коўдраю таемна
Застылі свежыя прасціны,
І мы з табою узаемна,
А пад вакном кусты язміну.

Таршэр стары і галавасты
Рассеяў хітраваты бляск,
Мацней акрэсліўшы пілястры,
А ў нашай згодзе — прагнасць
ласк.

Ж-ЖАРТ

Я пяю (Гавяду маіх вершаў
Пасвяць пастухі літаратуры.
Сонца ім пячэ старыя плешы,
Рабацінне сеючы па скуры.

Я іду) Імчаць па аўтабане
Мудрыя машыны без шафёраў,
А тубыльцы на сваім экране
Сочаць за работай святлафораў.

Я маўчу (Гумовая пакрышка
Расцвітае кветкамі агрэсту,
З дрэва ўпала мне на голаў шышка,
Утварыўшы акцыю пратэсту.

Я пішу) Працэсс пісання словаў
Не падобны на чытанне іх жа.
Гэта, скажам, як бы сотні лёваў,
Альбо пецяў, скажам, альбо грышаў
Стануць есці разам памідоры.

Зрэшты, я не ведаю, навошта.

А вядома мне, што носіць пошта
Прэсу, дзе не пішуць пра мяне.

Фота Васіля ЦІТОВА

ГАРАСКОП

Падаем вам гараскоп, які грунтуецца на вартых даверу крыніцах. Вядома, нашыя веды па астралогіі не абмяжоўваюцца надрукаваным, але, на жаль, з-за недахопу месца ў часопісе, мы вымушаны адмовіцца ад падачы багацейшай характарыстыкі знакаў.

Просім не ставіцца да гэтай старонкі залішне сур'ёзна, а ўспрымаць яе як разумовую забаву, як галіну ведаў, што хоць і не абцяжараная акадэмічнымі мантыямі, аднак кранае нашыя душы.

Няхай усе добрыя характарыстыкі з гараскопа спраўдзяцца ў кожнага з вас і ў кожнага вашага сябра, а адмоўныя застануцца нашай памылкаю. Покуль мы друкуем першы раздзел гараскопа. З кожным наступным нумарам часопіса ў вашыя рукі трапіць і чарговы раздзел. Па адным на месяц.

Прыемных забаў!

КАЗЯРОГ

22 снежня — 20 студзеня

Планета-апякун — Сатурн
Стравы — свойская птушка, рыба, рыс.
Напоі — віскі, каньяк.
Расліна — кіпарыс.
Кветка — нарцыс.
Камень — онікс.

Знакамітыя людзі, народжаныя пад знакам Казярога:
21.12.1904 — Марлен Дытрых
24.12.1798 — Адам Міцкевіч
25.12.1642 — Ісак Ньютон
26.12.1893 — Мао Цзэдун
27.12.1822 — Луі Пастэр
31.12.1869 — Анры Маціс
6.01.1412 — Жанна д'Арк
15.01.1929 — Марцін Лютар Кінг
19.01.1839 — Поль Сэзан

Казярог разам з Быком (21.04 — 20.05) і Паннай (24.08 — 23.09) адносіцца да знакаў Зямлі. Уплыў Сатурна на Казярога даволі змрочны, маласпрыяльны. Гэтая акалічнасць робіць Казярогаў недаверлівымі, пазбаўленымі ілюзій. Уразлівы і поўны сумненняў у душы, ён заўсёды знешне халодны і дэманструе бездакорныя манеры. Вельмі амбітны, вытрыманы, сумленны і педантычны. Выдатны арганізатар і асцярожны тактык. Ягоная актыўнасць вызначаецца паслядоўнасцю, ён здатны гадамі канцэнтраваць сваю дзейнасць на пэўнай справе. У рэалізацыі абранае мэты выяўляе жалезную волю і цвёрдасць. Нягледзячы на знешнюю сціпласць, духоўна Казярог цалкам незалежны і самастойны. Да сябе самога вельмі патрабавальны, пакутуе з-за памылак. Поўны сумненняў і не вельмі таварыскі, ён звычайна не выпраўляецца заваёўваць свет, а толькі бароніцца перад ім. Паслядоўна будуе сістэму самаабароны, якая мусіць ахоўваць яго ад небяспек жыцця. Мае прыроднае пачуццё абавязку і таму ва ўсіх сваіх учынках кіруецца самадысцыплінаю.

Яму ўласціва збіраць, акумуляваць і асімільваць духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці. Здольны быць адданым і верным сябрам, разважным дарадчыкам. Замкнёныя ў сабе, некаторыя Казярогі з'яўляюцца інтэлектуаламі высокай кваліфікацыі, маюць схільнасць да абстрактных спекуляцый, містыкі і аскетызму. У спрыяльных абставінах робяцца суддзямі і палітыкамі (Адэнаўэр, Мао Цзэдун), навукоўцамі (Ньютон, Франклін, Пастэр), а таксама досыць меланхалічнымі мізантропамі ад мастацтва (Утрыла, Сэзан, Мальер, Сэнт-Бю). Аднак перш за ўсё гэта знак людзей больш сціплай кар'еры, якая грунтуецца на цярплівай шматгадовай працы: знак бібліятэкараў, архівістаў, фармацэўтаў, лабарантаў і да іх падобных. Казярогі бываюць шахцёрамі, мулярамі, канструктарамі, земляробамі, рамеснікамі і кіраўнікамі невялікіх прадпрыемстваў. Пэўнага становішча ў грамадстве і дабрабыту дасягаюць параўнаўча позна і з вялікімі намаганнямі. Аднак з гадамі з'яўляецца пачуццё бяспекі і волі, узмацняецца вера ў сябе, таму што Сатурн заўсёды спрыяе старасці. Найвышэйшая мэта кожнага Казярога — дасягнуць пэўных пазіцый і забяспечыць сабе высокі грамадскі статус, такое ж моцнае ў іх жаданне разбагацець. Аднак дзейнічае Казярог у гэтым напрамку паволі, асцярожна, без размаху. Зарабляе рэгулярна, і ягоныя фінансавыя справы заўсёды ідуць ўгору. Ён хутчэй ашчадны, чым скнара.

Нягледзячы на тое, што здароўе ў Казярогаў сярэдняе, яны звычайна дажываюць да глыбокае старасці, паколькі ўмеюць размяркоўваць свае сілы. Аднак з-за неспрыяльнага ўплыву Сатурна на Казярогаў яны нярэдка нявечацца ў няшчасных выпадках (ломяць рукі і ногі), а ў час зусім неспрыяльны іх можа напаткаць гвалтоўная смерць з прычыны падзення, утаплення, атручвання, тэхнічных аварый, аўтамабільных або авіякатастроф.

Пачуцці Казярога характарызуюцца суровасцю і павагаю да іншых. Моцныя жаданні ён хавае ў сваім сэрцы доўгія гады. А бывае, нават да самой смерці. Ён панічна баіцца няўдачы ў каханні. Баіцца кахання без узаемнасці, баіцца згубіць каханага чалавека. Казярог вельмі стрыманы ў выказванні сваіх пачуццяў, бо не ўмее і не жадае агаляць іх, не змагацца за каханне. Тут ён пасіўны, пазбаўлены ініцыятывы і недаверлівы. Ён чакае сяброўскага жэсту, праяў чужога пачуцця, але не ўмее сам супрацьстаяць кампліментам і флірту. Лёгка спакушаецца на недаказанасць у пачуццях, бо сам можа наважыцца выказаць іх хіба што жэстам, а не словам. Чулы, нярэдка рамантычны, ён усё-такі пазбягае кахання, бо баіцца, што інстынкты перамогуць ягоную асобу, баіцца не столькі самога кахання, як ягоных вынікаў — пакут. Баіцца глядзецца смешна, сапсаваць сабе рэпутацыю. Таму Казярогі нярэдка застаюцца самотныя — з-за боязі, эгаізму або альтруізму.

А найчасцей застаюцца самотныя, бо так ім падабаецца. Аднак, калі ўсё ж такі яны ажэняцца, то будуць салідным мужамі, праўда, даволі халоднымі і суровымі. Жэняцца Казярогі позна і па разліку.

Жанчыны з-пад гэтага знаку выходзяць замуж раней, аднак робяць гэта часцей з-за неабходнасці ці з прымусу, і таму нярэдка памыляюцца ў выбары партнёра. Сваю ролю жонкі і гаспадыні выконваюць з уласцівай ім сур'ёзнасцю і грунтоўнасцю. Яны верныя сяброўкі і жонкі, аднак больш ахвотна рэалізуюць сябе не ў сям'і, а на працы. Ад прадстаўніц іншых знакаў Казярогі-жанчыны адрозніваюцца мацнейшымі воляй, логікай, рацыяналізмам і таму хутчэй дасягаюць сапраўднай сацыяльнай незалежнасці. Нярэдка адмаўляюцца ад асабістага жыцця на карысць кар'еры. А часам рэалізуюць свае амбіцыі праз мужаву кар'еру. У каханні жанчыны з-пад гэтага знаку смялейшыя за мужчын, яны лёгка паддаюцца на заляцанні, аднак заўсёды захоўваюць пэўную дыстанцыю. З узростам Казярогі-жанчыны пачынаюць жыць паводле сваіх сапраўдных эмацыянальных патрэб, робяцца больш прывабныя.

А вось уласцівасці характару, абумоўленыя ўплывам Сатурна: моцна абмежаваныя біялагічныя патрэбы, запаволенасць фізіялагічных працэсаў, стрыманасць, прадбачлівасць, цярплівасць, канцэнтрацыя волі, настойлівасць, схільнасць да збірання і набыцця маёмасці, суровасць і стрыманасць у пачуццях, здольнасць да абстрактнага аналізу і медытацыі, халоднае, рэалістычнае стаўленне да прыемных праяў жыцця, песімізм, недавер.

Неспрыяльны ўплыў планет стварае тып непапраўнага мізантропа, эгаіста, скнары — маўчуна, чалавека, абыякавага да ўсяго, што не тычыцца ягоных асабістых інтарэсаў.

АБ'ЕКТЫЎНА

БЕЗ САЛЮТАЎ УСІМ ПРАВАДЫРАМ

Калі памёр Сталін і на замарожаным даляглядзе з'явіліся першыя адзнакі адлігі, Барыс Слуцкі напісаў...

Эпоха зрелищ кончилась.
Пришла эпоха хлеба.
И перекур объявлен
Всем штурмовавшим небо...

Аднак паэт крыху паспяшаўся, і цяпер, кінуўшы рэтраспектыўны погляд у асцярожлівую адлігу, якая змянілася потым на безжыццёвы штыль стагнацыі, гэта асабліва маркотна асэнсоўваць.

І яшчэ раз сыходзіць эпоха... Зноў надзеі, зноў чаканні.

Сёлетні Першамай праходзіў у Мінску, здаецца, упершыню за 70 гадоў без звыклых аксесуараў. Хто хацеў, прыйшоў на пляц, прайшоў у калонах, а хто не хацеў, таго не змушалі. Такая была і дэманстрацыя 7 лістапада. Не было шэсця раённых калонаў, сцягоў і транспарантаў, партрэтаў правадыроў і натужлівых заклікаў з трыбун, на якія калоны адгукаліся слабым рэхам.

Яшчэ не паспелі забыцца?

Галасісты камсамольскі работнік з «групы скандзіравання» абвяшчаў які-небудзь палітычна спелы спіч, накшталт: «Слава студэнтам і выкладчыкам мяса-малочнага інстытута!» І ў адказ гучала «Ура»!

І ніхто не задумваўся пра ганебнасць і дурату такога вось «дэманстравання». Пыхлівыя чыноўнікі



абыякава пазіралі на тых, хто праходзіў унізе, адасобленыя шэрагамі апранутых з такой нагоды ў форму супрацоўнікаў дзяржбяспекі, і час ад часу складалі далоню рыбкаю і млява пагойдвалі паўсагнутымі рукамі. На бакавых трыбунах шчыльна кучкаваліся меншыя рангам, іхнія сваякі і тыя, хто па блату адхапіў запрашальныя квіткі.

І ўсё гэта называлася дэманстрацыяй...

А хто стаяў на трыбунах? Старшыня выканкома, якога праз некаторы час прыцягвалі да адказнасці за хабар. Сакратар райкома, пра якога ўсе ведаюць, што ён апошні прайдзісвет.

І прывезены ў райцэнтр працоўны народ, а таксама мясцовыя жыхары мусілі цвёрда крочыць міма трыбуны і кідаць прывітальныя позіркі на тых, каго лепш было б і ўвогуле не бачыць.

І ўсё гэта было асвечана абавязковым помнікам У. І. Леніну.

Гэх, падняўся б Ленін з Маўзалея, ён бы нам усім даў рады!

Ад райцэнтраў да Чырвонай плошчы разыгрывалася камедыя ганьбавання двух нашых цудоўных свят. А 1 Мая і 7 лістапада вымагаюць не танных маскарадаў, выкананых паводле сцэнарыяў, зацверджаных «сакратаром па ідэалогіі». Гэта не звычайныя даты, пазначаныя чырвоным у каляндары, а наша гісторыя.

Са святам!

Зміцер СЯМЁНАЎ



Фота Яўгена СКУРАТОВІЧА, Алега БЕЛАВУСАВА і Валерыя СІБРЫКАВА

ПАШУКАЕМ «СВАЮ ТАЛЕРКУ»

«Дапамажыце! Ростам я не выйшла, усе навокал называюць мяне пігаліцай ды яшчэ насміхаюцца. Я вельмі хачу падрасці!»

«Усе мае праблемы сышліся ў адной, галоўнай: я вельмі поўная. Праз гэта так шмат засмучэнняў і няўдач прыходзіцца цярпець, вы проста не ўяўляеце! Стараюся выбрацца неяк з гэтага «балота», але, на жаль, нічога не атрымліваецца. Кажуць, мая паўната спадчынная...»

«У кожнага свая бяда, ёсць яна і ў мяне. Справа ў тым, што на маім твары — невялікая радзімая пляма. Праз яе адчуваю сябе няўпэўнена, лаўлю на сабе цікаўныя позіркі. І таму мая адзіная мара — пазбавіцца яе...»

Магу і далей цытаваць лісты юных чытачак, незадаволеных сваёй знешнасцю. Некаму не падабаецца свой нос, нехта незадаволены яркім румянцам (каб займець яго, іншыя не шкадуюць касметыкі), нехта наракае на высокі рост (хоць тыя ж прыгажуні-манекеншчыцы рэдка бываюць невялікія ростам)... Адным дзяўчатам можна параіць звярнуцца да канкрэтных спецыялістаў — ну, напрыклад, у Мінскую касметалагічную лякарню, іншым — прыйсці ў спартзалу і пакінуць там свае «лішнія» кілаграмы... Але ўсё-такі большасці трэба зразумець: не заўсёды можна змяніць тое, што дала прырода. А вось навучыцца хаваць ад чужых вачэй недахопы і звярнуць увагу на вартасці — можна.

Напрыклад, у вас тонкая талія, але не вельмі прыгожыя поўныя ногі. Значыцца, трэба адмовіцца ад кароткіх спадніц (няхай і звышмодных!), насіць прыталеныя рэчы альбо свабодныя — з поясам. Другі прыклад: у вас, як вам здаецца, доўгі нос ці шырокія скулы. Трэба параіцца з цырульнікам, касметолагам — хутчэй за ўсё, новая форма прычоскі і грым дапамогуць. Калі ж у вас доўгія прыгожыя ногі, а талія, наадварот, далёкая ад дасканаласці — насіце прамыя свабодныя сукенкі, жакеты, блузкі навыпуск, але не адмаўляйцеся ад кароткіх спадніц, доўгія ж насіце з разрэзам. Згадзіцеся, такія невялікія «хітрыкі» можа прыдумаць кожная з нас. А пачаць я параю ўсё ж з люстэрка, з уважлівага позірку на саміх сябе.

І ўсё ж гэта толькі «прыказка» да сённяшняе размовы. Хачу ў вас запытацца: якія ў вас узнікаюць асацыяцыі пры ўпамінанні аб «тургенеўскіх паненках», «рубенсаўскіх жанчынах», «чэхаўскіх гераінях»? Не толькі ж канкрэтны стыль адзежы, але і пэўны тып знешнасці, манера гаварыць, трымацца, ці ж не так? Усё разам гэта называюць вобразам. Вось і нашая размова пра тое, як пачаць пошук сябе, свайго вобразу кожнай з нас. Справа гэтая нашмат больш складаная, чым, скажам, пошукі «свайго» адзення, «свайго» макіяжу. Прапаную пагартаць часопіс, які, на мой погляд, якраз дапамагае адшукваць свой вобраз у нашым складаным свеце. Гаворка пойдзе пра новы часопіс мод «Стиль», які выходзіць у Ленінградзе. Вось што я прачытала ў ім: «...Усе ведаюць, як ад «касцюма з чужога пляча», няхай дарагога і добра пашытага, але зусім неадпаведнага ні вашаму характару, ні ўсяму таму, што вас акружае, узнікае пакутлівы стан, калі вы «не ў сваёй талерцы». А дакладней, узнікае супярэчнасць паміж тым, што «просіць вашая душа», вымагае сітуацыя, і тым, як абавязвае вас гаварыць, рухацца, жыць касцюм. Так што адзенне — справа сур'ёзная. Яно — прадаўжэнне чалавека, яго «другая скура», адзін з, няхай і не галоўных, кампанентаў ягонай асобы». Згадзіцеся: вельмі сур'ёзнае і апраўданае стаўленне да адзення. Дарэчы, адразу ж прыводзіцца такі цікавы прыклад: узорны хлопчык надзявае «даспехі» «металіста» і на вачах ператвараецца ва ўзвінчанага, агрэсіўнага падлетка...

Сучасная мода прапануе вельмі многае. Самыя розныя фасоны, малюнкі, сілуэты, колеры, даўжыню. А выбіраць трэба самастойна, давяраючы густу і веданню самога сябе, свайго стылю. Вядома, гэта не значыць, што я, напрыклад, усё жыццё буду насіць аднастайныя строі, якія мне пасуюць. Зусім не! Знакамітая Габрыэль Шанэль казала: «Я не люблю, калі гавораць пра моду Шанэль. Шанэль — гэта перш за ўсё стыль. Мода выходзіць з моды, стыль — ніколі!» Надзіва слушна, як і тое, што адзін стыль можа мець бясконцую колькасць варыяцый. Тая ж класіка можа быць з элементамі фальклору, рамантыкі, спартыўнасці.

Натуральна, калі я стану перад люстэркам і скажу сама сабе: «Выбіраю такі вось стыль» — я пакрыўлю душою, альбо падману сябе. Па-першае, каб выбраць стыль, трэба шукаць яго не адзін дзень, па-другое, неабходныя веды, а дзеля гэтага трэба будзе пахадзіць на спектаклі тэатра мод, прагляды мадэляў, пачытаць часопісы мод і г. д. Трэба, нарэшце, мець галоўнае — жаданне творчасці. З'явілася яно, абрыдла насіць купленыя рэчы, якія «ўсе бяруць» і па якія адстаялі доўгую чаргу і выклалі немалую суму,— можна прыступаць да пошукаў саміх сябе.

Шляхоў для такой творчасці некалькі. Я ж хачу спыніцца на самым, як на мой погляд, плённым: нам дапамогуць нашыя рукі. Інакш кажучы, гаворка ідзе пра вязанне, вышыўку, макрамэ, шыццё. Мяркую так таму, што многія мае знаёмыя, якія ўмеюць трымаць у руках пруткі, кручок, нітку з іголкаю, дзякуючы свайму ўменню ўжо знайшлі свой стыль.

Знайшла яго і Алена Атраховіч, з якой мне хочацца вас пазнаёміць. Алена па прафесіі мастацтвазнаўца, і, ведама ж, яе прафесія не магла не паўплываць на яе аблічча. Да таго ж, яна, як кажуць, не толькі тэарэтык, але і мае дзіўныя рукі. І пачалося ўсё даўным-даўно, калі Алене было гадоў пяць і калі ёй самой захацелася зрабіць ружу, падобную да той, што стаяла ў вазе. Не лічачы вочкаў, без усялякай тэорыі, проста наўздагад. Ружа распусцілася ў яе маленькіх ручках, і мама адразу ж прыкалола кветку да сваёй сукенкі.

Потым прыйшло майстэрства. Сёння, прызнаюся шчыра, гардэробу Алены можна пазайздросціць: якіх расфарбовак і ўзораў вязаныя касцюмы, сукенкі, кофты, шалі! І галоўнае: каб мне паказалі безліч рэчаў, я, ані разу не памыліўшыся, змагла б вылучыць тыя, што носіць Алена — па няўлоўнай прыналежнасці да аднаго стылю. Зрэшты, сама Алена тлумачыць усё проста: творчасць нязменна прыводзіць да пошукаў свайго стылю. Таму што, выбіраючы тую ці іншую мадэль, параўноўваеш яе з іншымі ўзорамі, праглядаеш часопісы, кнігі, каталогі, шукаеш патрэбныя спалучэнні, а гэта якраз тая праца думкі, якая вядзе да свайго стылю.

— Ну, а калі я ў пошуках свайго стылю, з чаго пачаць? — пытаюся ў Алены.

— Самы творчы шлях — гэта стварэнне новых рэчаў. І зусім неабавязкова мець дарагія новыя ніткі — карыстайцеся тымі, што засталіся ў розных колькасцях ад іншых рэчаў. Паглядзі вось на гэтую летнюю кофтачку: адных колераў колькі, тыпы нітак самыя розныя — усе, што засталіся, а ў дадатак — такія ж яркія рознакаляровыя гузічкі. Ці вось камплект на лета: тое ж камбініраванне з рэштак, але тым часам арыгінальна і проста.

У гардэробе кожнай дзяўчыны ёсць вязаныя рэчы, якія ўжо даўно надакучылі, хоць і выглядаюць досыць прыстойны. У сітуацыі, калі адзежа асацыруецца з якім-небудзь перыядам часу, якой-небудзь падзеяй, да якой не надта хочацца вяртацца ў памяці, на дапамогу таксама прыходзіць рукадзелле. Можна памяняць фасон, даўжыню, аддзелку. Напрыклад, была ў мяне трыкатажная сукенка, якую я доўга насіла. Распусціла, зрабіла касцюм, а ў кофтачцы замест устаўкі выкарыстала невялікую квяцістую вязаную хустку. (Дадам да слоў Алены асабістае ўражанне: касцюм атрымаўся найвыдатнейшы!)

І нарэшце, спосаб, самы багаты на выдумку і фантазію — вывязванне (ці пляценне) самых розных дапаўненняў. Напрыклад, набываеш у магазіне досыць простую, немудрагелістую сукенку і за адзін-два вечары робіш яе непадобнай на ўсе астатнія. І можаш быць упэўнена, што не сустрэнешся нос у нос з такімі ж, як у цябе, строямі, скажам, заўтра ў гасцях. Упрыгожыць сваю сукенку можна з дапамогаю кветак, каўняроў, манжэтаў, паясоў, аддзелак, вышывак і г. д. Галоўнае тут — раскаванасць, фантазія, а прынцып застаецца той самы — з рэштак нітак.

Выслухаўшы рэкамендацыі Алены, задаю апошняе пытанне:

— Ва ўсіх тваіх строях надзвычай удала спалучаюцца колеры. Як гэтаму навучыцца?

— Таксама вельмі проста: часцей аглядвацца вакол сябе. Выходзіць у поле, на поплаў, у лес, глядзець, нарэшце, як растуць кветкі на падаконніку... Тут не трэба прыдумваць нічога новага — бяры прыклад з прыроды!

Дарэчы, Алена Атраховіч, як мне здаецца, знайшла свой стыль не толькі ў адзенні. Яна знайшла яго ў творчасці, у паводзінах, у сяброўстве дый проста ў побыце. Я амаль не заўважыла ў яе кватэры «выпадковых» рэчаў — і свяцільнікі, і шторы, і разлапісты корань для пацерак, і яе вырабы з макрамэ, і падвесы для кветак, і яшчэ шмат што іншае сведчыць пра гэта... А вось ці здолеем мы з вамі стварыць свой стыль, свой вобраз — пакажа час. Але пошук трэба пачаць ужо сёння.

І апошняе, пра што хочацца сказаць. Які стыль ні знайшлі б вы ў выніку, не забудзьцеся на выраз вашага твару. Памятайце параду Дэйла Карнэгі: «Усмешка — самы танны і эфектыўны касметычны сродак». Не верыце — падыдзіце да люстэрка і пераканайцеся! Не скупіцеся на ўсмешкі. Паверце, з імі пошук будзе больш паспяховы.

КАСЯ

ВЫРАБЫ БРЭСЦКАЙ ДОСЛЕДНА-ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЙ ФАБРЫКІ ВЕРХНЯГА ТРЫКАТАЖУ — ПРЫВАБНЫЯ І НЕПАЎТОРНЫЯ

Па заказу Беларускага
Цэнтра Моды.
Рэкламная фірма БЕЛАР

Індэкс 74824



50 к. «Крыніца», 1990, №№ 11—12, 1—76.